Віктар Дзятліковіч

# Іх Мроя
# Іх N.R.M.



Віктар Дзятлікові

# Іх МРОЯ
# Іх N.R.M.

Віктар Дзятліковіч

# Іх Мроя
# Іх N.R.M.

Мінск
Сучасны літаратар
2005

УДК 784
ББК 85-2
Д 69

Аўтар
Віктар Дзятліковіч

**Дзятліковіч В.**

Д 69 **Іх Мроя. Іх N.R.M.** Гэтая кніга, бадай, першая спроба біяграфіі беларускага гурту. Болей увагі тут надаецца «Мроі», яно й зразумела: «Мроя» тая была так даўно, што некаторыя з музыкаў не памятаюць гарадоў і датаў, а хтосьці, нават, забыўся на падзеі. Таму гэта тое, што ў нас прынята называць легендай. Дзякуючы Віктару Дзятліковічу аднавіўся парваны ланцуг мроеўскага жыцьця, і цяпер можна ўдыхнуць дзіўны водар, здаецца, блізкіх, але такіх даўніх гадоў. Гэткая машына часу... Таму – добрага Вам падарожжа! / В. Дзятліковіч.– Мн.: Сучасны літаратар, 2005.– 320 с. + 32 вкл.

ISBN 985-14-1115-9.

**УДК 784**
**ББК 85-2**

**© Дзятліковіч В., 2005**

**ISBN 985-14-1115-9**

# ПРАДМОВА АД ВОЛЬСКАГА

Віця (аўтар гэтае кнігі) — наш добры сябар. Як толькі прыяжджае ў наш стабільны, чысты й узорны Менск, дык мы абавязкова сустракаемся. Ён нам распавядае пра сваю нялёгкую працу, мы яму — пра сваю. Калісьці Віктар Дзятлікович працаваў у Менску, але змушаны быў зьехаць у чужы далёкі велізарны горад, які, як усім вядома, ня верыць сьлязам. Таму наш герой ня стаў плакаць, а пачаў працаваць тэлежурналістам на адным зь вядомых расейскіх тэлеканалаў. Праца кідала яго ў Чачэнію, у Аўганістан, нядаўна тэлефанаваў з Таймыру...

Віктар добра нас ведае й нямала з намі паезьдзіў: наведваў «Басовішча», прыяжджаў у Менск на эпахальныя для нас канцэрты «Радыё Гамон» і «Падарожжа на Возера Трох Чарапахаў», гасьцяваў з намі ў Лёніка Тарасэвіча, карацей, зьведаў нягоды й цяжкасьці музыканцкага жыцьця.

Гэтая кніга, бадай, першая спроба біяграфіі беларускага гурту. Болей увагі тут надаецца «Мроі», яно й зразумела: «Мроя» тая была так даўно, што некаторыя з музыкаў ня памятаюць гарадоў і датаў, а хтосьці нават забыўся на падзеі. Таму гэта тое, што ў нас прынята называць легендай. Дзякуючы Віктару аднавіўся парваны ланцуг мроеўскага жыцьця, і цяпер можна ўдыхнуць дзіўны водар, здаецца, блізкіх, але такіх даўніх гадоў. Гэткая машына часу... Таму — добрага Вам падарожжа!

*Лявон Вольскі*

# ЭПОХА МРОЯ

Ня кожнаму чалавеку дадзена пражыць эпоху. Сучасным беларусам тут пашанцавала, бо два апошнія дзесяцігодзьдзі сталіся для Беларусі эпохай. І, што самае цікавае, пражылі яе разам, на агульным уздыху, адразу некалькі пакаленьняў — усе тыя, каму ў сярэдзіне васьмідзесятых ужо прамінулага стагодзьдзя было болей за пятнаццаць. І каму Бог даў магчымасьць увайсьці ў трэцяе тысячагодзьдзе. Узгадайма маршы свабоды, мітынгі і рок-імпрэзы з выразнай скіраванасьцю і «за» і «супраць». Мы былі разам незалежна ад узросту, калі пратэставалі супраць рэвалюцыяў, дзяржаўнага тэрору, магчымасьці чарговых акупацыяў ці выступалі ў абарону нашай мовы, свабоды слова, палітычных вязьняў, або проста адзначалі завяршэньне вакацыяў.

Гэта была эпоха разьвітаньня з камунізмам, яго татальнымі забаронамі свабодаў — асабістага жыцьця, слова, веравызнаньня, нацыянальных адчуваньняў, творчасьці. І гэта была эпоха надзеяў на набыцьцё гэтых свабодаў дзеля таго, каб стаць творцамі ўласнага жыцьця і сваёй краіны, якой ня мелі і якую хацелі мець. Мы мроілі збудаваць Незалежную Рэспубліку Беларусь. Напэўна ж, гэтая дзяржава будзе збудаваная. А пакуль мы збудавалі Краіну Мрою. І гэта ўжо выдатна, бо мроі маюць асаблівасьць ператварацца ў рэальнасьць. Але гэта будзе ўжо іншая эпоха.

Вось жа кніга, якую вы трымаеце ў руках, напісаная ці не пра самых галоўных культурных герояў Эпохі Мроі. Лявон Вольскі і ягоныя сябры-калегі, аднадумцы сталі, з майго гледзішча, аднымі з самых выразных і сьветаглядных, і эстэтычных знакаў эпохі.

У рэшце рэшт, палітыкі — толькі выканаўцы. А дух эпохі, яе здабыткі й супярэчнасьці, яе маральныя і эстэтычныя пакажчыкі выяўляюцца ў творах мастацтва, літаратуры, народна-паэтычнай творчасьці, дзе вобразна адлюстроўваюцца псыхалягічныя адчуваньні людзей. І асабліва гэта тычыцца часу прынцыповых пераменаў. Героі гэтай кнігі — гурты «Мроя» і «N.R.M.» — ня толькі сьпявалі пра мроі людзей найноўшага беларускага часу, а былі, так бы мовіць, сярод завадатараў разбурэньня старога часу і стварэньня новага. Прастора сцэны рассоўвалася да памераў вуліцаў і плошчаў, дух апошніх звужаўся да выразнай мэтафары паэтычнага тэксту ці рок-н-рольнага акорду.

Пра гэта і ёсьць кніга Віктара Дзятліковіча. Яна таксама мае шанцы стаць унікальнай зьявай у нашай культуры найноўшага часу. І ня толькі таму, што гэта першая ў Беларусі кніга, прысьвечаная рок-музыкам. Яе арыгінальнасьць у шматслойнасьці. Гэта — і кніга-біяграфія культавых музыкаў з матывамі сяброўства, вернасьці, здрады. Гэта і кніга-роздум пра час і ролю мастака ў ім, ягоны ўплыў на тысячы, дзесяткі, сотні тысячаў людзей. Мае кніга і прэтэнзію на мастацтвазнаўчы аналіз працэсу станаўленьня беларускай рок-музыкі ўвогуле. Выкарыстоўваючы багатыя газэтныя і часапісныя матар'ялы, Віктар паказвае, як беларускі рок разрываў стэрэатыпы несвабоднага мастацтва ў несвабодным грамадзтве, як нараджалася альтэрнатыўная музыка і як яна станавілася і зьявай мастацтва, і зьявай грамадзка-палітычнай. Асабістыя, мастацкія, культурныя, палітычныя матывы кнігі зліваюцца ў адно — у паказ шляху герояў да сваёй мары, да сябе, да сваёй публікі і да мастацтва. Мо таму найпрыемней чытаць гэтую кнігу, калі гучыць штосьці з «N.R.M.». Я рабіў гэта пад «Тры чарапахі».

*Вячаслаў Ракіцкі,*
*кандыдат мастацтвазнаўства*

# Разьдзел 1

# ПАЧАТКІ. СТВАРЭНЬНЕ МРОІ

Каго паставіць ля самых вытокаў? Каго прызначыць адказным за зьяўленьне Мроі? Уладзю Давыдоўскага? Патлатых рокераў з Захаду — якіх-небудзь Cream ці Led Zeppelin? Піцерскіх музычных падпольшчыкаў? Не.

Усё распачала Галіна Фёдараўна Давыдоўская. Гэта яна купіла сыну першую гітару. Праз вялікую скептычнасьць бацькі і нават бяз гучных енкаў з боку самаго Уладзі — ён у той момант, гледзячы на брата, болей за ўсё жадаў стаць архітэктарам.

Пакупка гітары, што адбылася неяк узімку ў краме «Музыка», праз колькі год зьмяніла лёс яшчэ трох чалавек, якія да таго часу і ня думалі рабіцца музыкамі. Хоць жыцьцё іх да гэтага паціху падпіхвала.

## Дзеці — баяністы

О, гэтае невынішчальнае бацькоўскае жаданьне ганарыцца сваім дзіцёнкам на вачох у публікі! Колькі разоў мы сарамліва ўзьбіраліся на зэдлікі ды дэклямавалі вершыкі, зьбіваючыся і чырванеючы. Таньчылі, сьпявалі, каб атрымаць дозу апляадысмэнтаў ад падпітых гасьцей.

Бацька Алезіса да вершаў ставіўся спакойна. Болей за паэзію ён любіў баян. Падчас любога сьвяточнага застольля ён, вясковы самавучка, трохі выпіўшы, адразу браўся за любімы інструмэнт і дадаваў вечарыне вясялосьці. І дзе ж было Алезісу пазьбегнуць таго лёсу! Калі ён перайшоў у трэцюю

клясу, бацька вырашыў, што час прысьпеў, і адвёў сына ў музычны гурток.

Алезіс: «*Вучылі мяне граць на дарослым баяне. А ён жа такі вялікі! Паспрабуй дзесяцігадоваму хлапчуку разгарнуць гэтыя мяхі. Ня хочацца пасьля гэтага нічога, нават мульцікі глядзець... Амаль не замардавалі маленькага дзіцятку тым баянам*».

Некалькі месяцаў працягвалася катаваньне. Жыцьцё імкліва ляцела пад адхон. Але й скончылася ўсё раптоўна. Алезіс захварэў. А вылечыўшыся, заплакаў і сказаў, што больш у гурток ня пойдзе. Дзіўна, але бацька той бунт прыняў амаль адразу, са шкадаваньнем зрабіўшы выснову, што да музыкі сын ня здатны.

Пачуў бы тую гісторыю Юрась, здзівіўся б моцна. Яго рукі самі цягнуліся да баяну. Калі ўсе дзеці выпрошвалі ў бацькоў клюшку, канькі ды цацачную чыгунку, то маленькі Юрык прасіў усё гэта, але яшчэ і баян. Маці не супраціўлялася. Яна ўвогуле была добрай жанчынай і па магчымасьці патурала жаданьням сына. Адно, чаго Юрык так і не дачакаўся — гэдээраўскага канструктара. Бо ён быў дэфіцытам. Баян дэфіцытам ня быў.

Юрась: «*Чаму баян? А халера яго ведае. Я ў той час вучыўся ў 20-й школе. Асноўным прафілюючым прадметам там была француская мова. І па сваёй мэлёдыцы яна чамусьці прывяла мяне да баяна. Калі гаварыць пра нейкія асацыяцыі, то мне і зараз скажы «баян», і я адкажу: «француская мова*».

Праз чатыры гады навучаньне скончылася празаічна. Сям'я пераехала ў новую кватэру, і Юрасю стала лянота перціся кожны дзень з баянам праз увесь горад.

### Дэклямант Вольскі

Лявон баяністам ня быў. Таму што болей за музычныя выяўляў іншыя здольнасьці. У чатыры гады ён пайшоў у мастацкую студыю, потым у мастацкую ж школу № 1. Гэта, — кажа зараз, — пазбаў-

ляла нават мізэрнага і тэарэтычнага шанцу стаць хуліганам: урокі маляваньня прыходзілася наведваць увечары, пасьля заняткаў у звычайнай школе. Таму й не бегаў ён па дварох са шпаной ды не хадзіў сьценка на сьценку.

Праўда, болей за ўсё савецкім грамадствам у той час быў запатрабаваны іншы Лявонаў талент — дэкляматарскі. Забава для партыйных босаў ды чыноўнікаў: падчас сьвяткаваньня чарговае гадавіны рэвалюцыі пабачыць на сцэне хлопчыкаў у белых кашулях ды чырвоных гальштуках, што пісклявымі галасамі дэклямуюць:

*Для нас учёба — самый главный труд,*
*Знак качества — отличные отметки.*
*От нас глубоких, прочных знаний ждут*
*Свершения десятой пятилетки.*

Лявон і зараз, не прыкладаючы асаблівых намаганьняў, узгадвае падобныя вершыкі адзін за адным. А кім ён у такім выпадку быў у дзяцінстве? Мабыць, жывой анталёгіяй дзіцячае прапаганды. Добрая памяць разам з гучным голасам — за гэта яго нават узялі ў зборную дэклямантаў раёну!

Лявон: *«У дэкляматарстве класным момантам было тое, што падчас рэпэтыцыяў цябе здымалі з заняткаў. Як я ўваходзіў у зборную раёну, дык напярэдадні адказных выступаў маглі нават на два-тры дні вызваліць ад школы. А мне гэта лёгка давалася — раз-два прачытаў тыя вершыкі і ўсё памятаеш. Ды пры гэтым на заняткі ня ходзіш. Цудоўна!»*

## Школьныя вопыты

Уладзя Давыдоўскі першы паставіўся да музыкі сур'ёзна. У восьмае клясе ён скалаціў сваю першую банду. Ня тое, каб школьныя ВІА тады былі паўсюдна, аднак дырэкцыя школы з музычным ухілам магла гэта дазволіць. У першы склад без-

назоўнага ансамблю ўвайшоў бубнач Сяргей Лоскутаў і тры гітарысты — сам Уладзя, Юрась Ляўкоў, які вучыўся ў паралельнае клясе, і Сяргей Надежкін. Цікава, што па жыцьці толькі Сяргей Лоскутаў адыйшоў ад музыкі (хоць пэўны час і спрабаваў граць з Мрояй). А Сяргей Надежкін пазьней быў найбольш вядомы як лідар-гітарыст гурта Тарнада.

Ні аб якой уласнай творчасьці ў школьным ВІА размова не йшла. Адно — перапеўкі савецкае эстрады ды самага бяскрыўднага з The Beatles, Kinks, іншых заходнікаў. Тады гэта называлася «зьняць адзін да аднога». На той час і Уладзя і Юрась ужо лічылі сябе прыстойнымі гітарыстамі, хоць і было гэта вынікам звычайнага самавуцтва.

Юрась: *«Адбывалася так — нейкі хлопец старэйшы грае на гітары, а ты просіш паказаць, як гэта ў яго так капітальна атрымліваецца. Потым дома сам доўга-доўга спрабуеш зрабіць тое ж самае. Калі не атрымалася, зноў ідзеш і просіш паказаць. Я такім чынам навучыўся збольшага добра граць на гітары Баха, з Моцарта пасажыкі просьценькія. У яго ёсьць канцэрт для клявэсыну, які на клясычную гітару перакладаецца.*

*Інакш было немагчыма, бо ніякае літаратуры музычнае тады ўвогуле не было. Для мяне першай сур'ёзнай адукацыйнай інфармацыяй была «школа Блэкмара» на нейкіх маленькіх аркушыках, літаркамі маленькімі — як пальчыкі ставіць на струны. Усё па-ангельску, невядомым спосабам растыражаванае. І то гэта мы атрымалі ў 87-м годзе. А да гэтага часу нічога не было. У краме «Ноты» падручнікі былі толькі для клясычнае гітары. І толькі напрыканцы 80-х я знайшоў у той краме нейкую венгерскую кніжку па клясе бас-гітары»*.

Ансамбаль праіснаваў год. Пасьля восьмае клясы Уладзя, забыўшыся на сваё жаданьне стаць архітэктарам, кінуў школу і скіраваўся ў мастацкую вучэльню. Праўда, паступіць здолеў

толькі з другой спробы. І ў той жа год у вучэльні апынуліся Лявон і Алезіс. Справа незваротна ішла да стварэньня Мроі.

### Менск — музычнае балота

Напрыканцы 70-х музычнае жыцьцё віравала дзе заўгодна, толькі не ў Беларусі. За заходняй мяжой буяў польскі рок. Lady Pank падпісвалі кантракт на выданьне дзесяці альбомаў у Злучаных Штатах, Lombard і Maanam з посьпехам выступалі па ўсёй Эўропе. Савецкі Саюз вар'яцеў ад Машины Времени і піцерскага року. У Менску было ціха як на балоце. Калі музыка аднекуль і чулася, дык толькі з адкрытых вокнаў рэстарацыяў ці на вясельлях. Прабіцца ў рэстаран, каб атрымаць «ангажэмэнт», было запаветнай марай ці ня кожнага беларускага музыканта. Гэта давала стабільнасьці, якой часам не хапала на «вясельным фронце». Хоць і там, зарабляючы 25 рублёў за вечар (а пашанцуе — дык і 50 за выходныя), можна было пачуваць сябе забясьпечаным чалавекам.

Зьміцер Падбярэзкі: *«У рэстарацыях тады, дарэчы, сядзелі вельмі класныя музыканты. Напрыклад, у «Каменнай кветцы» на вуліцы Талбухіна гралі Стэф (саксафаніст Ігар Сафонаў), Барыс Бернштэйн, Валодзя Ткачэнка. І ў любое месца, дзе граў «жывы» калектыў, патрапіць было амаль немагчыма.*

*Хаця, канешне, на канец 70-х прыпаў правал у беларускай музыцы. Адыйшла першая рокавая хваля, што нарадзілася ў 60-х. Тады, у 68-м годзе, у РТІ прайшоў другі ў Саюзе рок-фэстываль, зьявіліся Алгарытмы на чале з Жэням Канавалавым, 2+2, дзе пачыналі Валодзя Угольнік і Генадзь Старыкаў. Памятаю нават гурт Сьвінары — які назваўся так у супрацьвагу Песнярам і ўжо праз гэта нёс нейкую панкаўскую ідэю.*

*Але ў той час, пра які мы гаворым, ніводзін з гэтых гуртоў не існаваў, а чагосьці новага, адпаведнага па ўзроўні, не нарадзілася».*

Адзіны менскі гурт, які можна было назваць рокавым і да якога пасавала слова «папулярнасьць», — гэта Сузор'е. Зьявіўся ён у 77-м годзе і дасягнуў нечага дзякуючы камсамольскаму экспэрымэнту.

Пад крылом Савецкага райкаму камсамолу на вуліцы Багдана Хмяльніцкага тады адкрылі кафэ «Сузор'е», дзе гурт і выступаў па чатыры разы на тыдзень. Квіткі ў кафэ расьпісваліся на месяц наперад, а студэнтам РТІ выдаваліся ў якасьці ўзнагароды за выдатную вучобу.

Музычна-кафейны адпачынак моладзі быў «адказным участкам працы» для другога сакратара Савецкага райкаму камсамолу Мішы Падгайнага. Відаць, менавіта з таго часу ён зразумеў, што падтрымліваць трэба маладых. У 94-м годзе на першых прэзыдэнцкіх выбарах ён зрабіў стаўку на маладога дырэктара калгасу і неўзабаве стаў міністрам інфармацыі...

У 81-м годзе, «забранзавеўшы», на піку славы й папулярнасьці, Сузор'е залічваецца ў штат Беларускай філярмоніі і становіцца прафесійным дзяржаўным калектывам. Прыходзіць час, калі мусіць узьняць галаву хоць нейкі андэграўнд. За некалькі месяцаў да гэтага знаёмяцца Лявон і Алезіс.

## Як пазнаёміліся Вольскі і Дземідовіч

Лявон: «*Я вучыўся ў 127-й школе на перакрыжаваньні Берута і Адоеўскага. І ніякіх добрых успамінаў пра яе няма. Школа была без усялякага ўхілу, але мела статус нейкай узорна-паказальнай. І дырэктар з настаўнікамі падтрымлівалі яго да пасіненьня. Таму я з лёгкім сэрцам адтуль зьліняў адразу пасьля восьмае клясы*».

Летам 80-га Лявон паступае ў мастацкую вучэльню на педагагічнае аддзяленьне, спэцыяльнасьць — «выкладчык чарчэньня й маляваньня». Тут жа, у групе «12 ПО», аказваецца і Алезіс. Магчыма, і не пасябравалі б яны так хутка, каб не адна акалічнасьць — ва ўсёй групе іх было два хлопцы

на дваццаць дзяўчат. У такім атачэньні толькі й заставалася, што трымацца разам.

Ясная справа, што настаўнікам ніхто станавіцца не зьбіраўся.

Лявон: *«Мяне, канешне, цікавілі не ўрокі чарчэньня, а станкавы жывапіс. Я Ван Гога любіў, іншых вар'ятаў. А як у вучэльню патрапіў, зразумеў, што народ тут вельмі прадвінуты. Я думаў не адставаць, але тое было цяжка. Адзін чалавек хадзіў у капелюшы і з булаўкай у вуху. У капелюшы не было верху, і ён праз гэтую дзірку выпускаў свае доўгія валасы. Аднойчы ён у сьвятарскай рызе і басанож прыйшоў на сэанс у кінатэатр «Кастрычнік». Там яго, канешне, завінціла міліцыя. Прывялі ў вучэльню, выключылі з камсамолу. І зацкавалі — давялося яму акадэмку браць. Пасьля яе ён таксама дзіўнаваты прыйшоў. Але ўжо не такі. Бровы час ад часу збрываў, але ўжо завушніцу насіў, а не булаўку».*

У паралельнай групе «11 ПО» на спэцыяльнасьці «мастак-афарміцель» аказваецца Уладзя Давыдоўскі. Ён — адзіны, каго ў гэты момант хвалюе музыка. Яшчэ не забыты вопыт школьнага ансамблю, і пастаянна выношваецца думка ўзнавіць музычныя экспэрымэнты. Акрамя таго Уладзя разумее, што музыка — гэта яшчэ й спроба вылучыцца сярод астатніх. Тая ж булаўка ў вуху...

Уладзя: *«Амаль усе, хто йдзе ў мастацкую вучэльню, — людзі эгацэнтрычныя, абсалютна ўпэўненыя ў сваёй перавазе над іншымі. Сьмешныя людзі, але яны такія. Яны вераць у сваю выключнасьць. І мы былі такімі. А калі вакол цябе ўсе мастакі, то варта ж нечым выдзяляцца зь іх. Вось мы й сталі музыкантамі».*

### Машина Времени — хаўруснік Давыдоўскага

Першым, каго Давыдоўскі пачаў спакушаць ідэяй уласнага ансамблю, быў Вольскі. Аднойчы, з-за адмены заняткаў, абедзьве групы загналі ў актавую

залю. Ад няма чаго рабіць Лявон сеў за фартэп'яна і пачаў найграваць просьценькую мэлёдыю з каўбойскага фільму.

Граць ён навучыўся яшчэ ў шасьцігадовым узросьце — крыху пазаймаўся ў спэцыялізаванае клясе. Потым пра музычныя здольнасьці Вольскага-малодшага на доўгі час забыліся. І толькі значна пазьней старэйшыя таварышы прыцягнулі Лявона да ўдзелу ў школьным ансамблі.

Лявон: «*У восьмае клясе я мог трыма пальцамі граць на фартэп'яна. Нармальна ня ўмеў, але слых меў добры. Узнавіць нейкія веды дапамог Радзівон Глебаў, сын кампазытара Яўгена Глебава, зь якім мы сябравалі сем'ямі. Паказаў расстаноўку пальцаў, некаторыя прыёмы, і нешта пачало атрымлівацца.*

*А ў 10-е клясе на той час сабраўся добры ансамбаль. Яго ўзначальваў Саша Лукашэвіч, таленавіты чалавек. Гэта былі сапраўдныя «тэхнары». Яшчэ школьнікамі яны адзін да аднаго здымалі гурты кшталту Аракса. Я зь імі недзе год пакаўбасіў на клявішах, але мне ўжо тады такая музыка падавалася занадта халоднай*».

Тым часам, пачуўшы, як Вольскі грае на фартэп'яна, Давыдоўскі зацікавіўся:

— Во, дык ты ж клявішнікам можаш быць...

Сказаў, быццам у паветра. «У той час мы былі апантаныя мастацтвам», — у адзін голас прызнаюцца і Лявон і Алезіс. Музыка жывапісу прайгравала. Аднак Давыдоўскі не адступаў. Плянамэрна, тыдзень за тыднем вёў «апрацоўку» Вольскага.

І пералом наступіў. У сьнежні 80-га ў Менск прыехала Машина Времени. Квіткоў дастаць было немагчыма. Выратавала толькі сяброўства з Радзівонам Глебавым. Як вядомаму кампазытару, ягонаму бацьку ўдалося па блату, ці не праз самога Машэрава, дастаць квіткі.

Лявон: «*Я ў той час з падачы Глебава слухаў збольшага джаз. Такую лёгкую аркестровую музыку, ранні The Beatles, нейкія рок-н-ролы 50—60-х га-*

*доў. І тут мы раптам трапляем на канцэрт Машины Времени. Тое, што я пачуў, мяне проста прыбіла. Тым болей на канцэрце ў адрозьненьне ад запісу гэта гучала цяжка. А для мяне словазлучэньне «цяжкі рок» было нечым таямнічым, забароненым і вельмі цягнула. Была ў Машины Времени песьня «Ты можешь ходить как запущенный сад». Мы з Алезісам фанацелі па ёй цэлы год»*.

Прыцягненьне Вольскага да музыкі стала справай часу. Вясна наступнага году прайшла ўжо ў размовах пра будучую славу. Штодня падчас перапынку паміж лекцыямі Уладзя й Лявон хадзілі па адным маршруце: вучэльня — сталоўка Палітэхнічнага інстытуту (танны й часам нават смачны абед) — крама «Музыка» — вучэльня. Часьцяком у краме праводзілі больш часу, чым у сталоўцы — усё абмяркоўвалі, якія інструмэнты купяць найперш, якія крыху пазьней, а якія змогуць дазволіць сабе ўжо зоркамі.

Бадзяючыся за імі і слухаючы размовы пра хуткую зорную кар'еру сяброў, сьмехам заходзіўся Алезіс. Ня ведаў гэты прыхільнік выяўленьчага мастацтва, што хутка багна зацягне й яго. Што ў галаве Уладзі сасьпеў хітры плян.

### Вярбоўка Алезіса

Дарэмна адмаўляць, што рашэньне прыцягнуць да музыкі Алезіса тлумачылася найперш мэркантыльнымі інтарэсамі. Па-першае — яго бацька да таго часу зрабіў неблагую кар'еру, стаў не апошнім чалавекам сярод менскіх будаўнікоў. Гэта азначала матар'яльную забясьпечанасьць і ў вачах хлопцаў рабіла Адама Андрэевіча Дземідовіча патэнцыйным галоўным спонсарам гурта. Па-другое — швагер Алезіса кіраваў ансамблем у салёне сямейных урачыстасьцяў, што на вуліцы Матусевіча. Адпаведна, зьяўлялася тэарэтычная магчымасьць задарма браць на будучыя канцэрты апаратуру.

Геніяльны плян меў толькі адну, але вялікую, хібу — Алезіс ня ўмеў граць ні на адным інструмэнце. Ну не лічыць жа музычнай адукацыяй дзіцячыя практыкаваньні на баяне... Аднак калі б не чалавечая рашучасьць (ці папросту авантурнасьць), дзе зараз былі б тыя вялікія геаграфічныя адкрыцьці, дакранулася б нага Ніла Армстранга да Месяца? Хаця, канешне, Ікар застаўся б жывы.

Авантурызм кіраваў і Давыдоўскім. Хаця, прызнаем, яму было прасьцей, чым Калумбу. Калі чалавек ня ўмее граць, яго трэба навучыць, — агучыў Уладзя праграму дзеяньняў. Але на каго? Вырашылі — на бубнача. Гэта, па-першае, прасьцей, а па-другое, бубны каштуюць даражэй за ўсе інструмэнты (вы не забыліся пра мэркантыльныя інтарэсы?).

Тут зноў паўстала праблема. На месца бубнача ўжо запрасілі Сяргея Лоскутава, які граў з Давыдоўскім у школьным ансамблі. Варта было нечым ахвяраваць, і змоўшчыкі вырашылі — калі Алезіс пагаджаецца, яго садзяць за бубны, а Сяргея пераводзяць на лідар-гітару. У рэшце рэшт так і атрымалася.

Праўда, на бубнах Лоскутаў граў зь дзяцінства. У адрозьненьне ад гітары. І ўрэшце ракіроўка атрымалася «моцнай» — замест прафэсыйнага барабуля гурт атрымаў няўмеку-гітарыста і няўмекубубнача.

Самае дзіўнае ў гэтай гісторыі тое, што Алезіс на прапанову далучыцца да гурта адказаў згодай адразу, не вагаючыся ні хвіліны. І калі пра мэркантыльнасьць сяброў ён праз колькі год здагадаўся, то рашэньне граць у гурце ня можа патлумачыць нават зараз.

Алезіс: *«Я сам зьдзівіўся, калі даў згоду. Бо да таго часу хадзіў і насьмяхаўся: «Гляньце на іх — музыканьцікі. Замест таго, каб жывапісам займацца, малюнкам, кампазыцыяй, яны ходзяць, гітаркі нейкія глядзяць». А тут прыйшоў на рэпэтыцыю як дысцыплінаваны вучань, і ўсё — адразу*

*перастаў сьмяяцца з іх, сам патрапіў у гэтую багну. Яны ж мяне і курыць навучылі, гэтыя музыканьцікі».*

Такім чынам, гурт быў у поўным складзе. Можна было купляць апаратуру. Ну і дзе ж было ўзяць грошы, як не ў сямейным бюджэце? Лявону бацькі купілі «Фаэмі-М» — монафанічны клявішны інструмэнт за 60 рублёў. Задача, якая паўстала перад Алезісам, была складаней. Бо бубны — гэта ж вам не бутэлька кефіру. Нават менскія рэстаранныя халтуршчыкі часьцяком не маглі дазволіць сабе такое раскошы.

Алезіс: *«Я проста давёў сваіх бацькоў — хадзіў і цэлымі днямі гаварыў: «Вось, мне няма на чым граць... У нас зараз рэпэтыцыя... У хлопцаў ёсьць гітары, а ў мяне нічога...». І бацька ня вытрымаў і купіў мне новую рыжскую ўстаноўку за 728 рублёў. Я значна пазьней у яго запытаўся: «Як ты мог аддаць такія шалёныя грошы за гэтыя бубны, калі я нават граць ня ўмеў?!». Ён нічога не адказаў, але, мабыць, лічыў так — хай лепш сын на рэпэтыцыі ходзіць, чымся па сутарэньнях поўзаць будзе ды гарэлку жэрці».*

Давыдоўскаму агульнымі намаганьнямі набылі гітару «Фарманта» вытворчасьці «Барысаўдрэў». Паказальнымі характарыстыкамі гэтага цуду савецкае прамысловасьці было тое, што вырабляўся ён у адным цэху з шахматамі, а матар'ялам для корпусу зьяўляліся адходы асноўнае прадукцыі фабрыкі — піяніна.

Алезіс пачаў наведвацца да свайго швагра і практыкавацца ў граньні на бубнах. Адначасова шукалі месца для рэпэтыцыяў. Першыя тыдні скарыстоўвалі для гэтага кватэру Уладзі. Спаганілі адносіны з суседзямі. Сапсавалі і маёмасьць гаспадара — Алезіс, ня маючы яшчэ ўласнае ўстаноўкі, так энэргічна калашмаціў пэнзалямі па кнігах ды карцінах Уладзі, што адну зь іх прапароў. Прыгожая ружа стала першай ахвярай музычнага мастацтва. Каму гэта спадабаецца?

З кватэры Уладзі прыйшлося эміграваць. Хутка дамовіліся з кіраўніцтвам вучэльні — за магчымасьць рэпэтаваць у актавай залі хлопцы мусілі граць на вечарынах. На той час гурт ужо меў назоў — Эскалатар — і нават свой рэпэртуар. Не адкладваючы надоўга, хлопцы пачалі пісаць спачатку сваю музыку на вершы Арсенія Таркоўскага, а потым і ўласныя.

Лявон: «*Першыя песьні былі на расейскай мове. Сьмешныя такія. У раньнім юнацтве ўсім хочацца выглядаць разумнымі, інтэлектуальнымі:*

*В который раз мечтаешь ты*
*Иметь удачу и цветы.*
*Поставив цель, идешь ты к ней,*
*Забыв про счастье и друзей...*

*...И вот успех ушёл опять,*
*Теперь его не отыскать...*»

7 лістапада 1981 г. адбыўся афіцыйны дэбют Эскалатара на танцах у вучэльні. Асноўная дыскатэка ладзілася на першым паверсе — там граў гурт, які складаўся з навучэнцаў старэйшых курсаў — заўсёднік такіх імпрэзаў. Эскалатару аддалі актавую залю на трэцім паверсе. Што б зрабілі вы, жадаючы перамагчы ў гэтым няроўным спаборніцтве? Атрута ў піва ці 10 рублёў хуліганам, каб тыя пабілі канкурэнтаў? Цікава. Але мо таму, што вас тады не было побач, нашыя героі выбралі больш цывілізаваны спосаб барацьбы. Прымітыўны, але, як высьветлілася, вельмі эфэктыўны: Эскалатар граў толькі дзьве песьні — «Скачки» і «Поворот» Машины Времени. Раз за разам. На працягу гадзіны. Публіка была ў захапленьні. Хутка на трэцім паверсе яе было ня менш, чым унізе.

Нягледзячы на такі посьпех, самі музыкі адчувалі, што згралі мярзотна. Трэ было падвышаць майстэрства. Рабіць гэта прыйшлося ўжо бяз Сяргея Лоскутава.

Уладзя: «*Сяргей быў чалавек з мяккім характарам. Яму, як я разумею, ня вельмі падабалася граць на гітары, бо ён жа ў музычнай школе вучыўся на бубнача. А на гітары я час ад часу сам яму пальцы на рыфы выстаўляў. Выказаць незадаволенасьць ён ня мог і, відаць, вырашыў проста сыйсьці*».

Тут Уладзя і ўзгадаў пра Юрася Ляўкова. Скончыўшы школу, той ня здолеў паступіць у інстытут і ўладкаваўся тэхнікам на катэдру ядзернае фізікі БДУ (дзе загадчыкам быў Станіслаў Шушкевіч). А яшчэ паступіў на вячэрняе аддзяленьне ў Палітэхнічны інстытут. Пратрымаўся там толькі да першае сэсіі. Падрыхтоўка з Эскалатарам навагодняе праграмы вымагала амаль штодзённых рэпэтыцыяў. Падчас іспытаў некалькі выкладчыкаў, гледзячы на Юрася, спыталі:

— Малады чалавек, а вы хто?

Як чэсны чалавек, Юрась вырашыў на пытаньне не адказваць, а сыйсьці. Так вызначыўся яго лёс, а адначасова сфармаваўся і «кананічны» склад Мроі.

## Нарачэньне Мроі

Сваім назовам гурт абавязаны Уладзю. У нейкі момант Эскалатар усім надакучыў. Пошукі новага і арыгінальнага былі марнымі. Праз спустошанасьць думак гурт некалькі гадзінаў нават называўся Фаварытам, але тут, на агульнае шчасьце, Уладзя, зазірнуўшы ў нейкі слоўнік, знайшоў шматзначнае і прыемнае на слых слова. «Мрою» зацьвердзілі аднагалосна і адразу. У адрозьненьне ад пераходу на беларускую мову.

Хаця Лявон з Уладзем ужо абмяркоўвалі гэтае пытаньне, справа зацягвалася. Махровая дэмакра-

тыя, што панавала ў калектыве, вымагала адзінагалоснасьці, а Юрык быў супраць. «Да вы с ума сошли!», — сказаў ён, пачуўшы прапанову.

Лявон: *«Мы цярпелі, цярпелі тую апазыцыю, пакуль неяк Юрык не пайшоў з Давыдоўскім на дзень нараджэньня аднаклясьніка. Там ён пачуў песьню Раінчыка і Бураўкіна «Завіруха, мяце завіруха» — абсалютны тагачасны хіт. І па п'яні яна Юрыку «ўставіла». На наступны дзень Давыдоўскі прыйшоў і сказаў: «Усё, Юрык згодны». Больш таго, Юрык з таго часу стаў заятым прапагандыстам беларускай мовы, пачаў казаць — супэр, класна, толькі так і трэба рабіць».*

Юрась: *«Я меў нешта супраць беларускай мовы? Ня памятаю такога».*

## Разьдзел 2

# 1982–1983. ПЕРШЫЯ КАНЦЭРТЫ. «СТАРЫ ХРАМ»

### Вёска Дзегцяроўка

Напачатку 82-га году Мрою пазбавілі магчымасьці рэпэтаваць у мастацкае вучэльні. Па афіцыйнае вэрсыі, дырэктар засьпеў хлопцаў за рэпэтыцыяй падчас заняткаў і, ня вытрымаўшы такое непавагі да навучальнага працэсу, выгнаў прэч. Аднак больш праўдзівымі выглядаюць вэрсыі неафіцыйныя.

У той час хлопцы ўжо вучыліся на другім курсе. А на першы (так атрымалася, ніхто не падумаў нічога дрэннага) паступіў сын дырэктара вучэльні. І, што самае істотнае, таксама сабраў свой ансамбаль. «Маладым талентам» трэ было недзе рэпэтаваць. Такім чынам, Мроя стала ахвярай бацькоўскае любові.

Акрамя таго, дырэктар ужо даўно закалец меў на маладых нацыяналістаў, якія па-беларуску сьпявалі, размаўлялі між сабой і нават (няма на іх таварыша Сталіна!) карысталіся мовай падчас адказаў на лекцыях. Зусім хутка ў вучэльні пачалося сапраўднае змаганьне з «нацыяналістычнымі групоўкамі», да якога далучыўся Камітэт дзяржбясьпекі. У выніку найбольш пацярпеў... той жа дырэктар, пазбавіўшыся пасады. Аднак гэтыя падзеі разгарнуліся празь некалькі месяцаў, а пакуль Мроі трэ было шукаць месца для рэпэтыцыяў.

Вырашыць праблему дапамог Алезіс. Ужо напрактыкаваўшыся ў граньні на бубнах, ён браў

«левую» працу. Са знаёмымі хлопцамі з раёну некалькі разоў зграў на гарадзкіх вясельлях ды на танцах у вёсцы Дзегцяроўка. Вёска тая знаходзілася ў сямі кілёмэтрах ад Менску і ад іншых паселішчаў, што губляліся сярод бязьмежных палеткаў ды сьвінафэрмаў, адрозьнівалася толькі наяўнасьцю калгаснага клюбу. Наскрозь прагніўшага, але ж з электрычнасьцю. Пару дзён на тыдзень у клюбе круцілі кіно (незабыўныя індыйскія кактэйлі з мэладрамы ды баевіка ў адным фляконе — гіты тагачаснага вясковага кінапракату), а ў пятніцу зь сёмае гадзіны вечара да чацьвертае раніцы ладзілі танцы. Задавальненьне каштавала 25 капеек.

Дамовіцца з дырэктарам клюбу аказалася лёгка. Хуткім часам у Дзегцяроўку перавезьлі ўсю небагатую апаратуру. Кожную пятніцу давалі канцэрт, заставаліся начаваць, а ў суботу там жа рэпэтавалі.

Менавіта ў Дзегцяроўцы і напісаліся першыя беларускія песьні — псыхадэлічны «Лябірынт» і «Настальгія»:

*З прычын якіх жыцьця абставін*
*У роднай хаце госьцем стаў ты,*
*На абразах прарок маны,*
*І твой гадзіньнік рух спыніў?..*

*Настальгія — няма зноў спакою,*
*Па зямлі той, што стала ўжо мрояй.*
*Дзе жыве памяць продкаў і мова.*
*Толькі горыч...*
*Толькі горыч...*

Аднак ня гэтай песьні было наканавана стаць першым сапраўдным гітом Мроі. Бо праз колькі часу зьявіўся «Стары храм»:

*Стары храм зруйнавалі,*
*Абразам ня гледзячы ў твары.*
*Парушылі мост да нябёс.*
*Парушылі мост да нябёс.*

*Храма старога каменьне*
*Зрабілася сонца праменем,*
*Ён асьвятляе наш лёс.*
*Ён асьвятляе наш лёс.*

*Агеньчыкі траў гасіць вецер,*
*Памяць зьнікае ў паветры,*
*Але рэха зноў адгукнецца.*
*Але рэха зноў адгукнецца.*

*Граць жалейка ня скончыць...*
*Матыў гэты, шчыры і просты —*
*Усё, што нам засталося.*
*Усё, што нам засталося.*

Зь ідэяй песьні на заняткі аднойчы прыйшоў Алезіс.

Алезіс: *«Я напярэдадні да швагра свайго зайшоў, а там нейкія вайскоўцы ў гасьцях сядзяць. Далучыўся, і хутка пайшла нейкая п'яная спрэчка. Вайскоўцы пачалі:*

*— Што гэта ты па-беларуску гаворыш? Трэба па-расейску, бо ў нас уся гісторыя агульная...*

*А я, вінца выпіўшы, адказаў адпаведна. Усю гісторыю ў рэшце рэшт перабралі, амаль морды адзін адному не набілі. На наступны дзень я прыйшоў у вучэльню і сказаў — трэба песьню напісаць».*

Гэта быў ці не адзіны выпадак калектыўнае творчасьці ў гісторыі Мроі. Пісалі на лекцыі па чарчэньню, па радку, перадаючы адзін аднаму аркуш паперы.

Вялікім плюсам Дзегцяроўкі была магчымасьць адразу праверыць уласныя песьні на публіцы. Высьветлілася, што аніякае алергіі яны не выклікаюць і ўспрымаюцца ня менш станоўча, чым творы «прызнаных клясыкаў». Дыскатэчную праграму Мроі складалі тады Машина Времени, Воскресенье, Зодиак, Judas Priest, The Beatles. Максымальнай саступкай савецкай папсе былі пару твораў

Антонава. А «шэдэўры» кшталту «Спасите, спасите, спасите разбитое сердце моё» ня гралі нават па заяўках. У выніку Дзегцяроўку зазамбавалі добрай музыкай. Высьветлілася гэта, калі аднойчы Мроя не змагла прыехаць на канцэрт, і на падмену дырэктар клюбу запрасіў нейкую «вясельную» брыгаду. Праз паўгадзіны суцэльнае італьянскае ды савецкае папсы вясковыя пацаны падыйшлі да музыкаў і ветліва папрасілі:

— Хлопцы, валіце адсюль.

Адмовіцца значыла рызыкнуць здароўем. Пазыцыі ж Мроі ў Дзегцяроўцы заставаліся непарушнымі да канца сэзону. У кастрычніку месца дыслякацыі прыйшлося кінуць — да вясны танцы зачыняліся, а бадзяцца зімой у халодны клюб на рэпэтыцыі нікому не хацелася.

Знайсьці новую кропку для рэпэтыцыяў дапамог выпадак. Праходзячы неяк побач адной з менскіх аўтакалён, Вольскі і Давыдоўскі падумалі — чаму б не зайсьці. Увалілся да намесьніка дырэктара і запыталі наўпрост:

— Вам ансамбль патрэбны?

Той паглядзеў на патлатых хлопцаў з пэўным недаверам, але (добры знак) адразу ня выгнаў:

— Трэба абмеркаваць з дырэктарам, — адказаў ён і сыйшоў.

А ніхто нікуды і не сьпяшаўся. Праз паўгадзіны бакі «падпісалі» стандартнае пагадненьне: Мроя атрымоўвала месца для рэпэтыцыяў, кіроўцы — сьвяточныя канцэрты. На наступны дзень хлопцы ўжо аглядалі сваю новую «студыю» — пакой на дзевятым, апошнім паверсе інтэрнату аўтакалёны на вуліцы Веры Харужай. Перашкодзіць творчасьці ніхто ня мог — у пакоях паверхам ніжэй ніхто ня жыў. Можна было біць у бубны колькі заўгодна. За ўвесь час, пакуль дзейнічала пагадненьне, Мрою папрасілі зграць толькі два разы — на навагодняе вечарыне і нейкім юбілеі.

Ад аўтакалёны гурт узяў значна больш. Менавіта ў інтэрнаце быў зроблены першы, аматарскі

запіс праграмы «Стары храм». Спрычыніліся да гэтага найперш маладыя нацыяналісты з «Майстроўні».

### «Майстроўня» і малады нацыяналізм

Аб'яднаньне «Майстроўня» распачало дзейнасьць у 1980 г. Менскія студэнты дэклеравалі намер адрадзіць у гарадзкім асяроддзі беларускія народныя абрады і сьвяты.

*«Адраджэньне беларускай народнай культуры разглядалася як аптымальная форма выхаваньня нацыянальнай сьвядомасьці, форма фальклёрна-этнаграфічнага клюбу дазваляла весьці ўласна палітычную дзейнасьць»* (часопіс «Супольнасьць» № 3—4, 1998 г.).

Фактычна «Майстроўня» аб'яднала ідэёлягаў беларускага маладзёвага нацыянальнага руху. На чале яе сталі тады Вінцук Вячорка, Сяргей Дубавец, Сяргей Вітушка, Сяржук Сокалаў-Воюш, Віктар Івашкевіч, Алесь Суша. Ужо ў 1982 г. «Майстроўня» ўздымала кампанію за выкладаньне ў школах на беларускай мове, ладзіла сьвяткаваньні Калядаў, Купальля. Сокалаў-Воюш і Дубавец як студэнты мелі доступ у бібліятэку, дзе бралі заходнебеларускія выданьні, патаемна фатаграфавалі, а потым праяўлялі і рабілі кніжачкі кшталту «Што павінен ведаць кожны беларус».

Менская мастацкая вучэльня таксама патрапіла пад уплыў «Майстроўні» ды іншых нефармальных груповак. Хоць адміністрацыя гэтаму і супраціўлялася — не для таго савецкая ўлада ў свой час стварала адпаведныя навучальныя ўстановы.

Сяргей Дубавец (з перадачы «Беларуская Атлянтыда», Радыё Свабода): *«Адразу пасьля вайны ў Беларусі пачалі ствараца пэдвучэльні, якія б рыхтавалі зь вясковых дзяцей кадры ідэйных настаўнікаў-русыфікатараў для тых жа вясковых школаў. Адным з рассаднікаў русыфікацыі стала і Менская мастацкая вучэльня».*

Сяргей Харэўскі, выпускнік вучэльні (Радыё Свабода, 9 лістападу 1997 г.): *«Гэта быў час, калі ў Афганістане ішла вайна. Некалькі выпускнікоў вучэльні склалі там галовы. А камсамольскія арганізацыі сачылі, каб, барані Бог, дзе на сьцяне ці ў сшытку не зьявіліся пацыфісцкія значкі. Але многія правакацыі праходзілі. Ужо ў сярэдзіне 80-х нацыянальная сьведамасьць сярод навучэнцаў пачала буяць нечаканым кветам. То тут, то там зьяўляліся Пагоні, бел-чырвона-белыя спалучэньні, шасьціканцовыя крыжы і нават подпісы беларускаю лацінкай. Пасьля зьявіліся насьценгазэты па-беларуску, з усімі нацыянальнымі «наваротамі» і першыя ў Менску беларускамоўныя дыскатэкі...*

*Але пасьля ўдзелу навучэнцаў у акцыі супраць зьнішчэньня будынку першай беларускай опэры «органы» ўзяліся за мастацкую вучэльню ўсур'ёз. На агульным сходзе вучэльні, пасьля цытатаў 30—50-х гадоў пра дробнабуржуазнасьць Дуніна-Марцінкевіча і Багушэвіча, старшыня камсамольскае арганізацыі з прозьвішчам Марцінкевіч распавёў зьнямелым вучням і настаўнікам, што ў вучэльні дзейнічаюць некалькі(!) антысавецкіх груповак. Тады гучнай справы ня выйшла. Дырэктар вучэльні, Краўчук, па мянушцы Орех (за тое, што старанна «окал»), як ні спрабаваў давесьці ў КГБ, што й сапраўды ён выявіў нацыяналістычную сетку, нічога не дамогся. Зь ягонага спрыту сьмяяліся нават гэбісты. Ну а камсамолец Марцінкевіч, злоўлены спачатку за расьпіцьцём гарэлкі ў пад'езьдзе, а пасьля і за «фарцою», скончыў сваю палітычную кар'еру.*

*Але змаганьне дырэкцыі зь беларушчынай не супынялася. Дырэктар выклікаў па адным вучняў, якія паслугоўваліся моваю, і казаў: «Я тоже белорус, но говорю по-русски. И ты, будь добр, в училище говори по-русски». Вынікі такога выхаваньня неўзабаве далі свой плён...*

*У кастрычніку, на сьвята брэжнеўскае Канстытуцыі, на вучэльні былі вывешаныя бел-чырвона-белыя сьцягі... Савецкія былі сарваныя, адзін паклалі замест анучы перад дзьвярыма, а другі знайшлі ў сьметніцы. Цікава, што хлопцы, якія зрабілі гэты ўчынак, не былі беларусамі па крыві. Таму іх нават не падазравалі. Затое паўгады ў вучэльні йшлі гэбісцкія допыты, праводзіліся экспэртызы. Дазнаньне КГБ выявіла, што й сапраўды, дзесяткі навучэнцаў ужо даўно праводзілі незалежніцкую прапаганду, актыўнічалі ў розных беларускіх суполках. У ЦК КПБ і ў «органаў» галава пайшла кругам. Праз пару гадоў дырэктара вучэльні «скарацілі».*

*...Міхась Мірошнікаў, які вывесіў сьцягі, працуе рэстаўратарам мэталу ў музэі народнага дойлідзтва ў Строчыцах, а ягоны паплечнік Алесь Макееў даўно эміграваў з бацькамі ў Канаду».*

Мроя стала кантактаваць з «Майстроўняй» праз Давыдоўскага. Хоць і самі маладыя нацыяналісты, празнаўшы пра існаваньне беларускамоўнага рок-гурта, зацікавіліся.

Віктар Івашкевіч: *«Нам сказалі, што ёсьць гурт, які сьпявае па-беларуску. А тады сытуацыя была не такая, як у 88—89-м годзе, калі ствараўся Народны Фронт, калі вакол усё віравала і людзі ішлі да нас тысячамі. У 83-м годзе нам трэба было прыцягваць да сябе людзей па аднаму. І таму, канешне, калі мы пачулі пра Мрою, дык захацелі іх «завербаваць».*

Уладзя: *«Я праз нейкіх знаёмых прыйшоў на паседжаньне «Майстроўні». Спачатку яны мяне насьцярожана ўспрынялі. Бо ў іх уяўленьне пра беларушчыну было такое: сустрэліся, пасьпявалі народныя песьні, патаньчылі ў народным стылі і ўсё. І на пэўным пэрыядзе іх прыйшлося нават пераконваць, што рок-музыка на беларускай мове — гэта нармальная зьява. У рэшце рэшт яны пагадзіліся на тое, каб прыйсьці і паслухаць, што мы граем».*

Першы раз на рэпэтыцыю ў інтэрнат аўтакалёны прыйшлі Івашкеіч, Дубавец ды Суша. Былі яны старэйшыя за мройчукоў. Мо таму тыя засаромеліся, запанікавалі і пачалі граць нешта з Машины Времени. Вечар расейскай музыкі спыніў Дубавец:

— Ну ладна, гэтае глупства мы й так чулі, давайце што-небудзь сваё зграйце.

Толькі пасьля гэтага Мроя зграла пяць беларускіх песень — усё, што было напісана на той момант.

— А вось гэта, хлопцы, сьвядомы рок, — сказаў Дубавец.

Хутка пачалі абмяркоўваць, як запісаць першы альбом. Да пяці «дзегцяроўскіх» песень дадаліся яшчэ некалькі. Рэпэтыцыі йшлі па некалькі разоў на тыдзень. Ідэя альбому натхніла, і ўсе працавалі як завядзёныя. Недзе ў гэты час адбылася перастаноўка на інструмэнтах, якая надала гурту канчатковы выгляд. Юрась перайшоў на бас, а Уладзя на лідар-гітару. Абодва ня надта таго й жадалі, але інакш працаваць не атрымлівалася. Юрась, які любіў усялякую тэхніку, быў прызначаны «тэхнічным дырэктарам» гурта. Ён адказваў за спраўнасьць усіх комбікаў, калёнак, датчыкаў, каб перад канцэртам усе шнуры былі гатовыя, што трэба запаяна, распаяна і г. д. Юрась падыходзіў да справы адказна. Пасьля працы ва унівэрсітэце бегаў па музыкантах, нейкіх паўпадпольных кватэрах, выбіраў апаратуру, правады. Часу гэта займала шмат, што адбівалася на ўласна музычных практыкаваньнях.

Юрась: *«Лідар-гітара патрабуе большае ўвагі па часе, чым бас. Калі проста «здымаць» іншыя гурты — дык яшчэ нястрашна. А калі мы пачалі рыхтаваць уласную праграму, пайшоў вал сьвежае інфармацыі. Давыдоўскі на кожную рэпэтыцыю прыносіў новыя тэмы, зробленыя на гітары.*

*І атрымлівалася, што, па-першае, у мяне папросту не было часу, каб вывучыць усё гэта, добра падрыхтавацца да рэпэтыцыяў нават. А па-другое — ну які мне сэнс быў вучыць партыі, якія напісаў іншы чалавек? І я тады сказаў: «Давай я лепш на басу буду граць». Усе неяк адразу пагадзіліся, усім спадабалася, як я граю. Гэта ня дзіўна, бо ў школьным ансамблі я таксама на басу граў, а Давыдоўскі на лідар-гітары».*

Праца над альбомам прасоўвалася, і заставалася толькі вырашыць, дзе запісвацца. Пачаліся перамовы з гуртом Студыя 7 (які пазьней падзяліўся на славутую беларускамоўную Бонду і сканаўшы ў нябыт расейскамоўны Минск). Сярод іншых менскіх гуртоў Студыя 7 вылучалася заможнасьцю. Час ад часу хлопцы езьдзілі на заробкі ў Сібір і мелі магчымасьць набыць нядрэнныя інструмэнты і апаратуру.

Апраўдваючы свой назоў, гурт меў нешта, што сапраўды нагадвала студыю. Найперш гэта былі два магнітафоны «Тэмбр», што дазваляла пісаць гук на чатыры(!) дарожкі. Акрамя таго, запіс вёўся ў памяшканьні, якое і сапраўды было абсталяванае пад студыю — з гукаізаляцыяй і нядрэннай акустыкай. Месьціўся такі цуд у сутарэньнях мастацкага інстытута на рагу Сурганава і праспэкта Леніна.

Прымітыўная апаратура давала збольшага якасны запіс. У 1984 г. менавіта там свой альбом «Рок-тэрапія» запісала Сузор'е, якое, на чарговай хвалі барацьбы з рокам, выгналі з філярмоніі, пазбавіўшы назвы і дзяржаўнага статусу. Аднак запісаць «Стары храм» Студыя 7 адмовілася — музыкі-капіталісты запатрабавалі з Мроі грошы, якіх у навучэнцаў-мастакоў быць не магло.

Заставалася толькі адна магчымасьць — пісаць альбом у інтэрнаце аўтакалёны. Віктар Івашкевіч прынёс на рэпэтыцыю той жа «Тэмбр» і два мікрафоны. Адзін здымаў гук з бубнаў і гітары, а другі пісаў вакал і клявішы. Самым запамінальным момантам таго запісу быў «фанатызм» Івашкевіча.

Каб дамагчыся прыстойнага гучаньня, ён (ужо тады ня вельмі мініятурны чалавек) поўзаў па пакоі, шукаючы найлепшыя кропкі для мікрафонаў. Пару песень ён запісаў раскірэчыўшыся на падлозе каля бубнаў, сьцьвярджаючы, што менавіта ў гэтым месцы «ловіцца» выбітны гук.

У выніку альбом быў запісаны за адзін дзень. Яго склалі песьні: «Настальгія», «Лябірынт», «Стары храм», «Не згубі», «Калі на двор я выхажу з сваім сабакам», «Драпежнікі», «Аукцыён», «Мая мяжа», «Кола».

Распаўсюджваўся запіс самым прымітыўным спосабам — перапісваўся з магнітафону на магнітафон, а касэты хлопцы з «Майстроўні» раздавалі «сваім людзям». Ні пра якія грошы тады і размовы ня йшло.

Алезіс: *«Якія грошы! Мы былі радыя ўжо тым, што некаму цікава слухаць тое, што мы робім».*

З дапамогай «Майстроўні» арганізавалася і сэрыя канцэртаў па менскіх школах. Гэта было ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. «Майстроўня» мела магчымасьць ладзіць у школах літаратурныя вечарыны. Але аднымі вершамі савецкіх школьнікаў было не праняць. І рок-гурт граў ролю дадатковага кавалку сыру ў пастцы «нацыяналістычнае прапаганды». Праўда, першы канцэрт у школе, што на вуліцы Мірашнічэнкі, скончыўся правалам.

Лявон: *«Мы тады няправільна пабудавалі праграму. Разгарачаныя посьпехам сярод вячоркаў і дубаўцоў, мы пачалі далей пасоўваць беларускі рэпэртуар і панапісвалі шмат чаго, збольшага песень лёгкіх і сьмешных. Калі прыехалі ў школу, спачатку згралі некалькі цяжкіх песень. Народу спадабалася. А потым пачалі граць нейкія кантры, і народ расхаладзіўся. І ўжо не запаліўся».*

Цягам 1983 г. было яшчэ некалькі канцэртаў у школах, выступ на гарадзкой алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры, дзе ўсіх ледзьве не забіла токам (затое выбухі з мільёнамі іскраў выглядалі так па-панкаўску). Але першым сур'ёзным зьяў-

леньнем на публіцы варта лічыць, канешне, канцэрт у Траецкім прадмесьці 22 красавіка 1984 г.

Праўда, непасрэдна перад гэтым гурт амаль не пазбавіўся свайго «правадыра» — Уладзі, якога злы ваенрук зьбіраўся выкінуць з вучэльні. Прычынай усяго былі даўгія валасы.

### Патлы да зямлі

Пачатак 80-х быў супярэчлівым часам. Ужо пару дзясяткаў год прайшло з таго моманту, як рэспэктабельныя снобы з Daily Herald называлі Rolling Stones «мешаньню нэандэртальца з галаварэзам XVIII стагоддзя» ўсяго толькі за валасы, якія нават вушы не зусім прыкрывалі. Цяпер тое падавалася верхам ахайнасьці ў параўнаньні з патламі новага пакаленьня рокераў. Аднак у запаведніку пад назовам Савецкі Саюз прычоска яшчэ магла стаць прычынай сардэчнага прыступу.

Што 80-я гады! Памятаю, такое ледзьве не адбылося нават у 90-м. Амаль непераможны ў сваёй правінцыйнасьці і шэрасьці туркмэнскі горад Чарджоў, куды мяне занёс лёс, ранішні шпацыр на рынак за сьпелым арбузам і дзікі, дзікі(!), дзікі (!!) позірк дзьвюх бабулек, што суправаджаў мяне (а дакладней, мае даўгія валасы, ды яшчэ сабраныя ў хвост) ці не хвіліну. А потым голас за сьпіной: «О господи!». Нават не ўяўляю, што магло зьдзівіць іх больш. Другое прышэсьце Хрыста? Хаця не — у яго ж таксама былі патлы да зямлі...

У Менску 80-х галоўнымі ахоўнікамі маральнага аблічча савецкага грамадзтва былі (акрамя дваровых бабулек) дзяды-камуністы ды ваенрукі. Мроі не пашанцавала з прадстаўнікамі абедзьвюх папуляцыяў.

Ваенрук вучэльні, Яфім Ігнацьевіч, да пэўнага часу знаходзіўся ў шчасьлівым няведаньні, якія прычоскі носяць ягоныя падначаленыя. Каб трымаць падпалкоўніка ў ілюзорным сьвеце, прыходзілася вычварацца. Напрыклад, састрыгаліся ва-

ласы наперадзе, а таксама з бакоў. Усё астатняе завязвалася ў хвост і хавалася пад каўнер. Лявон яшчэ і шалік на шыю завязваў — добры адмаз: маўляў, што зь іх, мастакоў, возьмеш. Такія хітрыкі да пэўнага часу спрацоўвалі. «Пэўным часам» стаўся адзін з канцэртаў.

Алезіс: *«Мы павінны былі граць тры песьні ў зборным канцэрце самадзейнасьці з усіх курсаў. Стаім за кулісамі і бачым — у залю заходзіць наш палкоўнік з павязкай. Аказваецца, ён быў у гэты вечар дзяжурным. Паўстае праблема — распускаць валасы ці не распускаць. Я кажу: «Давайце распускаць». Бо, сапраўды, уяві: выходзім мы — рок-гурт — з залізанымі ды схаванымі пад каўнер валасамі. Сорам. Лепш памерці з музыкай, зграць апошні раз, але каралямі. Падумалі, падумалі дый распусьцілі валасы. І ён пабачыў нас на сцэне...»*

Падпалкоўнік быў у шоку. Ды каб толькі ён. Вагню на ягоны чырвоны ад абурэньня твар дадаў стары камуніст Іван Кузьміч — выкладчык грамадазнаўства.

— Ды як, Яфім Ігнацьевіч, ты гэта церпіш, — цікаваў ён ваенрука, — як ня выкінеш іх з вучэльні?!

Карніцкія меры былі прынятыя ўжо на наступным занятку. Падпалкоўнік зайшоў у кабінэт, абвёў цяжкім позіркам з-пад павекаў усіх вучняў і спыніўся на мройчуках:

— А вам, валасацікі, — сказаў ваенрук, — я за зьнешні выгляд стаўлю «2» вось тут, тут, тут... — Ягоны палец паступова паказаў на ўсе пустыя клеткі журналу насупраць прозьвішчаў Давыдоўскі, Дземідовіч і Вольскі.

Лявона напужаць было цяжка. Нават панаставіўшы двоек ва ўсе вольныя клеткі, ваенрук ня здолеў вывесьці выніковае «2» — ратавалі чацьвёркі і пяцёркі за стральбу ды зборку-разборку аўтамату. У выніку выходзіла «3». Алезіс вырашыў пастрыгчыся. Але бунтарская душа не магла прызнаць поўнае паразы — і адначасова ён пафарбаваў валасы ў яркі жоўты колер. Відаць, ва ўяўленьні ваенрука гэта было меншым злом, і ад Алезіса ён

адчапіўся. А вось Давыдоўскага не ратавала нічога. Гэта быў гамон. Двойка па ваеннай падрыхтоўцы азначала адхіленьне ад іспытаў, адсутнасьць дыплёму, выгнаньне з вучэльні. Выратавальную саломінку кінуў сам ваенрук.

— 23 лютага, валасацікі, будзе канцэрт, прысьвечаны самаму галоўнаму сьвяту нашай краіны — Дню Савецкае Арміі і Ваенна-Марскога Флёту, — сказаў ён. — Хочаце выратаваць вашага Давыдоўскага — зграйце на ім патрыятычную песьню. Будзе добрая песьня — пастаўлю яму «тры».

Доўга думалі, пакуль ня выбралі «Я с детства выбрал верный путь» Машины Времени. Да каранёў іранічная і зьдзеклівая, дзе агітатар службы ў арміі выглядае няйначай як на дэбіла, ваенруку яна... спадабалася.

— Цудоўна, — праслухаўшы яе на рэпэтыцыі, зрабіў выснову кат. — Тут сапраўды агітуюць ісьці ў армію.

Такім чынам Уладзя атрымаў тройку і застаўся ў вучэльні.

### «Гурт, які граў у Траецкім»

22 красавіка 1984 г. з дапамогай «Майстроўні» Мроя зграла першы вялікі канцэрт. Гэта адбылося на вэрнісажы ў Траецкім прадмесьці. Невялікая зацемка ў газэце «Літаратура і мастацтва» наўрад ці была б заўважаная, калі б ня гістарычны факт — зь дня ўтварэньня Мроі гэта была першая ўзгадка пра яе ў савецкае прэсе.

Газэта «Літаратура і мастацтва», 27.04.84: *«Што такое выстаўка аднаго дня? Адказ на гэтае пытанне могуць даць цяпер жыхары і госці Мінска, якія пабывалі ў мінулую нядзелю ва ўтульным Траецкім прадмесьці. Удзельнікі гэтага свята назіралі незвычайную карціну: на беразе Свіслачы мастакі расстаўлялі мальберты, размяшчалі на спецыяльных драўляных стэндах пейзажы і нацюрморты, партрэты і графічныя лісты. По-*

*бач экспанаваліся вырабы з дрэва, саломы, шкла... Так ішла падрыхтоўка да своеасаблівага вернісажа, які завяршаў тыдзень выяўленчага мастацтва на Беларусі, прысвечаны 114-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 40-годдзю вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў.*

*...Са сваімі творамі пазнаёмілі прысутных кампазітар Л. Шлег, інструментальная група «Мроя», створаная ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава, вакальны дуэт «Кася і Алесь», які нядаўна стаў лаўрэатам фестывалю маладых спевакоў у Малдавіі...»*

Адмыслова для канцэрту дасталі моцную апаратуру — хадзілі і пабіраліся дзе толькі маглі. Выступ быў на адкрытым паветры, ніякіх квіткоў не прадавалася, і пад канец да пляцоўкі падцягнуліся ўжо ня толькі тыя, хто прыйшоў на вэрнісаж, але й шмат мінакоў, якім проста стала цікава, што за музыка такая гучная, ды яшчэ на беларускай мове ў цэнтры гораду. Самакрытыкі пасьля таго канцэрту гучала, як заўжды, шмат, але дарэмна. Бо вынік быў істотны — пагалоска пра беларускамоўны гурт, «які грае у Траецкім», папаўзла па Менску. Вядомасьць Мроі ўпершыню выйшла за даволі вузкае на той час кола прыхільнікаў «Майстроўні».

Цікава, што адным з выпадковых слухачоў канцэрту ў Траецкім быў чалавек, які зьявіцца на старонках гэтае кнігі пазьней, але неаднаразова — на той час студэнт-першакурсьнік РТІ Пеця Паўлаў.

Піт: *«Мы гулялі па горадзе з маім сябрам Алегам Піваварчыкам і пачулі музыку. Памятаю, мяне відовішча вельмі ўразіла. Па-першае, было бачна, што на сцэне сапраўдны рок-гурт. Па-другое, у іх быў арыгінальны матэр'ял, ды яшчэ і на беларускай мове. І мне адразу стала зразумела, што гэта самае вартаснае з таго, што ёсьць у Менску на гэты дзень»*.

«Самае вартаснае» тым часам грала апошні канцэрт перад тым, як сыйсьці ў армію і надоўга забыцца, што такое музыка.

## Разьдзел 3

## 1984–1986. СТРАЧАНЫЯ ГАДЫ

Адным сонечным восеньскім днём 86-га году на медагляд у ваенкамат прыйшоў студэнт менскай мастацкай вучэльні Віктар Лосьмінскі. Ён зайшоў у кабінэт да псыхіятра, рашуча падыйшоў да стала, зь яшчэ большай рашучасьцю ўзяў вазон з фікусам і... зьеў расьліну. Пасьля чаго падняў вочы на доктара і сказаў, што хоча служыць у арміі.

— Чаму? — запытаўся да ўсяго прызвычаены, але ўсё ж крыху збянтэжаны сытуацыяй доктар.

— Надта падабаецца зялёны колер, — быў адказ.

Праз два месяцы «мара» Віктара зьдзейсьнілася.

### Армія і Ленін

За некалькі год да таго, ягоныя старэйшыя таварышы па вучэльні Лявон, Алезіс і Уладзя былі ў крыху іншае сытуацыі. Савецкая армія яшчэ ня ведала дэфіцыту кадраў. У ваенкаматах не турбаваліся пра «выкананьне пляну». Закасіць пад дурня было вельмі проста. Дзе-нідзе патлатых рокераў нават гвалтоўна накіроўвалі на абсьледаваньне ў псыхушку. Найгоршы сцэнар выглядаў так: ты патрапляеш у Навінкі, дзе два-тры месяцы бавіш час сярод вар'ятаў, а потым 10 год стаіш на ўліку ў псыхіятрычнае клініцы з дыягназам «лёгкая форма шызафрэніі». Гэта ў сваю чаргу вымагае штогадовых абсьледаваньняў і тыдня-другога сярод тых жа вар'ятаў. Лявону армія ня вельмі падабалася, але станавіцца шызафрэнікам хацелася

яшчэ менш. Таму ён, прыйшоўшы на медагляд у ваенкамат, з усёй сур'ёзнасьцю выслухаў параду першага доктара — акуліста.

— Ты, хлопча, рызыкуеш адразу ў Навінкі паехаць, — сказаў той са шчырым спачуваньнем (мо ў самога сын быў такім жа «нефармалам»?).

Высьветлілася, што ў суседнім пакоі сядзіць Аляксандар Францавіч — псыхіятр, які ўсіх патлатых адразу адсылае менавіта ў тыя Навінкі. Быў Аляксандар Францавіч чорны як смоль. Арліны нос, ужо заўважная лысіна. На Лявона, які ўвайшоў у кабінэт, ён паглядаў як драпежнік на мышку. Прафэсыйнае крэда ягонае было простым — «антысавецкі элемэнт» мусіць сядзець у псыхушцы.

Лявон: *«Як толькі я ўвайшоў, пачаў ён мне задаваць розныя пытаньні тыпу: А раптам камандзір аддасьць загад, які ты палічыш няправільным? А што ты будзеш рабіць? А калі табе загадаюць зрабіць вось так і так, якімі будуць твае дзеяньні?*

*І я разумею, ён хоча пачуць, што я не буду выконваць загад, што я мацёры пацыфіст з дваццацігадовым стажам. А я ў супрацiў яму кажу адваротнае — маўляў, загад трэба выконваць паводле статуту, наколькі я ведаю. Карацей, прыкінуўся камсамольцам тупаватым. Размаўлялі мы хвілінаў сорак. І ён у рэшце рэшт сказаў:*

*— Ладна, хлопец ты, здаецца, добры. Толькі пастрыжыся і ідзі.*

*Толькі калі я адтуль выйшаў, зразумеў, што я напароў».*

Той жа выбар паміж псыхушкай і арміяй зрабілі Алезіс з Уладзям. Таму два наступныя гады й выкрасьліліся зь іх жыцьця. Лявон за гэты час прайшоў шляхам Сцяпянка–Смаргонь–Слуцак. Алезіс служыў на Украіне, у горадзе Хмяльніцкі, ды езьдзіў на танку, а Уладзя ўсе два гады праседзеў у Асіповічах.

Пра музыку на гэты час прыйшлося забыцца. У арміі не было нават самадзейнасьці. Усе трое

займаліся іншым — аздаблялі ленінскія пакоі. Тое было невыпадкова — яшчэ ў ваенкаматах сядзелі «пасланцы» з розных вайсковых частак і «набывалі» выпускнікоў мастацкіх вучэльняў, каб было каму маляваць гераічныя твары воінаў і ленінаў. Алезіс дык увогуле аздобіў лепшы ленінскі пакой у дывізіі. Два разы. За што атрымаў два дзесяцідзённыя адпачынкі. Сам сцвярджае, што асабліва добра ў яго атрымліваўся правадыр пралетарыяту — і ў профіль і анфас.

## Пацыфіст Ляўкоў

Адзіным, хто ад арміі адкасіў, стаў Юрык. Есьці кактусы ён не хацеў, Навінкі ня вабілі, плоскаступнёвасьці таксама не назіралася. Наш радыкалбасіст выбраў адзіны магчымы шлях — сапсаваў сабе здароўе. Зрок у яго і пасьля школы быў ня лепшы — мінус чатыры.

— У касманаўты і танкісты з такім не бяруць. Будзеш сувязістам, — агучыў прысуд акуліст і даслаў Юрыка далей па этапу ваенкамісіі. Белы квіток ператвараўся ў недасягальную мрою. Што рабіць? Думкі запаўнялі галаву ажно да кабінэту стаматоляга. Той (каб быў ён усё жыцьцё здаровы, і дзеці яго, і суседзі па лесьвічнае клетцы, і рыбкі гупі ў ягоным акварыюме) заўважыў у Юрыка карыес, адсутнасьць трох плёмбаў і накіраваў на лячэньне.

Паўторная мэдкамісія мусіла адбыцца празь месяц ці два. Увесь гэты час Юрась чытаў. Выключна ноччу, зь ліхтарыкам. Перад Караткевічам ды Дастаеўскім, Гётэ ды Янкам Брылём аддаваў перавагу звычайным савецкім дэтэктывам. За адведзены лёсам час прачытаў іх штук сто і свайго дамогся. Было «мінус 4» — стала «мінус 8». Шлях у армію зачыніўся.

Юрась: *«Праз пару месяцаў зрок крыху палепшыўся — да «мінус 6». Але ўсё адно давялося купіць акуляры. Затое, пакуль мае хлопчыкі кірзач нюхалі, я працаваў»*.

Карыстаючыся момантам, Юрык паспрабаваў атрымаць-такі вышэйшую адукацыю. Але, не паступіўшы з першага разу ў РТІ, кінуў дурное. Да таго ж меў адказную грамадзкую працу — прадстаўляць інтарэсы Мроі ў рок-клюбе «Няміга», што толькі-толькі стварыўся ў Менску.

## Рок-клюб «Няміга»

Ідэю стварэньня рок-клюбу вылучылі журналісты газэты «Чырвоная змена» Анатоль Мяльгуй і Вітаўт Мартыненка. Прыдумляць ня трэ было нічога. На той час рок-клюбы ўжо існавалі ў Ленінградзе і Маскве, дзе музычнае жыцьцё віравала ня ў прыклад Менску. У савецкай сістэме гэта была адзіная магчымасьць неяк легалізавацца і зарганізоўваць канцэрты, не баючыся, што прыйдуць менты і ўсіх разгоняць. А такія сцэнары разгортваліся паўсюдна. Бо савецкую сістэму пачало калаціць, і «старэйшыя таварышы» з партыі ўявілі, што галоўны іх вораг — рок. У 1983 г. ЦК КПСС выдае пастанову «Аб рэглямэнтацыі дзейнасьці вакальна-інструмэнтальных ансамбляў і дыскатэк». Цяпер на дыскатэках не магло гучаць болей за 20 адсоткаў замежнае музыкі. Астатнія 80 мусілі быць творамі членаў саюзу пісьменьнікаў. Усе ВІА таксама мусілі граць толькі іх песьні.

Адначасова ўзмацнілася барацьба з «спэкулянтамі» і «фарцоўшчыкамі», што запаланілі краіну сучаснай заходняй музыкай. Як сьцьвярджаюць сьведкі тагачасных падзеяў, у Менску тады існаваў самы магутны, бадай, ва ўсім Савецкім Саюзе цэнтар спэкуляцыі. Кіравалі ім браты Рабіновічы. Напачатку 80-х яны паказалі сябе сапраўднымі бізнэсоўцамі. Усе навінкі заходняе рок-музыкі зьяўляліся ў Менску праз тыдзень пасьля рэлізаў у Лёндане ці Нью-Ёрку. Гэтыя плыты пераганялі на стужкі і сотнямі рассылалі сваім кліентам па ўсім Саюзе. На бабіну пісалася два плыты. Кожная каштавала 3 рублі, самае новае — 5. Бізнэс спыніла міліцыя і КДБ.

Зьміцер Падбярэзкі: *«Пасьля арышту Рабіновічаў ЦК камсамола вымушаны быў стварыць спэцыяльную камісію, каб ацаніць іх музычную «спадчыну». Там былі камсамольцы, перакладчыкі ну і, скажам так, дасьведчаныя ў музыцы людзі. У тым ліку і я. Камсамольцы імітавалі барацьбу з антысавецкімі зьявамі. І камісія мусіла вызначыць, якая музыка сярод гэтага ідэалягічна шкодная, а якае мае права на існаваньне.*

*Мы зьбіраліся разоў 5 і праслухалі 150—200 плытоў. Канешне, уся музыка была вартасная, аднак мы разумелі, што нечым прыйдзецца ахвяраваць. Некаторыя плыты з маўклівае згоды камсамольцаў мы адкладалі, гаварылі, што гэта ня шкодная, добрая музыка, нават і слухаць ня трэба. Ахвярамі зьнішчажэньня станавіліся збольшага гурты, якія гралі соул, фанк. Напрыклад, я ставіў Sly & Family Stone і міргаў перакладчыку. Той, паслухаўшы адну-дзьве песьні, казаў:*

*— Ну, тут яны пра сэкс пяюць...*

*Лёс плыта быў вызначаны. Вось так адну зьнішчажалі, а дзьве-тры адкладалі. Тыя, што ўдалося выратаваць, потым перадалі ў менскую нотную бібліятэку ў агульны фонд карыстаньня. Туды можна было прыйсьці, узяць той жа Led Zeppelin, навушнікі і паслухаць. А Рабіновічы адсядзелі, выйшлі і неўзабаве зьехалі ў Штаты».*

Праз усе гэтыя перасьледы жыцьцё не спынілася, аднак зарганізоўваць рок-канцэрты па інстытутах стала цяжэй. Не гаворачы ўжо пра вялікія пляцоўкі. «Афіцыйны статус» мог дадаць свабоды.

Вітаўт Мартыненка: *«Мы з Толем Мяльгуём вялі тады ў «Чырвонай змене» рубрыку «Нотны аркуш». І калі не пра заходнія гурты пісалі, дык пра Магнэтык Бэнд, Вітамін з Эстоніі, пра Макарэвіча. І неяк Толя падыходзіць да мяне і кажа:*

*— Слухай, а чаго гэта мы пішам пра ўсіх гэтых чужынцаў?*

*— А пра каго яшчэ пісаць? — пытаюся. — У нас жа ўсе па рэстаранах сядзяць.*

*— А вось ёсьць нейкія Близнецы, мне сказалі. Недзе ў сутарэньнях Нархоза сядзяць, нешта робяць.*

*Так мы напісалі першую зацемку пра беларускі гурт. Потым даведаліся пра Мрою, Студыю 7. І неяк Мяльгуй падыходзіць да мяне і пытаецца: "Слухай, а чаму б нам не стварыць рок-клюб?"».*

У гаркаме камсамолу ідэю падтрымалі. Каб кантраляваць рок, камсамольцы вырашылі яго ўзначаліць. Калі рок-клюб «Няміга» адкрыўся, у яго уваходзілі Бонда, Близнецы, Рэй (што ўтварыўся са студэнтаў БПІ і імкліва набываў папулярнасьць), Мінск, Мроя ў асобе аднаго вольнага ад войска Юрася і яшчэ некалькі гуртоў. Ляўкоў хадзіў на кожнае паседжаньне клюбу, хаця сэнсу ў гэтым было няшмат — амаль увесь час там абмяркоўвалі, як зладзіць чарговы канцэрт. Юрык жа сядзеў на паседжаньнях толькі жывым напамінам пра тое, што Мроя яшчэ існуе.

Лявон: *«Пакуль нам у войску палітінфармацыю чыталі, у Саюзе, аказваецца, перабудова даўно пачалася. Рок на ўздым пайшоў. І Юрык у лістах нам пісаў: «Я схадзіў на паседжаньне рок-клюбу...». А мы думалі — што за вар'яцтва такое, які рок-клюб, мо Юрык загібацца пачаў? Для нас гэта было як паведамленьне зь іншага сьвету».*

## Першы гіт-парад «Чырвонай змены»

Акрамя рок-клюбу Мяльгуй і Мартыненка стварылі яшчэ й першы ў Беларусі рок-гіт-парад. Праблемай было толькі — якімі крытэрыямі кіравацца. Ня дубляваць жа «Голубые огоньки» ды «Утреннюю почту».

Мартыненка: *«Гіт-парад мы распачалі недзе ў 83-м годзе. Прыйшлі ў клюб філафаністаў (яны тады хаваліся па завугольлях дома грамплясьцінак на Казлова, міліцыя іх час ад часу ганяла) і кажам: «Хлопцы, давайце створым гіт-парад. Да-*

*вайце пакажам, што ёсьць новая музыка, а ня толькі тая, што на «Песне года» гучыць ды па радыё».*

*Толя купіў на свае грошы пачак капэртаў (на пяць рублёў — немалыя грошы), даў ім, нават напісаў на кожным зваротны адрас — толькі каб даслалі й выказалі свае думкі. І са ста капэртаў вярнулася 30. Так мы склалі першую табліцу. У яе ўвайшлі, наколькі я памятаю, эстонскія Вітамін, Магнэтык Бэнд, расейскія Автограф, Машина Времени. З беларускіх гуртоў у першым выпуску не было нікога».*

Гіт-парад у «Чырвонай змене» праіснаваў шмат год. Час ад часу кіраўніцтву камсамольскае газэты не падабалася, хто займае першыя радкі папулярнасьці. Два ці тры разы гіт-парад перапыняў выхад, узнаўляўся і ў рэшце рэшт зачыніўся канчаткова (як праз колькі год і сама «Чырвоная змена»).

## Юрык і КДБ

Пакуль астатнія мройчукі малявалі ленінскія пакоі, Юрась «маляваў» сабе старонкі ў гэбісцкіх дасье. Летам 84-га «Майстроўня» вырашыла сьвяткаваць Купальле. Яе актывісты падбілі паехаць на сьвята цэлы выпуск мастацкай вучэльні. Да кампаніі прыбіўся і Юрась. Ехалі да Сокалава-Воюша, які працаваў дырэктарам музея Якуба Коласа у Мікалаеўшчыне. Разьмясьціліся ў лясочку на пагорку. Як толькі запалілі кастрышча, падыйшлі трое. Віктар Івашкевіч, завадатар сьвяткаваньня, спакойна запытаўся:

— Хлопцы, што вам трэба?

— Ды на аганёк зайшлі, — адказалі тыя і зь цікаўнасьцю пачалі прыглядацца да таго, што адбывалася. На адным з дрэваў вісеў бел-чырвона-белы сьцяг. На паляне разгортвалася тэатралізаваная дзея з удзелам Чорнай сілы, Купалінкі... Чорная сіла чытала прамову, абсалютна бессэнсоўную, у стылі Брэжнева:

— Нашыя людзі... Усё вышэй і вышэй... нягледзячы ні на што...

Усе рагаталі. І толькі трое незнаёмцаў паспрабавалі ў Чорнае сілы забраць паперку з тэкстам.

Івашкевіч: *«Тут ужо мы ня вытрымалі. Падыйшлі да іх і кажам:*

*— Слухайце, тут прыватная вечарына, мы тут распрыгоненыя ўсе, зараз каханьнем зоймемся. Ішлі б вы адсюль.*

*Яны пайшлі. Мы наскакаліся праз вогнішча і недзе а чацьвертае раніцы пайшлі купацца на бліжэйшую рэчку. Выйшлі пасьля купаньня, і тут міліцыянты на машынах прыяжджаюць, ачапляюць і просяць зайсьці ў машыны. У іх быў загад затрымаць, але без ужываньня сілы. Ну і дзеці гэтыя пабеглі між імі што куры празь дзіркі ў плоце. А міліцыянты і не разумеюць, што рабіць, — бо сказалі ж ім «без ужываньня сілы». Але некаторых затрымалі».*

У пастарунак патрапілі ў тым ліку сам Івашкевіч і Ляўкоў. Размовы з кэдэбістамі адбываліся ў мясцовым аддзяленьні міліцыі. Мелі яны дзіўны характар. Міліцыянты яшчэ мала ведалі пра беларускіх нацыяналістаў і не былі спрактыкаваныя ў допытах.

— А што гэта ў вас за сьцяжкі вісяць бел-чырвона-белыя? — пытаўся, напрыклад, следчы ў Івашкевіча.

— А гэта, — адказваў той, — сымболіка рэвалюцыйнага руху Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, што спрычыніўся да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нашыя клясыкі Колас і Купала хадзілі на іх паседжаньні.

— Ага... А чаму ў вас тут па-нямецку напісана? — маючы на ўвазе надпіс Kupalle ў мастацкім аздабленьні дзеі, пытаўся сьледчы.

— А гэта лацінскі варыянт беларускага правапісу, — зноў адказваў Віктар. — На ім у тым ліку пісалі Купала і Колас.

— Ага... — ківаў галавой сьледчы. Было відаць, што школьная праграма навучыла яго паважаць

тыя імёны, хоць наўрад ці ён памятаў хоць пару радкоў зь іх твораў, акрамя «Мой родны кут, як ты мне мілы».

З Юрыкам размова ішла больш прадметная. Гэбісты ўжо вылічылі ў ім басіста Мроі. Таму настойліва прапаноўвалі «завязаць з гэтымі нацыяналістамі» альбо ўстрымацца ад сьпяваньня некаторых песень. Дзіўна, але болей за іншыя сьледчаму не падабалася песьня «Чужы горад».

— Дарэмна вы такую песьню напісалі, мы разумеем, што вы мелі на ўвазе, — шэрыя вочы асабіста пагрозьліва пазіралі на Юрыка.

Якая тут была лёгіка? Чаму болей за песьні пра парушаныя храмы й занядбаную мову іх хвалявала песьня пра нейкі горад, тым болей чужы? Відаць, таму, што хоць слова гэтае ў тэксьце ні разу не гучала, было відавочна, што песьня — пра Маскву. Напісалася яна пасьля таго, як Лявон з Уладзям зьезьдзілі ў савецкую сталіцу.

Лявон: *«У Маскву мы патрапілі пасьля таго, як запісалі дэма «Старога храму». Мы тады часьцяком перасякаліся з кампаніяй хіпаноў, якія мелі гурт зь ідыёцкім назовам Тумблер — Валік Задзіран, басіст Жан (зараз ён у Польшчы ці ў Аўстрыі жыве) і барабуля Слэйд. Яны былі нармальныя інструмэнталі, але хіпі. Езьдзілі пару разоў рэпэтаваць у Дзегцяроўку. І яны зьбіраліся ў Маскву, але перасварыліся і нікуды не паехалі. А Жан падбіў нас — сказаў, што ў Маскве класна, ёсьць дзе граць. І мы як ідыёты з Давыдоўскім туды ламануліся.*

*Там усе на нас глядзелі як на ідыётаў, мы нічога не знайшлі і вярнуліся назад. Уражаньнем ад гораду і стала песьня. Сэнс быў такі, што я прыехаў сюды, а тут усё чужое, і хочацца дамоў:*

*Як хацеў я знайсьці цеплыні,*
*Каб хоць рукі пагрэць.*
*Я бег без дарогі адсюль,*
*Прэч ад гораду, прэч».*

Аднак непавагу да тагачаснае сталіцы нельга было лічыць крыміналам, сьвяткаваньне Купальля таксама, таму Юрыка, Івашкевіча ды іншых затрыманых адпусьцілі. Прыйшлося толькі заплаціць штрафы за хуліганства ды вытрымаць іранічныя жартачкі калегаў. Бо праз некалькі дзён на працу да Івашкевіча прыйшоў ліст зь міліцыі. І сьмеху пасьля таго было на некалькі дзён: «Ты, Івашкевіч, — казалі Віктару, — нават у лесе здолеў пахуліганіць. Патлумач, як? Мо спрабаваў галавой зьбіваць дрэвы?»

### Вяртаньне і самы жудасны правал Мроі

Вяртаньне з арміі адбылося ўвесну 1986 г. Краіна хоць і перажывала перабудову, але музыку слухала тую ж. Амаль дзень у дзень з дэмбелем мройчукоў «Знамя юности» друкуе «Вынікі музычнага конкурсу — 85»:

*Певица — Алла Пугачёва, София Ротару, Анне Вески.*

*Певец — Валерий Леонтьев, Михаил Боярский, Игорь Скляр.*

*Ансамбль — «Форум», «Земляне», «Верасы».*

*Песня — «Островок» (гр. Форум), «Комарово» (Игорь Скляр), «Паромщик» (Алла Пугачёва).*

Савецкаму чалавеку падрабязна тлумачылі, чаму іншае слухаць ня тое што ня варта — шкодна:

*«В 85-м году в США вышла книга «Учебник для ведения психологической войны», в котором сказано буквально следующее: «Музыка является первым послом доброй воли США за рубежом». Разумеется, здесь имеется в виду определенная часть так называемой массовой музыки, относительно которой медицинские исследования установили, что ее громкие звуки вызывают резонанс клеточных структур организма человека, в результате чего возникает звуковое опьянение, аналогичное по своим ощущениям одурманиванию наркотиком».* (З артыкулу «Хто заказвае музыку» П. Сміла-

віцкага, выкладчыка менскага Інстытуту культуры. «Знамя юности», 01.02.87.)

Адсутнасьць музычнае практыкі наклала на хлопцаў свой адбітак. Гэта было амаль як амнэзія. Быццам два гады таму невядомыя людзі кінулі цябе ў багажнік машыны, і вось ты ачуняў у лесе, увесь зьбіты і ледзьве жывы. Выбраўся на шашу і як зомбі даплёўся да гораду. Тыдзень за тыднем, месяц за месяцам памяць паступова вяртаецца, ты наноў вучысься браць у рукі гітару ці клявішы, узгадваеш найпрасьцейшыя акорды. Піт Паўлаў, які служыў на два гады пазьней за мройчукоў, так узгадвае наступствы тае службы.

Піт: *«Колькі год пасьля арміі я як завядзёны быў. Я ў краму не хадзіў, а бегаў. Бегаў навыперадкі з аўтобусам. Выходзіў з хаты, ён ехаў, і я мог перагнаць аўтобус. Год шэсьць мне спатрэбілася, каб ад гэтага пазбавіцца. Бегаў нават з гітарай, і яна некалькі разоў падала на зямлю. Толькі калі цьвёрды кейс для гітары займеў, прымочак шмат, кінуў бегаць...»*

Піт яшчэ выконваў свой «грамадзянскі абавязак», калі Мроя, сабраўшыся пасьля перапынку, вырашыла даць першы канцэрт. Не адразу. Паўгода па некалькі разоў на тыдзень гурт рэпэтаваў у сутарэньнях Дому літаратара. І там жа (не ў сутарэньнях, канешне, а ў вялікае залі) на 29 кастрычніка прызначылі канцэрт. Хто ж ведаў, што і шасьці месяцаў рэпэтыцыяў недастаткова, каб адчуць сябе ўпэўнена.

Лявон: «*Правал быў жудасны. Такога, здаецца, ніколі болей у маім жыцьці не было. Хаця мы сапраўды былі гатовыя, праграма адрэпэтаваная. Але зьбег абставінаў быў супраць нас*».

Напачатку высьветлілася, што за два з паловай гады пра Мрою не забыліся. У залі на 200 месцаў быў перааншляг. Людзі занялі ўсе месцы, стаялі ў праходах і дзьвярох. На гэтым прыемныя моманты скончыліся і пачаліся праблемы. Перад самым канцэртам у Давыдоўскага зламалася гітара. Неяк

наладзілі, выйшлі на сцэну і... патрапілі ў поўны ступар. Чатыры чалавекі стаялі на сцэне і не варушыліся. Гледачы чакалі. Прайшла хвіліна, потым, здаецца, другая. З-за сцэны амаль на ўсю залю чуўся быццам бы шэпт: «Чаго не пачынаеце? Пачынайце! Чаго не пачынаеце?? Пачынайце!!» Гэта быў Алег Каранькоў, сваяк Юрася, якога запрасілі на канцэрт папрацаваць асьвятляльнікам.

Як пачалі, стала яшчэ горш. Цяпер, узгадваючы той канцэрт, усе сыходзяцца на думцы, што віной акрамя хваляваньня была яшчэ і апаратура. Пра існаваньне такой тэхнічнай «навінкі», як маніторы, якія дазвалялі музыкам на сцэне чуць тое ж, што чуюць і слухачы ў залі, ніхто ў Беларусі не здагадваўся. Апаратура слабая, пазычаная з розных месцаў ці сабраная ўласнымі рукамі, ды яшчэ й расстаўленая недакладна. У выніку хтосьці ў залі чуў толькі гітары, не разумеючы ні слова з вакалу, камусьці ў вушы білі бубны...

Расчараваньне публікі было жудаснае. Адзіным чалавекам, які мог ганарыцца сваёй працай, быў той жа Алег Каранькоў. Як высьветлілася, асьвятляльнік з яго атрымаўся клясны. Напярэдадні канцэрту Алег прынёс правады, напаяў нейкую схемку і, не зважаючы на вонкавыя абставіны, пачаў працаваць. У той час, як у залі людзям закладвала вушы, Алезіс не трымаў тэмп, а хлопцы зьдзервянелымі рукамі вымучвалі гітарныя пасажы, Алег спакойна націскаў на нейкія кнопкі. Чырвоныя, зялёныя і белыя пражэктары асьвятлялі сцэну...

З таго вечара Алег так і не сыйшоў з гурта, працуючы на кожным канцэрце, і праз некалькі год «узьняўся» да пасады гукарэжысэра гурта. У той вечар ён быў задаволены сабой. У адрозьненьне ад усіх астатніх. Мроя зь цяжкасьцю перажыла правал і «сыйшла ў падпольле». Два месяцы пра гурт ніхто нічога ня чуў. Усё разам спарадзіла чуткі пра хуткі канец Мроі. Самі хлопцы хадзілі ў сумненьні — ці варта працягваць справу, якая не прыносіць задавальненьня...

## Разьдзел 4

## 1987. ВЯРТАНЬНЕ ДА ЖЫЦЬЦЯ. «ЗРОК»

Да жыцьця Мроя вярнулася праз уласную ўпартасьць (амаль штодзённыя рэпэтыцыі ў сутарэньнях Дому літаратара) і ў нечым пры дапамозе... камсамольцаў. Гучыць, згаджуся, сьмешна, аднак менавіта «малодшыя сыны партыі» на самым пачатку 1987 г. зладзілі рок-фестываль у Гародні, куды і запрасілі Мрою.

### Фестываль «Рок-крок» у Гародні

Камсамольцы ў ролі прапагандыстаў рок-музыкі тады ўжо мала каго дзівілі. Прайшоў час, калі ворагам сацыялістычнага ладу лічыўся ўвесь рок. Напрыканцы 80-х прапаганда душыла найперш набіраўшы моц і папулярнасьць хэві-мэтал. AC/DC, KISS, Accept — з колькасьцю гэтых надпісаў на шэрых сьценах менскіх новабудоўляў паспрачацца ня мог ніхто, нават Modern Talking. Савецкія газэты былі «расьпісаныя» іншымі надпісамі.

*«Ці бяскрыўдны рок-н-рол. Гэтая спрэчка ідзе ў Амэрыцы ды і ў іншых краінах ужо больш як 30 год — з таго часу, як з масавым зьяўленьнем электрычных інструмэнтаў у сьвеце пачалі хутка распаўсюджвацца яго бурныя рытмы. Ва ўсіх без выключэньня бандах і хуліганскіх групах амэрыканскіх падлеткаў ідаламі аказваюцца гарлапаняшчыя спевакі ў сатанінскім аблічы з груп Кісс, Твістэр сістэр і да іх падобных ансамбляў*

*і груп. Камісія па справах падлеткаў штата Каліфорнія ў сваім дакладзе аб уздзеянні цяжкага металічнага гуку на моладзь сцвярджае, што хэві-мэтал, сатанінскі рок і панк-рок служаць штуршком разгулу злачыннасьці сярод юнакоў і падлеткаў. Большасьць слухачоў і прыхільнікаў хэві-мэталу — гэта члены банд, хуліганскіх груп. У буйнейшым амэрыканскім штаце іх колькасьць перавышае зараз 75 тысяч чалавек. Пад уплывам такой музыкі, якая суправаджаецца дзікімі выхадкамі, імітацыяй боек і забойстваў, насільле і наркотыкі становяцца ў жыцьці звычайнай справай».* (Ю. Алгуноў. Какафонія насільля. «Чырвоная змена», 04.11.87.)

У такіх умовах людзі, што абыходзіліся без вісклівых гітарных запілаў у кожнай песьні, ня злоўжывалі грымам і нават час ад часу спявалі пра мір і дружбу (былі й такія, павер), успрымаліся камсамолам калі не як саюзьнікі ў справе выхаваньня моладзі, дык, прынамсі, як не безнадзейна хворыя. А яшчэ на іх можна было й грошы зарабіць.

Зьміцер Падбярэзкі: *«Арганізоўваць рок-фэсты камсамол пачаў па дзьвюх прычынах. Папершае, ім трэ было накіроўваць наверх справаздачы аб «працы з моладзьдзю». Па-другое, і гэта мо было галоўным, камсамольцы як людзі маладзейшыя за сваіх босаў з партыі спрабавалі ўжыць перамены ў грамадстве на сваю карысьць. Яны пачалі ствараць навукова-тэхнічныя майстэрні, напаўкамэрцыйныя структуры, дзе зараблялі грошы. У нейкі момант гэтыя людзі зразумелі, што можна зарабляць і на музыцы. Адсюль усё і пайшло».*

Рок-фэст у гарадзенскім Палацы культуры хімікаў атрымаўся моцным. З Расеі прыехалі Зоопарк Майка Навуменкі, ЭДС, Обелиск. Для памяркоўнай Беларусі яны зладзілі звышэкстравагантнае шоў. Обелиск ламаў на сцэне апаратуру, музыкі Зоопарка адно што нагамі на піяніна ня гралі. На та-

кім фоне ад бляклых ценяў «даваеннае» Мроі ніхто нічога не чакаў.

Уладзя: *«Паездка ў Гародню была вялікай рызыкай. Прычым рызыкавалі і мы, і тыя, хто нас запрасіў. Гэта была гульня ва-банк — альбо зноў правал і мы сыходзім назаўжды з музыкі, альбо застаемся. Бо нашыя сталыя прыхільнікі, менская беларуская тусоўка, пасьля канцэрту ў Доме літаратара пачала ўспрымаць нас хутчэй са спачуваньнем. Ішлі размовы, што мы ўжо памёрлі».*

Падрыхтоўка да фэсту прайшла грунтоўная. Найперш быў зроблены набег на менскі Тэатар юнага гледача. Там працаваў бацька Лявона, што дазволіла абрабаваць пакой са спісанымі сцэнічнымі касьцюмамі. У выніку выгляд Мроі на сцэне быў па тых часах проста эпатажны. Сярэднявечныя вопраткі — прынцы ды кардыналы — прымусілі выпасьці ў асадак усіх мэталістаў.

«Мы ня думалі пра тое, каб так ужо моцна адрозьнівацца ад іншых. Проста не хацелася выходзіць на сцэну ў нечым штодзённым, а каб набыць штосьці новае, грошай не было», — прызнаецца пазьней Лявон.

Акрамя эпатажнага зьнешняга выгляду, на канцэрце выраашана было ўжыць спэцэфэкты. За хвіліну да пачатку выступу Мроі ў залі выключылі сьвятло. Раптам пачуліся аўтаматныя чэргі, а зь першымі акордамі імгненна ўключылі ўсе існуючыя лямпачкі, люстры ды пражэктары. Не прызвычаены да такіх зьяваў рокерскі народ быў шакаваны. Некалькі сэкундаў маўчаньня, а потым заля зараўла ад захапленьня. І не спынілася ўжо да заканчэньня канцэрту.

Гэта быў фурор! На наступны дзень, падчас гала-канцэрту, выступ Мроі праходзіў пры ахове ля сцэны і ўключаным сьвятле ў залі. Арганізатары баяліся пагромаў.

Гарадзенскі канцэрт спыніў чуткі пра сьмерць Мроі. У Менск гурт вярнуўся ўжо на крылах былое велічы. Тут жа, напачатку 1987 г. адыгралі некалькі

навагодніх канцэртаў у менскім Палацы культуры чыгуначнікаў, што ладзіліся рок-клюбам «Няміга». Пазьней, увесну, рэабілітаваліся за правал у Доме літаратара, даўшы там новы, пасьпяховы канцэрт, ды і ўвогуле пачалі шмат выступаць.

Лявон: *«На «Рок-кроку» ў Гародні да нас падыйшоў нейкі чалавек з Магілёву і запрасіў на фэст у свой горад. У Магілёве яшчэ нехта падыйшоў... Вось так мы і езьдзілі па фэстывалях пару гадоў. Гародня, Бабруйск, Магілёў, Быхаў, Наваградак. Мы былі вельмі лёгкія на пад'ём. Аднойчы тэлефануе чалавек з Драгічына: «Можа прыедзеце, зграеце канцэрт?» Мы гаворым: «Чаму б і не». Прыяжджаем, а ў яго аднапакаёвая кватэра. Ноч валяемся на падлозе, на дыване, а зранку — на рэпэтыцыю.*

*А ў Воршу мы ўвогуле на папутках дабіраліся аднойчы. І амаль на кожны канцэрт шмат людзей прыходзіла. Прычым ня толькі маладыя. І цёткі і бабкі прыходзілі. Ну, ім жа было цікава. Да іх увогуле мала хто езьдзіў, а мы выступалі незвычайна апранутыя, у макіяжы. І ў правінцыі шмат каму было цікава паглядзець на такіх вар'ятаў. У Воршы мы два канцэрты ў адзін вечар гралі. Аншляг быў і на першым і на другім. Неяк у Быхаў прыехалі летам. І баяліся, што ня прыйдзе ніхто. А атрымаўся — зноў аншляг. Зрубілі тады 500 рублёў — па 100 на чалавека.*

*На той час мала хто так езьдзіў. Толькі Бонда з Модулем (была такая каманда гэткага супэргітарыста Алега Сьпіцына. Зараз ён грае ў дуэце «Сьпіцын і Чэрмэн»). Іх канцэрты ладзіў цэнтар «Арыенцір», які тады стварылі пры ЦК камсамолу. Але тое было ня вельмі прыбытковa, бо такі доўгі ланцуг з пасярэднікаў атрымліваўся, што самой Бондзе і Модулю заставаліся нейкія рэшткі. Івана Маркава, лідар-гітарыста Бонды, мы сустракалі, і ён увесь час быў незадаволены. Казаў, што трэба кідаць гэтую справу, бо прыбытку няма ніякага. А мы езьдзілі самі па сабе, з*

*дырэктарамі ДК дамаўляліся наўпрост, не зьвяртаючыся да пасярэднікаў».*

### Хлопцы з «зоны»

Такому пераможнаму шэсьцю па правінцыі магло перашкодзіць толькі адно — адсутнасьць дазволу на выкананьне песень. Зноў жа — спэцыфіка апошніх гадоў савецкае ўлады. Каб стрымаць распаўсюджаньне рок-заразы, кампартыя ўзгадала прыёмы яшчэ з 60-х гадоў. Сярод іх і так званае літаваньне тэкстаў — любы калектыў, які жадаў граць уласную музыку, мусіў зацьвердзіць усе песьні ў спэцыяльнае камісіі пры гарвыканкаме.

Не сказаць, што гэта стварала вялікія перашкоды, бо сістэма фактычна не працавала. «Савецкія» ВІА вылазілі за кошт патрыятычных песень, «антысавецкія» — невядома як. Літаваліся ўсе. У Ленінградзе праз камісію прайшлі нават звышантысавецкія Аквариум і Зоопарк. Мроя не прайшла!

Злым геніем гурта была таварыш Гарулёва, намесьніца кіраўніка аддзелу культуры Мінгарвыканкаму, якая па сумяшчальніцтву ачольвала камісію па літаваньні. Славу сярод рок-музыкаў яна займела ў сэкунду, вымавіўшы толькі адну фразу. Адбылося гэта на праслухоўваньні праграмы Бонды. Сярод іншых Ігар Варашкевіч выканаў песьню «Тата мае рацыю». Пачуўшы яе, Гарулёва забілася ў істэрыцы:

— Какую такую рацию имеет его папа?! Зачем советскому человеку рация? Он что, шпион?!

Тлумачыць Гарулёвай беларускае значэньне слова «рацыя» ня мела сэнсу. Але ж Бонда літаваньне прайшла. У адрозьненьне ад Мроі. Паслухаўшы тры песьні — «Белы сьцяг», «Чужы горад» і нейкую яшчэ (яе ўсе ўдзельнікі мерапрыемства не ўзгадалі нават агульнымі намаганьнямі), Гарулёва вымавіла:

— Занадта яны змрочныя нейкія. Такое ўра-

жаньне, што год 20 правялі ў Сібіры на лесапавале. Як гэта ўвогуле можна людзям паказваць?

Сваю пазыцыю Гарулёва адстойвала да канца. Каб падтрымаць сына, Артур Вольскі нават арганізаваў вялікі ліст ад Рады Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. Тэксты Мроі маюць вялікую мастацкую вартасьць і ні да чаго кепскага не заклікаюць — сьцьвярджалася там. Марная праца! Таварыш Гарулёва не саступала.

Праз пэўны час Віталь Сямашка паставіў у эфір радыё «Беларуская маладзёжная» песьню «Ён яшчэ вернецца». На наступны дзень Гарулёва прымчалася ў рэдакцыю і ўсчыніла грандыёзны скандал — дзяржаўнае радыё ну ніяк не магло паставіць у эфір песьню гурта, які не прайшоў літаваньне. Сытуацыю выратавала кіраўніца «БМ» Жанна Літвіна. У яе з Гарулёвай былі нейкія далёкія сваяцкія сувязі, і тая, пакрычэўшы, супакоілася. А канчаткова яна адчапілася ад Мроі недзе праз год, пасьля Наваполацкага фэстывалю. Але пра тую скандальную перамогу — у наступным разьдзеле.

### Савецкая крытыка: «Гэта падобна на прафанацыю музыкі»

Добраахвотнае зьняволеньне ў сутарэньнях Дому літаратара нельга лічыць бязвыніковым і яшчэ па некалькіх прычынах. Па-першае, там быў перапісаны альбом «Стары храм». Зьявілася яго, так бы мовіць, «другая рэдакцыя». Акрамя песьняў, якія пісаліся яшчэ напярэдадні сыходу ў войска, дапісаліся дзьве — «Белы сьцяг» і «Замежны дэтэктыў». Па-другое, менавіта там пачала нараджацца і рэпэтавацца новая праграма — «Зрок». Студыйны яе запіс рабіўся ўжо ня ў Доме літаратара (чаму так — крыху пазьней), але менавіта яна забясьпечыла трыюмф у Гародні. Большасьць песень з альбому на шмат год засталіся ня толькі гітамі, але й візытоўкай Мроі. Найперш, канешне, «Я рок-музыкант» і «Ён яшчэ вернецца».

## Ён яшчэ вернецца

*Ён мне сказаў: «Зашмат пагарды*
*У свеце ні на што ня вартым,*
*Дзе ў паветры гіне слова*
*І ад памкненьняў толькі стома».*

*Ён мне сказаў: «Зь мяне даволі!»*
*Сказаў, ня вернецца ніколі.*
*І не спыніць яго хады,*
*Ды я спакойны, як заўжды.*

*Ён яшчэ вернецца...*

*Ён мне сказаў: «Нашто сьвітанак,*
*Калі штодня адны туманы,*
*Калі штодня бясконца,*
*І ўсё адно не ўбачыць сонца.*

*Нашто Купала і Скарына,*
*Калі ўсё роўна ўсё загіне?»*
*Ды я лічу ўсё гэта жартам,*
*Бо ведаю яго характар.*

*Ён яшчэ вернецца...*

Тэкст песьні напісаў Уладзя. Ідэя высьпявала паволі. Але памыляецца кожны, хто лічыць, што зразумеў усе аўтаравы думкі (ды тое ж можна сказаць пра любую, а ня толькі гэтую песьню). За чацьвертым кубкам кавы, на кухні Уладзі, слухаючы ягонае тлумачэньне, я спачатку таксама ківаў галавою, усім сваім выглядам быццам гаворачы: «Так, так, разумею...». А потым шчыра зьдзівіўся. Упэўнены, і ў вас будзе тая ж рэакцыя.

Уладзя: *«Апошнюю кроплю (дакладней, словы пра Купалу і Скарыну) дадалі сваякі. Яны ня раілі з галавой кідацца ў «беларушчыну», бо мелі жыцьцёвы вопыт і добра ведалі, чым усё гэта можа скончыцца. Але раз-пораз зь іх так і перла: «Мы ж*

*са шляхты», і г. д. ...Ні страх, ні трагічны вопыт ня выкаранілі зь іх тое, што было закладзена на генэтычным узроўні. Розумам яны адмаўлялі, а сэрцам мусілі вяртацца...*

*Менавіта ў такіх варунках і нарадзілася песьня «Ён яшчэ вернецца».*

*Пра каго яна? Напэўна, пра чалавека, які лічыць, што можа зьбегчы ад сябе, ад сваіх каранёў. Дарэчы, заўваж, Ён кожны раз сыходзіць бязадрасна, у нікуды. І Ён ня можа не вярнуцца, бо іншага прытулку і каштоўнасьцяў у яго проста няма.*

*А яшчэ тады вельмі мусолілася тэма сталінізму і пакаяньня. Праўда, людзі, якія пра гэта шмат размаўлялі, будавалі сваё жыцьцё такімі ж сродкамі, як і тыя, каго яны адмаўлялі. У такіх варунках Ён (увасабленьне зла), хай і ў іншым абліччы, ня мог не вярнуцца...»*

Праз колькі месяцаў «Ён яшчэ вернецца» трыюмфальна пераможа ў першым гіт-парадзе «Беларускай маладзёжнай» і замацуе за сабой статус галоўнай песьні «Зроку». Аднак гісторыя перапіша гэты ранжыр, найбольш вылучыўшы сярод тагачасных песень «Я рок-музыкант», перапетую Мрояй на альбоме «28-я зорка».

Але на «Зроку» гэтая песьня прайшла амаль незаўважна. Прынамсі, большасьць дыскусіяў была скіраваная на іншую — народную песьню «Мела мамка тры сыночкі». Гэта быў першы экспэрымэнт Мроі з фолькавым матэр'ялам.

Лявон: *«Нам гэтая песьня, канешне, падабалася. Для нас гэта быў прэцэдэнт хуліганскі — узяць народную песьню і перакласьці ў хард-панк. Атрымалася даволі энэргічна. Хаця калі быў канцэрт у Доме літаратара (другі, рэабілітацыйны), людзі розныя прыйшлі, і некаторыя казалі:*

*— Як жа ж так... Неахайнае стаўленьне да нашай народнай спадчыны... Як можна было ў такім стылі такую песьню...*

*Так рэагавалі людзі больш сталыя. Ну, усе ж былі выгадаваныя на Песнярах, у якіх «ахайнае*

*стаўленьне». А тут хрыплым голасам ды ў напружаным рытме прасьпявалі калядную песьню...*

*Гэтую песьню нам падсунуў Дубавец і кампанія. Яны прапаноўвалі яшчэ некалькі песень, якія самі пелі падчас тусовак «Талакі» і «Майстроўні». Але большасьць тых песень былі павольныя, а гэтая — хуткая. Вось мы яе і абралі».*

Запісаўшы «Мела мамка...», Мроя сталася ахвярай палемікі, што вялі ў той час на старонках прэсы два варожыя лягеры, найбольш яскравымі прадстаўнікамі якіх былі Вітаўт Мартыненка з «Чырвонай змены» ды «вольны журналіст» Зьміцер Падбярэзкі. Вітаўт, які на мяжы фанатызму падтрымліваў беларускамоўны рок, і Падбярэзкі — птушаня гнязда Сузор'я ды джазавай тусоўкі — былі абсалютнымі антыподамі. На сэрыю публікацыяў Вітаўта пра беларускамоўныя гурты Зьміцер адказаў адным, але магутным стрэлам. Загаловак у «Советской Белоруссии» ад 3 ліпеня 1987 г. вызначаў плянку дыскусіі: «Найти свое лицо. О некоторых тенденциях развития рок-музыки в республике». Больш за ўсё пацярпела ад Зьміцера адна з галоўных зорак тых часоў «7 герц». Дасталося крытыкі Бондзе, Магістрату. А Мроі аўтар прыбіў адной фразай:

*«Исполнение группой Мроя колядной мелодии чуть ли не в стиле металла больше походит на профанацию музыки».* (Зьміцер Падбярэзкі. «Советская Белоруссия», 3 ліпеня 1987 г.)

Праз некалькі год Падбярэзкі памірыцца з Мрояй, а падчас падрыхтоўкі гэтае кнігі патлумачыць мне свой тагачасны радыкалізм.

Зьміцер Падбярэзкі: *«Калі параўноўваць сыграны калектыў — Сузор'е, напрыклад, дзе непаразуменьня паміж музыкамі няма, і тыя гурты, дзе людзі намацвалі адзін аднаго, то адрозьненьне было відавочнае, і я выказваў уласную думку.*

*«Мела мамка тры сыночкі» сапраўды выпадала з рэпертуару Мроі найперш таму, што яна*

*была народнай песьняй, чужароднай па натуры для гурта. І на фоне таго, што на той час было зроблена Песнярамі з народнай песьняй, яна выглядала блякла. І, магчыма, правільна зрабіў Лявон, што потым пачаў арыентавацца на ўласныя, а не народныя песьні».*

Лявон: *«Ну як яшчэ мог успрыняць гэтую песьню чалавек, які слухаў толькі Сузор'е ды Песняроў? Якраз нічога дзіўнага, што яму гэта падалося трызьненьнем».*

«Зрок» разыходзіўся між фанаў тым жа спосабам, што і «Стары храм» — праз беларускія нефармальныя суполкі, перапісваючыся з магнітафону на магнітафон. Адрозьненьнем было хіба толькі тое, што якасьць зыходнага запісу была лепшай. Альбом пісаўся ўжо не ў Доме літаратара, а ў аўтобусным парку № 3, дзе на той час працавалі Алезіс і Лявон. А студыйным гукарэжысэрам Мроі стаў Веня Конеў-Петушковіч. Ён прывалок на запіс чатырохканальную студыю «Фостэкс», і гэта ўжо давала магчымасьць для больш якаснага гуказьвядзеньня. Веня, майстар сваёй справы, зрабіў амаль немагчымае, і наракаць можна было хіба на «кардонны» гук бубнаў. Вакал і гітары гучалі цудоўна. Па тых часах гэта быў вельмі «прасунуты» запіс, і што самае галоўнае — ён ня моцна псаваўся нават пасьля дзясятку перазапісаў з магнітафону на магнітафон.

## Стод-рок

Экспэрымэнты з фолькам прывялі да таго, што Мрою ў пэўны час ахрысьцілі яшчэ й пачынальнікамі новага кірунку ў музыцы. У «Зроку» на народным матэр'яле акрамя «Мела мамка тры сыночкі» была пабудаваная яшчэ песьня «Купальскае кола», некалькі разоў на канцэртах згралася народная «Вяне рута» (гэтая песьня запісвалася яшчэ ў Доме літаратара, але потым падалася хлопцам ня вельмі энэргічнай і не ўвайшла ў ніводзін з альбомаў.

што не перашкодзіла піратам распаўсюджваць яе на касэтах і нават ў MP3 як адну з кампазыцыяў другога выданьня «Старога храму»).

Для 80-х спалучэньне року і фольку яшчэ было экзотыкай, і хтосьці, ня вытрымаўшы спакусы, нарэк гэты сімбіёз стод-рокам. Але хто гэта быў? Гісторыя маўчыць. Дакладней, гаворыць зашмат, але рознае. Большасьць сьведкаў паказваюць на Вітаўта Мартыненку. Той у сваю чаргу гаворыць, што вызначэньне пайшло ад самой Мроі. Яшчэ адну вэрсыю вылучыла беластоцкая газэта «Ніва».

*«Музыказнаўцам спачатку было проста: назваў музыку Мроі цяжкім рокам, і кожны пагодзіцца. Але потым зьявіліся новыя адценьні творчае палітры... Назвалі «цяжкі панк-рок». Потым прыйшлося ўдакладніць — «цяжкі пост-панк». У рэшце рэшт дайшло да абсурду — «пост-панк-хэві-мэтал». І чым бы ўсё скончылася, каб малады карэспандэнт газэты «Беларускі універсітэт» ня ўзяў на сябе сьмеласьць адысьці ад заходніх канонаў рок-тэрміналёгіі, назваўшы музыку Мроі «стод-рок». Стод — гэта ідал. Але тут няма ніякага намёку на прагу гурта да ідалапаклонства. Проста падсьвядома музыканты прыйшлі да каранёў той беларускай культуры, якая яшчэ ня мела налёту экспансіі хрысьціянства».* (Р. Дамінюк, газэта «Ніва», 19.06.88 г.)

Тэрмін пратрымаўся пару год (намаганьнямі таго ж Вітаўта Мартыненкі), але ня быў падтрыманы большасьцю тагачасных «музычных крытыкаў».

*«Вельмі тэмпэраментны, толькі часам нястрыманы журналіст Віктар Мартыненка ахрысьціў Мрою заснавальнікам новага стылю. Стод-рок (ад старажытнага «стод» — ідал, паганскі бог). Але, мяркую, гэты тэрмін хутчэй чакае Мрою ў перспектыве. Бо зондэркаманды, кансерватары і нацыянальныя нігілісты, пра якіх сьпявае гурт, да паганскай культуры сла-*

*вян дачыненьня ня маюць ну аніякага, хоць нясіце мяне ў ахвяру таму стоду. Спробы Мроі выкарыстоўваць фальклорныя матывы ў кампазыцыі «Купальскае кола» выглядаюць практыкаваньнямі, што заслугоўваюць пахвалы настаўніка, і ня больш».* (Адам Глобус, часопіс «Беларусь», 1987 г.)

У рэшце рэшт бяз моцнае медыя-падтрымкі «новы стыль» пацІху сканаў. З нагоды чаго шкадуюць, напрыклад, Юрась і Уладзя, а вось Лявон вялікіх сьлёз ня лье.

Юрась: *«Мне гэтая назва заўсёды падабалася. Гэта нешта першабытнае, паганскае. А калі ісьці ўжо гэтым шляхам, дык што такое паганства ў музыцы — гэта панк, глэм. Вось, ангельцы гэта назвалі глэм. Па-беларуску стод. Але бачыш — стод у Беларусі не прыжыўся, а глэм на Захадзе прыжыўся».*

### Гілевіч і дэмакратыя

Дыскусіі ў прэсе надавалі Мроі ўсё большае папулярнасьці і разам з тым праблемаў. У траўні 1987 г. Мрою пагналі з Дому літаратара. Прычынаю стаў удзел у «Дзьвінскім паходзе» — мерапрыемстве супраць пабудовы Дзьвінскае ГЭС у Латвіі.

Да акцыі гурт прыцягнулі старыя знаёмыя з «Талакі» (былой «Майстроўні»). Гідраэлектрастанцыя будавалася за кошт затапленьня вялікае тэрыторыі на мяжы Латвіі і Беларусі. У Латвіі гэтая тэма дыскутавалася на кожным кроку. І найбольшую актыўнасьць праяўлялі якраз маладзёвыя нацыянальныя групоўкі. Яны й наладзілі акцыю пратэсту. Запрасілі талакоўцаў.

Віктар Івашкевіч: *«Алесь Суша праходзіў тады прыктыку ў «Чырвонай змене». І неяк так сталася, што аднаго дня стаў выпускаючым рэдактарам нумару. Карыстаючыся гэтым, ён без дазволу галоўнага рэдактара ціскануў артыкул — маўляў, «моладзь пратэстуе супраць бу-*

*даўніцтва... гэта катастрофа... заклікаем усіх, хто хоча падтрымаць латвійскую моладзь, далучыцца да акцыі... час і дата...». Збор наладзілі непадалёк ад мяжы з Латвіяй і мусілі сплавіцца туды на плытах. А народу зь Менску прыехала — чалавек 200. Мясцовыя менты заварушыліся, бегаюць, валасы дыбарам, пытаюцца: «Хто тут галоўны?» Да мяне падбеглі:*

*— Вы галоўны?*

*— Не, — адказваю.*

*— А хто вас сюды прывёз?*

*— А я па заклiку камсамолу, — гавару і паказваю нумар «Чырвонай змены».*

*Не знайшлі яны падставаў нас арыштаваць, і мы хутка селі на плыты і паплылі ў Латвію».*

На тым баку мяжы ладзіўся мітынг і канцэрт. Два гурты з латыскага боку і Мроя ды навапалацкі Рокаш з беларускага. Патрапіўшы на тэрыторыю Латвійскае ССР, талакоўцы перасталі маскіравацца, паначаплялі бел-чырвона-белыя стужкі і значыкі. Ня дзіва, што хутка пагалоска пра «нацыяналістычнае зборышча» дайшла да Менску.

Кіраўніком Саюзу пісьменьнікаў быў тады Ніл Гілевіч. Чалавек паважаны (ужо за незалежніцкімі часамі — адзін з аўтараў Закону аб мовах), але ў рок-музыцы разьбіраўся ён, як карова ў смаку ананасаў. Яго выклікалі «на кавёр» і запыталіся — як жа ж гэта ў Доме нашых, савецкіх, літаратараў знайшоў прытулак такі палітычна ненадзейны гурт? Гілевіч, не жадаючы прыкрываць сваімі шырокімі плячыма нейкіх там малакасосаў, хуценька аддаў загад «вызваліць памяшканьне», матывуючы гэта нейкімі гаспадарчымі неабходнасьцямі. Перажывала Мроя нядоўга. Страта адной кропкі дазволіла знайсьці другую, і болей таго — атрымаць прыз, якога няма ні ў кога зь беларускіх гуртоў. Бо праз некалькі месяцаў хлопцы занялі другое месца на конкурсе самадзейнасьці аўтобусных паркаў Менску!

Да таго часу Алезіс з Лявонам ужо каторы год працавалі ў трэцім аўтобусным парку Менску. Вярнуўшыся з арміі, абодва паспрабавалі паступіць у тэатральна-мастацкі інстытут, але, ня маючы рэкамэндацыяў, праваліліся. Думалі паўтарыць спробу праз год, але потым плюнулі — так зацягнула музыка. Па савецкіх законах, каб не лічыцца дармаедам (артыкул крымінальнага кодэксу, між іншым), трэ было недзе працаваць.

Першым на пасаду мастака-афарміцеля ў аўтобусны парк уладкаваўся Алезіс. Праз год ён перацягнуў туды й Лявона. Службовыя абавязкі акрэсьліваліся проста — маляваць графікі сацыялістычных спаборніцтваў, плякаты «Слава КПСС» і табліцы нарматываў. Праца лёгкая, ніхто да цябе не чапляецца, асабліва калі ўмееш маляваць трохі лепш, чым Астап Бэндэр. А калі яшчэ дазволілі і рэпэтаваць на тэрыторыі парку, то ўвогуле тое можна было лічыць раем.

Толькі аднойчы хлопцаў выклікалі на «прафіляктычную» гутарку да намесьніка дырэктара па кадрах — калі пачулі, што між сабой яны размаўляюць па-беларуску.

Намесьнік дырэктара сустрэў іх трывожным позіркам:

— Что это, ребята, вы по-белорусски разговариваете? Не кажется ли вам, что тут каким-то национализмом попахивает?

Лявон з Алезісам зрабілі зьдзіўленыя вочы:

— Не, не падаецца.

— Но у нас же в парке работают люди разных национальностей. Не считаете ли вы, что нужно все-таки говорить по-русски?

— Ну, мы ж усё ж такі ў Беларусі жывём, — зноў не саступілі хлопцы.

Намесьнік дырэктара, бачна па ўсім, ня быў вялікім аратарам і не чытаў падручнікаў па «чорнае рыторыцы». Скарыстаўшы за хвіліну ўсе аргу-

мэнты, ён на ўсялякі выпадак яшчэ раз ці то запытаў, ці то падвёў вынік гутаркі:

— Так, значит, будем считать, что национализмом тут не пахнет?

— Не пахнет! — канчаткова ўпэўнілі яго мройчукі і спакойна сабе пайшлі.

А хутка ўсё кіраўніцтва аўтапарку і ўвогуле паціскала хлопцам рукі. Бо Мроя падтрымала гонар працоўнага калектыву, амаль не перамогшы на конкурсе самадзейнасьці аўтобусных паркаў гораду Менску.

Алезіс: *«Калі наладзілі конкурс, кіраўніцтва парку нават не вагалася, хто будзе ўдзельнічаць. «Ну ў нас жа ёсьць нашыя рабяты», — сказаў нехта з адміністрацыі, і мы паехалі. Згралі мы тады тры мроеўскія песьні, і ў параўнаньні з саматужнымі музыкамі іншых аўтапаркаў гэта было супер. Праўда, занялі толькі ганаровае другое месца. Першымі стаць было немагчыма. Бо хто яго зойме, было вядома загадзя — дырэктар якога парку больш перспектыўны, той ансамбаль і лічыўся фаварытам. А ў нас была цякучка кадраў, і па выкананьні пляну мы былі ня першыя».*

Пераможцы конкурсу выконвалі песьні Антонава. З прычыны другога месца моцна не сумавалі. Тым болей, што ў наступным годзе да Мроі прыйшла сапраўдная, хоць збольшага і скандальная, папулярнасьць.

## Разьдзел 5

## 1988. СКАНДАЛЫ Й ПЕРАМОГІ

*«У апошні час зьявіліся ўсялякія групы і сьпевакі з д'яблавай музыкай і хрыпамі. Пасьля яе ў моладзі рукі чэшуцца. Хочацца біць, ламаць, гвалціць і разбураць. У дні нашай маладосьці нашым ідэалам быў Паўка Карчагін. А ці ведае хто з гэтых касматых пра яго, як расцэньвае яго ўчынкі?»* (Ліст у газэту «Беларускае тэлебачанне і радыё» ад «14 пажылых кабет з Магілёву», 14.11.88 г.)

### «Зярняткі духоўнасьці». Гіт-парад «Беларускай маладзёжнай»

1988-мы быў для Мроі годам фурору. Сакавік — прыз глядацкіх сымпатыяў на другім фэсьце «Рок-крок» у Гародні, сэрыя акустычных канцэртаў па менскіх НДІ, канцэрты ў Львове, запіс альбому «Студыя БМ». І напрыканцы году — два грандыёзныя скандалы, якія мусілі паставіць на Мроі крыж, але мелі адваротны вынік. Аднак спачатку пра падзею, якая так ці інакш паўплывала на ўсе наступныя. Да папулярызацыі беларускага року далучылася радыё, а дакладней — рэдакцыя «Беларуская маладзёжная».

Гіт-парад у «Чырвонай змене», пра які я ўзгадваў раней, меў адзін вялікі недахоп — ён выходзіў неперыядычна, раз на тры-чатыры месяцы. «Беларуская маладзёжная» адразу пайшла іншым шляхам. У неабходнасьці менавіта штотыднёвае музычнае праграмы кіраўніцу «БМ» Жанну Літвіну ўпэўніў Віталь

Сямашка. Першы выпуск выйшаў у эфір у сярэдзіне 1988 г. Моцнай перашкодай на гэтым шляху быў галоўны рэдактар музычных праграмаў Беларускага тэлебачаньня і радыё Бахціяр Бахціяраў.

Віталь Сямашка: *«Гэта быў чалавек з абсалютна д'яблавай інтуіцыяй. Ён «трымаў» усю беларускую музыку, вызначаў, хто будзе гучаць у эфіры, а хто не, каму станавіцца «зоркай», а хто пра гэта можа забыць назаўжды. І ён адчуў, што ідзе новая плынь, якая адваёўвае ў яго патэнцыйны кусок прасторы. Калі я высунуў ідэю гіт-параду, мы сустрэліся, паглядзелі адзін адному ў вочы, і ўсё зразумелі. Ад яго ня варта было чакаць дапамогі. І галоўнай стала пазыцыя Генадзя Бураўкіна — кіраўніка тэлерадыёкампаніі».*

Канцэпцыя праграмы была простая. Кожны тыдзень у эфіры «БМ» гучала сем песень беларускіх гуртоў. Каб прагаласаваць за найбольш адметную, слухачы мусілі напісаць у рэдакцыю ліст (тэст на ўзрост: вас зьдзіўляе, чаму яны не скарыстоўвалі Інтэрнэт?). Кожныя тры месяцы «тыднёвыя» пераможцы сыходзіліся ў міні-фінале. Адпаведна, пераможцы міні-фіналаў напрыканцы году ўдзельнічалі ў фінальнае праграме, якая вызначала лепшую песьню году.

У першым выпуску «Гіт-параду» сярод сямі песень прагучала й мроеўская «Ён яшчэ вернецца». На працягу тыдня радыё атрымала каля 3000 лістоў. Гэта быў рэкорд за ўсе часы існаваньня беларускага радыё. І гэта нягледзячы на тое, што праграма выходзіла даволі позна — у 23.05.

Гэтыя ж лісты дапамаглі ў генэральнай бітве за месца ў эфіры. У кабінэце Генадзя Бураўкіна сабралася калегія Белтэлерадыёкампаніі. Першым слова ўзяў Бахціяр Бахціяраў:

— Гіт-парад — гэта цудоўная ідэя маладзёжнай рэдакцыі, — пачаў ён (ня мог жа сказаць інакш пасьля такой колькасьці ліставаньняў). — Але паглядзім і падумаем, ці тым густам яны патураюць, ці тых «зорак» ствараюць?

Гэта сказаў чалавек, які напярэдадні арганізоўваў канцэрты Барыса Маісеева ў Менску. Пазыцыя «Беларускай маладзёжнай» была вядомая. І цяпер усё залежала ад Генадзя Бураўкіна.

— Найперш, — нетаропка пачаў ён, — я хачу падзякаваць журналістам маладзёжнае рэдакцыі. Яны праявілі добрую ініцыятыву, зрабілі праграму, якая спадабалася слухачам...

Пяць сэкундаў маўчаньня.

— ...і ў той жа час правы і Бахціяр Бахціяраў, бо радыё мусіць клапаціцца аб густах слухачоў...

Яшчэ пяць сэкундаў... Шалі маглі хіснуцца ў любы бок. Усе чакалі. І старшыня БТ вывеў рэзюмэ:

— Давайце пачакаем, паглядзім, як аўдыторыя будзе рэагаваць на наступныя перадачы. І давайце шукаць ува ўсім гэтым зярняткі духоўнасьці.

Бахціяраў прайграў «зярняткам духоўнасьці». Праграма атрымала шанец і напоўніцу яго скарыстала. «Ён яшчэ вернецца» ў гіт-парадзе перамог безальтэрнатыўна. За песьню Мроі прагаласавала амаль паўтары тысячы чалавек. Усе астатнія песьні разам набралі ня болей за 200. І надалей гіт-парад быў самым актыўным прапагандыстам беларускага року. У краіне, дзе ўвесь эфір акупавалі ласкавыя маі ды пугачовы са склярамі, сем беларускамоўных песень запар былі як ін'екцыя лекаў наўпрост у вену цяжкахвораму. А хутка «Беларуская маладзёжная» пачала ладзіць і ўласныя канцэрты пераможцаў гіт-параду. Лісты сыпаліся на беларускае радыё. Хаця той жа Мроі даставаліся ня толькі пернікі...

*«Здравствуй, Виталя! Мы побывали на твоём концерте, сидели на 1-м ряду 19 числа, может помнишь нас?! Концерт был очень клёвый! Особенно нам понравились Отражение и Мясцовы Час. До концерта мы уважали белорусский рок, но не слушали, но после концерта поняли, что и в Беларуси есть клёвые ребята, которые играют классный рок...*

*Наташа, Таня и наша команда»*. (Ліст у рэдак-

цыю «Беларускай маладзёжнай». З уласнага архіву Віталя Сямашкі.)

*«В прошлой вашей передаче хит-парада выступала группа Мроя. Но как можно её слушать, если нельзя разобрать ни одного слова? И в каком стиле они работают? Нечего слушать! Я бы с их концерта ушла, если бы вообще пошла после прослушивания вашей передачи. Учились бы они лучше у таких групп, как Кино, НП, Круиз, Алиса...*

*Худякова Екатерина, г. Бобруйск, 15 лет».* (Ліст у рэдакцыю «Беларускай маладзёжнай». З уласнага архіву Віталя Сямашкі.)

Між тым, праіснаваўшы некалькі месяцаў, гітпарад амаль не спыніў сваё існаваньне. І Мроя перажыла адзін з самых гучных скандалаў у жыцьці. Надыходзілі іншыя часы. Партыя разумела, што губляе кантроль над сытуацыяй нават у такой лагоднай рэспубліцы, як Беларусь. І Мроя магла стаць ахвярай лёсавызначальнага паходу савецкай улады супраць беларускіх нацыяналістаў.

## Пена на хвалях перабудовы

Нацыянальны рух уздымаў галаву. Летам 1988 г. адбываюцца мітынгі і жалобныя шэсьці ў Курапатах. 19 кастрычніка ўтвараецца Аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту. 30 кастрычніка міліцыя з ужываньнем гумовых дубінак і газу «черомха» разганяе жалобнае шэсьце да Курапатаў, прысьвечанае Дзядам. Сяргей Навумчык потым напіша, што «ля ўсходніх могілкаў дэмакратам упершыню давялося прайсьці выпрабаваньне жорсткасьцю і цынізмам уладаў». А напярэдадні і для Мроі пачалося выпрабаваньне савецкай прапагандай.

Першым стрэлам стаў артыкул «Эволюция политического невежества» ў газэце «Знамя юности» ад 23 кастрычніка. Пакуль гэта быў удар толькі па «палітычным крыле» нацыяналістаў — «Талацэ».

Публічна дэкляруючы сваімі мэтамі «...*вывучэньне і прапаганду ленінскіх ідэяў захаваньня гістарычна-культурнай спадчыны савецкага народу, заканадаўства аб ахове помнікаў*...» (статут арганізацыі), талакоўцы актыўна прапагандавалі незалежніцкія ідэі. Артыкул, што падпісалі пяць ветэранаў-акадэмікаў, мусіў раскрыць грамадству вочы на гэтых ваўкоў у авечых скурах:

*«На заседаниях клуба стали читаться всякого рода доклады, рефераты, демонстрировать специально подобранные и тенденциозно смонтированные слайд-фильмы, фотомонтажи, стенгазеты и т. д., создающие у присутствующих превратное мнение о деятельности местных Советов по охране памятников истории...*

*...Находясь в плену своих собственных иллюзий, отдельные члены «Талакі» не обращают внимания даже на то, что происходит вокруг. Их не интересует ни новое мышление, ни широкая, многоцветная палитра новых политических и мировоззренческих реалий. Вместо этого они призывают себе на помощь духов давно осужденного историей и всем белорусским народом буржуазного национализма, привнесли в свои «звароты» и «ратушы» давно обветшавший идеологический хлам...*

*В этой связи попробуем дать морально-политическую характеристику некоторым из таких «детей своего времени» — «завадатараў» «Талакі». Достаточно полное представление мы имеем об одном из них — Валентине (или Винцусе, как он теперь себя называет) Вечерке — преподавателе белорусского языка Минского педагогического института им. А. М. Горького. ...Будучи студентом, он верховодил в так называемой «Майстроўні». Уже тогда сквозь политическую незрелость и юношеский максимализм просматривалась мания величия этого молодого человека.*

*...Прикрываясь заботой о национальных ценностях, он хочет добиться только личной изве-*

*стности, прославить себя. Порой создается впечатление, что в силу своего болезненного воображения он представляет себя неким лидером национального возрождения. Именно это толкает его на действия, объективно призванные подмять под себя многие самодеятельные коллективы. Пока Вечерка ведет кампанию за возрождение националистической символики. А дальше?»*. («Знамя юности», 23 кастрычніка 1988 г.)

27 кастрычніка наносіцца другі, мацнейшы ўдар. «Вячэрні Мінск» друкуе артыкул «Пена на волне перестройки» за подпісам карэспандэнтаў БелТА В. Левіна й Б. Тарасевіча. Зразумела, гэта былі псэўданімы. Імёны іх пазьней сталі вядомыя. Адзін з аўтараў зараз, кажуць, жыве ў Амэрыцы. Другі хутка стаў вядомым журналістам і ёсьць неблагім чалавекам (паверце майму дзесяцігадоваму зь ім знаёмству, не абцяжаранаму веданьнем ягонага ўдзелу ў гэтае гісторыі). Аднак па маладосьці напісалі яны звычайны пасквіль. Галоўнай мішэньню зноў становяцца нефармалы ад палітыкі, але дасталося й музыкам.

У той час грамадскае жыцьцё вiравала. Моднымі былі дыскусійныя клюбы, дзе выпрацоўваліся розныя «наказы» народным дэпутатам. Ініцыятарамі такіх дыспутаў выступалі нефармалы, і каб папсаваць ім карціну, КДБ накіроўваў на такія сходы актывістаў, якія мусілі даносіць да гнілое інтэлігенцыі «голас народу». Голас, зразумела, усяляк падтрымліваў партыю. Менавіта пра такі дыспут і будзе расповед, калі вы дойдзеце да словаў «вторая встреча». Такім чынам, «Левін» і «Тарасевіч» пісалі:

«...*Так уж совпало, что в один день нам довелось побывать на двух молодежных мероприятиях. Утром в ЦК ЛКСМБ собрались на совет ребята, которые работают в промышленности, сельском хозяйстве, бытовом обслуживании. Разговор шел о том новом, что вошло в жизнь, что наболело, что плохо решается или*

*не решается вообще. За каждым словом звучала забота о деле, о том, как решить продовольственную проблему, дать на прилавки больше товаров и продуктов, расширить сферу услуг, и о том, что мешает двигать дело, сдерживает инициативу молодежи.*

*Сколько заботы и тревоги было в каждом выступлении! Эти люди не привыкли к трибуне, не умеют говорить так же хорошо, как умеют работать.*

*Самый молодой в нашей республике Герой Социалистического Труда Константин Хлебцов удостоен этого звания в нынешнем году. По семь тысяч литров молока надаивает его молодежное звено от каждой коровы.*

*Зинаида Ляхова организовала семейную подрядную ферму, вдвое увеличила надои молока. За год молодая доярка добилась наивысших результатов в труде. Теперь у нее вместо 75 коров 130.*

*Александр Лукашенко возглавил самое убыточное в Могилевской области хозяйство. И оно практически за год благодаря внедрению новых хозрасчетных отношений получило миллионную прибыль. Молодого директора пригласили на совещание в ЦК КПСС. С ним беседовал по этим проблемам Михаил Сергеевич Горбачев.*

*Мы могли бы назвать сотни молодых людей, которые сегодня не просто говорят о перестройке, а творят ее созидательным трудом, научно-техническим поиском. Но есть люди, которые на волне перестройки не строят, не пашут, а лукаво мудрствуют, лицемерят, мельтешат, взбивают пену, выброшенную прибоем обновления.*

*...Вторая встреча состоялась в ту же субботу, 22 октября, в Доме политического просвещения г. Минска. Проводил свое заседание политический клуб «Современник». Тема, вынесенная на обсуждение: «Свобода личности, выбор и выборы».*

*Что говорить, вопрос актуальный, тем более в этот день был опубликован проект Закона «Об изменениях и дополнениях Конституции (Основного Закона) СССР».*

*На встречу, организованную «Современником», пришли и активисты «Талаки». Председатель клуба Л. Кривицкий объявил, что в предстоящей дискуссии будут выработаны предложения, которые «неформалы» вручат депутатам Верховного Совета республики, как наказ на предстоящую сессию. Но вместо делового обсуждения вопроса председатель «Современника» и его помощник А. Галькевич начали разговор с откровенной провокации, заявив о том, что в республике создан некий «Оргкомитет народного фронта», который, дескать, объединит всех неформалов.*

*Из зала последовал закономерный вопрос:*

*— Против кого разворачивается «народный фронт»? Представляет ли он народ?*

*В ответ на резонное замечание руководитель «Современника» стукнул кулаком по столу, заявив:*

*— Здесь много специально подсаженных людей. Прошу их покинуть зал...*

... [в ответ на выступление лидеров «Талаки»] *Заместитель директора по учебно-воспитательной работе ГПТУ номер 72 В. Штефский сказал:*

*— Вот здесь выступал от имени неформалов Леонид Зубарев. Он теперь называет себя литератором (кстати, многие лидеры неформальных групп называют себя литераторами, социологами, — звучит!* (Авт.). *Кто же этот, с позволения сказать, «литератор»? Хорошо знаем его, работал в профтехучилище... В свое время о нем был фельетон в газете «Вечерний Минск» под красноречивым названием «Шабашник от музыки». Он промышлял игрой на свадьбах, был замешан в валютных операциях. Теперь*

*Зубарев стремится стать первой скрипкой у «неформалов».*

*Недавно в нашем училище были гости — выступали ансамбли «Мроя», «Рэй» и никому не известная группа «Мясцовы час» из Гродно. Там же крутились парни из «Талаки». Когда подростки одурели от душераздирающего грохота, появился на сцене молодой человек и стал размахивать бело-красно-белым флагом — символом белорусских буржуазных националистов. А солисты скандировали: «Вайна — паляванне», «Вы за калючым дротам!», и так повторялось многократно. После так называемого «концерта» из-за кулис педагоги училища ведрами выносили пустые бутылки из-под водки. Так внушается молодым дух экстремизма, так пропагандируются националистические идеи, так внедряется чуждая нашему обществу символика. (Про флаг они потом, как всегда, лицемерно говорили, что это спортивный атрибут, совсем безобидная штучка, пустячок.)*

*Вроде бы невзначай, безобидно, но нагло и воинственно. А что за этим стоит? Стоит задуматься. Мы считаем, что подлинной демократии учатся не на таких «концертах», который устроили «неформалы» в строительном ПТУ. Они на всех перекрестках кричат о свободах, а сами навязывают молодым свои заблуждения. При этом вырывают микрофоны из рук и кричат, что их зажимают».*

Крыху пазьней у тым жа «Вячэрнім Мінску» ўжо за подпісам «Рэдакцыя камуністычнага выхавання моладзі БелТА» зьяўляецца артыкул «Нялёгкія ўрокі», дзе тэма канцэрту ўздымаецца зноў:

*«У вучылішчы супрацоўнікі рэдакцыі размаўлялі з будучымі будаўнікамі з групы 64 Сяргеем Бязуглавым, Сяргеем Букшанскім, Сяргеем Здолькіным, Юрыем Гарбачонкам, Мікалаем Луковічам і Ігарам Коранем. Вось што яны расказалі: «Білеты на канцэрт каштавалі паўтара*

*рубля. Мы купілі іх за 50 капеек, а астатнюю суму, якую запатрабавала «Мроя», даплаціла вучылішча. Мы ішлі іменна на канцэрт «Мроі», як было аб'яўлена. Але на сцэну выйшаў нейкі чалавек і сказаў, што «Вам вельмі пашанцавала, бо зараз тут выступіць адзін з лідараў, рок-група «Мясцовы час». Нам цяжка меркаваць — цвярозымі або п'янымі былі музыканты, таму што іх твары хаваліся за яркім грымам і густымі прычоскамі. Але можам засведчыць, што рэплікі «Вы — за калючым дротам!», «Вайна — паляванне!» і «Зондэркаманда — гэта пазыцыя!» выкрыкваліся музыкантамі розных груп настойліва, па некалькі разоў...»*

Нават прымаючы ў разьлік пэўны лібералізм перабудовачных часоў, такі артабстрэл мог мець наступствы. Мроя да таго часу выступала без літаваньня тэкстаў, гіт-парад «Беларускай маладзёжнай» трымаўся толькі на добрым стаўленьні спадара Бураўкіна. Але зараз у даўняга ворага праграмы Бахціяра Бахціярава зьявіўся добры аргумэнт: глядзіце, — мог сказаць ён, — як можна трымаць у эфіры праграму, якая стала рупарам нацыяналістычных гуртоў?!

Варта было нешта рабіць. Тым болей, што рэчаіснасьць крыху адрозьнівалася ад газэтных артыкулаў. У ПТВ № 72 і сапраўды ладзіўся міні-фэстываль. Мроя, якая мусіла граць канцэрт, запрасіла паўдзельнічаць Рэй ды Мясцовы Час.

Лявон: *«Выносілі бутэлькі ці не? Напэўна, выносілі. Але ж ня вёдрамі. З Рэем прыйшло некалькі знаёмых, ну і яны трохі выпілі. А мы ў той час ня тое што перад канцэртам, мы ўвогуле мала пілі. У дзень канцэрту асабліва. Бо для нас, юнакоў-максымалістаў, сцэна — гэта было сьвятое. І хлопцы зь Мясцовага Часу таксама перад канцэртам не пілі».*

Ратаваць сытуацыю кідаецца Віталь Сямашка. Праз некалькі дзён мусіць быць чарговы эфір гітпараду, і адзіны шанец застацца ў эфіры — пад-

рыхтаваць абгрунтаванае абвяржэньне. Віталь сядае ў машыну і едзе ў тое самае ПТВ. Намесьніка дырэктара Штэфскага знайсьці было няцяжка. Той, шэрая мышка, ня можа пераказаць газэтны маналёг, нешта мямліць, выкручваецца і пад запіс абвяргае амаль усе свае словы, што пададзеныя ў газэце. І вёдзер з пляшкамі гарэлкі ён ня бачыў, і словы песень дакладна не разабраў. Запісаў Віталь і прыбіральшчыцу, якая таксама ніякія бутэлькі не выносіла. А галоўнае, высьветлілася, што аўтараў артыкулу на канцэрце не было. Скляпаныя разам, гэтыя факты ратавалі сытуацыю. Трэ было толькі выпусьціць рэпартаж у эфір — увайсьці у дыскусію з партыяй.

Віталь Сямашка: *«У той час шэфам радыё быў Баляслаў Сушкевіч — былы дзетдомавец. Ёлупень поўны, але час ад часу яго «прабівала» і ён станавіўся чалавекам. У тым выпадку нешта ў яго ўнутры зварухнулася, ён адчуў, што людзей папросту забіваюць, і калі я прыйшоў да яго з праграмай, ён, амаль ня думаючы, сказаў: «Стаўце ў эфір». А па тых часах, калі нешта прагучала ў эфіры дзяржрадыё, то гэта рабіла магічную справу. БелТА і надалей пісала нейкія артыкулы, апраўдвалася, але хваля захлынулася.*

*Хаця, калі б намесьнік дырэктара ПТВ пацьвердзіў тое, што надрукаваў «Вячэрні Мінск», і мяне з радыё выкінулі б, і гіт-парад зачынілі б».*

*Лявон: «Калі б скандал быў на 10 год раней, гэта б нас зьнішчожыла. А так ён толькі трывала замацаваў нас на п'едэстале зорак. Нам гэта класны піяр стварыла... Там былі цытаты з песень, праўда, перахлушаныя. І на нас пачалі хадзіць некаторыя як на экстрэмістаў, каб паглядзець, што гэта такое. Ну і мы падтрымлівалі імідж».*

Канчаткова Мроя супакоілася пасьля адной з «палітінфармацыяў» у трэцім аўтобусным парку.

Алезіс: *«У нас на працы адзін дзень на тыдзень пачынаўся раней на 15 ці 20 хвілінаў, і была*

*палітінфармацыя. Нехта чытаў даклад — што адбываецца ў сьвеце і ў краіне і як на гэта мусіць рэагаваць сапраўдны савецкі грамадзянін. Час ад часу палітінфарматарам прыходзіла разнарадка — абавязкова сказаць ці пра галадоўку Чарльза Хайдэра, ці пра які нікарагуанскі рэвалюцыйны рух.*

*Аднаго разу мы сядзім зь Лявонам (якраз пасьля зьяўленьня «Пены...») і чуем, як дакладчык гаворыць — маўляў, сярод нашага грамадства існуе такая адыёзна-нацыяналістычная плыня, якія не паважаюць савецкі строй; яны бачаць сваімі сымбалямі нацыянал-буржуазных падонкаў; і ёсьць сярод музычных калектываў такія, што падтрымліваюць тых нацыяналістаў-прафашыстаў — такія, як ансамбаль Мроя.*

*Пачуўшы тое, да нас паварочваюцца двое кіроўцаў аўтобусаў і пытаюцца:*

*— Хлопцы, дык гэта ж вы, здаецца, Мроя?*

*— Так, — адказваем.*

*— Ага, — рэагуюць яны і адварочваюцца. І болей ніхто нічога не сказаў».*

Гэта было паразай савецкае ўлады: «соль зямлі» — пралетарыят, ведаючы, што сярод іх сядзяць «нацыяналістычныя недабіткі», толькі і гаварылі, што «ага», і спакойна жылі-пілі далей. Лёс супрацьстаяньня станавіўся зразумелым. Праўда, высьветлілася, што камуністы — не адзіныя ворагі Мроі. Хапала іх і сярод калег-музыкантаў.

### Змова ў Наваполацку

Застаўшыся пры працы, Віталь Сямашка разам зь Юрыем Цыбіным прыдумалі, як канчаткова зьвесьці на «не» наступствы скандалу і надаць Мроі хаця б нейкае адценьне афіцыйнасьці. Яны прабілі для каманды запрашэньне на другі агульнабеларускі рок-фэстываль «Наваполацк-88», які ладзіла Міністэрства культуры. Там была процьма ансамбляў з розных куткоў Беларусі. Ніхто і паду-

мацьня мог, што «Наваполацк-88» стане полем бою паміж дзьвюма галоўнымі музычнымі ды ідэалягічнымі плынямі беларускае музыкі.

Хаця не — плыняў было хутчэй тры. Найперш гэта былі людзі, якія гралі па кабаках і адначасова спрабавалі нешта зрабіць на сцэне. Фэстываль для іх быў магчымасьцю прарвацца да «кармушкі» — атрымаць статус дзяржаўнага калектыву, сядзець на ганарарах ад канцэртаў па калгасах. Музыка іх была дзіўнай мешаньню з розных стыляў — ад савецкае папсы да клясычнага року (карацей — усяго таго, што яны гралі па рэстарацыях).

Другой групоўкай былі расейскамоўныя мэталічныя гурты. Амаль усе яны гралі амэрыканскія і брытанскія стандарты, асноўную ўвагу зьвяртаючы на тэхніку граньня. «Ну ты й зграў! Амаль Ван Хален!!!» — такой фразай можна было пацешыць самалюбства кожнага з іх. Пачыналі яны як усе — «здымаючы адзін да аднога» Кузьміна і AC/DC. Толькі паставілі на сабе крыж, калі не змаглі перайсьці на іншую ступень. Бо, нават пачаўшы пісаць сваю музыку, засталіся тымі ж мэханічнымі «здымальнікамі», а ня творцамі.

Лявон: *«Усе яны гралі абсалютна стандартную музыку без уяўленьня пра тэксты. Для нас гэта было сьмешна. А для іх мы былі сьмешныя як музыкі. Бо яны думалі пра тэхніку, а мы на іх погляд гралі слаба. Пра ленінградскую плыню таго часу яны пагардліва казалі «текстовики». Хаця пра гэтыя брыгады зараз ніхто і ня памятае.Дзе той Акцэнт, дзе Квінто, што з нас пасьмейваліся?»*

Трэцяй плыняй быў беларускамоўны рок. Пакрысе ён выходзіў на дамінуючыя пазыцыі. Акрамя Менску існавала й другая сталіца беларускага року — Наваполацк. Пошук, Рокаш, Кадэцкі Корпус і, канешне, Мясцовы Час. Цікава, што большасьць зь іх пачынала з расейскамоўных песень, але паступова праз знаёмства з беларускімі «нефармаламі» падпадала пад іх уплыў. А Мясцовы

Час засьпяваў па-беларуску ў тым ліку і пад уплывам Мроі.

Уладзя: *«Калі я першы раз пачуў Мясцовы Час, яны мне вельмі спадабаліся. У іх быў вельмі шыкоўны вакаліст Алесь Кузьмін. Ён электрызаваў, гіпназаваў людзей сваім голасам, паводзінамі на сцэне — ён рабіў рух і заля адразу паўтарала яго. І мы вырашылі, што такі чалавек павінен быць нашым. Пасьля была размова. Я, памятаю, казаў Алесю нешта кшталту: «Ды Вы са сваім талентам займаецеся чорт ведае чым. Гэта грэх. Вы павінны сьпяваць па-беларуску». Мо таму што ў нас у той час быў ужо невялікі аўтарытэт у музычных колах, ці з-за таго, што яны самі дайшлі да гэтае думкі, але месяцы праз тры пасьля тае размовы зрабілі беларускамоўную праграму. І што важна — усе містычныя рэчы з уплывам Алеся на публіку ня зьніклі».*

Вось такая была дыспазыцыя. Што атрымалася? Кожны бачыць па-рознаму. Вось, да прыкладу, думка нэйтральнага відавочцы. Нэйтральнага, але вельмі крытычнага.

Адам Глобус. «УДАР МІМА. Суб'ектыўныя нататкі пра II Рэспубліканскі фестываль савецкай маладзёжнай песні ў горадзе Наваполацку». (Часопіс «Беларусь», 1988 г.)

*«Уяві на сцэне «Рынг», рок-групу зь Пінска. Ня можаш? Дапамагу. Гітары, барабаны, анілінавыя лямпачкі міргаюць... Уявіў? Не? Тады прыдумай любую рок-групу і зрабі яе падобнай да рынга. Клубы дыму і рытм, толькі саліста прыдумваць не трэба, яго няма ў рок-групе «Рынг», пакуль што не знайшлі яго. Шукаюць лепшага сярод лепшых, а яго няма ў Пінску. Няма дык няма. Што рабіць? Глядзець на сцэну, а там ужо вакальная група «Джэм» з Брэста.*

*У Брэсце з салістамі значна лепш. Можна, як бачыш, цэлую вакальную групу стварыць. «Джэм» спявае ў стылі «кантры» па-руску, па-беларуску і нават па-англійску. Спявае пра тое, што іхняе*

*сэрца ў гарах, але відавочна, што сэрцы спевакоў на наваполацкай сцэне, а не ў гарах. У нейкі момант «Джэм» нагадвае «Песняроў», гэта песні на вершы Роберта Бёрнса ды Сяргея Грахоўскага дапамагаюць нагадаць знакаміты ансамбль. Чуеш апладысменты? І гэта радуе?*

*«Джэм» толькі паспявае схавацца за кулісамі, а на сцэне ўжо настройваюць свае гітары Павел Харэвіч і рок-група «Трохкутнік». Паўлу ні Бёрнс, ні Грахоўскі не патрэбныя: тэксты і музыку ён піша сам. Чуеш песню — «Зямля — шэдэўр сусвету»? Не ведаю, ці падабаецца яна табе, а мяне яна проста ашаламлівае, саліст паўтарае і паўтарае пошлы і бяздарны радок — «Зямля — шэдэўр сусвету». Наступнай песняй Харэвіч трохі выпраўляе становішча. Зала прымае прыпеў, толькі, на маю думку, той прыпеў не шэдэўр, у адрозненьне ад Зямлі. Але ж на бязрыб'і і рак — рыба: «Мая сям'я: жонка, і сын, і музыка — я не адзін». Гэты тэкст апыніцца сярод лепшых на фестывалі. Уяві, калі здатны, горшыя. Пра класічную паэзію на наваполацкай сцэне мы яшчэ пагаворым з табою.*

*І вось ты (той, хто любіць «метал», я да цябе звяртаюся) дачакаўся. На сцэне рок-група «Удар»! Можаш крычаць. Ура! Калі ёсць «Рынг», павінен быць і ўдар. Яшчэ на пачатку канцэрта рок-група «Удар» зрабіла заяву, што сыграе лепш за лаўрэатаў леташняга фестывалю — мазырскую групу «Адбітак». ...Абяцаць «Удар» абяцаў, а перамагчы «Адбітак», як бачыш, не здолеў. Чаму? А таму, што дзве з трох гітар у першай кампазіцыі не гучалі. Прычыны будуць бурна высвятляцца, але так і не высветляцца. «Металістаў» у зале мала, толькі мы з табою, і няма каму падтрымаць саліста з «Удару», няма каму адгукнуцца на ягоны забойны заклік. А ён крычыць і крычыць, што «наша жыццё — мір!», а зала маўчыць, як маўчыць чалавек, калі бачыць блага выкананы правільны плакат.*

*Плакат патрабуе высокага майстэрства. А няма майстэрства — і бачыш ты пакарабачаны дыктавы планшэт з вялікарукімі і дробнагаловымі постацямі, а пад імі складзеныя з крывых літар патрэбныя словы, і табе робіцца непамысна і не можаш ты сказаць, што трэба зняць са сцяны, а ў дадзеным выпадку са сцэны, махровую халтуру. Не ведаю, як табе, а мне дык шкада хлопцаў з рок-групы «Удар». Яны пакідаюць сцэну ў поўнай цішыні. Чаму маўчыць зала? Хто памыліўся? Няўжо ўся справа толькі ў апаратуры, якая сапсавала першую кампазіцыю? Думаю, што не. Не ў ёй справа.*

*...Я не расказаў у сваіх занатоўках пра 28 калектываў-удзельнікаў і хацеў папрасіць прабачэння, а потым думаю: не буду. Выдавалі музыканты ў залу свае 100 дэцыбелаў, а рок-група «Дзвіна» з Віцебска выкарыстала апаратуру ансамбля «Верасы» як толькі змагла. Апаратуры ў зале было на 500 тысяч, і міліцыянер пры ёй быў. У мяне пасля выступлення гэтай «Дзвіны» тры гадзіны ў вушах звінела. А ў гэтым звоне плавалі крыкі: «Прэч са сцэны!» Уяві, як трэба сыграць, каб табе крыкнулі: «Прэч!» Так што ніякіх прабачэнняў...».*

Дзівіцеся, што на такога ўзроўню фэстывалі мог усчыніцца скандал? Але між тым так і здарылася. Бо хто з музыкаў падзяляў думку Адама на ўласную творчасьць? Ды ніхто. А найлепшае думкі пра сябе былі, канешне, расейскамоўныя «мэталюгі». Гурты кшталту Мроі ці Мясцовага Часу яны ўсур'ёз не ўспрымалі. Тэхнары-інструмэнталісты і падумаць не маглі, што ім могуць стварыць нейкую канкурэнцыю. Аднак прайшоў конкурс фэстывалю, падвялі вынікі. І высьветлілася, што Мроя атрымлівае прыз як лепшы рок-гурт. Гэта быў яшчэ не скандал. Канчаткова ён узьнік пасьля гала-канцэрту. Што і казаць — на ім Лявон і кампанія ў адрозьненьне ад першага дня фэстывалю згралі пагана. На тое былі свае прычыны. Найперш узьнікла праблема ў Лявона.

Лявон: *«У мяне не было клявішаў, і я падыйшоў да Пашы з гурта Акцэнт. Ён быў чалавек някепскі. Акрамя таго меў Ямаху DX7. Пазычыў без праблемаў. Я ўзяў апарат у грымёрку тэмбры паглядзець, уставіў у разетку — і клявішы пагарэлі, бо я падключыў не праз выпроствальнік. І што рабіць — прыйшлося кінуцца да Несцяровіча з Сузор'я. Ён таксама без пытаньняў пазычыў клявішы, але яны былі другія. І на невядомым апараце я недакладна запісаў і набраў тэмбры. Акрамя таго, увесь гала-канцэрт я думаў ня столькі пра музыку, колькі пра тое, што спаліў чужыя клявішы і прыйдзецца за гэта плаціць, а грошай няма. Усе гэтыя нэрвы іншым перадаліся, і згралі мы мярзотна»*.

Уладзя: *«На такіх фэстах шмат што залежыць ад гукарэжысэра. Калі ён добрага гуку ня хоча, ён можа заваліць любую праграму. Першы канцэрт прайшоў выдатна проста таму, што мы гукарэжысэру сказалі — выставіш гук пагана, мала не падасца. Але ўжо калі быў другі канцэрт, калі пачалася валтузьня вакол гран-пры, пагроза не падзейнічала і гук выставілі жудасны. Вынік быў адпаведны»*.

Правальныя гала-канцэрты ўвогуле былі кармай Мроі. Ужо праз два гады гурт перамог на менскім фэсце «Тры колеры». Узялі неверагодную колькасьць прызоў — лепшы клявішнік, гран-пры, лепшыя тэксты, атрымалі ў падарунак нейкія вазы, усялякія дробязі. На гала-канцэрце трэ было граць з усялякімі мэтрамі кшталту ДДТ. А дзе гітарыст? Вені (які тады ўжо замяніў Уладзю) не было. Ён перад канцэртам паехаў на сустрэчу аднаклясьнікаў. Вярнуўся абсалютна неадэкватным. Больш таго — з сабой ён меў шклянку, а ў ёй нешта кшталту гарбаты з гарэлкай. Сёрбаючы з тае флягі і са словамі: «Усё нармальна, нармальна», — Веня выйшаў на сцэну. Лішне казаць, што канцэрт па адчуваньнях наблізіўся да вялікапомнага правалу ў Доме літаратара.

Між тым мярзотнае граньне Мроі на гала-канцэрце ў Наваполацку дало падставу ўсялякім квінтам ды акцэнтам пачаць разборкі. «Мроя перамагла, а нам што цяпер — назад у кабак вяртацца?» — істэрычны гэты крык кагосьці з прайграўшых на агульнае вячэры ў рэстарацыі шмат што тлумачыў.

Істэрыку падтрымалі іншыя галасы: «Каму вы аддалі гран-пры? — вішчалі «інструмэнталісты». — Давайце разьбірацца. У нас галоснасьць!!!».

Прыбярыце са свайго твару скептычную ўсьмешку. Слова «галоснасьць» вымаўлялася тады без усялякае іроніі, успрымалася як сьвятая каштоўнасьць. Галоснасьць мусіла аднавіць «папраную справядлівасьць». Падрабязна пра пошукі праўды напісала газэта «Літаратура і мастацтва» :

*«... Пасля гала-канцэрта, на якім былі абвешчаны вынікі і раздадзены ўзнагароды, прызы і дыпломы, а пятай гадзіне раніцы большасць удзельнікаў, абураныя рашэннем журы, яшчэ збіраліся тэлеграфаваць на ЦТ у праграму «Взгляд»?!*

*І добра, што тэлеграма не пайшла. Што падумалі б ва «Взгляде» пра беларускі рок? Ну проста самы зручны час займацца «Взгляду» яго праблемамі, асабліва тады, калі беларускі рок нідзе, апрача як у роднай рэспубліцы і ў ЗША, не ведаюць. Які сэнс спрачацца з журы? У яго ж складзе не адзін быў чалавек. І калі «Мроюю» назвалі лепшай групай, гэта думка менавіта журы, а не тайнага прыхільніка калектыву.*

*Усе групы напрамку «сацыяльны рок» з «Мрояй» на чале заклапочаныя тым, што сказаць, а ўжо потым — як сказаць. Відаць, на сённяшні дзень у беларускай рок-музыцы актуальнасць выказвання перавышае па значэнні мастацкасць выказвання. Што ж, пра дзень сённяшні найбольш востра гавораць не раманісты, а публіцысты... Знак часу!*

*І на гэтым я мог бы нарэшце і скончыць, калі б не адзін, я сказаў бы, далікатны момант. Тое ж самае журы вызначала кандыдатаў на паездку на фестываль у Юрмале. Тут, як кажуць мае сябры з колаў, набліжаных да контркультуры, «халява не прайшла». Лепшым быў заслужана названы мінчанін А. Саладуха, які страсна, натхнёна, прафесійна выканаў песні А. Елісеенкава. Трэба думаць, што тут ужо менавіта ўзровень музычнасці і прафесіяналізму быў крытэрыем ацэнак журы.*

*Дык што ж, урэшце, здарылася з журы, калі яно вырашала лёс першага месца сярод рок-груп?! Куды падзеліся — як крытэрыі ацэнкі тых груп — прафэсіяналізм выканання, індывідуальнае майстэрства, ансамблевая, сцэнічная і вакальная культура? Нарэшце, музычнасьць? Альбо рок — гэта не музыка, а сацыяльная з'ява, якая сцвярджае сябе музычнымі сродкамі, альбо гэта ўсё ж музыка, але наладжаная паводле зусім іншых, не ўласцівых мастацтву, крытэрыяў? Адсюль і невытлумачальнасць высноў журы...*

*Што ж, відаць, я сапраўды безнадзейна пастарэў і ўжо нічога не петру ў гэтым жанры. Але памяркуйце самі: журы не змянілася, а прынцыпы ацэнкі сталі з ног на галаву. Ужо нават сярод публікі чуліся думкі, што першае месца сярод рок-груп наогул не трэба было даваць. Да ўсяго, як мне здалося, удзельнікі «Мроі» не былі надта ўсхваляваныя перамогай. Ці то таму, што адчувалі пэўную недарэчнасць сітуацыі, ці то таму, што разумелі: сённяшнім творчым багажом яны яшчэ прыцягваюць нейкую частку аўдыторыі, але ўжо заўтра гэтага ім можа не хапіць. Сёння жаданне выказацца ў «Мроі» значна мацнейшае за майстэрства, і мо таму на сцэне група ўспрымаецца даволі арганічна. Ды не больш.*

*Але чаму ж у нас рок-музыканты, за малым выключэннем, дбаюць найперш пра фірменны інструментарый ды незвычайную сцэнічную*

*знешнасць, а не пра ўласна музыку? Ці не таму, што ў музыцы сказаць нешта перакапальнае цяжэй за ўсё? Але ў самадзейнай творчасці недарма маецца адзін не дужа прыемны сінонім — «самапал». Г. зн. — падробка. І тое, што сёння трапляе ў «дзесятку», заўтра можа проста даць асечку».* (Зьміцер Падбярэзкі, «Літаратура і мастацтва», 17.02.89 г.)

Што можна сказаць пасьля такога эмацыйнага, палкага выступу? Толькі тое, што праўдашукальнікі мелі рацыю! Журы й сапраўды было неабыякавым і жадала перамогі Мроі.

Віталь Сямашка: *«Трэба было ўяўляць атмасферу ў Наваполацку. Панаехала гуртоў расейскамоўных процьма. Ідуць рэпэтыцыі, гэтыя маскалі бяруць сабе лепшыя гадзіны. Гукарэжысэр агульны і таксама прамаскальскі. Яны яму і падарункі, і частуюць гарэлачкай-каньячком... А Мроі дзякуй богу што на квіткі да Наваполацку грошай хапіла — якія там падарункі! На рэпэтыцыю ім толькі дзьве гадзіны далі.*

*І, канешне, на Мрою ніхто ня ставіў. Наадварот, усіх сабак на іх вешалі — і нацыяналісты яны, і граць ня ўмеюць. І гэтыя маскалі ўпэўненыя былі, што выйграюць. А ў журы ўваходзіў тады я, Юра Цыбін, Лёня Барткевіч, Сяргей Вінаградаў з маладзёжнага тэлевізійнага цэнтру, яшчэ пару чалавек і Падбярэзкі. Але Дзіма тады быў жлоб і яго ў разьлік ніхто ня браў. І вось сабраліся неяк увечары дома ў Сокалава-Воюша я, Юра і Барткевіча запрасілі. Пасядзелі, выпілі і сказалі: глядзі ты, што робіцца — час ужо гэтых маскалей мачыць нарэшце. А то зашмат выёбваюцца. Паводзяць сябе тут як гаспадары і пуп зямлі. І тады адбыўся такі гандаль — мы абяцалі Вінаградаву, што на гранпры падтрымаем «Дзьвіну» з Віцебску (абсалютна мафіёзная рэстаранная каманда была, якая паіла журы з ног да галавы і з ранку да ночы), а ён за гэта галасуе за Мрою як пераможцу сярод рок-гуртоў. Так мы й набралі большасьць галасоў.*

*І потым ужо Отражение і Сяргей Сількевіч, гомельскі гурт Гранит сталі завадатарамі бунту — крычалі, што журы купленае. За якія такія грошы Мроя магла нас купіць? Ім кішэні тады можна было зашываць — бо ўсё адно яны заўжды пустымі былі».*

## Спрэчкі пра вартасьці

Што тычыцца вартасьцяў мроеўскай музыкі, дык спрэчка тая як з нараджэньнем Мроі пачалася, дык па сёньняшні дзень і не сьціхае. Праз некалькі месяцаў пасьля таго ж наваполацкага фэсту «Вячэрні Мінск» надрукаваў інтэрвію з лідарам Сузор'я Валянцінам Пучынскім, дзе той абураўся залішняй увагай да творчасьці Мроі і назваў яе «торжеством безвкусицы». Праз колькі год гэтыя спрэчкі перакінуліся і на N.R.M. Па мне, дык добра Клімаў сказаў.

*«Неоднократно слышал в приватных беседах из уст наших известных музыкантов, что как инструменталисты, по отдельности, «энэрэмовцы» чудовищно слабы и примитивны (так уж и «чудовищно»!). Но вот ведь собираются вместе — на записи, в концерте, — и ты уже не обращаешь внимания на огрехи, впитываешь их музыку целиком, не отвлекаясь на ее составляющие. И в этом феномен коллектива: играть музыканты ни хрена не умеют, но хренячат так, что, папа, торжествуй!»* (Олег Климов, «Музыкальная газета».)

Уладзя: *«Нейкі час таму я быў на мерапрыемстве з нагоды дня нараджэньня Лявона Нарушэвіча. І Сузор'е, якое ў свой час нас крытыкавала пастаянна, там брала ўдзел. А яны вырашылі вярнуцца да старых песен. І згралі самы вялікі гіт таго часу «Стары мост». Я ня чуў гэтай песьні гадоў 20. Я цалкам разыйшоўся з Мрояй і зараз магу гаварыць як чалавек досыць нэйтральны, у мяне іншыя цікаўнасьці ў жыцьці. Але я паслухаў гэтую песьню*

*і падумаў — ну якога чорта вы так валілі на Мрою?! Нашыя жа песьні былі нічым ня горш. І акрамя таго ў іх была энэргетыка. Іх можна хоць зараз падняць і прасьпяваць. А «Стары мост» — гэта песьня, якая засталася ў тым часе. Была мода і прайшла. Як і на само Сузор'е. Дык дзеля чаго тады трэба іх «прафэсыйнае» граньне? А наша музыка была іншая, але ня горшая».*

Алезіс: «*Канешне, гурты кшталту Отражения былі больш тэхнічнымі музыкамі. Але што з таго, калі іх граньне ніякіх эмоцыяў не выклікае? Ну, скажуць яму «маладзец» за прыгожанькі пасаж, а што акрамя таго?*»

Між тым скандал у Наваполацку ня меў працягу. Перамога адчыніла перад Мрояй усе дзьверы. Гарулёва не магла лезьці са сваім літаваньнем тэкстаў да ляўрэатаў рэспубліканскага конкурсу, радыё магло без папрокаў ставіць песьні ў эфір, а Мроя набыла статус першага рок-гурта Беларусі. Скандалы толькі дадалі вядомасьці. У гадавым выніковым «Парадзе папулярнасьці» «Чырвонай змены» Мроя з вялікім адрывам становіцца першай. Праўда, што такое папулярнасьць самі яны разумеюць зь цяжкасьцю.

## Парад папулярнасьці 1988

«Парад папулярнасьці '88». Зь інтэрвію Вітаўту Мартыненку, «Чырвоная змена», 31.12.88:

«Юрась Ляўкоў: *Папулярнасць? Я яе не адчуваю. Поўныя канцэртныя залы — гэта прыемна, але яны не сведчаць аб чымсьці неверагодным у адносінах да нас. Каб была сапраўдная папулярнасць, нам бы сыпаліся не толькі запрашэнні на выступленні, але і прапановы ад розных дырэктараў ДК у сэнсе творчай базы. У нас жа няма ніякіх умоў для творчасці. Сёння рэпеціруеш тут, заўтра там, а паслязаўтра не можаш паехаць на дамоўлены канцэрт, бо няма апаратуры ці транспарту. Праўда, калі выступленне арганізу-*

*ецца дэталёва, як у Бабруйску, напрыклад, куды мы былі запрошаны гэтай восенню ў якасці гасцей побач з такімі зоркамі, як ленінградскі «Сезон дажджоў», рыжскі «Пілігрым», наш «Рэй» ці «Алібі» з Дубны, — усё ўдаецца. Мы і выступілі добра (атрымалі прыз гаркома камсамола «За актыўную жыццёвую пазіцыю»), і сваю матэрыяльную базу палепшылі (канцэрт праходзіў па ўзаемавыгадным кантракце). Але гэта хутчэй выключэнне, чым правіла.*

Лявон Вольскі: *За гэты год мы далі каля паўтара дзесятка канцэртаў. Гэта ў 3 разы болей за мінулагоднюю колькасць, але мізэрна мала ў параўнанні з такімі калектывамі (сапраўды папулярнымі), як венгерская «Амега», польскі «Лёмбард» ці тым больш які-небудзь «Айран Майдан»... Там да двухсот-трохсот канцэртаў у год, ды яшчэ рэгулярны выхад альбомаў, відэакліпаў. Наша папулярнасць, спадзяюся, яшчэ наперадзе.*

Уладзя Давыдоўскі: *Калі пасля доўгай працы адчуваеш пэўную ўвагу да яе плёну з боку публікі, прэсы — гэта цікава. Прыемна. Але потым разумееш, што гэта толькі адзін бок справы. Вядомасць усё большая, а магчымасць ствараць усё меншая. Мы ўжо былі тройчы лаўрэатамі, калі нас тройчы папрасілі пакінуць прадастаўленую базу. Нам даюць прызы за грамадзянскую пазіцыю і за пазіцыю ж узнімаюць цэлы скандал вакол «Мроі».*

Алег Дземідовіч: *Не варта яшчэ закранаць тэму нашай папулярнасці. Скажу лепш: мы адчуваем, што наша творчасць патрэбна людзям. Бадай, прыхільнікаў усё больш. Але спецыяльна працаваць дзеля гэтага?.. Нас не вабіць такая перспектыва. Увогуле, папулярнасць — абстрактнае паняцце. Можна быць усім вядомым, усюды на слыху, але не быць нікому дарагім. Куды лепей адчуваць сваю лучнасць з працэсам абуджэння грамадскай думкі, спрыяць канкрэтным зрухам у перабудове чалавечай свядомасці».*

Паралельна са скандаламі пісаўся і новы, трэці альбом Мроі. Уся праца праходзіла ў студыі «Беларускай маладзёжнай». З гурта за запіс ня бралі ні капейкі. Мо таму, за такую дабрату, альбом і атрымаў свой назоў — «Студыя БМ». Гэта быў першы запіс не ў падпольных умовах, а ў прафэсыйнае радыйнае студыі. Яго рабілі гукарэжысэры Уладзімір Сакульскі і Валеры Бяляеў.

Альбом склаўся з песень «Вайна», «Паляваньне на вядзьмарак», «Хто верне?», «Зондэркаманда», «Белая вежа», «Горад», «Я рок-музыкант» (абноўленая вэрсыя са «Зроку») і «Дэвальвацыя». Умовы запісу былі вельмі суровыя: запісваўся адразу ўвесь гурт, а потым на гэтую глебу пісаліся «давескі» — гітарнае сола, нешта з клявішаў, бэкі. Пры запісу першага этапу, калі хто саб'ецца, даводзілася ўсю песьню перапісваць спачатку. Таму перад запісам быў шэраг напружаных рэпэтыцыяў — прыйсьці ў студыю непадрыхтаваным было немажліва.

Зь нейкіх абставінаў Алезісу давялося талеркі дапісваць потым, накладкаю. Таму, калі ўважліва паслухаць, гэта адчуваецца.

На тым альбоме не было звышгітоў кшталту «Ён яшчэ вернецца» ці «Старога храму». «Студыя БМ» прайшла крыху незаўважанай. Найбольш прагучалі, здаецца, дзьве песьні — «Вайна» і «Зондэркаманда».

«Вайна», што распачала ў творчасьці Мроі ваенную тэму, зьявілася пасьля паездкі на фэстываль у Магілёў.

Лявон: *«У Магілёве былі лекцыі пра піцерскі рок-клюб. А я раней нічога гэтага ня чуў, акрамя Аквариума і, можа быць, Зоопарка. Нам паказалі нейкі канцэрт піцерскіх гуртоў, дзе вайсковая тэма прагучала даволі моцна. Мне спадабалася, і мы вырашылі гэтую тэму распрацаваць, тым болей пад уплывам нэгатыўнага вопыту ад арміі. Атрымалася ад сэрца, бо ўспаміны былі сьвежыя — такі моцны пацыфісцкі гімн:*

*Мы рушым на захад,*
*Мы крочым на ўсход,*
*Куды загадаюць нам.*
*Халодным паглядам сталёвых вачэй*
*Усьлед нам глядзіць вайна.*

*Паслухай, брат, мне б азірнуцца, ўбачыць знаёмыя вочы.*
*Я ведаю, брат, нам не вярнуцца з гэтае ночы...*»

Пацыфісцкі гімн быў ацэнены публікай і ўвесну 1989 г. перамог у гіт-парадзе «Беларускай маладзёжнай». «Зондэркаманда» праславілася зь іншых прычынаў — на яе быў зьняты кліп.

На хвалях мроеўскае папулярнасьці і перамогі ў Наваполацку Бахціяр Бахціяраў перамяніў свой погляд на беларускі рок і зацікавіўся Мрояй. Ён выказаў жаданьне зьняць кліп, які б можна было ставіць у маладзёвыя праграмы і такім чынам падвышаць рэйтынг. На той час у гурта мэнэджэрам быў Міхал Амельяновіч. Выслухаўшы Бахціярава, ён павёў сябе нахабна. За здымкі двух кліпаў запатрабаваў грошы. Прычым немалыя. У Бахціяра ўсе валасы, што засталіся, паўсталі дыбам. А Міхал спакойна паглядзеў на гэта і сказаў: «Ну, калі ня хочаце плаціць, мы здымацца ня будзем». І Беларускае тэлебачаньне заплаціла!

Выбралі дзьве песьні — «Зондэркаманда» і «Я рок-музыкант». «Зондэркаманда» была, як у тыя часы казалі, вострасацыяльнай песьняй — пра прастытутак:

*Зондэркаманда — армія любові,*
*Зондэркаманда — служба ўначы.*
*Зондэркаманда — жалезная лёгіка,*
*Зондэркаманда — зграя жанчын.*

Лявон: «*Песьня была скандальная. І яны спрабавалі зрабіць адпаведны кліп. У студыі паставілі трох напаўаголеных дзяўчынак, якія танчылі, і я дэманічны на іх фоне сьпяваў. І перабівалася гэта*

*кадрамі, на якіх дзявочыя ногі ідуць па вуліцы, заходзяць у бар... Карацей, мы самі з выніку сьмяяліся».*

Кліп на песьню «Я рок-музыкант» атрымаўся лепей. Здымаў яго добры рэжысэр Нікалаеў, зараз ужо нябожчык. Ён прыдумаў, што Мроя ў кадры павінна будаваць дом. Дзеля гэтага завалок гурт на будоўлю. Там і здымалі — спачатку руйнавалі сьцяну, а потым будавалі новую. Па прызнаньні ўсіх відавочцаў, па тых часох гэта быў супэркліп. Як ні дзіўна, і праз паўтара дзесятка год яго час ад часу паказваюць па розных беларускіх каналах.

*«Клип группы Мроя «Я рок-музыкант» — первый (и едва ли не единственный) «f** the system» белорусского видео. Он был создан в начале 1990-х, когда беспокойное перестроечное время было позади. Однако в кадрах клипа удалось не только сохранить, но и акцентировать протестные настроения людей излёта перестройки. «Я рок-музыкант» — редкий случай визуализации желания — огромного желания агрессивных, напористых, молодых музыкантов «прогнуть» мир, утвердиться вопреки всему.*

*У них, как ни странно, получилось. «Актерский» состав клипа сделал его самым известным из ранних работ белорусских клипмейкеров. Еще в «те» времена поклонники Мрои сделали достаточно много копий ролика...»* (www.smotritel.com)

## Разьдзел 6

## 1989–1990. СЫХОД ДАВЫДОЎСКАГА. «28-я ЗОРКА»

Сыход Давыдоўскага да гэтага часу зьяўляецца, мабыць, самай балючай тэмай у гісторыі Мроі. Толькі ў 2002 г. Уладзя і Лявон забыліся на былыя крыўды і зноў пачалі кантактаваць між сабой. Таму й распавядаць пра падрабязнасьці разрыву ва ўсіх было мала жаданьня. «Нагавару чаго лішняга, дык ізноў перасварымся», — перасьцерагаецца ад такіх размоў Уладзя і таму наконт канфлікту выказваецца зусім коратка: «*Нас разьвялі два пытаньні: першае — асабістае, другое — пытаньне лідарства ў гурце. Адно зь іх можна было б пераадолець, але калі яны наклаліся адно на другое, гэта прывяло да такога выніку*».

### Каханьне і амбіцыі

«Асабістым пытаньнем» была распрыгоненая дзяўчына Віка Казлова з «Талакі». Яна прыядналася да гурта ў якасьці макіяжніцы. Праз нейкі час іх паўсюль пачалі бачыць зь Юрыкам. Аднак ужо праз колькі месяцаў пара разыйшлася і Віка закруціла невялічкі раман з Алезісам. Хутка скончыўся і ён. Чарговым выбарам Вікі стаў Уладзя, які ў рэшце рэшт амаль ня стаў ейным мужам.

Лявон: «*Уладзя сам сябе накруціў, што ён адбіў ва ўсіх Віку. Алезіс гэта перажыў, Юрык таксама, але сам Давыдоўскі падумаў, што яны мусяць яго ненавідзець. Зыходзячы з гэтых высноваў ён сябе*

*і паводзіў. Бо лепшая абарона — гэта напад. Увесь час нападаў на кагосьці з нас, на яго думку, у нас усё было пагана».*

Але, як і сказаў Уладзя, калі б сардэчныя справы былі адзінай праблемай, іх можна было б перажыць. Болей за ўсё кранала Давыдоўскага пытаньне лідарства ў гурце.

Падчас стварэньня Мроі ролю Уладзі як лідара ніхто ня ставіў пад сумнеў. Ён быў крыху старэйшы за астатніх, натхняў усіх ідэяй стварэньня гурта, лепш за ўсіх валодаў гітарай. Аднак потым мяжа неяк сьцёрлася. Чым далей, тым меней адчувалася розніца ва ўзросьце, Лявон і Алезіс сталі пісаць усё болей тэкстаў, дый у музычным пляне ўсе хутка падраўняліся. Мроя стала камандай роўнавартасных і самадастатковых асобаў, у якой не было мейсца моцнаму лідару. Уладзя гэтага не адчуў. Прапусьціў момант, калі існаваньне гурта перастала залежаць ад прысутнасьці ў ім стваральніка.

Лявон: *«Мы ўсе прыйшлі з войска зьмененымі асобамі. А Давыдоўскі і так схільны да хваравітай падазронасьці, фобіяў. Армія гэта яшчэ ўзмацніла. У яго, напрыклад, было ўражаньне, што я на запіс прасоўваю ў асноўным свае тэксты. Калі «худсавет» не прымаў ягоную песьню, яму падавалася, што за гэтым нешта крыецца, кааліцыі нейкія. Напрыклад, у яго была песьня з апошнімі словамі: «Ну, можа, хопіць таптаць нагамі Радзіму і памяць». Я быў супраць, бо гэта занадта ў лоб, агітка. А ён пакрыўдзіўся. Хаця ў астатнім тэкст быў нармальны.*

*Ён усё болей і болей лічыў, што бяз нас, сольна ён зробіць болей. Што мы стрымліваем ягоны рост».*

Юрась: *«Уладзя ў пэўны момант ізаляваўся ад нас. Доўгі час было так — на рэпэтыцыі прысутнічала тры чалавекі плюс Давыдоўскі. Ён замкнуўся ў нейкіх сваіх думках, нешта шукаў... Мы выходзілі падчас перапынкаў папаліць, а ён заставаўся адзін, нешта там найграваў...»*

«Агульная сям'я», якой доўгі час жыла Мроя, распалася. Атмасфэра ў гурце паціху псавалася і ў рэшце рэшт стала зусім немагчымай. Гэта было тым болей балюча, што папулярнасьць Мроі толькі расла.

Тэлебачаньне круціла кліпы, «Вайна» перамагла ў гіт-парадзе БМ, адно за адным ішлі запрашэньні на фэстывалі — «Рок-дыялёг» у Магілёве, «Стары замак» у Навагрудку, а летам — Чарнаўцы. Гэта быў час, калі ўздымалася ўкраінская рок-хваля. У Чарнаўцах далі ўсім па мазгох «Браты Гадзюкіны», там жа зьявіліся «Воплі Відаплясава» з песьняй «Таньці». Гала-канцэрт адкрыцьця з удзелам Мроі трансьляваўся па першым канале Украінскага тэлебачаньня.

Лявон: *«На адкрыцьці мы зграли дзьве песьні, і нас сталі паўсюль пазнаваць. Для нас гэта было крыху дзіўна. Забягаеш папіць піва — і ўвесь бар на вушы станавіўся, што такія зоркі да іх, выпівохаў, зайшлі. З гуртоў на тым фэсьце мяне, канешне, найбольш уразілі «Браты Гадзюкіны» — фэнамэнальная панкаўская каманда зь вельмі іранічнымі тэкстамі».*

Аднак посьпехі толькі ўзмацнялі ўнутраны крызіс Мроі. У траўні на «Беларускай маладзёжнай» пішуцца песьні «Амбіцыі», «Пераможцы», «Манэтны двор», «Зямля», «Па кім б'юць званы». Хаця па гуку яны адрозьніваюцца ад песень папярэдняе сэсіі, вырашана падаваць іх як дапіску да «Студыі БМ». Праўда, кампаноўка альбому ад Мроі фактычна не залежала. Бо не было ніякае фабрычнае вытворчасьці касэтаў, дамоваў, аўтарскіх правоў. Як і ранейшыя альбомы, «Студыя БМ» распаўсюджвалася мэтадам перапісваньня з магнітафону на магнітафон. Праўда, папулярнасьць Мроі дасягнула ўжо такіх межаў, што ёй зацікавіліся мясцовыя «піраты».

Лявон: *«Піраты фактычна і кампанавалі альбом. Як адбывалася? Запісаныя трэкі захоўваліся на радыё. Знаёмыя тых, хто там працуе, зьвяр-*

*таліся з просьбай: «У вас, кажуць, ёсьць Мроя? Можна перапісаць?» Перапісвалі і нейкія песьні дадавалі да тых запісаў «Студыі БМ», што ў іх былі з ранейшых часоў. Ніхто і ня думаў ладзіць перасьлед піратаў. Наадварот. Я йшоў па пераходзе побач з Філярмоніяй і бачыў, што прадаюцца касэты Мроі. "Супэр! — думаў я. — Значыць, камусьці гэта цікава"».*

Давыдоўскі бярэ ўдзел ва ўсіх запісах «Студыі БМ», але сыход з гурта насьпявае. Апошнім выступам у складзе Мроі для яго становіцца агульнасаюзны фэстываль «Рок-багема» ў Днепрадзяржынску напачатку верасьня. Пасьля канцэрту Уладзя аб'яўляе, што ён сыходзіць. І яго ніхто не ўтрымлівае.

Лявон: *«Трэба сказаць, што ён павёў сябе нармальна ў гэтай сытуацыі. Сказаў, што, пакуль ня знойдзеце замену, на канцэртах магу граць, але на рэпэтыцыі прыходзіць ня буду. Аднак на той час у нас быў чалавек, які мог яго замяніць».*

Лявон меў на ўвазе Венедыкта Конева-Петушковіча. Некалькі год у Мроі ён выконваў ролю студыйнага гукарэжысэра, і вельмі ўдала. А да гэтага граў у гурце Чистое Серебро. Як гітарыст, па агульнай думцы, быў мацнейшы за Давыдоўскага.

На прапанову ня толькі гукарэжысэрстваваць, але й пайграць у гурце Веня згадзіўся адразу. «Канешне, гэта не Pink Floyd, але лепш граць канцэрты, чым толькі сядзець і лясы тачыць, як Чистое Серебро», — сказаў ён. Прыход Вені меў яшчэ адзін істотны плюс — той выдатна ведаў усю праграму Мроі. Таму проста прыйшоў на рэпэтыцыю, узяў гітару і пачаў граць. Ды яшчэ ўразіў усіх іншым талентам — узяў старую барысаўскую «Фарманту» Давыдоўскага (дзікую па дызайне і гуку), якой той ужо не карыстаўся, сам зрабіў датчык, усё начыньне і ператварыў яе ў прыстойны інструмэнт.

Тады ніхто і ня думаў сумаваць з-за сыходу Уладзі.

Юрась: *«Калі Уладзя сыйшоў, мы не адчулі, што гэта некая згуба. Канешне, сёньня я, вяртаючыся да таго часу, магу сказаць, што гэта была страта. Але, зноў жа, — мы атрымалі болей, чым згубілі. Веня быў вельмі музычным чалавекам. Ён вучыў нас, як паводзіць сябе ў студыі, навучыў будаваць падпевачныя партыі, мы ж тады да таго часу працавалі як шчанюкі, навобмацак шукалі нешта, вучыліся. Прыход Вені, безумоўна, даў нам музычны рост»*.

Можа, Юрась і правы. Але нядаўна я паглядзеў па Discovery фільм пра Марс. Ведаеце, 4 мільярды год таму там існавала атмасфэра, прыдатная для жыцьця (так што, можа, і па Марсе поўзалі чарапахі). Проста ў нейкі момант плянэта згубіла (вучоныя так і не разумеюць, чаму) сваё магнітнае поле, якое абараняла яе ад сонечнага ветру. Павольна, цягам мільёнаў год гэты самы вецер папросту зьдзьмуў атмасфэру Марса ў космас.

У выпадку з Мрояй мільёнаў год не спатрэбілася. І хоць яшчэ пару год пасьля сыходу Уладзі папулярнасьць Мроі не зьмяншалася (дзякуючы, найперш посьпеху «28-й зоркі»), нельга ня вылучыць гэтую вэрсыю — сьмерць гурта шмат у чым была прадвызначаная менавіта пасьля канцэрту ў Днепрадзяржынску.

## Давыдоўскі пасьля Мроі

Пасьля сыходу Уладзя паступіў на факультэт журналістыкі, пачаў супрацоўнічаць з радыё ды газэтамі, аднак ад музыкі не адыйшоў. Безумоўна, ён да апошняга лічыў сябе лідарам Мроі і, мабыць, быў упэўнены, што посьпехамі гурт збольшага абавязаны менавіта яму. У такое сытуацыі ня могуць ня ўзьнікнуць думкі пра сольную кар'еру. Хуткім часам Уладзя напісаў тэкстаў амаль на цэлы альбом і стаў думаць, дзе і з кім яго запісаць.

Уладзя: *«У мяне тады ні памяшканьня, нічога не было. Вяліся перамовы пра тое, што я сыходжу*

*з Мроі, аднак змагу рэпэтаваць на яе тагачаснай пляцоўцы. Але хлопцы сказалі мне катэгарычнае «не». Відаць, каб не было канкурэнтаў. Я першы час і так вельмі моцна перажываў разрыў, а такія паводзіны іх толькі ўзмацнілі, бо, натуральна, падаліся мне не зусім сумленнымі».*

Ня здолеўшы адразу запісаць напрацаваны матэр'ял, Уладзя знік з музычнага жыцьця. Працаваў на «Беларускай маладзёжнай». Але ў 1993 г. зьдзівіў шмат каго, выпусьціўшы-такі свой альбом. Цікавы і нечаканы.

Уладзя: *«Я вельмі доўга спрабаваў рабіць нешта ў музычным пляне падобнае на Мрою. Але ў нейкі момант мне ўдалося спыніцца, зьвярнуцца да самога сябе, падумаць. І я зразумеў, што мне трэба і навошта. Тэксты для новага альбому напісаліся даволі хутка. І атрымалася дзіўная рэч — калі набраліся тэксты, зьявіліся і людзі, зь якімі можна было альбом пісаць. Прыйшоў Юрась Паўлоўскі, які пазьней пачаў граць у Троіцы, частку музыкаў мне прывёў Лявон Нарушэвіч з Зарціпо. Былі музыкі зь дзяржаўных аркестраў. Шукаў я і вакаліста. Але яны не адчувалі мае тэксты, і прыйшлося сьпяваць самому».*

Вынікам гэтае сумеснае творчасьці стаў альбом «Вялікае Княства». Спалучэньне аўтарскае песьні, старажытных матываў плюс імправізацыя. Шкада толькі, што наклад таго альбому так і не перавысіў мінімальныя лічбы.

Лявон Нарушэвіч: *«Мы с Володей познакомились где-то в то время, когда он ушел из Мроі, развелся и вообще был открыт всему миру. Сколько было выпито, и сколько хороших людей прошло через его съемную квартирку на Волгоградской! Именно там была собрана в первоначальном виде группа Князь Мышкин. Ну и там Вова написал свои песни к альбому. Я привел к нему Валеру Башкова на бас — мы с ним долго играли в Зартипо. Скрипки прописал Валера Беляев — звукарь гос-радио. Альбом получился очень личностный, ли-*

*рычный, и хорошо, что он не пропал, как многое из того, что было написано в то время».*

«Вялікае Княства» так і засталося адзіным постмроеўскім альбомам Уладзі. Як ён гаворыць, само жыцьцё вымусіла адыйсьці ад музыкі.

Уладзя: *«Склаліся вельмі цяжкія абставіны. Матэр'яльнае пытаньне мяне за горла ўзяло. Я сыйшоў з радыё. Зьявілася рэальнае жыцьцё, рэальныя людзі, якім трэба дапамагаць. Калі ты думаеш, што табе есьці, ты ня будзеш думаць пра музыку. Хаця ідэі былі. Некалькі разоў я нават нешта пачынаў, але бязвынікова».*

Увесь гэты час Давыдоўскі сачыў за Мрояй, але не адчуваў нічога, акрамя расчараваньня: *«Мроя адкацілася з альтэрнатывы ў абсалютна прадказальную музыку. Мне было крыўдна, што гурт пайшоў у іншы бок. Ад стварэньня Мроя была ідэалістычным гуртом, а тут пачалі зьяўляцца песьні забаўляльныя, вясёленькія...».*

## «28-я зорка»

Лявон: *«Чаму зорка менавіта 28-я? Неяк мною гэтая лічба напісалася ў тэксьце, падавалася нечым таямнічым і шматзначным. Потым паводле гіроніі лёсу яна некалькі разоў адыгрывала з намі розныя жарты. Але гэта ўжо для жоўтых часопісаў...»*

Зьмены ў складзе падштурхнулі Мрою да больш актыўнай працы над новым альбомам. Некалькі песьняў з «28-й зоркі» ўжо запісалі на студыі «Беларускай маладзёжнай». Там жа плянавалі і скончыць працу. Але здарыўся цуд, які апроч іншага перадвызначыў шалёную папулярнасьць будучага альбому.

Улады рыхтавалі Дні беларускае культуры ў Расеі. Адначасова ў рэдакцыі «Чырвонай змены» за кубачкам гарбаты няўрымсьлівыя журналісты Вітаўт Мартыненка і Анатоль Мяльгуй пісалі ліст на саюзную фірму «Мэлёдыя». Пытаньне да гіганту

гуказапісу яны паставілі рубам — чаму гэта ён не спрыяе сяброўству народаў, ігнаруе беларускую музычную культуру і не выдае плыты такіх, напрыклад, цудоўных гуртоў, як Мроя і Уліс.

Ліст прыйшоўся да часу і да месца. Бо ў межах Дзён беларускае культуры «Мэлёдыя» якраз мусіла выдаць некалькі беларускіх кружэлак. Аднак каго? Песняры і Сябры і так стаялі ў гадавых плянах. А больш нікога прадстаўнікі «Мэлёдыі» ня ведалі. Ня дзіва таму, што ў Менск з Масквы панесьліся запыты — што за Мроя такая, за якую дбаюць журналісты камсамольскае газэты?

І вось ён, цуд — на нарадзе ў Міністэрстве культуры Беларусі вырашаецца, што Мроя і Уліс вартыя таго, каб іх песьні выдала «Мэлёдыя». Слава Корань прадставіў у Маскву запіс, зроблены ў Ольштыне, а вось Мроя пісалася на перасоўнай студыі «Мэлёдыі», якую дзеля такое справы прыгналі ў Менск. Студыя зьяўлялася на той час цудам тэхнікі.

*«Студия MCI представляла собой 10-метровый вагон, внутри которого находились 24-канальный магнитофон с системой шумопонижения 001ВУ, микшерный пульт Sony и всевозможные технические «излишества» вроде цветного видеомонитора. Студия была сделана в Лондоне специально для международной выставки «Связь-80», проходившей в Москве накануне Олимпиады. Оборудованный по последнему слову техники вагон произвел фурор и после недолгих торгов был приобретен советской стороной за 250 тысяч долларов.*

*Удивительная щедрость первого в мире социалистического государства объяснялась просто. Приобретение современной аппаратуры для нужд радио, телевидения и кинематографа небезосновательно относилось к вопросам идеологии — так же, как обеспечение всем необходимым лабораторий по исследованиям проблем космоса или военно-промышленного комплекса. На подоб-*

*ные затраты нефтедолларов в СССР, как правило, не жалели. Таким образом, сделанная в Англии передвижная звукозаписывающая студия осталась в Москве.*

*...С первых же дней работы технический потенциал MCI использовался не более чем на 30 процентов. Во всем цивилизованном мире в подобных студиях записывались рок-группы уровня Queen. Похожая «передвижка» была в начале 70-х у Rolling Stones, и на ней работали Deep Purple («Machine Head») и Led Zeppelin.*

*У наших собственная гордость. В СССР звукозаписывающий вагон был задействован исключительно на концертах классической и народной музыки. В числе постоянных клиентов студии числились оркестр Рождественского, оперные певцы Виктор Нестеренко и Ирина Архипова, а также какие-то хоры».* (Александр Кушнир. «100 магнитоальбомов советского рока», Москва, «Леан»/»Аграф»/ «Крафт+», 1999.)

Напрыканцы 80-х студыю ўсё ж пачалі скарыстоўваць і для рок-запісаў. Часам афіцыйна, а часам напаўпадпольна там запісваліся «монстры» расейскага року «Алиса», «Черный кофе», «Аквариум», студыя працавала і на шматлікіх рок-фэстывалях.

Лявон: *«Пісаць было вельмі цяжка. Была зіма — на вуліцы мароз. І нас прымушалі ўвесь час піць. Добра што хоць не падчас запісу, а пасьля. Быў там гукарэжысэр Барыс Натанавіч Шцільман. Ён мала піў. Пазьней яго замяніў Віця Глазкоў — таксама адэкватны чалавек. Алкагалізмам кіраваў тэхнік. Звалі яго, здаецца, таксама Віця. І не, каб прынёс яму — і хай сам п'е. Абавязкова трэба было зь ім сядзець і піць, інакш назаўтра ўвогуле можа нічога не запісаць. А запіс пачынаўся рана. Прыходзіш — пасьля ўчорашняга галава баліць. Але прымушаеш сябе, бярэш сябе ў рукі. Запісваеш — і зноў у краму».*

З такім гераізмам за пяць ці шэсьць дзён запісалі 8 песень: «Дваццаць восьмая зорка», «Мама-

мафія», «Шмат», «Кастрычніцкі цягнік», «Апошні інспэктар», «Аўстралійская полька», «Зямля», «Я рок-музыкант».

Рашэньне запісаць на «28-й зорцы» «Я рок-музыкант» тлумачылася менавіта тым, што новы альбом выдаваўся праз «Мэлёдыю». Гіт усіх часоў і народаў ня мог не ўвайсьці ў такое выданьне.

*«Менавіта «28-ю зорку» можна назваць самым «сьпелым» запісам «Мроі». Музыкі стварылі тут нейкую невытлумачальную і запатрабаваную «перабудовачным» слухачом атмасфэру: цяжкі хардавы гук, дэпрэсіўнае аздабленьне, надрыўны вакал і абавязковая сацыяльна-палітычная заклапочанасьць («Зямля», «Мама-мафія»). Як апошні цьвік — прэтэнзія на «нятленку» — «Я рок-музыкант». Ня ведаў Вольскі, калі сьпяваў пра нянавісьць да песень «рэстараннага варыянту», што ўжо праз 13 год на фоне азызлых ад крамбамбулі твараў калегаў па цэху будзе прэзэнтаваць альбом застольных песень у нятанных менскіх рэстарацыях».* (Часопіс «Студэнцкая думка», 02.2003 г.)

Зьміцер Падбярэзкі: *«Пачуўшы «28-ю зорку», я падумаў, што гэта нешта канцэптуальна новае, якога раней не было. Вакал Вольскага вылятаў з агульнапрынятых правілаў, таму што другая палова 80-х была часамі панаваньня ВІА з саладжавымі, часам добра пастаўленымі галасамі, а тут нешта адзін чалавек сьпявае, і нават не сьпявае, а крычыць. Гэта цалкам упісвалася ў манэру сьпеваў заходніх калектываў. Хаця мне слухаць той альбом было трошкі няўтульна».*

Першы наклад «28-й зоркі» склаў 2000 асобнікаў. Кружэлка прадавалася ў кожнае музычнае краме. У параўнаньні з хатнімі перазапісамі гэта быў неверагодны прагрэс. Канчатковага накладу ня ведае зараз ніхто. Дадрукаванак было шмат, бо нават год праз пяць пасьля выхаду альбому яго яшчэ сустракалі ў крамах, аднак зь іншым аздабленьнем — і па колеры і па якасьці друку.

## «Веня быў у абсалютнай і пастаяннай адключцы...»

Аднак «28-я зорка» пры ўсіх плюсах выявіла і адну вялікую хібу. «Сонечны вецер» пачаў дзейнічаць. Пад уплывам Вені ў музычным стылі Мроі адбываюцца зьмены. Зараз Вольскі вызначае тую новую музыку як «інтэлектуальны рок». «Халодны прафэсыянал» Веня пачаў працягваць у гурт тое, чаго Мроя заўжды цуралася, — філігранную музычнасьць, у ахвяру якой прыносілася іншае, нешта больш важнае.

Віталь Сямашка: «*Веня цягнуў апранаху на сябе і пры гэтым быў у поўнай, абсалютнай і пастаяннай адключцы ад той духоўнай, энэргетычнай плыні, на якой Мроя трымалася і якую яна ўтварала. Так, ён добра валодаў гітарай, выцягнуў альбомныя запісы (на іх хоць нешта стала чуваць), але пад свае стандартызаваныя гітарныя трэлі ён пачаў падмінаць усю энэргетыку, інтанацыю. Бо Мроя была цікавая менавіта інтанацыйнасьцю*».

«28-я зорка» збольшага пазьбегла гэтага ўплыву, бо значная частка матэр'ялу напрацавалася яшчэ разам з Давыдоўскім. Мо толькі «Апошні інспэктар» стаў прадвесьнікам зьменаў у стылістыцы — менавіта да гэтае песьні, больш чым да іншых, Веня прыклаў сваю руку. А вось наступны альбом «Біяполе» стаў ужо бенефісам новай мроеўскай музыкі.

# Разьдзел 7

## 1990–1992. ЗАМЕЖНЫЯ ВАЯЖЫ, ГКЧП І ПЛЯНЫ ЭМІГРАЦЫІ

Мой улюбёны варыянт такі. Недзе апоўдні прыйсьці да менскага Цэнтральнага аўтавакзалу — чэргаў амаль няма, а квіткі ёсьць. У 21.40 выйсьці з мэтро на Плошчы Незалежнасьці — яшчэ застаецца час купіць штосьці папіць у дарогу (каньячок у самы раз, а крамбамбуля — каварны напой і да дабра не даводзіць). У 22.05 ад'езд. Праз сем гадзінаў і дзьве мытні — Беласток. 5.60 злотых за рэйсавы аўтобус да Гарадку, яшчэ 500 мэтраў пешшу праз чыгунку, па лесе. Прыйшлі. Не зразумелі куды? Закрывайце кнігу.

### Басовішча

Ясная справа, што гэта пра Басовішча. Найнефармальнейшы, найвесялейшы і найбеларускі з усіх беларускіх рок-фэстаў. Ня маці і ня тата, але мэцэнат беларускага року. Бо дзіцё нарадзілася раней і само паўстала на ногі, але Басовішча зьявілася ў момант, калі яму патрэбна была падтрымка. Найперш нават не фінансавая (да галечы беларускім музыкам не прызвычайвацца), а энэргетычная, падтрымка дзеяньнем, стварэньнем адчуваньня ўласнае патрэбнасці й вартасьці.

Лета 1990 году. Камсамол парынуў, а разам зь ім і камсамольскія фэстывалі. Канцэртовая дзейнасьць таксама паціху марнела. Ды й абрыдлі ўжо гэтыя савецкія тусоўкі з кабацкімі камандамі, мэ-

талюгамі, рэглямантамі ды ідэалёгіяй. Басовішча ж адразу набыло нязвыклы для савецкага яшчэ чалавека фармат — сцэна на паляне ў лесе, мора піва, жыцьцё ў намётах — і даравала рэдкае адчуваньне свабоды.

*«Этымалёгія слова даволі простая — гэта абрэвіятура БАС (Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў, арганізатар фэстывалю) плюс салідны беларускі канчатак — овішча. Нехта потым спрабаваў зьвязваць паходжаньне слова з бас-гітарай — маўляў, на фэстывалі моцна «басуюць», то бок, граюць на «басе», — але студэнцкі БАС адкінуў гэткую «народную этымалёгію» як прынцыпова няслушную. Затое студэнтам спадабаўся калямбур пісьменьніка Уладзімера Арлова, які, пабачыўшы бурную рэакцыю гарадоцкай публікі на выступы беларускіх «цяжказбройных» гуртоў «Мроя» і «Уліс», ахрысьціў фэстываль Бесовішчам.*

*Басовішча было словам зусім новым, бо называла зусім новую зьяву — беларускую рок-культуру, пазбаўленую савецкага штампу і расейскамоўнай афарбоўкі. Гэта была несумненна першая культурная зьява, у якой і дзякуючы якой беластоцкія маладыя беларусы знайшлі поўнае духоўнае паразуменьне з пад- і постсавецкімі суродзічамі. А таксама адчулі гонар за беларускую культуру перад маладымі палякамі, якія пачынаючы зь першага фэстывалю нязьменна складалі сама менш палову публікі ў гарадоцкім лесе, дзе йшлі канцэрты...»* (Ян Максімюк, «Радыё Свабода».)

Першае Басовішча адбылося 13—15 ліпеня, адрозьнівалася сьціпласьцю і болей арыентавалася на бардаўскую песьню. Пелі Кася Камоцкая, Сяржук Сокалаў-Воюш, Віктар Шалкевіч, Дарэк Фёнік. З рок-гуртоў запрасілі толькі Мрою, Уліс і Грамаду. Выступы праводзіліся яшчэ на старой паветаванай сцэне. Ужо колькі апошніх год там п'юць піва ды закусваюць сардэлькамі. А тады пад павецьцю,

дзе магло зьмясьціцца ня болей за 200—300 чалавек, гучала музыка. Для першага Басовішча гэтага месца было дастаткова.

Бардам пашчасьціла больш — у першы дзень сьвяціла сонейка, было цёпла. Рокерам надвор'е амаль не сапсавала ўсю справу — пахаладнела, часам накрапваў мярзотны дождж. З-за холаду гітары разладжваліся, пальцы ня слухаліся. Аднак, на дзіва, задаволенымі засталіся ўсе.

Мроі дапамагла добрая згранасьць. З праграмай, што пачула Басовішча, раней выступалі і на канцэрце ў Тэатры Коласа ў Віцебску, на сьвяце горада Салігорску, у польскім Сопаце на фэсце «Maffia». Усюль «габлявалі»і «паліравалі» новыя песьні «Рок са мною», «Гуляй, душа!», «Крык», «Чорна-белы сон».

Гэта былі песьні з новай праграмы «Біяполе». Яна пісалася цягам 1990 г., калі «Мэлёдыя» яшчэ ня выпусьціла «28-ю зорку». І тут музычны ўплыў Вені быў ужо відавочны. На першы плян высоўваецца валоданьне інструмэнтамі, мяняецца музычны малюнак.

Лявон: «*Пачалося тое, чаго ў Мроі ніколі не было — такія задуменныя, шматчасткавыя песьні са зьменай рыфаў, памераў, перанасычаныя сола. Я б назваў гэта заўчаснай сталасьцю*».

«Біяполе» пісалася ў 1-й студыі дзяржрадыё. Гукарэжысэрамі зноў былі Сакульскі і Бяляеў, што працавалі і над «Студыяй БМ». Альбом склаўся з дзесяці песень: «Прадчуваньне крыві», «Гуляй, душа!», «Біяполе», «Крык», «Чорна-белы сон» («Я на сямі вятрах»), «Халі-галі», «Рок са мною», «Брага» («Як я ў лесе ягады зьбіраў»), «Марш гопніка», «Краіна крывавых дажджоў».

Прэзэнтацыя адбылася ў Тэатральна-мастацкім інстытуце ўвесну 91-га. Гралі першую гадзіну папулярныя песьні мінулых гадоў, другую — «Біяполе». Заля была паўнюткая.

Улетку 91-га ў той жа студыі запісаліся песьні «Так і трэба» і «Беларуская Афрыка». Але да аль-

бому іх адносіць ня варта — пісаліся яны выключна для ўдзелу ў гіт-парадзе «Беларускай маладзёжнай».

### Музыкі-клуначнікі

Асобным плюсам Басовішча быў «няпрофільны» бізнэс — магчымасьць паралельна з удзелам у фэсьце заняцца гандлем.

Для Мроі то былі часы безграшоўя. Верышне — Алезіс тады падрабляў дворнікам у Доме літаратара, Юрась халтурыў на сваёй катэдры ва унівэрсітэце, у Вені таксама была праца ў кампутарнай фірме. Грошы, што прыносілі канцэрты, ішлі найперш на інструмэнты, усялякія ўзмацняльнікі, прымочкі. На жыцьцё заставаліся капейкі. Па маладосьці тое пераносілася лёгка і нават надавала існаваньню яшчэ больш рамантызму. «Глыток віна ды луста хлеба, мая надзённая патрэба» — напіша праз пару год Вольскі, і ў гэтых радках ня будзе ніякага ілжывага пафасу ці няшчырасьці. Ясна ж, што ня можа рок-музыка купацца ў раскошы. Іншая справа, што і ў абсалютнае галечы існаваць таксама ня хочацца.

У тыя часы праз мяжу вазілі ўсе і ўсё. Гарэлку, сьпірт, тытунь, шампунь. Эпоха нарадзіла новае слова — «клуначнік». Піянэры дробнага беларускага бізнэсу акупавалі мяжу і ўсе бліжэйшыя польскія гарады. Некаторыя дабіраліся і да Варшавы. Жывы прыклад бязьмежнасьці чалавечых магчымасьцяў, яны зьдзіўлялі нават да ўсяго прызвычаеных суседзяў па соцлягеры. Убачыўшы невызначальнага ўзросту кабету, нагружаную пяцьцюшасьцю сумкамі, што цягнецца па памежным польскім гарадку, можна было не заглядаць у пашпарт — беларуска (ну, расейка, у скрайнім выпадку). Зь першага Басовішча да арміі клуначнікаў далучыліся й музыкі.

З Мроі заўзятымі гандлярамі сталі Юрык і Алезіс. У першую паездку яны ўзялі гарэлку. Калі паба-

чылі, што справа пайшла, павялічылі размах. Алезісу дапамагалі сваякі — сястра, што працавала ў тэкстыльнае краме, перад кожным выездам на Басовішча прывозіла брату некалькі клункаў тавару. Аднойчы Алезіс пацягнуў у Польшчу нават ровар. Актыўным гандлем займаўся і Уліс. Праўда, не для паляпшэньня ўласнага дабрабыту. Слава Корань і кампанія складалі грошы ў агульную касу, а потым скарысталі іх для запісу ў польскім Ольштыне альбому «Чужаніца».

Найменш прыдатным для бізнэсу аказаўся, па ягоным уласным прызнаньні, Вольскі.

Лявон: *«Я пару разоў браў гарэлку, але ўжо ў аўтобусе пачынаў усім прастаўляць. І да Польшчы давозілася так мала, што ніякага прыбытку не было. Хутка перастаў гандляваць і Юрык. А Алезіс і наш тагачасны мэнэджэр Міша Амельяновіч працягвалі. І гэта была пакута суцэльная. Алезіс з Мішам заяжджалі ў якоенебудзь мястэчка і цэлы дзень тырчэлі на рынку, пакуль усё не распрададуць. У гэтых мястэчках нават паглядзець не было на што. Чым было заняцца? Мы зь Юрыкам куплялі мярзотнае чарніла польскае і цэлы дзень пілі».*

Так, ёсьць людзі, нyздатныя да бізнэсу. І тут галоўнае — своечасова гэта зразумець. Інакш атрымаецца тое ж, што і з францускімі бізнэс-плянамі Мроі.

## Францускія ўражаньні

Запрашэньне на фэстываль у Францыю прыйшло адразу пасьля Басовішча. У той час мэнэджэрам Мроі быў Міхал Амельяновіч. Хлопцам яго парэкамэндавала Іра Башнява — былая аднагрупніца Лявона і Алезіса па мастацкае вучэльні. Міша вучыўся на акторскім факультэце ў Тэатральна-мастацкім інстытуце. Дзелавітасьць перла зь яго, як нафта зь сібірскай сьвідравіны. Падчас знаёмства ён экспрэсыўна, па-акторску размахваў рукамі, праз слова ўжываў малазразумелыя экана-

мічныя тэрміны і, натуральна, падаўся хлопцам сапраўднай «акулай шоў-бізнэсу». «Тое, што трэба», — вырашылі яны. Толькі чалавек з жорсткай камэрцыйнай хваткай мог дапамагчы гурту выжыць ва ўмовах, калі камсамолу і ягоных фэстываляў ужо няма, а грошы патрэбныя.

І не сказаць, што Міхал мог толькі па-акторску махаць рукамі. Найперш ён забясьпечыў Мрою новым месцам для рэпэтыцыяў, а сябе — асобным кабінэтам. Зрабіў ён гэта так. У Менску існавала Навукова-вытворчае аб'яднаньне «Цэнтр», якое ўзначальваў вельмі амбіцыйны і цікавы чалавек Валерый Шаплыка. У ягоных плянах была пабудова беларускага Дыснэйлэнду недзе пад Ракавам, стварэньне некалькіх паркаў атракцыёнаў, шоў-праграм. Пад гэтыя мары ён сабраў і шэраг музычных калектываў.

Пачуўшы пра такога мэцэната, Амельяновіч, ні хвіліны не вагаючыся, зайшоў да яго ў кабінэт. Выклаў на стол усе дыплёмы фэстываляў, прызы, граматы, газэтныя артыкулы і запытаўся:

— Ці не жадаеце Вы, каб такі таленавіты й знакаміты гурт прадстаўляў менавіта вашу фірму?

Станоўчы адказ ён атрымаў адразу. Міхалу далі асобны кабінэт на тэрыторыі «Цэнтру», а Мроя рэпэтавала ў сутарэньнях, дзе была абсталяваная нядрэнная студыя. Хутка прыйшло запрашэньне ў Францыю на фэст «Belfort-FIMU». «Аднак чаму мы мусім абмяжоўвацца адным ганарарам за выступ?» — падумаў Міхал, і думкі адна фантастычней другой апанавалі ягоную галаву. Праз колькі дзён ён падыйшоў да Вольскага:

— Слухай, Лявон, ты ж мастак?

— Ну...

— Ну калі мастак, дык намалюй карцінаў.

— ?

— У Францыі прададзім, грошай заробім, клявішы табе новыя купім.

З далейшае размовы высьветлілася вось што. Праз нейкі выпадак Міхал знайшоў у Нямеччыне

савецкую эмігрантку з Казахстану. Кан'юнктурная цётка зарганізавала там нейкі чарнобыльскі фонд і акрамя таго мела дробную мастацкую галерэю. У размове праз шумы і хрыпы міжнароднае сувязі Амельяновіч пачуў тое, што хацеў:

— Міша, ды тут усіх цікавіць выяўленчае мастацтва. Асабліва сьвежае, з Усходу. Прывозьце ўсё, што ёсьць!

Вольскі і Алезіс адразу ператварыліся ў нявольнікаў гэтай ідэі. Намаляваць карцінаў і разбагацець!!! Мора, сонца, пальмы! Ракфелер загарае на суседнім лежаку... Праца пачалася.

Лявон: *«Зраніцы я ехаў у «Цэнтр». У сутарэньнях, дзе была студыя, адзін пакой перарабілі пад майстэрню. Палову дня я маляваў карціны, потым абед, рэпэтыцыя і ўвечары абсалютна забіты вяртаўся дадому, клаўся спаць. У такім тэмпе напахаў я амаль 40 карцінаў. 10 з іх былі проста супэрскія. Барышы лічыў зараньня. Яны вагаліся — 5 тысячаў марак туды, 5 тысячаў сюды. Думаў: «Карціна каштуе мінімум 500 марак. А ў мяне іх сорак. Прадам усё, куплю такія клявішы, што ні ў кога ў Менску няма».*

Алезіс намаляваў пару дзясяткаў карцінаў. У прадчуваньні немінучага багацьця чакалі ад'езду ў Францыю. Нэрваваліся. Ад'езд у капкраіну нават напачатку 1991 г. выглядаў амаль немагчымым і болей падобным на эміграцыю. За чатыры дні да «сьваточнае» даты Міхал паехаў у Маскву па візы. У чаканьні яго музыкі гулялі па менскіх вуліцах. Зайшлі ў кафэ ля ГУМу. Выпілі па 100 грамаў. Францыя стала бліжэй на 10 хвілінаў. Зайшлі ў іншае кафэ. Убачылі Віталя Сямашку. Яшчэ па 100. Хто і што піў далей, удакладніць немагчыма. Вядома толькі, што працягвалася гэта тры дні на кватэры ў Віталя.

Між тым у Маскве зь візамі ўзьніклі праблемы. Французская амбасада зацягвала працэс. Каб паведаміць дрэнныя навіны, Міхал патэлефанаваў Вольскаму. Маці адказала, што ня ведае, дзе сын.

Тое ж адказалі бацькі іншых сяброў-музыканьцікаў. Міхал знайшоў адно Алезіса, які таксама быў зьдзіўлены адсутнасьцю калегаў. Зрэшты, літаральна ў гэты самы дзень ён напаткаў іх у кавярні «Утулак» на вуліцы Чычэрына (на слэнгу — «Втулка», альбо, як казалі яшчэ раней — «Чорныя скалы»), куды зайшоў перахапіць «50», каб супакоіць нэрвы. На ягоныя ўшчуваньні й просьбы зьвязацца зь Міхалам калегі адказалі прапановаю выпіць зь імі кілішак-другі. Пасьля гэтае сустрэчы да Сямашкі загрымела ўся кампанія, уключна з гукарэжысэрам Алегам Караньковым.

Міхал тым часам быў блізкі да інфаркту. Пятніца, ранак, — Вольскі здымае-такі слухаўку і чуе голас мэнэджэра:

— Візаў няма, але рыхтуйце аўтобус.

Вечарам пятніцы Міхал усё ж атрымлівае візы і раніцай наступнага дня зьяўляецца ў Менску. Аўтобус быў падрыхтаваны. Туды загрузілі некалькі скрыняў «Фанты», «Бураціна», дзьве вялікія галоўкі сыру, 50 буханак хлебу, масла — правіянт на шлях у абодва бакі. Паў-Эўропы музыканьцікі ціха-мірна спалі ў аўтобусе, адыходзячы ад перадад'езднага стрэсу. Дый ува Францыі амаль ніхто нічога ня піў, апроч невялічкіх колькасьцяў чырвонага віна.

*«Адной з самых цяжкіх задач для хлопцаў аказалася перасячэньне мяжы. Толькі не савецкай, а нямецка-францускай, пошукі якой занялі добры кавалак часу. Хто б мог падумаць, што людзі так давяраюць адзін аднаму?! Нялёгка было знайсьці паліцэйскага на мяжы, але яшчэ цяжэй аказалася растлумачыць, што яго штамп у пашпарце патрэбны для атрыманьня «камандзіровачных». І ўжо зусім дарэмнымі і непачутымі засталіся ўгаворы праверыць аўтобус — навошта, калі ёсьць візы і няма наркотыкаў?»* (Аксана Клімовіч, часопіс «Бярозка», 1991 г.)

Фэст адразу ўразіў Мрою арганізацыяй. Што адбывалася на любым беларускім фэстывалі? Пры-

яжджаеш, напрыклад, на саунд-чэк у прызначаны час і чакаеш яшчэ гадзіны дзьве-тры. А тут сказалі, што саунд-чэк а 13-й гадзіне, хлопцы спазьняюцца на пяць хвілінаў і разумеюць, што гэтыя пяць хвілінаў іх чакаюць... Зьдзіўляюцца і гаспадары — непунктуальнасьці.

Юрась: *«Пасьля саунд-чэку да мяне падыходзіць чалавек з абслугі і кажа — ты, можа, возьмеш маю гітару пайграць? У яго нейкая амерыканская гітарка вельмі файная. А я ў той час граў на пячатцы — нават ня ведаю, ліцэнзійнай ці не — «Рыкэнбэкэра» чэскага. А што такое пячатка? Вазьмі для параўнаньня нашую барысаўскую гітару — гэта пячатка чэскай «Крэмоны», якая ёсьць пячаткай германскай «Музіма», а «Музіма» — у сваю чаргу гэта пячатка «Фэндэра». Вось такая лінія, і ў выніку ты маеш інструмэнт, які па дызайне вельмі падобны, але па гуку — гэта неба і зямля. Так і з маім «Рыкэнбэкэрам» — хаця я перарабіў яе сам, выразаў тое-сёе, некаторыя дэталькі памяняў, і яна па гуку стала больш-менш нармальная.*

*І гэты хлопец прапанаваў мне гэтую гітару, таму што зразумеў, што мая ня вельмі якасная, і хацеў дапамагчы. Але падумай сам: з аднаго боку, той жа Лявон грае на нейкіх жудасных клявішах — такія зараз на рынку прадаюцца па 10 баксаў, а тады каштавалі 500 (рэальна яны маглі зрабіць чатыры тэмбры больш-менш нармальна, а ўсё астатняе — фуфло поўнае), з другога боку, Веня грае на гітары, якую ён зрабіў з барысаўскае швайкі. І вось хлопцы будуць граць на гэтым гаўне, а мне дадуць добрую амэрыканскую гітару!!! І я адмовіўся. Хаця, канешне, яшчэ хваляваўся, што не змагу граць іншы грыф, а да сваёй я ўжо прызвычаіўся».*

Фэст у Бэльфоры ня быў занадта буйным — такія летнія сьвяты ладзяць шмат у якіх гарадках французскае правінцыі. Запрашаюць цікавыя калектывы, зарганізоўваюць некалькі сцэнаў. Там

жа — выставы, пэрформансы, музыка абсалютна розная — ад фолку да панку. І Мроя мала сказаць выбітна выступіла. Фурор быў поўны.

Нейкія людзі з гораду Нім падыйшлі адразу пасьля канцэрту і запрасілі на мейсцы ж падпісаць пагадненьне на ўдзел у такім жа фэстывалі ў іх горадзе. З мэрыі Бэльфору прыходзілі здзіўленыя людзі, паціскалі рукі і радаваліся — як гэта ім на свой фэст за такія малыя грошы ўдалося зацягнуць такі забойны гурт! Мэр запрасіў усіх на прыём разам з брытанскім амбасадарам ды іншымі важнымі пэрсонамі. Там адзначыўся Міхал, які на стрыманае паціскаленьне рукі памагатай мэра Мішэль Жандэр адказаў трыма моцнымі пацалункамі. Паліцыю не выклікалі: вядомая справа — рокеры, ды яшчэ з Усходу. Праз колькі год шляхам Міхала пайшоў Барыс Ельцын, паспрабаваўшы абняць брытанскую каралеву...

## Сьмерць бізнэс-пляну

...Між тым паралельна з музыкай працягваліся і спробы азалаціцца на карцінах. Прадаць іх паспрабавалі яшчэ у Бэльфоры. Гаспадар мясцовае галерэі паглядзеў некалькі, разьвёў рукамі і сказаў:

— Не, мы гэта ня можам прыняць. У нас людзі правінцыйныя, ім трэба конікі на лузе, дзевачка па расе бяжыць, мора плешчацца. А ў вас сапраўднае сучаснае мастацтва. Прапаноўвайце іншым.

Пэрспэктыва азалачэньня станавілася ўсё больш рэальнай. Уся Эўропа, здавалася, чакала сьвежага беларускага мастацтва. На адваротным шляху заехалі ў Нямеччыну. Тая казахская эмігрантка карціны забрала. Але грошы ня дала. «Хлопчыкі, гэта ж капіталізм — спачатку прадам, а потым і грошы аддам, не хвалюйцеся», — запэўніла яна. Адно, што паймелі хлопцы з тых карцінаў, — паход у добрую нямецкую рэстарацыю ад добрай нямецка-казахскай пані.

Па вяртаньні ў Менск Міхал пэрыядычна тэлефанаваў у Нямеччыну. «Нешта не прадаюцца карціны, пачакайце крыху», — адказвала яму гаспадыня галерэі. А аднойчы, набраўшы нумар, Амельяновіч пачуў адказ, што ягоная знаёмая тут болей не жыве і куды зьехала — невядома. Сьлед карцінаў зьнік. Засталіся толькі ўспаміны пра Эўропу.

Алезіс: *«Я да канца так і ня мог зразумець, як нас у тую Францыю выпусьцілі. Гэта ж было амаль немагчыма. Калі ехалі назад і заехалі на нейкі рынак у Варшаве, я паспрабаваў разьлічыцца 50-цю франкамі. Дык прадавец у мяне пашпарт запатрабаваў:*

*— Ня можа, — кажа, — у савецкага пана быць франкаў. Яны відаць, фальшывыя.*

*Толькі калі пашпарт пабачыў, а ў ім візу і адзнакі, што былі ў Францыі, узяў грошы са словамі: «Дзіўна, дзіўна».*

Ужо ў Менску прыйшло запрашэньне з Бэльфору прыехаць і на наступны год. Але не атрымалася. Амельяновіч тады ўжо амаль не займаўся справамі Мроі, адыйшоўшы ў нейкі больш прыбытковы бізнэс. Запрашэньне ж прыйшло ў ягоны офіс, дзе й парынула.

У Бэльфоры, між тым, былі распрададзеныя ўсе кружэлкі «28-й зоркі», якія хлопцы ўзялі з сабой. Чым ня сьведчаньне таго, што Эўропа вельмі прыхільна прымае беларускую музыку. Толькі недахоп грошай ды вопыту прадзюсарства не дазволіў тады раскруціцца далей.

## Жнівень 1991. На плытах у Швэцыю?

18 жніўня 1991 г., амаль адразу па вяртаньні з Францыі, Мроя паехала на Украіну. Горад Каламыя адзначаў 1000-годзьдзе, ставіў помнік Бандэру, і вітаў рок-гурты з усіх рэспублікаў, што хоць неяк вызначылі сваё імкненьне да незалежнасьці — Прыбалтыка, Беларусь, Грузія, Малдова. 18-га на першым

канцэрце грала Новае Неба. Назаўтра мусіла выступаць Мроя.

Раніцай у нумар зайшоў Міхал Амельяновіч:

— Усё, хлопцы, ваеннае становішча, — магільным голасам паведаміў ён.

Усе замахалі рукамі — маўляў, ну й дурань так жартаваць. Але Міхал не здаваўся:

— Кажу вам, ваеннае становішча. Ды ўключыце вы тэлевізію!

Усе нетаропка і зь іранічнымі тварамі спусьціліся ў бар гатэлю. На экране — «Лебядзінае возера». Пераглянуліся.

— Ну што, сустрэнемся на вечары патрыятычнай песьні, — сказаў нехта.

Сапраўдны жах агарнуў пазьней. Тэлескрыня круціць навіны пра хваробу Гарбачова, тэлефонныя лініі ў Беларусь і Прыбалтыку заблякаваныя. Арганізатары з сумам у голасе жаляцца:

— Эх, а мы толькі-толькі помнік Бандэру паставілі...

Усе нэрвова думалі, што рабіць з канцэртам. Але з Кіеву ніякіх забаронаў не прыходзіла, і выступ Мроі адбыўся. Увечары атрымалі ганарар — 1000 (!!!) рублёў. Нават раскінуўшы на ўсіх, атрымліваецца амаль па 200 — болей месячнага заробку сярэдняга савецкага інжынера. Аднак хто лічыць грошы, калі жыцьцё, лічы, скончылася. Накупілі 10 скрыняў сухога «Кабернэ» і ўсім «інтэрнацыяналам» пачалі абмяркоўваць, што рабіць.

Юрась: *«Латышы адразу сказалі — давайце на цягнік, і да нас. Там да Швэцыі рукой падаць. На плытах можна пераплыць. Праўда, памежнікі страляюць, але шанцы ёсьць. Мы гэты варыянт цалкам сур'ёзна разглядалі»*.

Вечар 20-га. Яшчэ нічога не зразумела. ГКЧП дае інтэрвію. У Янаева дрыжаць рукі. На вуліцах Масквы танкі. Музычны інтэрнацыянал сядзіць у грыль-рэстарацыі. Размаўляюць па-расейску. Падыходзіць мясцовы чалавек, звычайны západэнец, і кажа:

— Пачуем яшчэ адно слова па-расейску, і вас адсюль інвалідамі вынесуць.

Вышатоўвае гаспадар рэстарацыі — тлумачыць, што гэта ж музыкі зь Беларусі ды Прыбалтыкі. Заходнец адыходзіць. Праз пяць хвілінаў увесь стол быў застаўлены гарэлкай і курыцай. І піць ужо было немагчыма, і не адмовіш. Душыліся хлопцы гарэлкай зь півам, запіваючы гора і не ўяўляючы, што адбудзецца заўтра.

Між тым дэмакратыя перамагла...

## Басовішча '92 і выгнаньне Вені

Барыс Ельцын, які залез на танк і абвесьціў змаганьне за дэмакратыю, забіў чарговы й дужа вялікі цьвік ў труну Мроі. Марш, пераможны для дэмакратыі, стаўся жалобным для гурта. 22 жніўня 1991 г. гэтага ніхто яшчэ не зразумеў. Не зразумелі й пазьней — калі Беларусь абвесьціла незалежнасьць, калі прыняла гістарычную сымболіку, калі камуністы дрыжачымі рукамі галасавалі за забарону ўласнае партыі. Аднак творчы крах насоўваўся.

Канцэртаў амаль не было. Пасьля Каламыі за год Мроя зграла іх ня больш за пяць-шэсьць. Фінальнае шоў «Хіт-параду Беларускай Маладзёжнай», фэст «Рок вітае незалежнасьць», які зладзіў Бахціяр Бахціяраў (зразумеў, дзе трэба зарабляць грошы), «Рок-кола» ў Наваполацку. У такі «галодны» пэрыяд чарговага Басовішча чакалі больш, чым калі. Падрыхтаваліся добра, рэпэтавалі па некалькі разоў на тыдзень. І раптам за некалькі дзён да ад'езду зьнік Веня.

Лявон: *«Веня быў запойны чалавек. Ён ня быў падобны да Алезіса, які таксама піў, але пры гэтым мы былі ўпэўненыя, што ён ніколі не падвядзе. Веня калі ў клінчы, значыць у клінчы. Ён зачыняўся дома, абстаўляўся гарэлкай і тры дні сам з сабою вёў размову, піў і спаў, піў і спаў. Гэта была такая рэлаксацыя. Так адбылося і тады. Ён адрубіў тэлефон. Мы тры дні яго шукалі. І ўжо*

*ў дзень ад'езду Кася прыехала да яго, баючыся, што памёр. Ён адчыніў сам, але быў у такім стане, што проста ня мог ехаць. На стале сьпірцік стаяў. Кася ўсё ж пачала ўгаворваць — маўляў, паехалі, у аўтобусе адыйдзеце. Але Веня сказаў: «Я не паеду», і на гэтым усё скончылася».*

У безвыходнае сытуацыі Мроя зьвярнулася па дапамогу да Лёні Шырына. Ён быў таленавіты гітарыст, вельмі рухавы і ўспрымаў усё хутка. Але што можна паказаць на Басовішчы пасьля адной агульнай рэпэтыцыі? Урэшце вырашылі граць самыя простыя песьні. І атрымалася, мякка кажучы, непаразуменьне. Па двух мінулых выступах на Басовішчы ўсе чакалі ад Мроі валу музыкі, а выйшаў незразумелы гурт і зграў 8 вясёленькіх песенек. На фоне Крамы ды Улісу гэта выглядала бездапаможна. Той выступ яшчэ доўга гукаўся Мроі.

Лявон: «*Калі б зараз была такая сытуацыя, то ясна, што мы не паехалі б. А тады так карцела... І калі мы вярнуліся ў Менск, я сказаў: «Ён з намі граць ня будзе». Хаця Юрась вельмі адстойваў Веню, бо ён класны гітарыст. Але мяне ў жыцьці ніхто так не падстаўляў, як Веня той раз, і таму для мяне ягоны сыход быў пытаньнем вырашаным*».

Лявон сказаў так не дарма. У гурце ніколі не было ханжэй. І мала хто адмаўляўся ад прапановы «па пяцьдзесят». Але ніколі гэта не цягнула за сабой такіх наступстваў. Адносіны Мроі з алкаголем ды траўкай рэдка калі выходзілі за межы сьмешных гісторыяў, якія цікава пераказваць у сяброўскім коле. Вось, напрыклад...

# Разьдзел 8

# GARELKA, DRUGS & SAMAGON

Прызнайцеся хаця б самі сабе, што адразу перагарнулі кнігу на гэтую старонку. Нават зьдзівіўшыся вольнае інтэрпрэтацыі ў назове разьдзелу. Канешне, sex, drugs & rock-and-roll — гэта клясыка. Але пра rock-and-roll і так уся кніга. Пра sex... Ну як я магу пра яго распавядаць, калі ў суседнім нумары львоўскага гатэлю сэксам займаецца чалавек, якому 42, але які жадае выглядаць на 35, і заўтра зранку з таго нумару выйдзе дзяўчына, што натхніла Краму на песьню «А ў мяне ад доўгіх ног з'яжджае дах». А я тым часам сяджу і пад гукі за сьцяной пішу гэтую кнігу. Таму пра сэкс спытайце ў майго суседа (дарэчы, у юнацтве ён нядрэнна граў на бубнах і крыху шкадуе, што кінуў музыку), а я лепш — пра drugs & samagon.

І вас не чакае расчараваньне. Бо, перапыніўшы гаданьне, хто жыве са мной у суседнім нумары, вы пачуеце гісторыі пра спакусы і задавальненьні, пра дурноты чалавечыя — часам сьмешныя, часам жорсткія. І нават пра сьмерць. Пра тое, што камусьці і хацелася б схаваць, але немагчыма, бо ўсё адно нехта прагаворыцца.

### «Гэта мы пілі, а яны пелі»

Менская мастацкая вучэльня ніколі не была ўзорам прыстойнасьці ды цьвярозасьці. 15—16 год — дастатковы ўзрост, каб цягнуцца да спакусаў дарослага жыцьця. Прагна слухаючы гісторыі жыць-

ця мастакоў, яны паміж маралістам ды вэгетарыянцам Рэпіным і сканаўшым з-за п'янкі Саўрасавым, упэўнены, аддавалі сымпатыі другому. З захапленьнем чыталі пра Гагена, Ван Гога ды Латрэка. «Вінаграднікі цікавяць мяне толькі тады, калі яны патрапляюць у келіх», — часьцяком паўтараў Латрэк. «Гарэджы», «Эрэцы», «Сапэраві» — гэтыя назовы танных сухіх (а ўжо на ўсякіх бульбах-практыках, дзе сухога не было — «Агдам», «Вермут» ды мясцовыя чарлікі) часьцяком цікавілі будучых мастакоў ці ня больш, чым нацюрморты і пэйзажы.

Праўда, сярод галоўных «бухальшчыкаў» вучэльні мройчукі аўтарытэтам не карысталіся. Як аднойчы з абурэньнем перапытаў у мяне Віця Лосьмінскі (той самы, што зьеў фікус у ваенкамаце):

— Хто піў — Мроя? Гэта мы пілі. А яны пелі.

У гэтых словах ёсьць як мінімум адна праўда: калі мройчукі пелі, яны не пілі. Пытаньне было вырашана аднойчы і назаўсёды — фанатычнае стаўленьне да музыкі выключала любы «допінг» перад канцэртам.

Лявон: *«Мы занадта ашчадна, нават фанатычна, ставіліся да музыкі. П'яныя ня гралі ніколі. Нават на рэпэтыцыі нельга было прыйсьці нападпітку. Мы з Давыдоўскім неяк прыйшлі і старанна гэта хавалі. Ніхто й зараз ня ведае, што мы былі падшафэ».*

На ўсё астатняе распаўсюджваўся іншы прынцып. Нонканфармізм рок-н-рольнай тусоўкі не прыймаў ніякага іншага прынцыпу, акрамя таго, што жыцьцё трэба «пражыгаць». Стрыманасьць і памяркоўнасьць не віталіся.

«Мы жывем у апошні раз, / Мы жывем у поўны рост» сьпеў пазьней N.R.M. Не зусім пра тое, не на тых уражаньнях збудаваны, але тэкст адлюстраваў тагачаснае стаўленьне да жыцьця. Прыхільнікі здаровага ладу жыцьця калі й патрапляліся на шляху, дык хутка адыходзілі ўбок. Жыцьцё цудоўнае, асабліва пасьля 250-ці. Грамаў. Найбольш кіраваўся гэтым прынцыпам Алезіс (не забівай мяне

за праўду). Быў час, калі зь міліцыяй ён сустракаўся ці не часьцей, чым граў канцэрты.

Лявон: «*Алезіс піў ня болей, чым астатнія, але яго прабівала на агрэсію. Асабліва калі вакол усе былі свае. Бо калі мала было знаёмых, тады ён быў культурнейшы і класны чалавек. А ў іншых абставінах...*

*Неяк прыйшоў да Касі ў госьці. Напіўся. У такім стане на яго папросту не зважалі. І каб на сябе зьвярнуць увагу, ён узяў стол, за якім усе сядзелі, і проста паставіў яго дагары нагамі. Тады Алезіса вынеслі і выкінулі на вуліцу. Ён ламіўся назад доўга, але мы не пусьцілі. А зраніцы, а шостай, нехта грукаецца ў дзьверы. Кася кажа: «Мусіць, Алезіс». Адчыняем — стаіць. Кудлаты, пабіты.*

*— Што, — пытаемся, — з ментоўкі?*

*— Ну.*

*Аказалася, калі мы яго выперлі, ён пайшоў па горадзе. Праходзячы побач з інтэрнатам тэатральна-мастацкага інстытуту, вырашыў зайсьці ў прыбіральню. Вахторка яму кажа:*

*— Ну-ка, ідзіце адсюль, малады чалавек.*

*Алезіс паглядзеў на яе вачыма вар'ята, сказаў:*

*— Я цябе заб'ю, — і прайшоў у прыбіральню.*

*Вахторка спужалася, мо падумаўшы, што гэта нейкі сэрыйны забойца ці маньяк. Калі Алезіс спусьціўся, яго ўжо чакалі менты*».

### Грызя і яе хаза

Алкагалічнае жыцьцё на мяжы 80-х і 90-х віравала альбо па месцы працы, альбо на «хазах» — кватэрах музычных прыхільніцаў, якія зь нейкае шчасьлівае прычыны на пэўны час пазбаўляліся апекі бацькоў — справа на той час рэдкая, з прычыны агульнага дэфіцыту жыльля.

Што адно, што другое было небясьпечным. За часамі самай жорсткай барацьбы з алкагалізмам выкарыстоўваўся такі мэтад: міліцыянт заяжджаў у аўтобусны парк (тагачаснае месца працы

Лявона і Алезіса) на матацыкле і прыўздымаўся: дзе гарыць сьвятло, там, значыць, і п'юць. Калі сьвятла нідзе не было, мог прайсьціся й зазірнуць у кожны аўтобус. Не схаваўся — і чакае страшная параза ў правох.

Адным разам гэта скончылася сьмерцю. Намесьнікам дырэктара аўтапарку працаваў сярэдніх гадоў габрэй. Вяртаўся ён неяк зь дня нараджэньня. Натуральна, п'яны. Каб ехаць дадому, узяў таксоўку. І на хвіліну розум яго кінуў — так закарцела ў туалет, што папрасіў кіроўцу спыніцца, выйшаў і пачаў сікаць у сьметніцу. На няшчасьце побач ехалі менты. Заламалі рукі і прывезьлі ў выцьвярэзьнік. Зранку, прачнуўшыся і зразумеўшы, дзе знаходзіцца, чалавек зьвязаў разам некалькі прасьцінаў, перакінуў іх праз краты на вакне і павесіўся. Жыцьцё, якое палягала выключна на кар'еры, згубіла сэнс.

Піць на кватэрах было спакайней: пакуль суседзяў да сьмерці не зацкуеш, міліцыя не прыедзе. Таму хазы карысталіся папулярнасьцю. Самая знакамітая была на бульвары Шаўчэнкі, дзе жыла дзяўчына Марына па мянушцы Грызя. Маці яе часьцяком з'яжджала ў працяглыя замежныя выправкі і пакідала дачку адну ў трохпакаёвае кватэры. Роськвіт хазы прыйшоўся на 1985—1987 гг. У час, калі маці палявалі на дачок, каб вуліца іх не спаганіла, кватэра на бульвары была месцам, дзе бясьсьледна зьнікалі менскія рок-музыкі. Ды ня толькі менскія. Пэўны час у Грызі тусаваўся, напрыклад, Кінчаў — у перыяд, калі Алісу з-за абвінавачваньняў у фашызме цкавалі ў Расеі і гурт запісваў у Менску свой альбом «Шестой лесничий».

Мройчукоў на хазу прывёў Мікола Сьцепаненка — таленавіты чалавек, выпівоха, сьвецкі леў Траецкага прадмесьця і менскіх блатхат. У Траецкім тусавалася ўся «залатая моладзь» таго часу. Мроя ў поўным складзе не была выключэньнем. Алезіс сыйшоўся зь Міколам на глебе

пражыганьня жыцьця — усе дзеўкі яго ў той час кінулі, і што яшчэ рабіць, як ня піць. Дакладней, «шакаліць». Тэрмін значыў «раскруці на бабкі ўсіх, каго бачыш». Калі не ўдавалася знайсьці ахвяру, бралі на апошнія грошы бутэльку чарніла і ішлі да Грызі.

Гаспадыня ад утрыманьня хазы атрымлівала, па-першае, задавальненьне, а па-другое (як стала зразумела крыху пазьней) — прыбытак. 85—86-ты, як хто ня памятае — часы сухога закону і, адпаведна, страшэннага дэфіцыту алкаголю. Чэргі ў віна-гарэлачныя аддзелы, талёны... На першым паверсе ў Грызіным доме жыла баба Кацярына. Мела свае талёны. Дзесьці даставала яшчэ. Часу ў пэнсіянэркі, каб выстойваць чэргі, было досыць. Як вынік — у яе шуфлядах заўжды хавалася бутэлька-другая гарэлачкі ці партвейну.

У Грызі тым часам пілі. І, як заўжды, не хапала. Дзе ўзяць, каб дагнацца? Зразумела, у бабулі Кацярыны. Калі не было грошай, пакідалі ў заклад швэдары, курткі, адно што ня джынсы. Кажуць, Грызя ад пастаўкі кліентуры мела сваю капейчыну.

Лявон: *«І быў такі пэрыяд, што п'еш у Грызі ўсю ноч, а зранку каяньне такое: «Што ж я раблю, як жыву?». Лепей піць і радавацца, чым піць і так пагана сябе пачуваць. Але ўвечары ногі самі цябе нясуць туды, бо нехта тэлефануе і запрашае».*

## Подзьвіг Юрася

Напрыканцы 80-х у аўтапарку набралася вялікая кампанія рокераў. Акрамя Лявона і Алезіса там працавалі двое музыкаў з гурта Близнецы (у будучым Зартипо) — гітарыст Валера Шашок быў кантралёрам тэхнічнага стану аўтобусаў, а басіст Лёша Генералаў — інжынэрам па тэхніцы бясьпекі.

Звычайным мейсцам вечаровых п'янак была творчая майстэрня мройчукоў на тэрыторыі аўта-

парку. Пілі ў атачэньні лёзунгаў ды плякатаў. Тым вечарам, пра які пойдзе гаворка, акрамя Близнецов у майстэрню зазірнуў яшчэ і Юрык. Як звычайна, прынесьлі гарэлкі, кількі ў тамаце і для маскіроўкі выключылі сьвятло. Патрапляцца на п'янцы было нельга. Усе яшчэ памяталі гісторыю з самазабойствам намесьніка дырэктара аўтапарку. А Валера Шашок (адзіны партыйны ў той кампаніі) меў яшчэ й строгую вымову — за апошні месяц тры разы патрапляўся на п'янцы.

Лявон: «*Я тады некалькі месяцаў ня піў. І вымушаны быў сядзець зь імі цьвярозым. Нават паесьці не давалі: пацягнуўся заількамі, а яны мне па руках — маўляў, гэта ня ежа, а закусь.*

*Карацей, напіліся ўсе страшна. Пайшлі дадому. Я цягнуў Валеру. І тут Алезіса, як заўсёды, прабіла на дурныя паводзіны. Стаім на прыпынку, чакаем трамваю, і ён раптам пачынае зь Лёшам Генералавым тузацца. Маўляў, ну давай, паглядзім, хто мацнейшы. І быццам усё гэта жартам, а ў выніку перайшло ў нейкую валтузьню паскудную. Я іх хачу разьняць, але як толькі намагаюся пайсьці, Валера пачынае падаць, і ніяк ад яго не адыйдзеш. Я тады Юрыку кажу:*

— *Юрык, разьніміце іх!*

*А той стаіць, зламысна ўсьміхаецца і нічога ня робіць. Раней Алезіс і да яго ў такім стане некалькі разоў кідаўся, дык Юрык і гаворыць:*

— *Во, няхай яму хтосьці хоць раз па мордзе надае.*

*Карацей, выкачаліся яны па пабеленай сьцяне, валасы растрапаныя, выгляд жудасны, натуральныя бамжы. І тут, канешне, па тым баку вуліцы міліцыя едзе*».

Як Лявон з Валерам стаялі крыху ўбаку, іх і не забралі. Алезіса і Лёшу між тым ужо запхалі ў «варанок». І тут сваё слова вырашыў сказаць Юрык. Прага гераізму, што мірна спала ў ягонае душы, пад узьдзеяньнем алкаголю, нарэшце прачнулася. Ён падыйшоў да машыны і сказаў:

— Я таксама ў міліцыю хачу.

Людзі ў пагонах паглядзелі на яго як на вар'ята: «Валі адсюль», — селі і паехалі.

Аднак Юрык не супакоіўся. Сляды машыны і дэдуктыўны мэтад прывялі яго да ганку Цэнтральнага РУУС. Там стаяў і паліў міліцыянт.

— Гэта Цэнтральны РУУС? — запытаўся Юрык.

Той са зьдзіўленьнем паглядзеў на абсалютна п'янага чалавека, які імкнецца ў ментоўку, і сказаў, што так, Цэнтральны. Наш герой рашуча крочыў у адчыненыя дзьверы. Мо мроілася яму, што ў руках меч, а тое — логава трохгаловага дракона. Рэчаіснасьць між тым падманула. Галоў аказалася значна больш, яны былі апранутыя ў адну форму, сноўдалі туды-сюды, і што самае крыўднае — не зьвярталі на яго ўвагі. Юрык моўчкі стаяў пасярод аддзяленьня, а потым пачаў шоў.

Ён махаў рукамі, пытаўся, дзе ягоныя сябры, рабіў недвусэнсоўныя намёкі на сваяцкія сувязі ці не з паловай генералаў ад міліцыі і спрабаваў схапіць за руку кожнага, хто прабягаў побач. П'яную ды патлатую асобу шугаліся.

Юрык: *«Для міліцыянтаў гэта была новая сытуацыя. Ну ніколі яны ня бачылі, каб стаяў п'яны чалавек, якога яны нават пальцам не кранулі, і крычаў нешта пра сваякоў-генералаў. Праўда, праз паўгадзіны не стрымаліся. Падыйшлі двое і пачалі цягнуць мяне ў каталажку. Адзіным выйсьцем было яшчэ больш узвысіць голас».*

Юрыкаў крык «Сатрапы!!!» пачуў, здаецца, увесь раён. Менты перапужаліся і ад Юрыка адчапіліся. Невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б з другога паверху ў гэты час не спусьцілі Алезіса і Лёшу.

— Заўтра прыйдзеце ў суд, а зараз ідзіце, — сказаў ім нейкі палкоўнік і пасьля сэкунднага маўчаньня выразна папрасіў: — І гэтага... свайго... забярыце адсюль хутчэй!

Больш сакрамэнтальную фразу пачуў у сваім жыцьці ад ментоў толькі Алезіс.

Адбылося гэта недзе ў 89-м годзе. Хлопцы ўсё яшчэ працавалі ў аутапарку. Але плюралізм і дэмакратызацыя дасягнулі такога ўзроўню, што дзяржава больш не патрабавала абавязковага працаўладкаваньня. Алезіс зь Лявонам вырашылі звольніцца і стаць вольнымі мастакамі. Але заяву ім не падпісвалі ўжо болей за месяц. Адказ, што рабіць, прыйшоў у галаву Алезіса ў п'яным стане.

Лявон: *«Неяк мы засталіся начаваць у інтэрнаце тэатральна-мастацкага інстытуту ў Сяргея Рымашэўскага. А пятай раніцы пачынаецца ў пакоі нейкі шум. Глядзім — Алезіс устаў і некуды зьбіраецца.*

*— Куды ты? — пытаемся ў яго праз сон.*

*— У міліцыю, — адказвае той і тлумачыць: — Ідэя. Геніяльная ідэя. Я іду ў ментоўку, мацюгаюся, яны мяне забіраюць. Зранку пішуць па месцы працы, і мяне звальняюць за п'янку».*

Плян быў сапраўды геніяльны, каб не самі менты. Па-першае, а пятай раніцы знайсьці іх на вуліцы аказалася цяжка. Ці не гадзіну бадзяўся Алезіс, пакуль ня ўбачыў першага. Працягнуў да яго рукі і кажа:

— Забярыце мяне. Я п'яны.

Мент, скончыўшы зьмену, йшоў дадому і таму паслаў Алезіса куды падалей. Стомлены, зморфаны, але прынцыповы чалавек, Дземідовіч дацягнуўся да мясцовага РУУСу. Была шостая гадзіна раніцы.

— Забярыце мяне. Я п'яны! — зноў паўтарыў ён сваё заклінаньне і для ўпэўненасьці дыхнуў дзяжурнаму лейтэнанту ў твар. Той падняў сумныя вочы, і Алезіс пачуў тую самую фразу:

— Зараз нікога няма. Прыходзьце пасьля абеду.

Лішне казаць, што пасьля абеду Алезіс нікуды не пайшоў. Але з аўтапарку яго хутка звольнілі і бяз тых подзьвігаў.

Пазьнейшая гісторыя Алезіса ўтрымлівае і не такія прыгоды. Праз колькі год, ужо за часамі існа-

ваньня N.R.M., амаль не сарвалася прэзэнтацыя альбому «Одзірыдзідзіна». Бо вечар напярэдадні Алезіс правёў у пастарунку, зрываючы з ментоў пагоны, а бамжы, што сядзелі ў клетцы, ладзілі яму авацыю.

Тая гісторыя падзейнічала на яго моцна. Згубіўшы праз п'янку ці ня ўсю сваю спадчыну, ды тут яшчэ амаль не патрапіўшы за краты, ён кінуў піць. Не, не так, як, магчыма, гэта рабілі Вы — на тыдзень, два ці нават паўгода. Раз і, здаецца, назаўсёды. Без кадаваньняў і лекаў. Проста сказаў і зрабіў. Толькі год праз шэсьць ці сем я пабачыў, як ён дазволіў сабе бакал чырвонага віна, напалову разьведзенага вадой. Другі раз я пабачыў такое на ягоным вясельлі.

Хто паўторыць?

Лявон: *«Пры ўсіх сваіх экстравагантных паводзінах, Алезіс быў вельмі абавязковы чалавек. Што б ні здаралася, з-за яго мы не сарвалі ніводнага канцэрту за ўсе гады. Гэтым ён моцна адрозьніваецца ад таго ж Шота ці Вені, якія ў п'янцы гублялі адчуваньне рэчаіснасьці цалкам, забываліся на канцэрты і гурт».*

## Напой «Бурацінa»

На імідж гурта ўсе гэтыя гісторыі ніяк не паўплывалі. Дзякаваць за тое трэба выключна савецкае прэсе, якая на рок амаль не зьвяртала ўвагі. А калі і зьвяртала, то не даходзіла ў сваёй цікаўнасьці да такіх падрабязнасьцяў.

Алкаголікаў з Мроі зрабілі толькі адзін раз — у сумнавядомым артыкуле «Пена на хвалях перабудовы».

Мала хто ведае, што быў і другі раз. Толькі тады на абарону гонару беларускага рок-н-ролу стаў Адам Глёбус. Не, гэта ня была сацыяльная ці палітычная замова. Гэта была спроба прафэсыйна выканаць абавязкі журналіста. Аднак у выніку Мроя, наадварот, атрымала імідж цьвярозьнікаў.

Лявон: *«У 89-м годзе мы ехалі на фэстываль у Днепрадзяржынск. «Крыніца» — самы папулярны на той час маладзёвы часопіс — захацела напісаць пра гэта вялікі рэпартаж і адправіла з намі скандальнага журналіста Славу Ахроменку.*

*Ехалі на цягніку. Зь дзікім боем узялі недзе дэсэртнага віна (сухі закон быў у самым разгары). Ехалі і ціха пілі. У Днепрадзяржынску, ясная справа, працягнулі, бо там зь віном было неяк прасьцей. Слава за ўсім гэтым назіраў, назіраў, а прыехаўшы ў Менск, апісаў усё ў рэпартажы. Ды яшчэ ўпрыгожыў нашыя паводзіны нейснуючымі падрабязнасьцямі. Атрымаўся ня рок-фэстываль, а нейкі вінны марафон: «Папіўшы там, яны пайшлі на рэпэтыцыю... Папіўшы віна, зазірнулі на канцэрт... Палохаючы сваімі бляклымі пасьля мінулае ночы тварамі, Мроя прайшла праз сталоўку...». Выглядалі мы ў рэпартажы поўнымі алканамі».*

З такім тэкстам Ахроменка прыйшоў да Адама Глёбуса, тагачаснага рэдактара аддзелу «Крыніцы». Прачытаўшы рэпартаж, будучае «дрэннае дзіця» беларускае літаратуры сказаў:

— Слухай, Слава, гэта нельга даваць у друк. Хто б як да Мроі ні ставіўся, гэта ж твар беларускага року. А ў цябе паўсюль сухое віно ды сухое віно...

— Віно, не гарэлка ж, — спрабаваў адстаяць свабоду слова Ахроменка. Не атрымалася.

— Што ж рабіць? — спытаў ён у Глёбуса.

— Давай, Слава, замяні віно якім-небудзь больш прыстойным напоем. У нас усё ж такі маладзёвы часопіс.

Слава думаў доўга. І празь некалькі дзён выйшаў артыкул, дзе ўсе згадкі пра віно зьмяніліся на напой «Бураціна». Самой Мроі гэта спадабалася настолькі, што ў наступныя некалькі год пакупка «Бураціна» стала іх улюбёным прыколам. Часьцяком бутэлька з напоем стаяла на сцэне падчас канцэрту, падтрымліваючы імідж.

Пра што яшчэ не напісаў у сваім рэпартажы Слава Ахроменка — дык гэта пра знаёмства Мроі з камандай Шо з Крывога Рогу. А дакладней, зь іх цудоўнай крымскай шмальлю. Цяжкіх наркотыкаў музыкі Мроі ніколі не ўжывалі, старанна абыходзілі ўсе гераінава-какаінавыя менскія тусоўкі, але ад траўкі пры выпадку не адмаўляліся. Праўда, вопыт збольшага быў ня вельмі цікавы — ці то траўка патраплялася дрэнная, ці то настрой ня той быў. А тут адарваліся ад перасьледу Ахроменкі, забеглі ў нумар да братоў-хахлоў, зацягнуліся па разу і ўсіх торкнула. Прычым торкнула так, што ад Шо пасьля першага касяку запатрабавалі другі, а потым і трэці. Людзі вопытныя, тыя спыталіся: «Хлопцы, а можа досыць?» Што значыць «досыць»? — не зразумелі мройчукі, і пайшло такое вясельле, што самі хахлы паціху ўсталі і неўпрыкмет зьніклі за дзьвярыма.

Мроя весялілася ўвесь вечар. Толькі гукарэжысэр Алег Каранькоў моўчкі пайшоў у ванную. Узгадалі пра яго праз гадзіну. З крану ў ваннай ліўся струменьчык вады. Алег сядзеў на краі ванны, падставіўшы пад той струменьчык палец, і глядзеў на ваду.

— Алег, што з табой, табе дрэнна? — крыху спужаліся ўсе.

— Ды не, проста піць хочацца, — мэлянхалічна адказаў той, нават не адарваўшы ад вады позірку. Вясельле працягвалася...

Алега нельга асуджаць — ён заўсёды цягнуўся да новага. Падсьвядомае імкненьне да нязьведанага шмат разоў выходзіла яму бокам. Але ж і Каперніку праз тую ж самую любоў не пашанцавала...

Розьніца паміж Каперікам і Алегам толькі адна — замест навуковых адкрыцьцяў гукарэжысэр Мроі забясьпечваў сьвет (а дакладней, беларускую рок-н-рольную тусоўку) вясёлымі гісторыямі. Адна зь іх стала клясыкай...

Справа адбывалася летам. Маці папрасіла Алега схадзіць па хлеб. «Добра», — сказаў паслухмяны сын, узяў торбачку і зачыніў дзьверы. Аддаўшы ў касе 20 капеек за батон ды 18 за чорны, пайшоў дадому. На вуліцы ягоны позірк спыніўся на яркіх нэонавых літарах «Кафэ». «Першы раз бачу. Трэ зайсьці, паглядзець», — падумаў Алег і скіраваў у той бок. Няўжо ён ня бачыў, што літары тыя сваім выглядам нагадваюць сірэнаў?

З паўзмроку кафэ выбіваліся некалькі сталоў, барная стойка і велізарны акварыюм. «Як прыемна», — зноў падумаў наш герой і скіраваў да бару. Сярод бутэлек пабачыў лікёр «Амарэта». Справа па тых часох новая, але ж вы не забыліся Алегавы густы.

— Сто граммаў «Амарэта» — сказаў ён бармэну.

— «Амарэта» толькі з кавай, — пачуўся адказ.

Гэта цяпер мы б зьдзівіліся. Мы нават абразіліся б такімі словамі. А тады Алег проста ўдакладніў замову:

— Каву і сто «Амарэта».

Выпіў. «Паўтарыце», — папрасіў. Ніхто не адмовіў. І яшчэ 100 з кавай. І яшчэ. Гісторыя не даводзіць, колькі прайшло часу, пакуль Алег вырашыў, што варта й дадому ісьці. Выйшаў з кавярні, зрабіў пару крокаў і пабачыў старога знаёмага. Гэта ўжо была кампанія!

— Слухай, — кажа, — там «Амарэта» з кавай наліваюць. Пайшлі?

У бары вяртанньню Алега, ды яшчэ з кампаніяй, радыя не былі.

— Зачыняемся, — сказала яму афіцыянтка на просьбу зрабіць дзьве кавы з «Амарэта».

— Не, вы не зачыняецеся. Вы зараз жа нальеце мне каву з «Амарэта»!

— Ідзіце дадому, а то выклічам міліцыю, — стаяла на сваім дзяўчына.

— Ды баяўся я вашую міліцыю... Вы мне наліце «Амарэта» з кавай!!

Сябра тым часам, прадчуваючы разьвіцьцё падзеяў, паціху сыйшоў. Алег працягваў спрэчку.

— Зараз жа наліце мне каву з «Амарэтай», а інакш... — ён шукаў нейкіх аргумэнтаў, пакуль позірк не спыніўся на акварыюме, — ...інакш я разаб'ю ваш акварыюм! — і занёс кулак.

— У вас не атрымаецца, тут шкло таўшчэзнае, — сказала дзяўчына і падпісала акварыюму сьмяротны прысуд.

— У мяне не атрымаецца?! — зьдзівіўся Алег і з усёй моцы ўдарыў.

Шкло вытрымала. Але й кулак таксама. Алега было не спыніць. Ён замахнуўся і ўдарыў другі раз. Акварыюм трэснуў, шкло яшчэ некалькі сэкундаў трымала напор вады, а потым вадаспад з рыбкамі выліўся на падлогу. Мала! Алег зь нянавісьцю пачаў трушчыць нагамі ні ў чым не вінаватых гупі, барбусаў ды мечаносцаў. Забіў усіх. Акрамя сомікаў, якіх чамусьці паважаў болей за астатніх.

— А што мне было рабіць? Не афіцыянтак жа біць, яны ж жанчыны, — тлумачыў пазьней сваю нянавісьць да акварыюму Алег.

Тым часам ужо пад'ехала міліцыя. Два сяржанты ляцелі праз пакой да хулігана. Аднаму ён даў у сківіцу. Другога таксама неяк паваліў на падлогу. Трэці аказаўся лейтэнантам. Тут Алег спыніўся. Вырашыў, што біць афіцэра міліцыі — гэта ўжо сур'ёзна.

У пастарунку ён заўважыў, што хлеб і батон усё яшчэ разам зь ім. За супраціўленьне міліцыі сьвяціў Алегу артыкул. Але, скарыстаўшы нейкія сувязі, адмазаўся. Знаёмы палкоўнік сказаў:

— Справы ня будзе, толькі сходзі ў кафэ, павініся і разьбярыся ты з гэтымі рыбкамі...

Так і зрабіў Алег. Купіў новых рыбак, дараваў акварыюму новае жыцьцё, але ў той бар болей не заходзіў...

## Разьдзел 9

## 1992–1994. ШЛЯХ ДА СЬМЕРЦІ

Лёня Шырын адыграў з Мрояй Басовішча. На тым і скончылася. На ягонае мейсца прыйшоў Алег Піпін. Гітарыст добры, але з тусоўкі «гераіншчыкаў». Сам ён сядзеў на «калёсах», і скончылася ўсё гэта дрэнна, а магло яшчэ горш.

### Дзіўнае самазабойства

У верасьні 92-га пасьля канцэрту на Дзень Беларускае Вайсковае Славы на Плошчы Незалежнасьці Лявон, Юрась, Піпін са сваёй дзеўкай, Ангус з Тарнада і яшчэ пару чалавек паехалі да Віталя Сямашкі. Жыў ён тады ў інтэрнаце на Авангарднай, побач зь дзіцячай чыгункай і Паркам Чалюскінцаў. Набралі гарэлкі ды віна. Праз гадзіну-другую выпілі ўсё, зьбегалі яшчэ, ды пачаліся пустыя п'яныя размовы.

Сямашка: *«Памятаю, мы з Лявонам выйшлі на калідор. Селі, гаманілі, і паміж усяго неяк думка агульная прамільгнула — нешта насоўваецца. Так і адбылося».*

Бліжэй да раніцы з пакою зьехалі ўсе, акрамя Лявона і Ангуса. Піпін зь дзеўкай сыйшоў апошнім. Ангус заснуў, Лявон зь Віталем сядзелі за чарговай бутэлькай гадзіны да чацьвертай-пятай, а потым і яны паваліліся на ложкі. Але ненадоўга. А шостай у дзьверы ўвалілася вахторка з крыкамі пра забойства. Унізе стаяў, трэсься Піпін, вочы шалёныя і гаварыў толькі пра тое, што зараз прыедзе міліцыя.

Віталь Сямашка: *«Як выходзіш з майго інтэрнату, дык бліжэйшы шлях да прашпэкту Скарыны — праз Парк Чалюскінцаў. Там яе і знайшлі — дзеўку Піпіна. Яна сядзела ля сасны, на шыі ланцуг з бляхамі. Ён быў перакручаны так, што незразумела, ці сама задушылася, ці хто дапамог.*

*Я, пачуўшы пра міліцыю, пабег наверх, усіх растрос, хутка прыбралі бутэлькі. І як прыбіралі, я знайшоў кучу таблетак у прыбіральні. Гэтыя Піпін са сваёй дзеўкай імі, канешне, нажраліся, схаваўшыся ад усіх».*

Да гэтага часу ніхто ня ведае, што здарылася ў парку. Але экспэртыза нібыта вызначыла, што дзяўчына павесілася сама, і справу закрылі.

Юрась: «*Пасьля гэтага выпадку мы за галаву схапіліся: Божа, з кім мы зьвязаліся, на храна нам гэтыя наркаманы, ідыёты кончаныя, што на дрэвах вешаюцца?! Мы ж нармальныя, нам гэтая нарката па барабану! Нам бліжэй чысты прадукт — выпіў, пабляваў, і здаровы*».

Піпін пасьля таго выпадку з Мроі сыйшоў. Вольскі пад уражаньнем ад падзеяў амаль год ня піў нават піва. Пачаліся пошукі новага гітарыста. Але раней за яго ў гурце зьявіўся другі бубнач — бо ўсё часьцей і часьцей хлопцы выказвалі незадавальненьне грой Алезіса. Выгнаць не наважваліся і выбралі варыянт з «граючым трэнерам» — на рэпэтыцыі пачаў хадзіць Юра Цынкевіч, які мусіў крыху «падцягнуць» Алезіса, а потым пачаў падмяняць яго на некаторых канцэртах. На Басовішчы 1992 г. палову праграмы адыграў Алезіс, а другую палову Цынкевіч. Музыка ён быў нядрэнны. «Граў добра, але тупа», — скажа пра яго пазьней Лявон.

### Шот і Цынкевіч, «браты-махляры»

Менавіта Цынкевіч прывёў у гурт Віктара Шота, маладога чалавека, схільнага да п'янства. Аднак свае рэкамэндацыі яму даў Юрась, і да таго ж на той час ён быў зашыты.

Юрасы: *«Гэта быў музыка ад Бога, які добра адчувае ноты. Калі б яго навучылі граць на саксафоне, ён бы і на саксафоне супэр граў. Таленавіты чалавек. Сам зь Дзяржынску, здаецца.*

*Пазнаёміўся я зь ім на самым пачатку Мроі. Як я быў адказны за ўсю тэхніку, дык мне далі нейкія грошы на набыцьцё апаратуры. Я знайшоў спэкулянтаў музычных. Яны цягалі мяне па розных «кропках», паказвалі, дзе што ёсьць. Я, лішне казаць, выбіраў паякасьней ды патаньней. З гэтае нагоды я і ў Дзяржынск езьдзіў і ў Шота дома быў, але ня памятаю, што з апаратуры ў яго набываў.*

*Як ён да нас прыйшоў, я ўпэўніўся ў тым, які ён таленавіты хлопец. Але ў яго ў галаве былі нейкія прусакі. Фрэйда трэба чытаць, каб разабрацца. Быццам дасягаюць такія людзі чагосьці, а потым бац, і зрываюцца...»*

«Зашыты» Шот быў бы добрым набыткам для гурта, калі б не адна дробязь — на пару з Цынкевічам яны былі авантурыстамі і дробнымі махлярамі. Пастаянна камусьці штосьці вінныя, у пошуках грошай, хітраватыя. Мроя спазнала гэтыя рысы іхніх характараў напоўніцу.

Пачалося з таго, што аднойчы ў Лявона прапалі клявішы. Захоўваліся яны ў студыі, ключы ад якой мелі ўсе ўдзельнікі гурта. Між тым наперадзе было некалькі канцэртаў. Дадатковай складанасьцю стала тое, што Лявон меў даволі рэдкую мадэль Roland. Купіць яе ў Менску было немагчыма. Перавучвацца на іншую не было часу. Прыйшлося тэрмінова пазычаць грошы па сябрах і замаўляць Roland у Польшчы.

А праз пэўны час лявонаўскія клявішы ўсплылі ў Піцеры. Высьветлілася, што Цынкевіч перадаў іх туды ў якасьці пазыкі. Што самае агіднае — піцерскія хлопцы, у чыіх руках апынуліся клявішы, прапаноўвалі Лявону... купіць іх.

Другой стратай стала гітара. Яе купілі на агульныя грошы для Шота, бо сваёй ён ня меў. Праз некалькі месяцаў Шот і Цынкевіч прадалі яе. Ап-

раўданьне прыдумалі такое неверагоднае, што за даўнінай гадоў яго ніхто ня памятае. Такія гісторыі не маглі ня мець наступстваў. У Цынкевіча забралі ключы ад студыі, ён болей ня граў на канцэртах. Дзіўна, але пры ўсім тым ён яшчэ пэўны час круціўся вакол гурта і нават сасватаў на месца Шота новага гітарыста — Віктара Смольскага.

Неабходнасьць у новым гітарысьце ўзьнікла з банальнае прычыны — Віця Шот разьвязаўся. Выпіў адзін раз, другі. А потым увайшоў у запой.

Лявон: *«Запоі ў яго былі не такія, як, напрыклад, у Вені. Той піў некалькі дзён, тыдзень, але потым зьяўляўся. Віця Шот, разьвязаўшы, ехаў у свой горад і там прападаў на год».*

Так здарылася і ўвесну 1993 г. Ён не зьявіўся на адну рэпэтыцыю, другую. Усе тэлефоны маўчалі. Потым нехта сказаў, што бачыў Віцю ў родным Дзяржынску. Цынкевіч сеў на электрычку і паехаў вызваляць сябра ад зялёнага зьмію. Але нічога не атрымалася.

### Іншыя героі часу

За зьменамі гітарыстаў Мроя не заўважыла, як адыйшла ў цень іншых. Не, іх яшчэ запрашалі на звыклыя мерапрыемствы кшталту «Рок па вакацыях» ды на дробныя фэстывалі кудысьці ў Берасьце. Але героямі былі ўжо іншыя людзі.

Уліс, які пасьля магутных «Чужаніцы» і «Краіны доўгай белай хмары» выдаў у 1993 г. «Танцы на даху», тая ж Крама. Недзе ў тыя часы, крочачы па сходніках у мэтро «Плошча Якуба Коласа», я пабачыў афішу іх канцэрту. Месца, час, і ўверсе нясьціплааршыннымі літарамі: «Авангард беларускага рок-н-ролу». Але чаму «нясьціпла», калі праўда? У 1992—1993 гг. гурт запісвае свае самыя моцныя альбомы «Хворы на рок-н-рол» і «Гэй там, налівай». Блюзава-рокавыя мэлёдыі, губны гармонік Варашкевіча, выбітныя тэксты Зьміцера Лукашука ды ў дадатак цудоўная апрацоўка старых бон-

даўскіх хітоў кшталту «Стэфкі» і «Слуцкае брамы» зрабілі з Крамы герояў. «Бяжы, бяжы, хлопец» ды «Будзь разам з намі» ўвогуле сталіся гімнамі пакаленьня рамантычнае дэмакратыі. Дэмакратыі, якая Мрою і забіла.

Лявон: *«Мы не маглі сябе знайсьці ў час росквіту дэмакратыі. Мы былі змагарамі і іміджам і душою. А на той час змагарства сталася абсалютна непатрэбным. Зьявіліся больш рэспектабельныя каманды — Уліс і Крама...»*

Віталь Сямашка: *«Скончыўся час рокавай мітынговасьці. Пачаўся час выступу на сцэне. І стала зразумела, што Мроя адпрацавала. Было бачна, што Лявон б'ецца крыламі аб лёд стандартызаваных музычных формаў. Таму, калі Мроі ня стала — гэта было творчым і асабістым пратэстам Лявона супраць некалькіх апошніх год жыцьця гурта».*

Перадсьмяротны дыягназ Мроі толькі пацьвердзіўся тым фактам, што ў 1992 г. гурт становіцца намінальна напаўдзяржаўным калектывам, а менавіта — прымаецца ў штат Белканцэрту. Гэта была новая структура, якую стварылі пры Белдзяржфілярмоніі з мэтай набраць колькі дзясяткаў калектываў, каб раз'яжджаць потым зь імі па гарадох ды вёсках, забаўляючы народ. Магнітам для рок-гуртоў, што падаліся ў новую структуру, была халяўная рэпэтыцыйная база ў той жа Філярмоніі.

Праслухоўваньне гуртоў адбывалася ўлетку 1992 г. чамусьці на заводзе халадзільнікаў. Прыперся шмат хто. Мроя таксама зграла дзьве ці тры песьні — звычайны тагачасны свой хард-рок. «Прыёмную» камісію ачольваў Анатоль Ярмоленка. Пасьля выступу ён падыйшоў да Лявона і нечакана запытаўся: «Вы што, вакаліста памянялі?»

— Ды не, — адказвае Лявон — той жа самы...

У Ярмоленкі — зьдзіўленьне на твары:

— Дык ты ж як Deep Purple пяеш?!

Лявон яму:

— Ну, зараз такую музыку граем, я так і сьпяваю. Раней іншую гралі, па-іншаму і сьпяваў.

— Ну дык супэр, — узрадаваўся дзядзька Анатоль — Лічыце, што вас узялі.

Лявон: *«І ён нам сапраўды паспрыяў, каб нас залічылі ў штат Філярмоніі. Я па дакумэнтах праходзіў як саліст-вакаліст другой катэгорыі. У нашы абавязкі ўваходзіла выступаць на мерапрыемствах, якія ладзіў Белканцэрт. Але за тры ці чатыры гады пад дзяржаўным дахам мы згралі толькі адзін раз — ужо за часамі N.R.M. на нейкім сьвяце гораду пад фанеру злабалі «Дарогу» і яшчэ нешта.*

*А больш нас нікуды не запрашалі, бо мы ні ў якія іхнія «салянкі» канцэртныя ня ўпісваліся. Нас трымалі толькі з-за беларускае мовы — для адмазу. Прыходзіць, напрыклад, нейкая праверка ў Філярмонію, каб высьветліць, як выконваецца закон аб мовах, а ім і кажуць: «Вось, пабачце, у нас два беларускамоўных калектыва ёсьць» (бо акрамя нас яшчэ й Новае Неба ўзялі).*

*Пакрысе на нас і нажываліся — маглі выпісаць касьцюмы, фіктыўныя ганарары... Зразумела, што мы нічога з гэтага дабра ня бачылі і трымаліся там толькі з-за памяшканьня для рэпэтыцыяў».*

## Загінуўшы альбом

Пакуль Крама ды Уліс адзін за адным выдавалі альбомы-гіты, Мроя сьцішылася. Яшчэ ўлетку 1991 г., амаль адразу пасьля выданьня «Біяполя», на 1-й студыі дзяржрадыё запісаліся дзьве песьні — «Так і трэба» і «Беларуская Афрыка». Яны круціліся ў гіт-парадзе «Беларускай маладзёжнай», займалі там нейкія, у тым ліку і першыя, месцы. Да новага альбому справа дайшла толькі ў наступным годзе. Пры Доме піянэраў на вуліцы Чыгладзэ існавала невялічкая студыйка «RBS-studio». Менавіта там з рэжысэрам Валодзем Маркевічам і запісаліся песьні

«Сонца і аблокі», другі варыянт «Так і трэба», «Наша песьня», «Гэй, кіроўца», «Шлях да сябе», «Гульня ў жыцьцё»... Аднак трэкі так і засталіся ў нязьведзеным стане, а потым былі сьцертыя.

Юрась: *«Мы ж фінансамі не распараджаліся ніколі. Усе фінансавыя расклады былі ў дырэктара, Міхала Амельяновіча. А ён у той час ад нас зваліў, і мы засталіся на бабáх. І не змаглі выкупіць матэр'ял».*

Алезіс: *«Калі ня выйшаў той апошні запісаны альбом, крызіс узмацніўся. Яны самі па сабе напусьцілі ў гэты альбом кандовага хард-року, які быў увесь ужо сыграны ў 70-я гады. Мы патрапілі ў рамкі аднаго вузканакіраванага стылю, і нас гэтыя рамкі задушылі. Праграма атрымалася нецікавая. Было адчуваньне, што мы лезем у нейкае балота».*

Лявон: *«Мне не падабалася, што спыняецца прагрэс. Па стылі гэта быў цяжкі рок-н-рол, а па тэкстах нейкі абсурд, парадаксальны гумар, заведама мала папулярны. Ды й ня вельмі жыцьцяздольны».*

Пазьней на той жа студыі з тым жа ж рэжысэрам былі запісаныя «Ноч за вакном», «Віно і хлеб», «Свабода», «Дзеўчына з чароўнаю ўсьмешкай». Было гэта ўжо ўлетку — пачатку восені 93-га, калі на гітары граў ужо Віця Шот. Але ізноў матэр'ял ня быў нідзе скарыстаны. «Віно...» і «Дзеўчына...» пабачылі сьвет на складанцы «Рок супраць рэвалюцыяў» з аднайменнага фэстывалю. Астатнія песьні парынулі. Як і новы варыянт «Свабоды» і «Усё напалову», што пісаліся ў студыі «Песьняроў» яшчэ пазьней, ужо разам зь Віктарам Смольскім.

### Зьмены гітарыстаў працягваюцца. Віктар Смольскі

Смольскі, што прыйшоў на месца Шота, быў, бадай, самым выбітным на той час гітарыстам у Беларусі. Музыка-вундэркінд, ён прафэсыйна

граў на гітары ўжо ў 11 год, а з 14-ці быў прыняты ў другім складзе Песняроў і бадзяўся зь імі па абшарах Савецкага Саюзу. Да прыходу ў Мрою ён пасьпеў стварыць уласны гурт Инспектор, зь якім выправіўся на гастролі ў Нямеччыну. Там быў заўважаны заходнімі прадзюсарамі і ў рэшце рэшт зьехаў на Захад назаўсёды. Аднак перад гэтым пасьпеў пайграць у Мроі.

Юрась: *«Смольскі быў высачэзнага кшталту гітарыст, акадэмічны чувак, з нармальнай тэхнікай. Ён адзін на сцэне мог паўгадзіны працаваць. І дзікім плюсам ягоным было тое, што ён прыходзіў са сваімі музычнымі тэмамі, напрацовачкамі. І ён вучыў нас, як граць, паказваў нейкія азы. У яго зараз школа музычная ў Германіі, дык дзеці там у 16 год вучацца таму, што мне паказваў Смольскі ў мае амаль 30, хаця я гэта мусіў ведаць ад таго моманту, як да гітары дакрануўся»*.

Лявон: *«Смольскі прыйшоў вельмі самаўпэўненым і таксама памяняў крыху фармат. Мы пачалі граць ужо такі хард-энд-хэві прадвінуты, з усялякімі моднымі ўстаўкамі. Але гэта было так далёка ад таго, што нам трэ было граць... Гэта была поп-індустрыя, прычым у Беларусі абсалютна незапатрабаваная»*.

Аднак прафэсіяналізм Смольскага на пэўны час стварыў падманлівае адчуваньне музычнага росту. У самападмане Мроя дайшла да неймавернага — згоды з тэзай пра першаснасьць тэхнікі над тэкстамі і энэргетыкай музыкі. Прадчуваньне немінучага канцу заглушылі і яшчэ дзьве падзеі, што дадалі хлопцам збольшага станоўчых эмоцыяў, — вандроўка ў Данію на буйнейшы рок-фэст у Роскільд і чарговае Басовішча.

## Апошнія фестывалі. Данія і Басовішча

Запрашэньне ў Данію летам 1993 г. атрымала ня Мроя, а Новае Неба. Гэта быў адзін з буйнейшых эўрапейскіх рок-фэстаў. Тым годам у Рос-

кільдзе гралі Red Hot Chili Peppers, Midnight Oil, Velvet Underground, Chris Isaak...

Новаму Небу дапамаглі дацкія студэнты-славісты, што напярэдадні стажыраваліся ў Беларусі. Паехаўшы дадому, яны захапілі шмат касэтаў, якія і перадалі ў аргкамітэт фэстывалю. Там выбралі Касін гурт, які па складзе тады амаль дубляваў Мрою.

Лявон і Кася на той час ужо даўно жылі ў грамадзянскім шлюбе. Хутка наладзіўся і «творчы саюз» — амаль увесь склад Мроі пачаў «падпрацоўваць» і ў Новым Небе. Гэта не выглядала залішне ненатуральна — НН грала музыку, адрозную ад Мроі. Кася толькі адыходзіла ад бардаўскае песьні, шмат экспэрымэнтавала са стылямі, інструмэнтамі. Гэтым і зацікавіліся датчане.

Вандроўка была абсалютна халяўная — прымаючы бок аплочваў праезд ды пражываньне для 10 чалавек. І таму Лявон з Касяй не знайшлі лепшае думкі, каб пацягнуць з сабой увесь кагал — ня толькі склад Новага Неба, але й таго ж Смольскага, Цынкевіча, якія да гурта ня мелі ніякага дачыненьня. Дабром гэта ня скончылася.

Лявон: *«У Даніі была зробленая школьная памылка музыкаў — ніколі нельга даваць дэму аднаго матэр'ялу, а граць іншае. Арганізатарам мы перадалі касэту 90-га году — «Дзеці чорнага гораду». А тут ужо 93-ці. У нас рэпертуар мяняўся, усё ішло наперад. Ды яшчэ Кася пагарачылася, выгнала віяланчэлістку і скрыпачку, што было вялікай памылкай, бо гучаньне зь імі было цікавым. А так мы пачалі граць інтэлектуальную музыку са страшнымі наваротамі. І нават песьні «Дзяцей чорнага гораду» з новым складам гучалі па-іншаму. А арганізатары хацелі менавіта тое, што яны пачулі на дэма, — крышку этнікі, кабарэ нейкага. І раптам прыяжджае брыгада, якая грае інтэлектуальны рок. Канешне, яны былі расчараваныя».*

Правалам назваць выступ НН нельга, але кіслыя твары арганізатараў сьведчылі самі за сябе.

Запрашэньня на наступны год чакаць было ня варта і пачаліся пошукі вінаватага. Ім прызначылі Алезіса. Той і сапраўды зграў пагана. Ягоны крызіс, праз які ў Мроі ўжо зьявіўся Цынкевіч, толькі прагрэсаваў. Хутка ўжо, хутка ён стане каталізатарам распаду Мроі. Але пакуль Кася выгнала Алезіса з Новага Неба. Праўда, для НН гэта ня стала панацэяй. Больш за тое — хутка з гурта сыйшлі і Вольскі і Юрась.

Лявон: *«Ужо пасьля Даніі пачалася дурная штука, што мы зайздросьцілі Касі і яе запрашэньням за мяжу. А потым яна зайздросьціла нам з-за нашага статусу ў Беларусі. Так усё і скончылася...»*

Ня лепшы ўласны выступ тым ня менш не перашкодзіў атрымаць асалоду ад самога фэстывалю, ад атмасфэры сьвята. Нідзе ў Беларусі далучыцца да такой было немагчыма. Адразу некалькі сцэнаў, дзясяткі тысячаў народу, дзікі адвяз, шалёная энэргетыка.

Лявон: *«Я перад Даніяй амаль год нічога ня піў — пасьля тае гісторыі зь сяброўкай Піпіна. А тут пабачыў натоўп панкаў, агульную вясёласьць і зноў пачаў піва піць»*.

Пасьля Даніі ўсе паехалі ў Польшчу на чарговае Басовішча. Праблемай стаў амаль двухтыднёвы перапынак паміж фэстамі. Сэнсу вяртацца ў Менск — ніякага. Трэ было неяк бавіць час. Ахвярай у рэшце рэшт стаў Беласток.

Прыехалі, пасяліліся ў гатэлі. І пачалося... Ну сапраўды, што рабіць тыдзень у Беластоку, калі месца для рэпэтыцыяў няма, ды й рэпэтаваць ня трэба — да гэтага ў Менску і Роскільдзе зграліся добра. Заставалася толькі піць. Найбольшую актыўнасьць праяўлялі Юрась, Алезіс ды Смольскі.

Нейкім днём знайшлі яшчэ аднаго партнэра для п'янкі — эмігранта зь Беларусі, што ў Беластоку гандляваў бананамі. Гулянка пачалася ад ранку. Людзі маладыя, моцныя, пратрымаліся да вечара. Але стан быў адпаведны. У суседнім нумары між

тым жылі клуначнікі-маскалі. Бліжэй да ночы яны пачалі грукаць у дзьверы і прасіць спыніць п'янку зараз жа.

— А то выклічам паліцыю! — вішчэла нейкая цётка, чым і наклікала бяду ня толькі на сябе, але й на сяброўак.

Юрык узьняў галаву ад стала, адчыніў дзьверы і пракрычэў:

— Вон адсюль!!!

Слова за слова — пачалася сварка. Маскалі зразумелі, што справа ідзе да скандалу, і зачыніліся ў нумары. Але беларускіх хлопцаў было ўжо не спыніць. Адарваўшы ад сьцяны вогнетушыцель, яны паднесьлі яго да замочнае шчыліны, сарвалі плёмбу, націснулі на рычаг і запенілі ўвесь пакой.

Не на жарт перапужаныя маскалі выклікалі-такі паліцыю. Але, як і ўсе ў Беластоку, тыя нікуды не сьпяшаліся. За наступныя паўгадзіны хлопцы пасьпелі напіцца ўвогуле да непрытомнага стану. Юрык з Алезісам спалі ў нумары. Смольскі сядзеў на вуліцы на лаве, зьвесіўшы галаву, і толькі што сьліна не цякла ў яго з роту.

Паліцыя хутка высьветліла, што п'яныя — з Беларусі, а перапужаныя «пацярпелыя» — з Расеі. Невядома, што спрацавала — сімпатыя да першых ці антыпатыя да другіх, але далей падзеі разгорталіся так.

*Паліцыя* (ацаніўшы стан беларусаў, зьвяртаецца да цётак-клуначніц. Інтанацыя — іранічная): — І што, вось гэтыя недарэкі падвергглі вас такой экзэкуцыі?

*Маскалі*: — Канешне, яны. Вось той асабліва. (Паказваюць на Смольскага.)

*Паліцыя* (гледзячы на непрытомную фігуру Смольскага, якая ўжо ляжыць на лаве): — Вось гэты?

*Маскалі*: — Гэты, гэты!!!

*Паліцыя*: Прабачце. Але ГЭТЫ, пры ўсім жаданьні, ня мог.

На тым інцыдэнт скончыўся. Маскалі пераехалі ў іншы гатэль. А беларускія хлопцы папілі яшчэ два-

тры дні і стаміліся. Як надыйшло Басовішча, усе палекаваліся і былі абсалютна адэкватнымі.

Лявон: *«Мы тады добра згралі. Можна сказаць, цалкам рэабілітаваліся за мінулае Басовішча. Але сам стыль мне быў ня вельмі блізкі. Некалькі песень там было новых, прагрэсіўна-рокавых. Але нецікава мне гэта было. Мала энэргіі ва ўсім. Клаунада адна, кшталту Guns n' Roses».*

## Зьяўленьне Піта

Тое, што павінна было адбыцца, адбылося. Смольскі, які даўно не хаваў плянаў эміграцыі ў Нямеччыну, зьдзейсьніў мару. Расстаньне прайшло лёгка і бязь сьлёз. Мо таму, што ніхто і ніколі не лічыў яго неад'емнай часткай Мроі. Мо таму, што і сам Смольскі хутчэй за ўсё адчуваў сябе кімсьці кшталту сэсійнага музыкі (прынамсі, зрабіўшы ўдалую кар'еру ў Нямеччыне, ён зараз ані ва ўласнае біяграфіі, ані ў інтэрвію ня ўзгадвае пэрыяд супрацоўніцтва з Мрояй).

З сёньняшніх пазыцыяў сыход Смольскага ўвогуле можна назваць пазытыўнай падзеяй. Флёр музычнай віртуознасьці, што ён напускаў, зьнік разам зь ім. На сцэне засталася купка пасярэдніх інструмэнталістаў, якія ўжо не зусім разумелі, што, навошта і для каго яны граюць. На Вольскага ды Алезіса пачало з новай сілай накатвацца тое, што Смольскі здолеў на пэўны час заглушыць сваімі сола, — адчуваньне фальшу. Хутка гэты нарыў прарве. Але пакуль пачаліся пошукі новага гітарыста. Размова ня йшла пра тое, каб знайсьці адпаведную замену. Па ўсім было бачна, што гэта немагчыма — да ўзроўню Смольскага ў тагачаснай беларускай музыцы не дацягваў амаль ніхто. Тым болей неверагодна было знайсьці вольнага гітарыста добрага ўзроўню. Менавіта ў такой сытуацыі ў Мроі апынуўся Піт Паўлаў.

## Разьдзел 10

## 1994. СЬМЕРЦЬ МРОІ І СТВАРЭНЬНЕ N.R.M.

«У той час Мроюя ненавідзеў», — прызнаўся мне неяк Піт Паўлаў, гаворачы пра ўласныя музычныя практыкаваньні канца 80-х гадоў. У 94-м, калі яго самога запрасілі ў гурт, стаўленьне зьмянілася на больш станоўчае. Але ўсё адно прыход Піта ў каманду быў у нейкім сэнсе недарэчнасьцю. Гэта магло тлумачыцца чым заўгодна — жорсткай неабходнасьцю (праз сыход Смольскага), неразборлівасьцю Лявона, пажарам, патопам, але толькі ня здольнасьцямі новага гітарыста.

Тым ня менш, чалавек, які на той час ужо год ня граў ні ў адным гурце, дый увогуле ня быў упэўнены, чым хоча займацца ў жыцьці, здолеў пратрымацца ў гурце спачатку месяц, потым другі, перажыць распад Мроі і ў рэшце рэшт стаць неад'емнай часткай N.R.M.

### Піт. Дзяцінства

Піт (ён жа Пеця) Паўлаў нарадзіўся ў Слуцаку ў сям'і ваенных. Шасьцімесячным немаўляткам ён ужо трэсься ў чыгуначным вагоне: сям'я пераяжджала на новае месца службы бацькі — у Нямеччыну, горад Відшток.

У савецкім армейскім гарадку прайшлі наступныя шэсьць год. Бацька штодня сыходзіў на працу. Ці не адзінай забавай маці (ня ўвесь жа час слухаць плёткі іншых афіцэрскіх жонак) было сьпяваньне

ў вайсковым хоры. Малога Піта заўжды брала з сабою. Дома заўсёды быў магнітафон са стужкамі Высоцкага, Акуджавы — звычайны санкцыянаваны «дысыдэнцкі» набор савецкага чалавека. Але музычных схільнасьцяў хлопчык не выяўляў. Магнітафон быў хутчэй цыркавым нумарам — як для цяперашніх непаўналетак кампутар: цікавай была спроба ўключыць, паглядзець, як запальваюцца лямпачкі.

Усё дзяцінства Піт аддаваў перавагу ня музыцы, а спорту. Да 4-е клясы (тады сям'я ўжо пераехала ў Менск) актыўныя практыкаваньні ў плаваньні, астатнія школьныя гады — заняткі барацьбой, перамогі на раённых-гарадзкіх спаборніцтвах. А вышэйшаю марай да пэўнага часу была кар'ера ваеннага — найбольш заможнае жыцьцё сям'і прыпала менавіта на гады бацькавай службы.

Праўда, маці, не забыўшыся на свае музычныя практыкаваньні, усё ж аддала Піта і ў музычную школу.

Піт: *«Мой стрыечны брат у той час граў на акардэоне. І яна проста не магла вытрываць таго факту, што ён грае, а я — не. За 180 рублёў купілі мне акардэон. І аказалася, што амаль дарма — у музычную школу мяне спачатку браць не хацелі. Я ня вельмі дакладна сьпяваў, і было падазраньне, што ў мяне няма слыху. Потым, праўда, узялі, і маёй першай настаўніцай была родная сястра Юрыя Антонава. Мяне гэта асабліва ня ўразіла, бо на маім магнітафоне ў той час былі гурты кшталту Boney M і ABBA, а Антонава добра яшчэ ніхто ня ведаў.*

*Само граньне на акардэоне мне падабалася, а вось сальфеджыо і хоры я не вытрымліваў. Зараз шкадую».*

У пятае клясе раптам узьнікла жаданьне граць на гітары. Эканомія на школьных абедах хутка дала вынік — назьбіраўшы па 15 рублёў, Піт з аднаклясьнікам пайшлі купляць інструмэнты. Ні чорта ў іх не разумелі, таму набылі самыя танныя. Пры-

несьлі дадому. Высьветлілася, што для таго, каб пачаць граць, трэба ўмець гітару наладжваць. На гэтым працэс стварэньня гурта спыніўся.

Да дзевятае клясы Піт навучыўся граць тры акорды (лічы, адзін акорд на два клясы). А вось потым яму пашчасьціла стаць аднаклясьнікам Аркадзя Юршына.

Піт: *«Аркадзь граў так, што ўжо ў школе хадзіў на замены ў рэстарацыі, кафэ «Сузор'е». У яго была электрагітара. Праз Аркадзя я пазнаёміўся з прафэсійнымі музыкамі. І для мяне прыступка паміж прафэсійным граньнем і тым, што ўмеў я, не здавалася непераходнай. З Аркадзем і яшчэ адным хлопцам мы стварылі гітарнае трыо і перамаглі на камсамольскім гарадзкім конкурсе. Нават патрапілі на запіс на БТ».*

Паступіўшы пасьля школы ў РТІ, на першым курсе Піт знаёміцца з Алегам Піваварчыкам са Слоніму. І хутка яны разам з двума хлопцамі з Тэхналягічнага інстытуту ствараюць першы гурт, які ня мае нават назову. Гралі канцэрты па менскіх інстытутах ды танцульках. У той час у Піта зьявілася першая электрычная гітара — Iris (набыў за 250 рублёў у таго ж Аркадзя Юршына). Эканомія на школьных абедах была ўжо немагчымая, таму даводзілася працаваць начным вартаўніком у нейкім інстытуце і нават краму «Прырода» на прашпэкце Леніна ахоўваць.

«Неяк гэта здарылася натуральна, што ў гурце я стаў лідарам, граў на гітары і пеў», — гаворыць Піт. Ягоная няўрымсьлівасьць ды лідарскія амбіцыі праз колькі год адыграюць сваю ролю ў развале Мроі. Але на той час Піт пра існаваньне такога гурта не здагадваўся.

Слухаў ён «Динамик-5» Уладзіміра Кузьміна. Звышпапулярны гурт прыяжджаў на гастролі ў Менск на два тыдні. Кожны дзень даваў 2 канцэрты ў пяцітысячным Палацы спорту. І зьбіраў аншлягі. Піт зь сябрамі быў на 5 ці 6 канцэртах. Усё запісвалася на магнітафон, каб потым дома «здымаць» адзін да ад-

нога. З замежнае «атруты» слухаліся AC/DC, Iron Maiden, Scorpions. Аднак найбольшым уражаньнем для маладога Піта сталі Metallica ды гітарысты новай плыні кшталту Ван Халена.

Праз захапленьне музыкай экзамэнаў Піт не здаваў і на другім курсе вылецеў зь інстытуту. 14 траўня 1985 г. яго забрылі ў войска. Аднак у адрозьненьне ад хлопцаў з Мроі яму пашчасьціла не пазбавіцца музыкі на два гады.

Піт: *«Праз паўгода вучэбкі я апынуўся ў вайсковае часьці. І неяк пагналі мяне мыць падлогу ў клюб. Занятак, скажу вам, паганейшы. Напалову згніўшая анучa, халодная вада. Рукі не вытрымліваюць, камянеюць. Вада адразу становіцца бруднай і брыдкай. А ў клюбе мыць падлогу значна складаней — 20 радоў крэслаў, якія ня ссунеш. Поўзаеш сярод іх, мыеш чужы бруд».*

Аднак аказалася, што й праз бруд можна знайсьці шчасьце. Якраз калі Піт поўзаў з анучай між крэслаў, на сцэне праводзілася праслухоўваньне гітарыстаў у мастацкую самадзейнасьць часткі. Запрасілі ўсіх, хто мог трымаць у руках гітару. Праўда, больш яны не маглі нічога.

Піт: *«Я трываў, трываў, а потым устаў, кінуў анучу на падлогу, зайшоў на сцэну і проста выхапіў гітару ў аднаго з «канкурсантаў» са словамі: «Дай я паспрабую». Спачатку ўсе аслупянелі. Але настолькі лепш за астатніх я зайграў, што кіраўнік ансамблю адразу ж запрасіў мяне да сябе ў каморку і сказаў: «Ну, цяпер спакойна пайду на дэмбель. Ведаю, што ёсьць на каго ансамбаль пакінуць».*

## Піт: «Мы ставілі на Мроі вялікі крыж»

Пасьля арміі Піт узнавіўся ў РТІ, а ў вольны час бадзяўся бяз справы, пакуль яго не знайшлі хлопцы з гурта Полюс. Ужо не згадаць, як тое адбылося, — відаць, праз нейкіх агульных знаёмых, бо жылі ўсе ў адным раёне.

Піт: *«Полюс быў пачварным стварэньнем. Мы рэпэтавалі, зрэдку гралі канцэрты і ўвесь час чакалі, калі з войску прыйдзе нейкі Клімаў. Я ня ведаў, хто гэта такі, але мяне ўпэўнівалі: «Зараз, дружа, мы глупствам займаемся, а вось калі прыйдзе Клімаў, мы дамо дык дамо!» І неяк Клімаў прыйшоў. Звалі яго Ігар, і ён мне вельмі спадабаўся. Пеў моцна, як Ван Гілан. Але пасьля першай рэпэтыцыі з Клімавым Полюс развалiўся».*

Пасьля Полюсу быў Полтэргейст — тыповы прадстаўнік хард-рокавай плыні. Плыні ў беларускіх умовах збольшага другаснае, як і ўсё, што будавалася на капіяваньні не найсьвяжэйшых заходніх стандартаў. Патлы да зямлі, гераічныя рухі на сцэне, мінімум уласнае музычнае думкі ды максымум імпэту. Узьведзеная ў абсалют першаснасьць тэхнікі ды мімікі.

Піт: *«Я на той час Мрою ненавідзеў. Мне не падабалася, што яны граюць вяла і непераканаўча. Адно, што прыцягвала ўвагу, — беларуская мова ды грунтоўная канцэртовая праграма. Было чуваць, што яна адрэпэтаваная, найграная, а не на хуткую руку скляпана, як у нас. І, канешне, Мроя вызначалася наяўнасьцю вялікага кола сталых прыхільнікаў — ня тое што ў нас — два-тры сябры і сяброўкі.*

*Але калі мы ў Полтэргейсьце між сабой абмяркоўвалі Мрою, дык ставілі на ёй вялікі крыж. Па нашым разуменьні, гэта было немузычна, вельмі проста. Мы так ставіліся да ўсіх — і да Бонды і да Улісу. Бо яны лічылі сябе рок-гуртамі, але не выглядалі на мэталістаў. А для нас гэта проста сьмешна было — як гэта ты можаш быць рокерам, а граць не мэтал...»*

Напачатку 1993 г. Полтэргейст разваліўся. А Піт з музыкі сыйшоў у бізнэс. Балазе заняцца было чым. Увесь РТІ на той час зрабіўся падпольным цэхам па вытворчасьці тэлевізараў «Гарызонт». Не зьдзіўлюся, калі «шэрая» зборка тады перавышала афіцыйную. Бо ўмовы былі. Экспансія імпарту

яшчэ не пачалася. «Гарызонт» лічыўся лепшым ва ўсім Саюзе. Студэнты праз блат куплялі на заводзе камплектуючыя і ў інтэрнатах ці на кватэрах зьбіралі плястмасавыя скрыні, што прыносілі ці не залаты даход.

Напачатку Піт зьбіраў тэлевізары сам. Потым стаўся капіталістычным эксплюататарам — запрыгоніў некалькіх студэнтаў, а сам толькі прадаваў тавар, штотыдзень возячы яго ў Маскву. Такім спосабам не напружваючыся можна было зарабіць 1000 рублёў у месяц. Грошы па тых часах велізарныя. Але ў пэўны момант Піт зь бізнэсу сыйшоў.

Піт: *«Пайшло нейкае пераасэнсаваньне вартасьцяў. Мне не хацелася гэтым займацца. Сяброў пачала зацягваць багна скнарнасьці. Яны ўсе крычалі: «Які ты ідыёт!» А я, хоць доўгі час нідзе ня граў, адзінае, кім сябе лічыў, гэта гітарыстам.*

*Акрамя таго, у той момант у маім жыцьці зьявілася Зоя. А яна вяла жыцьцё сапраўднага вольнага мастака — малявала карціны, удзельнічала ў выставах. Яны зь сябрамі бясконца размаўлялі пра мастацтва, філязофію. І адзінае, чым я мог ёй адпавядаць, — граньне на гітары. І ў рэшце рэшт усё вырашылася за адну хвіліну».*

### «Нешта валасатае». Запрашэньне Піта ў Мрою

8 верасьня 1993 г. ля опернага тэатру ладзіўся канцэрт у гонар Дня Беларускае Вайсковае Славы. Гралі ўсе «монстры». Піт, узгадваючы музычнае мінулае, тусаваўся ля сцэны, калі да яго падыйшоў Лявон...

Піт: *«Я ўпэўнены, Лявон першы раз мяне ўбачыў і заўважыў на фэстывалі «Тры колеры» 91-га году ў Менску. Я тады граў з Полтэргейстам. На фэстывалі сабралася амаль 50 гуртоў з усёй Беларусі. Час быў такі — усе гралі рок. Там, дарэчы, першы раз зьявіліся Бі-2, Ляпісы.*

*Перамагла тады Мроя, другое месца ўзяў Уліс і трэцяе — Чистое Серебро. Мэталічныя гурты журы пракаціла. Ну не разумелі яны, што такое цяжкая музыка. Але нягледзячы на тое, што мэталісты не занялі ніякіх там месцаў, яны лепей былі як выканаўцы і як шоўмэны. Таму Полтэргейст, магчыма, і запомніўся».*

Піт памыляецца. У той момант, як Лявон падыходзіў да яго і працягваў руку, ён ні разу ня бачыў свайго будучага гітарыста на сцэне. Выключна за ёю.

Лявон: *«Я неяк заўважыў, што на канцэртах у натоўпе, а потым і за сцэнай, тусуецца хлопец патлаценькі. Быццам бы з гэтай тусоўкі, але хто такі, незразумела. Пытаюся. Кажуць, што гэта гітарыст адзін — зараз без каманды, граў у Полтэргейсьце. А мяне ўсе гэтыя полтэргейсты, мэталісты, сьмяшылі моцна.*

*На канцэрце ля Опернага зноў бачу яго па-за сцэнай і пытаюся ў басіста Алега «Паганіні» — ці нармальны гэта гітарыст. Той кажа — нармальны. Сам, маўляў, песьні рабіць ня ўмее, а так нармальны. А на той час ужо было вядома, што Смольскі сыходзіць. Трэ было ратаваць сытуацыю. І я падыйшоў да яго і пытаюся: «Піт, а можа Вы прыйдзеце да нас на рэпэтыцыю, паспрабуем разам зграць?». І той адразу пагадзіўся».*

Адзіным чалавекам, які да зьяўленьня Піта на першае рэпэтыцыі бачыў яго ў справе, быў Алезіс. І не на «Трох колерах», а на канцэрце Полтэргейста ў Палітэхнічным інстытуце.

Алезіс: *«Гэта быў канцэрт у Палітэху ад рокклюбу «Няміга». У мяне тады ў Полтэргейсьце быў знаёмы гітарыст, і ён мяне запрасіў. Сказаў — прыходзь, паслухай, як мы валім круты музон. Ну й валілі яны там свой хард-н-хэві ўперамешку з мэталам. Але мне было нецікава. І Піт мяне ня ўразіў — нешта валасатае скакала па сцэне, са скуры лезла вон. Толькі яны самі, відаць, і былі ў захапленьні ад уласнае музыкі».*

Піт: *«Самае дзікае, што пасьля Лявонавага запрашэньня зьдзіўленьня ў мяне не было. Мне здавалася, што гэта нармальнае разьвіцьцё падзеяў, хаця насамрэч гэта быў цуд. Я год нідзе ня граў. Разглядаць мяне як патэнцыйнага гітарыста ў лепшым на той час беларускім гурце было дзіўна. Але гэта адбылося».*

### Першыя рэпэтыцыі зь Пітам

Пра што мусіў думаць чалавек, які прыходзіў на месца Смольскага? Па-першае, пра адпаведнасьць, па-другое, пра адпаведнасьць, па-трэцяе... Піт пра гэта і думаў. І ня толькі Піт, але і ўся Мроя. Не дарма. Першыя рэпэтыцыі засьведчылі, што ў новага гітарыста зашмат энэргіі, ды замала майстэрства. Юрась пачаў крывіцца ды выказваць зьдзіўленьне кшталту: «Каго гэта ты, Лявон, запрасіў?» Пры тым, што Піт настойліва і паслухмяна спрабаваў асвойваць праграму. Ён браў дадому акорды, вывучаў іх гадзінамі. «Мы разумелі, што ён у прынцыпе ня можа граць тое, што граў Смольскі», — гаворыць зараз Лявон.

Піт: *«Я дастаў з загашніку гітару, купіў прымочку, бо абмежаваньня па грашах не было. Прыйшоў на першую рэпэтыцыю. Гітара парынула, нешта хруснула, і граў я паганейша. Але яны не паставілі на мне крыж, як варта было зрабіць. Віця Смольскі значна лепей граў за мяне. Хлопцам хапала мудрасьці зразумець, што прыйшоў новы чалавек і ён мусіць адаптавацца».*

Першы выхад на сцэну з новым гітарыстам адбыўся 7 кастрычніка на фэстывалі «Рок супраць рэвалюцыяў». Менавіта складанка з гэтага канцэрту, якую выдаў «Ковчег» захавала для гісторыі песьні «Глыток віна і луста хлеба» ды «Дзеўчына з чароўнаю усьмешкай». Касэта гэта даўно стала рарытэтнай, але ніхто (мо акрамя Піта) пра тое не шкадуе — праз уласнае крытычнае стаўленьне да ўсяго, што рабіў гурт у той момант.

Перадсьмяротныя сутаргі Мроі працягнуліся яшчэ амаль год. За гэты час згралася некалькі канцэртаў. І адным з апошніх стаў вялікі сольнік «Мроя-Live. 10 год у рок-н-роле».

Лявон: *«У 94-м годзе беларускія каманды пацягнула граць сольныя 2-гадзінныя канцэрты. Пачала гэтую завядзёнку Крама, балазе на той час у Менску была сталая рок-пляцоўка — Альтэрнатыўны тэатар, з адміністрацыяй якога заўжды можна было дамовіцца наконт правядзеньня любой акцыі. Пасьля Крамы вялікі сольнік адыграла Новае Неба. А потым у Альтэрнатыўным адбыўся і векапомны канцэрт Мроі. Яго мы прымеркавалі да 10-годзьдзя першага буйнога «мроеўскага» канцэрту ў Траецкім. Адыгралі сольнік пры поўнай залі й вельмі добрай публіцы. Але гэта не ўратавала каманду ад гібеньня. Наадварот, гэты канцэрт нібыта стаўся тлустай годнай кропкай у канцы шляху каманды».*

Піт: *«Я слухаў тады запіс канцэрту ў Альтэрнатыўным і думаў: «Які я віртуозо-гітарысто». Гэта было амаль тое, як у маім уяўленьні мусіць граць гітарыст».*

Лявон: *«Думка, што Мроя сябе вычарпала, зьяўлялася пастаянна. Але ж знутры ішоў і супраціў — як жа гэта скончыш, калі пачалі так даўно. Трэба мець сілы, каб сказаць, што ты займаесься ня тым, чым трэба».*

Аднойчы сілы знайшліся. Для гэтага прыйшлося зграць яшчэ адзін канцэрт — паўдзельнічаць у фэсьце «Рок па вакацыях».

### Вольскі ставіць на Мроі крыж

Лявон: *«Я працаваў на 8 канале (вяшчаў тады ў Менску на тых хвалях, што зараз СТВ), вёў праграму «Квадракола». У той час канал штодзень паказваў «Рок па вакацыях '94». І аднойчы я гэта ўбачыў. І як паглядзеў на Мрою, мне стала непрыемна — настолькі неэнэргетычна і страшна*

*гэта было. Незразумелыя людзі сьпяваюць гаўно, намагаюцца быць падобнымі да Guns n' Roses. Мяне ўсё не задавальняла: клявішы, да якіх я прывязаны, ненатуральна гераічныя рухі музыкантаў... Лішне казаць, што гэта было досыць суб'ектыўна. Магчыма, камусьці гэта ўсё й добра заходзіла, але асабіста я па рэакцыі публікі гэтага не заўважыў. І я падумаў: «Усё, трэ завязваць». А тут яшчэ Варашкевіч да мяне неяк падыходзіць і кажа:*

*— Слухай, Лявон, вы зараз граеце нешта падобнае да AC/DC, я магу вам дапамагчы з аранжыроўкамі, бо добра ў гэтым разьбіраюся.*

*Я тады адказаў:*

*— Ігар, ня трэба, бо мы хутчэй за ўсё ня будзем такое граць.*

*Мне ўсё гэта надакучыла. Бо мы заўжды былі людзьмі альтэрнатыўнага складу — я ніколі літаратуру не пісаў традыцыйную, карціны не маляваў клясічныя. А тут атрымліваецца, што ў музыцы мы абсалютна традыцыйным шляхам ідзем. І калі са Смольскім яно хаця б гучала пераканаўча, то з Пецям не гучала нават. А тут яшчэ Алезіс пачаў увогуле мярзотна граць».*

## Спроба выгнаць Алезіса

Граньне Алезіса даўно выклікала нараканьні. Менавіта з-за гэтага ў свой час запрашалі Юру Цынкевіча. З-за гэтага Алезіс першы, пасьля фэстывалю ў Даніі, сыйшоў з Новага Неба. У 94-м наракаць на яго сталі і ў родным гурце.

Наклалася на граньне Алезіса ўсяго патроху. Пачаць хаця б з прыватнага жыцьця. Ужо больш за год цягнуўся развод. Ажаніўся Алезіс яшчэ ў 89-м. Акруціла яго прывабная студэнтка Тэатральна-мастацкае вучэльні Лора, якая намагалася стаць рэжысэрам. Здольнасьцяў, праўда, у яе было няшмат, што і высьветлілася, калі яна паспрабавала ў якасьці ўласнае курсавое працы паставіць спэктакль па

абсурдысцкае п'есе «Кеглі», якую напісаў Вольскі. У якасьці актораў задзейнічалі ўсіх удзельнікаў Мроі ды студэнцкі тэатар «Рух». Калі высьветлілася, што Лора і прафэсія рэжысэра — рэчы амаль несумяшчальныя, асноўную працу ў пастаноўцы зрабіў Міхал Амельяновіч. Настаўнік за спэктакль паставіў адзнаку 4, але параіў нікому яго больш не паказваць. Тэатральная дзяўчынка Лора між тым ужо займала ўсе думкі Алезіса, і яны ажаніліся. Развод праз пяць год ператварыўся ў катаваньне.

Алезіс: *«Суды працягваліся два гады. Трэ было мяняць кватэру. Лора колькі разоў выклікала міліцыю, казала, што я яе б'ю, пісала скаргі. Ёй гэта трэ было для суду, каб абяліць сябе і давесьці суддзям — маўляў, глядзіце, гэтая скаціна не дае мне жыць. Калі мы разьехаліся, я быў самым шчасьлівым чалавекам на сьвеце. Але ж колькі я да гэтага перацярпеў праз сваю памылку маладосьці...»*.

Што яшчэ ўплывала на граньне Алезіса, дык гэта поўная незадаволенасьць тым, што робіць гурт. Па складзе характару яму неабходна было натхненьне ад уласнае творчасьці. У Мроі ж апошніх год усё ператварылася, па вызначэньні Вольскага, ў «сачыненьне музыкі й складаньне тэксту, які б гэтай музыцы не перашкаджаў».

Юрась: *«Алезіс у той час вельмі дрэнна граў. Ён чалавек, які пры пэўных абставінах захапляецца, жыве ў сваім сьвеце. І падчас канцэрту ён уваходзіў у нейкі стан нірваны, і мы для яго быццам не існавалі. На працягу адной песьні, песьні роўнай, дзе максімум два пераходы на бубнах — ён вычвараўся пяць разоў памяняць тэмп. Ён адчуваў з залі энэргетычны пасыл і мог па тэмпе загнаць песьню ў тры разы ад арыгіналу. Мяне гэта заўсёды заводзіла ў дзікі клінч. Як гэта так — мы рэпэтуем у адным тэмпе, а на канцэрце вымушаныя ў два разы хутчэй выконваць!»*.

Алезіс: *«Калі ты хочаш, я магу сказаць, які я барабуля. Я ня ўмею граць па нотах, я не высока-*

*тэхнічны. Гэта праўда. Але нельга сказаць, што дрэнны. У мяне ёсьць свая манэра. Я граю на акампанэмэнце. Барабаны ў рок-групе — гэта акампанэмэнт найперш. Калі вы высокатэхнічны — грайце сола, калі ласка. Я ж граю проста, але разнастайна. І разнастайнасьць, эфэктныя ўступы, тое, што я сам прыдумваў, — гэта вызначае маю манэру.*

*Акрамя таго, у мяне мозг заняты ня толькі бубнамі, але й нейкімі вобразамі, якія потым увасабляюцца ў тэкстах. А барабулі, якія ня пішуць тэкстаў, толькі пра бубны і думаюць. Таму яны выглядаюць больш тэхнічнымі».*

Аднак ініцыятарам выгнаньня Алезіса быў не Юрась, а Піт. Зграўшы некалькі канцэртаў і адчуўшы сябе паўнавартасным сябрам калектыву, ён перайшоў у наступ. Тады ніхто асабліва не акцэнтаваў сваё лідарства ў гурце, і Піт вырашыў узяць гэтую пачэсную, але нялёгкую ношу на сябе. Першым пачаўся ягоны ўплыў на музыку. Прыхільнік «гітарысто-віртуозо», розных там ван халенаў, ён хацеў дамагчыся таго ж ад Мроі. Пасьпяхова прасунуўшы некалькі сваіх музычных ідэяў, Піт пайшоў далей і пачаў улазіць у тэксты. Лягічна да яго прыйшло й адчуваньне магчымасьці мяняць склад каманды.

Піт: *«Як я зараз разумею, маё ўваходжаньне ў калектыў было пачаткам канца.*

*Я, не разумеючы ніякіх падыходаў, крыніцаў, ідэалягічных і сяброўскіх адносінаў, пачаў ператвараць калектыў у свой уласны. Мне здавалася, я ведаю, што трэба рабіць. Я даводзіў, што мы мусім граць музыку, якая мне на той час падабалася.*

*Я адчуваў сябе правым. Бо на той момант Мроя скончвалася. У яе не было энэргіі. Дэмакраты прыйшлі да ўлады. Мрою кананізавалі пры жыцьці, і для рок-гурта гэта было сьмяротна. Ідэалягічнай моцы ў гурта не было. І трэба было шукаць музычную моц, якая была ва Улісе, у Краме.*

*І я вельмі хацеў прынесьці гэтую музычную моц, хаця, аб'ектыўна кажучы, ня мог. І вось гэта было вельмі дэструктыўна».*

Размовы пра замену Алезіса вяліся перманентна. Юрык горача падтрымліваў ідэю: «Калі мы хочам далей разьвівацца прафэсійна, нам патрэбны адпаведны ўзровень выканаўцаў. Мы ўжо не маленькія. Трэ падвышаць узровень», — ня раз гаварыў ён Лявону. Той маўчаў. Маўчаньне было ўспрынятае «змоўшчыкамі» Пітам і Юрасём не як ваганьне, а як фактычная згода. Піт пайшоў да Кірыла Шавандо, добрага бубнача, які граў у першым складзе Уліса, потым у аркестры Фінберга, і правёў папярэднія перамовы. Шавандо папярэдне ж пагадзіўся. Рэвалюцыя насьпявала і выбухнула на адной з рэпэтыцыяў.

## Апошняя рэпэтыцыя

Мроя рэпэтавала ў Філярмоніі. Рэпэтыцыя праходзіла, як заўжды, пагана. Ніхто ня быў задаволены.

— А чаму ў нас так дрэнна ўсё атрымліваецца?! — у нейкі момант задаў рытарычнае пытаньне Піт.

— Ды таму што Алезіс дрэнна грае, — адгукнуўся Юрась.

— Так, усё, я прымаю рашэньне, — энэргічна і з запалам, як ён умее, прамовіў Піт. — Заўтра на рэпэтыцыю замест Алезіса прыходзіць Шавандо. Алезіс, ты можаш застацца пры гурце, але ня ў якасьці бубнача.

Юрык са згодай паківаў галавой.

Алезіс: *«Калі б Лявон у той момант Піта падтрымаў, я б сабраўся і пайшоў...»*

Юрась: *«Мы з Пітам разам адной лініі прытрымліваліся. Зараз я разумею, што з майго боку было глупствам уваходзіць у «каапэрацыю» зь Пітам. Бо ён сам як гітарыст быў гаўном поўным».*

Лявон: *«Калі Піт гэта абʼяўляў, я маўчаў. Мы склалі інструмэнты, пайшлі да выхаду, і тут я сказаў:*

*— Так, усё! Ніякіх Шавандо ня будзе. Мы наогул зьбірацца два тыдні ня будзем, мне трэ абдумаць сытуацыю. Калі хочаце, працягвайце безь мяне.*

*Я разумеў, што калі яшчэ Шавандо будзе граць, дык гэта ўвогуле ўжо ня Мроя будзе, а прафанацыя нейкая, дзяржансамбаль пры Філярмоніі, дзе мяняюцца людзі, а мыла працягвае граць».*

Віталь Сямашка: *«Вольскі, трэба аддаць яму належнае, своечасова зразумеў, што здрада доўжыцца адну сэкунду, а працягваецца ўсё жыцьцё. Бо яны з Алезісам разам ішлі па жыцьці, яны адзін аднаго энэргетычна падтрымлівалі.*

*А ўвогуле, распад Мроі быў наканаваны. Разумееш, ёсьць песьні, пасьля якіх задумляесься, як жыць далей. Башлачоў сабе такое пытаньне задаў і не знайшоў адказу. Вольскі задаў пытаньне на башлачоўскім узроўні, калі напісаў «Зямлю». Пасьля гэтага Мроя запытвацца ў каго-небудзь і пра што-небудзь ужо не магла. Таму і памерла».*

Рашэньне Вольскага стала шокам для ўсіх. Юрась паспрабаваў забыцца ў абдымках маладой сяброўкі Веры, прывабнай дзяўчыны, якую вычапіў нядаўна ў тусоўцы гурта Нэкст-стоп, Піт паплёўся дадому, а Лявон з Алезісам пайшлі ў бар Філярмоніі. У Вольскага ў кішэні было 5 даляраў. На іх узялі дзьве бутэлькі віна і пачалі абмяркоўваць, што рабіць.

Лявон выказаў сваю думку:

— Хопіць займацца глупствам. Трэба адкідваць хард-рок, быць бліжэй да вытокаў, да панку.

Алезіс пагадзіўся. Абмеркаваньні цягнуліся некалькі дзён — то ў барчыку Філярмоніі, то на кватэры ў Касі. Тая адразу выказалася ў падтрымку Алезіса, хоць сама яго ня так даўно выгнала з Новага Неба. «Хто такі Піт? Як ён можа нешта выра-

шаць у Мроі?» — сказала яна. Аднак і да яе важкага слова Лявон і Алезіс вырашылі, што ад Піта трэба пазбаўляцца.

Лявон: *«Мы тады шмат гаварылі, абмяркоўвалі ўсё. І я разумеў, што ў новым гурце Алезіс будзе і Юрык, найхутчэй. Пецю я абсалютна і дакладна выкідваў, бо прыхільнікі Ван Халена мне былі абсалютна нецікавыя. Трэ, думаў я, знайсьці маладога альтэрнатыўнага хлопчыка і граць панк.*

*Сам я яшчэ ня думаў на гітару пераходзіць — хацеў проста сьпяваць. І Юрык крычаў, што Пеця непатрэбны.*

*Але неяк у Белсаўпрофе быў фэст, наладжаны газэтай «Беларуская маладзёжная», — «Будзьце аптымістамі — рабіце дзетак». Там грала ўся гвардыя — Новае Неба, Уліс, Крама. Пасьля канцэрту быў банкет. І Пеця, скаціна, падыйшоў да мяне і пачаў, карыстаючыся лёгкай падпітасьцю маёй, весьці апрацоўку — маўляў, «дык што такое... а чаго мы ня граем... у нас жа ўсё атрымлівалася, такія прыгожыя мэлядычныя песьні...» Я яму адказваю ў тым пляне, што мне гэтыя мэлядычныя песьні надакучылі, і я іх граць больш ня буду. А Піт: «Ну дык ладна, давайце штосьці іншае рабіць. Што скажаце, тое я і буду граць». І я пачаў адтайваць. Ломка пачалася. А Пеця насядаў: «Ну, давайце я на адну рэпэтыцыю прыйду, там і вырашым». І ён мяне ня тое каб пераканаў — прасьцей было згадзіцца, бо я чалавек такі нежалезны. І я сказаў: «Ну ладна, давайце зьбярэмся».*

*На першай жа рэпэтыцыі я высунуў свае ўмовы. Назва зьмяняецца. На якую — яшчэ невядома, але Мрояй гэта ўжо ня будзе. Мроеўскіх песень мы не выконваем. Пра хард-рок забываемся. А калі вам нешта не падабаецца — то працягвайце без мяне. Юрык крычаў, што назву трэба пакінуць. Я сказаў, што гэтага ня будзе, бо назва нас зноў зьесьць. Новае — значыць новае.*

*Яны прынялі ўсе ўмовы. І літаральна з трэцяй рэпэтыцыі пачаліся адкаты: «А давайце зграем*

*лепшыя з мроеўскіх песень». Я кажу: «Ня будзем». «Не, — кажуць Юрык зь Пітам. — Давайце зграем». І потым праз год яны працягнулі праз худсавет «Я рок-музыкант» і «Ён яшчэ вернецца». І хаця зрабілі новыя аранжыроўкі, яны арганічна ня ўпісваліся ў праграму і праз пэўны час выпалі».*

Піт: *«Цяпер я разумею, што нічога класнага з выгнаньня Алезіса адбыцца не магло. Толькі Лявон зразумеў, што гэтага ня варта рабіць. Калі спыніліся рэпэтыцыі, для мяне гэта было шокам. Зараз я разумею, што Лявон не дапусьціў маразму, а тады ўспрыняў гэта як брэд. Я пачаў яго пераконваць, што ў нас усё толькі пачало добра атрымлівацца, што ўсё супэр.*

*За месяц, пакуль не было рэпэтыцыяў, я зьмяніўся. Мне стала зразумела, што адбываецца нешта важнае, што лепей мне ня лезьці са сваімі думкамі і лідарствам. Я першы раз адчуў жорсткую руку. Да гэтага было натуральнае суіснаваньне. А тут раптам зьявілася кіраўніцтва. Лявон кажа — гэта больш ня Мроя, і ўсе вымушаныя пагадзіцца, і не абмяркоўваецца. Зьявіліся нейкія рэчы, якія не абмяркоўваюцца. І я ў першы раз у жыцьці прыняў як дадзенае адсутнасьць плюралізму.*

*Недзе праз год я зразумеў, што распад Мроі быў задуманы, каб пазбавіцца ад мяне. Але Вольскі быў занадта мяккім чалавекам, і я ўтрымаўся».*

## Разьдзел 11

## 1994–1995. СТВАРЭНЬНЕ N.R.M. І «LALALALA»

### Пачаткі N.R.M.

Гісторыя N.R.M. (тады яшчэ безназоўнага) пачалася праз некалькі тыдняў пасьля апошняе рэпэтыцыі Мроі. Лявон выканаў дадзеную самому сабе абяцанку знайсьці «альтэрнатыўнага хлопчыка». Ім аказаўся Саша «Малодшы» Дудар, сын Юрыкавага супрацоўніка па унівэрсытэце. Калегі-гітарысты гаварылі пра яго як пра таленавітага музыку. На рэпэтыцыях тое пацьвердзілася.

Ніхто яшчэ ня ведаў, чым скончыцца новы экспэрымэнт, але Лявон, Алезіс і Саша ўтраёх пачалі паціху рэпэтаваць. Потым да іх далучыўся Юрась. І самым апошнім усё ж такі Піт — пасьля вядомае размовы зь Лявонам на фэсьце ў Белсаўпрофе. Амаль адразу Саша прынёс акорды «Трактару». Вольскі за адзін вечар напісаў да іх тэкст. Мо таму гэтую песьню, па чутках, так ня любіць Піт — яна ці не адзіная, што нарадзілася ў N.R.M., калі яго там не было. Амаль у той жа час напісаліся «Дарога» і «Бацька». Зь іх усё й пачалося...

Паралельна з рэпэтыцыямі йшлі пошукі новае назвы. Варыянтаў было шмат. Запомніліся тры. Вольскі прапанаваў «Паралюш», Алезіс — «Блюзьнеры» і «Гарадзкі вал». Ніводная не прайшла праз худсавет. «Блюзьнеры» стваралі непатрэбныя асацыяцыі з блюзам, які гурт, канешне, граць і не зьбіраўся; «Паралюш» выглядаў неяк блякла і нягучна;

намёкі на «вал музыкі» ў варыянце з «Гарадзкім валам» не былі відавочнымі. Толькі празь месяц Вольскі прыйшоў зь ідэяй N.R.M.

Лявон: *«Мне ў пэўны момант маланкай у галаву думка трапіла, што павінна быць абрэвіятура, і можна слова «мроя» выкарыстаць, але да пэўнага часу не рассакрэчваць. Абрэвіятура павінна гучаць таямніча. Літары N, R і M, па-першае, гучаць жорстка, што трэба для року. І ўсе літары і іх спалучэньне маюць нешта шаманскае. Шмат спалучэньняў гэтых літар можна знайсьці ва ўсялякіх фэнтэзі, у Толкіена, да прыкладу. Нешта пагрозьліае зыходзіць з абрэвіятуры, што добра.*

*І яшчэ я ўсё хадзіў і думаў, што трэба, каб у назове была нейкая назва дзяржавы. І неяк само сабой прыйшло... Ужо пазьней мне сказалі, што прыблізна тую ж ідэю выкарыстоўвалі ў той час Laibah, але я гэтага ня ведаў».*

Па першым часе рэпэтыцыі йшлі цяжка. Новы стыль шукаўся навобмацак. Правадыры музычнае рэвалюцыі Вольскі і Алезіс самі не маглі дакладна зразумець і патлумачыць, штó мусіць быць «на выхадзе». А тут яшчэ Піт усё спрабаваў вярнуць мінулае.

Лявон: *«Я на кожнай рэпэтыцыі думаў — ну навошта ж я Пецю ўзяў? Ён жа сам гаварыў, што будзе рабіць усё, як яму скажуць. А цяпер хадзіў і лямантаваў па старых песьнях».*

Сам Піт, канешне, такога і ня памятае...

Піт: *«На першую рэпэтыцыю Вольскі прынёс тры песьні. І гэта зусім не было падобна на Мрою. І шукаць пад гэтыя песьні музычны малюнак прыходзілася таксама зусім новы. Бо калі б мы падхапілі новую песьню і пачалі выграшаць па-старому, было б тое ж самае, што і ў Мроі. Мне было цяжка. Я слухаў тых жа самых гітарыстаў — Джо Сатрыані, Extreme, Ван Халена, а мне прыйшлося граць нешта зусім іншае. Я пачаў шукаць нейкія дысанансы ў музыцы, экспэрымэнта-*

*ваць. Прайшоў месяц, і ўсё стала іншым. Іншая палова галавы над гэтым працавала».*

Юрась: *«Галоўнае, што мы вырашылі працаваць больш агрэсіўна. Мы з Алезісам напісалі да «LaLaLaLa» пяць ці шэсьць музычных тэмаў. Я дома нешта падбіраў на гітары, альбо Алезіс першы накідваў мне нейкія малюнкі, а я гітарную партыю дадаваў. І потым мы гэтыя напрацовачкі паказвалі іншым. Так нарадзілася, напрыклад, песьня «Зомбі» — безумоўны шэдэўр».*

## Шчупак фаршаваны і N.R.M. на Рок-каранацыі

У 1994 г. беларускі рок дасьпеў нарэшце да агульнанацыянальнай прэміі. Ідэя стварыць беларускую «Grammy» нарадзілася ў галовах Віталя Сямашкі і Юры Цыбіна. Першая Рок-каранацыя адбылася 12 студзеня 1994 г. у Альтэрнатыўным тэатры і магла выхваляцца прадстаўніцтвам такіх «дыназаўраў» айчыннае эстрады, як Віктар Вуячыч, Эдуард Ханок, і нават тагачаснага міністра культуры Анатоля Бутэвіча. Што ня дзіўна — чаму б не прызнаць, што ў маладой дзяржаве існуе маладый, прагрэсіўны рок.

Арганізатары ня сталі выдумляць ровар — вызначылі некалькі намінацыяў, праводзілі галасаваньне сярод экспэртаў ды музычных журналістаў і таму, хто набіраў найбольшую колькасьць галасоў, давалі прыз. На першае цырымоніі іх было няшмат — фантазія яшчэ не разгулялася. Рок-карону атрымала Крама, лепшым альбомам назвалі «Сон у трамваі» Новага Неба, прыз «Традыцыі і сучаснасьць» аддалі Палацу, а «Дэбют году» — гурту Why Not.

N.R.M. у першае каранацыі ўдзельнічаць ня мог — да таго часу не было запісана ніводнае песьні і пра існаваньне гурта мала хто акрамя блізкіх сяброў здагадваўся. За былыя заслугі хлопцаў запрасілі пайграць у якасьці гасьцей на закрыцьці цырымоніі. Але выйшла неспадзяванка.

Як і любое пампезнае мерапрыемства, імпрэза ў Альтэрнатыўным не абыйшлася без фуршэту.

Пакуль абвяшчалі пераможцаў, у фае тэатру арганізатары накрылі сталы. І адразу, як стаў вядомы ўладальнік кароны, народ паваліў з залі. Якраз у той момант на сцэну выходзіў N.R.M. і пачынаў браць першыя акорды «Зомбі». На «Бацьку» ў залі засталіся толькі самыя цьвёрдыя прыхільнікі Мроі, якія хацелі паглядзець, ува што ж ператварыўся іх улюбёны гурт. Калі, зграўшы яшчэ пару песень, хлопцы выйшлі ў фае, фуршэтныя сталы былі пустыя. А на іх, між іншым, быў нават фаршаваны шчупак...

Лявон: *«Пасьля канцэрту на рок-каранацыі мы пачалі граць у нейкіх зборных салянках. Спачатку ніякае асаблівае рэакцыі не было, а потым раптам усё стала нармальна. Хаця выглядала на тое, што мы зусім незнаёмая каманда. Нас ніхто не пазнаваў. Маладая аўдыторыя апошнія гады ўспрымала Мрою не як нармальную каманду, а як старпёраў, патлатых, што павылазілі з далёкай сівізны. А тут мы сталі жыўчыкі, па-іншаму апраналіся сталі. Вузкія вранглеры і банданы на патлатай галаве мяне дасталі»*.

Піт: *«Ты ведаеш, у чым яшчэ мая заслуга, што яшчэ я прынёс у гурт? Наяўнасьць мужчынскага пачатку. Бо калі я прыйшоў у Мрою, гэта былі ня хлопцы. Яны былі закансэрваваныя, у іх усіх былі нейкія недарэчныя адносіны зь дзяўчатамі — нехта разводзіўся, нехта жыў незразумелымі грамадзянскімі шлюбамі. Яны перасталі быць аб'ектамі жаночых мараў, старцамі выглядалі. А тут зьявіўся чалавек, на якога можна было накіраваць жаночыя позіркі. Для рок-гурта гэта істотна. І ўжо ў N.R.M. усё зьмянілася. Дзяўчаты пачалі юрлівыя жарцікі гаварыць пра ногі Юрыка, у Алезіса закаханыя хадзілі. Вольскі валасы састыг, дык памаладзеў гадоў на 20»*.

Што спрачацца — у сардэчных справах Піт эксперт. У гасьцёўні на сайце N.R.M. я неяк патрапіў на вершаваную апалёгію, якую не паленаваўся захаваць для гісторыі:

**«2 РЕТЕ:**

*Боль*
*большы*
*за мяне.*
*Не падуладны*
*дозам*
*алкаголю.*
*Сьлёзы*
*болю*
*большыя*
*за мяне.*
*Камянеюць*
*аскепкі сэрца,*
*большыя за мяне*
*саму.*
*Чаму,*
*навошта*
*большага*
*за цябе*
*няма*
*і ня хочацца?*
*Боль*
*прасочваецца*
*праз падушку,*
*праз душу.*
*Пішу рознае*
*ў запозьненых вершах...*
*Навошта*
*ТЫ*
*ЛЕПШЫ?»*

Эх, Піт, пасьля такіх словаў — толькі ў ЗАГС.

## У розныя бакі...

Амаль пасьля Рок-каранацыі здарылася нечаканае — зьнік Саша Дудар. Проста не прыйшоў на рэпэтыцыю.

Лявон: «*Ад самага пачатку Сашу быццам бы*

*спадабалася з намі граць, але ён не ўспрымаў нас як нешта сур'ёзнае. Мы ж нават нармалёва не пазнаёміліся. Ён занадта малодшы быў. Ні разу не выпівалі разам, баяліся, што ён малы. І раней бывала так, што ён не прыходзіў на адну рэпэтыцыю, а потым зьяўляўся. Для яго гэта не было галоўнай справай».*

Напярэдадні было некалькі канцэртаў. Шукаць замену — справа цяжкая, ды й надакучыла тое рабіць. Лямант пра тое, што некалькі выступаў варта адмяніць, спыніў Лявон, заявіўшы, што на гітары граць будзе ён. Лямант перайшоў у істэрычны сьмех. Уявіць Вольскага-гітарыста ня мог ніхто. Але сытуацыя была безвыходная, ды і гітарныя партыі Лявон больш-менш ведаў.

Лявон: *«На клявішы ў мяне было табу. Пасьля таго, як я паглядзеў запіс «Рок па вакацыях '94», дзе я стаю з гэтай «расчоскай» на сцэне, я зарокся граць на клявішах. Мне хацелася проста пець, скакаць, бегаць па сцэне. Але Саша сваім сыходам не пакінуў мне выбару. Я спачатку зьвярнуўся да Славы Кораня, каб ён падыграў. І менавіта ён параіў мне самому ўзяць гітару. Маўляў, што там граць — падкладкі. Зграеш! Я сядзеў дома і як ідыёт «тачыў» гэтыя партыі».*

Юрась: *«Мы выгналі клявішніка і ўзялі гітарыста, які ня ўмеў граць на гітары. Прозьвішча ў абодвух было Вольскі».*

Піт: *«Саша ў N.R.M. выконваў такую ж дэструктыўную ролю, як я ў Мроі. Яму хацелася граць модную музыку, і яму было незразумела, чым мы тут займаемся ўсе. І ён, натуральна, сыйшоў».*

Вельмі хутка набраўся матар'ял для паўнавартаснага альбому. Першы варыянт запісалі ў лайвстудыі тагачасных «зарціпанаў» (у іх была кропка на паштамце) — шэсьць ці сем песень жыўцом, самае прымітыўнае дэма, проста каб пачуць, як усе песьні гучаць у складанцы. Аднак пасьля гэтага прыйшлося перапыніцца. Лявон з Касяй зьехалі ў Францыю.

Лявон: *«Нам трэба было разьвеяцца. Бо Лукашэнка прыйшоў да ўлады, і калі стала ясна, што гэта гамон і надоўга, гэта настолькі пачало ціснуць... На кухнях мы сядзелі і думалі, як будзем змагацца, як ствараць маладзёвыя атрады супраціву, ну і зусім брэд нейкі. Мы самі сябе згрызалі. А ў Францыі быў час усё асэнсаваць, і, вярнуўшыся, я пачаў глядзець на ўсё крыху спакайней».*

Гэта была паўнавартасная халтура. Лета ў Францыі — час невялічкіх гарадзкіх фэстываляў, сьвятаў, карнавалаў. Паймець з гэтага капейку-другую прыяжджала шмат народу з усёй Эўропы. Беларускую брыгаду ў Францыю запрасіла вікантэса Анн-Мары де Паншара. Яна рабіла бізнэс на тым, што кожны год вазіла па французскае правінцыі халтурныя брыгады, блатныя расейскія хараводы ды іншы лубок. Паслухаўшы шмат беларускіх касэтаў, яна тым годам чамусьці спыніла свой выбар на Касі.

У выніку Кася зь Лявонам ды яшчэ адным хлопцам, які склаў ім кампанію, гралі акустычна народныя песьні, нешта з рэпэртуару Новага Неба. Па беларускіх мерках зараблялі нармалёвыя грошы. Праўда, аднойчы даведаліся, як французская вікантэса на іх нажывалася. Спрычыніліся да гэтага морапрадукты, якія спадарыня Анн-Мары вельмі любіла, але ж праз іх атруцілася і патрапіла ў шпіталь. А зранку у замак, дзе разам з гаспадыняй жылі й нашыя героі, прыпёрлася кур'ерка з чэкам. Там стаяла сума ганарару за канцэрт...

Лявон: *«Зь песень у Францыі напісалася толькі «На вуліцы маёй». Праўда, прыехаўшы ў Менск, я ад таго варыянту і камяня на камяні не пакінуў. Ну немагчыма ў спакойнай французскай правінцыі ствараць такія тэксты. Я там збольшага маляваў. І пад канец мяне ўжо запрашалі расьпісваць нейкі замак за 1000 даляраў. Мне падалося мала, і, акрамя таго, я падумаў, што калі застануся тут яшчэ на месяц,*

*то асымілююся і не знайду моцы вярнуцца. І я вырашыў рваць адтуль...*

*Болей, дарэчы, вікантэса нас не запрашала. Бо мы былі занадта сваеасаблівыя. Блатныя народныя хараводы былі на ўсё згодныя, а мы артачыліся — маўляў, гэтага мы граць ня будзем, пра цыганскія песьні можаце забыцца і г. д.».*

Пакуль Вольскі бадзяўся па французскіх фэстывалях, Алезіс, Юрась і Піт пасьпелі зьездзіць на Басовішча. Прычым як... Мроя. Ну й сапраўды — запрашэньне (па старой яшчэ памяці) прыйшло, дарога аплочвалася, ганарар гарантаваны — як можна праігнараваць такі шанец? Адсутнасьць вакаліста не засмуціла. Песьні разьмеркавалі: па чатыры сьпелі Юрык ды Піт і тры — Алезіс. Да свайго выступу зараз ставяцца зь вялікай іроніяй.

Алезіс: *«У нас было два тыдні на рэпэтыцыі, і мы расьпеліся. Нам спадабалася. Мы былі ў захапленьні. Адным словам, зразумелі, што трымалі ў гурце лішняга чалавека...*

*Праўда, публіка і арганізатары больш холадна аднесьліся да гэтага вопыту. Але гэта ня быў правал».*

Лявон: *«Як я вярнуўся ў Менск, мне патэлефанавалі з Польшчы і сказалі: «Лявон, калі ласка, у наступны раз няхай бяз Вас ня едуць...»*

Па вяртаньні з замежных ваяжаў Мроі выкінулі зь Філярмоніі. Папросту не падоўжылі кантракт. І праўда — за колькі год у штаце дзяржаўнае структуры гурт зграў адзін канцэрт. Да таго ж часы беларусізацыі скончыліся, Белканцэрту больш ня трэ было трымаць у штаце беларускамоўныя калектывы «для галачкі».

Перад N.R.M. паўстала праблема, дзе пісаць канчатковы варыянт «LaLaLaLa». На дапамогу прыйшла фірма «Дайнова».

## «LaLaLaLa»

Напачатку 90-х «Дайнова» зьяўлялася адной з самых заможных беларускіх фірмаў. Імя і гро-

шы рабіліся на вытворчасьці і продажы кампутараў ды аргтэхнікі. Што галоўнае — ачольвалі фірму людзі, неабыякавыя да беларушчыны і, адпаведна, беларускага року. Адной зь першых гэта адчула на сабе Крама. Быў час, калі гурт пачаў актыўна раскручвацца ў Расеі — удзел ў фэстывалі «Пакаленьне ’94», культавай тады «Праграме А» на расейскім тэлебачаньні, якая запрашала да сябе ў госьці толькі выбітныя гурты. Стала зразумела, што гэта можа мець нейкае разьвіцьцё, і «Дайнова» цалкам забясьпечыла гурт новымі інструмэнтамі — прычым тымі, якім крамчукі выбралі. Не віна «Дайновы», што той паход Крамы на Расеі захлынуўся.

Між тым распаўся Уліс. Слава Корань пахадзіў, пасумаваў ды пачаў зьбіраць новую каманду. Рэпэтаваць і пісацца не было дзе. І Слава прыдумаў ход канём — зьвярнуцца па дапамогу да «Дайновы» для набыцьця ўласнае студыі. Каб заяўка выглядала больш салідна, ён запрасіў у хаўрусьнікі Лявона і Касю — атрымлівалася, што просьба сыходзіць адразу ад трох каманд. Такім складам і пайшлі да аднаго з кіраўнікоў фірмы, дзе выклалі Слававу ідэю — набыць апаратуру для студыі, на якой маглі запісваць альбомы Уліс, N.R.M., Новае Неба ды іншыя беларускамоўныя гурты. Прычым каб гэта быў якасны прадукт, а не аматарскія запісы. Прынесьлі з сабой і каштарыс выдаткаў — даволі вялікі па тых часах. Суразмоўца ўзяў некалькі дзён на роздум, потым паклікаў Славу і сказаў: «Я згодны».

Акрамя абсталяваньня, «Дайнова» заплаціла нейкія шалёныя грошы за арэнду памяшканьня для студыі ў гатэлі «Агат». Там на новенькай апаратуры N.R.M. запісалі «LaLaLaLa», Слава Корань з новым складам Улісу — свой першы альбом «Блуканьне», а Кася — «Маю краіну».

Крыху пазьней справы «Дайновы» пачалі пагаршацца. Яна адмовілася аплочваць арэнду памяшканьня. З таго часу студыя пераехала ў сута-

рэньні аднаго зь менскіх інтэрнатаў, дзе месьцілася і да гэтага часу.

Лявон: *«У рэшце рэшт мы запісалі са Славам Коранем на гэтай порта-студыі тры альбомы — пасьля «LaLaLaLa» яшчэ «Одзірыдзідзіну» і «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.». Студыя была хоць і якасная, Tascam, але прызначаная ўсё ж для запісу дэма. Слава на той час, у 95-м годзе правільна выбраў — найменш дарагое і найбольш якаснае, каб на ім можна было запісаць тое, што можна людзям паказаць. Там 8 каналаў, але ўсё гэта пішацца не ў кампутар, а на касэту. Мы выкарыстоўвалі высакаякасныя касэты TDK, якія, аднак, мелі адну хібу. Стужка ў іх была нармальная, фірмовая, зь Нямеччыны, а вось каробачкі, такое ўражаньне, у нейкім Кітаі рабіліся. Бо касэты пастаянна прабуксоўвалі, стужка нdroўна цягнулася. І таму на ўсіх трох альбомах гук месцамі плавае».*

## Першае праслухоўваньне

Памятаю момант, калі я першы раз пачуў дэма-запіс «LaLaLaLa». Неяк зімовым вечарам 94-га году ўладкаваліся мы на падлозе ў кватэры карэспандэнта «Газэты Выборчай» Цэзарыя Галіньскага. Выпівалі, адзначалі ягоны дзень нараджэньня. Былі Кася, Валодзя Пац з Polske Radio, шмат народу з Радыё 101.2, яшчэ нейкія палякі. Выпівалі ўжо гадзіны дзьве, калі зьявіўся Вольскі. Змерзлы, у куртачцы з жудасных памераў капялюшам. Прынёс касэту. Была гэта, як я высьветліў значна пазьней, яшчэ самая першая дэма «LaLaLaLa», толькі-толькі запісаная.

Да п'янкі Лявон не прыяднаўся. Павіншаваў Цэзарыя і пацягнуў у кут, дзе стаяў магнітафон, гукарэжысэра «Радыё 101.2» Толю Додзя. Хутка адтуль пачуліся «Нацыя», «Дарога», «Бацька». Час ад часу скрозь музыку можна было разабраць камэнтары Толі: «Глянь ты, а Піт, здаецца, навучыўся на гітары

грацьˮ. Усім астатнім значна цікавей за тую творчасьць (хай і Лявонаву, але пад невядомай яшчэ абрэвіятурай N.R.M.) была гарэлка ды адпаведнае градуснасьці размова. А праз колькі хвілінаў усе Лявонавы музычныя экспэрымэнты і ўвогуле перасталі гучаць, саступіўшы месца «Гарэла сосна...» ў Касіным выкананьні...

Варыянт, які пазьней запісаўся на таскамаўскай студыі, быў значна якасьней. Хуткім часам фірма «Ковчег» Юры Цыбіна выдала альбом на касэтах. Не, ён ня выклікаў фурору, але й незаўважаным не застаўся. На другой рок-каранацыі «Бывай» атрымала прыз як лепшая песьня году. А хтосьці і зараз лічыць «LaLaLaLa» лепшым альбомам N.R.M.

Алезіс: *«Першы альбом быў уступны, ён, здаецца, нікога так моцна не закрануў. Хаця зараз чуюцца словы ў інтэрнэце, што «LaLaLaLa» — лепшая праца N.R.M. Чамусьці, калі праходзіць час, шмат каму здаецца, што лепшыя альбомы былі першыя. Хаця мы выступалі з «LaLaLaLa» на рок-каранацыі, і ніякага ажыятажу не было. Хто мы былі тады ў параўнаньні з Крамай, якая карону атрымала? У Крамы тады быў узлёт, вакол іх нейкая аўра была блюзавая. А N.R.M. толькі пачынаў нешта рабіць у той час.*

Інга Дземідовіч: *Але ўжо на другой каранацыі ўсе, хто быў у залі, зразумелі, што Крама паціху сыходзіць, а N.R.M. прыходзіць ім на зьмену.*

Алезіс: *Ага, на пяткі наступалі, наступалі. І наступілі. Спачатку на пяткі, а потым і на галаву...»*

Лявон: *«Усе песьні «LaLaLaLa» пісаліся па перамозе Лукі. Менавіта на гэтым альбоме — найбалючыя ўражаньні ад гэтае перамогі й ад новае беларускае дзяржавы. Бунтарскі юнацкі імпэт Мроі мэтамарфазаваўся ў новую якасьць — тэксты зрабіліся асэнсаванымі й ня проста бунтарскімі, але й мастацкімі ў нейкім сэнсе. Гэты час нарадзіў, наогул, шмат таленавітых твораў.*

*Напрыклад, Міхал Анемпадыстаў напісаў, на мой погляд, лепшыя свае тэксты для Касі ў альбом «Мая краіна».*

*Песьня «Бывай» — адлюстраваньне гэткіх уцякацкіх настрояў у лукашэнкаўскай Беларусі. Прычым уцякаць можна было ня толькі за мяжу — уцякалі (і ўцякаюць) у свае думкі, у работу, у п'янства, у вар'яцтва. Таму «бывай, мой родны край!» — гэта сучаснае «разьвітаньне з Радзімай», з свабоднай, нармальнай, менавіта тваёй краінай. Зрэшты, тлумачыць сэнс песьні — няўдзячная справа. Там сказана значна болей. І гэта я патлумачыць ня здольны.*

*Легкадумна-таямнічая «Белыя лебедзі» пісалася так: я сказаў Алезісу: «Нясіце тэксты! Пішыце й нясіце! Будзем пісаць музыку на тэкст, а не наадварот, каб пабурыць старую хардрокаўскую завядзёнку». І ён пачаў фантанаваць. Алезіс — гэткі парадаксальны, дзіўнаваты лірык. І ў гэтым альбоме ён вельмі добра, яскрава паказаў сябе».*

Алезісава натхненьне ўзбагаціла «LaLaLaLa» амаль паловай песень — «Белыя лебедзі», «Дарога», «Мітусьня», «Зомбі», «Халі-галі».

Алезіс: *«Гэта не рэкорд. У Мроі бывала, што на нейкіх альбомах большасьць песень — мае. Магчыма, аднойчы гэта падштурхнула і Лявона да таго, каб болей пісаць».*

## «Дзе наш беларускі Deep Purple?»

Канчатковае пераўвасабленьне Мроі ў новы гурт пацьвердзіў першы ж эфір на тэлебачаньні. Анатоль Вечар вёў на БТ праграму «Акалада», куды й запрасіў старых сяброў. Гадзіну ў прамым эфіры яны сьпявалі, а потым адказвалі на тэлефанаваньні. Гэты эфір і засьведчыў — прыхільнікі Мроі, якія збольшага былі ейнымі пагодкамі, не даравалі хлопцам «зьмены арыенціраў». Стала відавочна — старая аўдыторыя губляецца, і трэба заваёўваць новую.

Піт: *«Зьяўленьне ў праграме Вечара выклікала мора абураных тэлефанаваньняў — «Як вы маглі, гады, такі цудоўны цуд, як Мроя, такі цудоўны наш беларускі Deep Purple ператварыць вось у гэта... Ці забыліся вы, як яшчэ нядаўна ўсе стаялі на сцэне і, счапіўшы рукі, пелі вашую «Наш карабель яшчэ плыве, Наш рок-н-рол яшчэ жыве!»*

Нешта падобнае ў будучым адбудзецца ўжо з аўдыторыяй N.R.M., прычым неаднаразова. Час будзе рухацца хутчэй. І ці ня з кожным альбомам будзе зьяўляцца ня толькі шмат новых прыхільнікаў, але й шмат людзей, што будуць блюзьнерыць з тае нагоды, што «N.R.M. ужо ня той», што новы альбом — найгоршае, што магло зьявіцца пасьля геніяльнага папярэдняга...

Аднак у тагачасных умовах зьмена кола прыхільнікаў была выратавальнай. Яна дазваляла музыкам перайсьці ў іншы час, скінуўшы старую скуру. Ужо наступны альбом надаў N.R.M. такую папулярнасьць, якой Мроя, магчыма, і ня ведала.

## Разьдзел 12

## 1996–1998. «ОДЗІРЫДЗІДЗІНА» І «ПАШПАРТ...»

«Корреспондент: *Одно из твоих наиболее часто встречающихся высказываний: «Хит-парад сделал белорусские группы популярными»... Меня всё время интересовала одна вещь: были ли какие-то предпосылки к этому убеждению?*

Анатоль Вечар: *Конечно! Подъем N.R.M., например, начался с чего?*

Корр.: *С чего?*

Вечар: *С «Одзірыдзідзіны», которая 36 раз прокрутилась в «Музыкальной обойме»*.

(Анатоль Вечар у інтэрвію «Музыкальной газете»)

### Хто «раскруціў» N.R.M.?

Эх, каб такі просты сцэнар і сапраўды дзейнічаў, штук 50 гуртоў было б зараз у Беларусі ўзроўню N.R.M. На жаль ці на шчасьце, для посьпеху трэба крыху больш, чым 36 эфіраў на Беларускім тэлебачаньні. Трэба нешта іншае. Тое, чым новы альбом N.R.M. «Одзірыдзідзіна» валодаў цалкам. А менавіта — ідэя, якасьць, своечасовасьць.

*«Менавіта пасьля гэтага альбому N.R.M. набылі папулярнасьць, згубленую Мрояй, і гэты посьпех сапраўды амаль ня быў зьвязаны зь імем «ветэранаў беларускага стод-року» — зусім іншая музыка і падыход. Хай сабе ідэя незалежнай краіны-гурта ня надта «сьвежая» — яе ўжо выкарыстоўвалі хлопцы з каманды Laibah, хай паміж Вольскім і Ка-*

*бэйнам доўгі час праводзілі паралелі. Але ж галоўнае ў тым, што самі N.R.M. здолелі стаць музычным сымбалем «нашай ускраіны»: прамежак часу, які пачаўся з гэтага альбома і цягнецца дагэтуль, можна назваць «эрай N.R.M.».* (Часопіс «Студэнцкая думка», 2003 г.)

Тое, што адбывалася на «нашай ускраіне», стварала глебу для ўздыму N.R.M. Часы рамантычнае дэмакратыі скончыліся. Рок з утульнае канапы зноў перабіраўся на барыкады. Гэта не заўжды было ўтульна і ёмка. Прыкмета часу — нязьменны аўтар тэкстаў і прадзюсар Крамы Зьміцер Лукашук кінуў музыку, зрабіўшы выбар на карысьць шлюбу з дачкой дырэктара мясакамбінату. Між тым «Одзірыдзідзіна» знайшла такі стыль і такія словы, што патрапілі на грамадзкія чаканьні, «у кропку».

Лявон: *«Спэцыяльна нічога не рабілася. Пісалася як пісалася. Гэта зараз, калі мы ведаем, што альбом «стрэльнуў», можна аналізаваць, чаму. На альбоме прысутнічала такая тэма, якая аб'ядноўвала маладую апазыцыйна настроеную моладзь, прычым розных абсалютна гатункаў — і беларускамоўную, і не беларускамоўную. Амаль у кожнай песьні там ёсьць словы «мы»: «Мы самі па сабе», «Мы жывем пад зямлёю», «Мы партызаны...». Гэта на падсьвядомым узроўні фармавала ў людзей упэўненасьць, што «мы» — гэта еднасьць нейкая. Зроблены быў падмурак, каб сфармавалася нацыя N.R.M.*

*Вельмі моцная песьня ёсьць на альбоме, якая заўжды добра «заходзіла» на канцэртах, — «Песьня падземных жыхароў». А ўсё таму, што яна як бы цэмэнтавала ўсю нашу публіку разам, наносіла падпольнага рамантызму і разам з тым усьведамленьне таго, што яны — эліта, змагары. Гэтае адчуваньне праходзіла праз увесь альбом разам зь яго асноўнымі тэмамі — партызаны, вайна, падпольле».*

Аднак папулярнасьць «Падземных жыхароў» пры ўсім тым ня йшла ані ў якае параўнаньне з галоўным гітом альбому — «Партызанскай». Квінт-

эсэнцыя ўсяго «змагарскага» ў альбоме, гімн «Менскай вясны-96», калі вулічныя выступленьні амаль ня зьнесьлі Луку з п'едэсталу. Памятаюцца «Чарнобыльскі шлях-96», першыя прарваныя кардоны міліцыі і АМАПу на плошчы Якуба Коласа, першая кроў і нэрвовая шматгалосная «Партызанская» над прашпэктам Скарыны. Песьня з настолькі яўнымі алюзіямі не магла ня стаць прычынаю скандалу. Што й здарылася на чарговай Рок-каранацыі.

Піт: *«Гэта быў год, калі каранавалі Ляпісаў. Там нейкія кветкі на сцэне былі, дамы з доўгімі нагамі — спроба зрабіць найгоршага гатунку нейкія Авацыі расейскія. Цыбін, арганізатар каранацыі, баяўся. Ён разумеў, што песьню года трэба аддаваць N.R.M., і аддаваць яе «Партызанскай». Бо ў Ляпіса не было такога звышгіта. Адно што «Ты Роксана, я Бабаян». Але яна не была настолькі вядомая, як «Партызанская»*.

Для перастрахоўкі Юра Цыбін прыдумаў два хады. Па-першае, песьню года вызначала заля з дапамогаю шумамеру. Па-другое, у намінацыю вылучылі тры песьні, сярод якіх «Партызанскай»... не было. Арганізатары выбралі «Мела мамка тры сыночкі» — кавер народнай песьні. Неблагі, але ж ня гіт. І вось на сцэну выйшлі Ляпісы, сьпелі «Раксану...», потым Шэдзько, і ў рэшце рэшт N.R.M., якія ўрубілі... «Партызанскую». Юра Цыбін зьбялеў, але выправіць сытуацыю ўжо ня мог. Заля білася ў істэрыцы, грукала нагамі. Песьня атрымала свой прыз. І нават прайшла па БТ, якое трансьлявала шоў.

### «ЗЬ ІРОНІЯЙ, САРКАЗМАМ, ДУРНОЙ ВЕСЯЛУХАЙ...»

Лявон: *«Ідэя партызаншчыны прыйшла досыць спантанна. Мэтай было абнавіць стары беларускі брэнд. Бо, з аднаго боку, гэтая тэма дзіка надакучыла яшчэ ў дзяцінстве — фільмы пра партызанаў, цягнікі пад адхон, яны ў шапках і валёнках бадзяюцца па лесе, дзед Талаш. Зь*

*іншага боку ў кантэксце беларускае дзяржавы 1995—1996 гг. тэма партызаншчыны гучала своеасабліва. Былі мітынгі, па 50 тысячаў народу зьбіралася. І песьня пісалася як лёгкая спэкуляцыя на гэтае тэме. Бо ўсе разумелі пра што песьня, але не маглі падкапацца. І таму можна было нават круціць яе на радыё. 101.2 пастаянна так рабіла.*

*Я б сказаў, што з «Одзірыдзідзіны» пачаўся нейкі іншы падыход да сытуацыі, да творчасьці. Мы сталі больш творча халодныя. Бо на «LaLaLaLa» адчуваецца запрыгоненасьць сытуацыяй, адчуваецца, што нам балюча, вельмі балюча бачыць, што ў краіне адбываецца проста гамон нейкі. А на «Одзірыдзідзіне» націск змаганьня быў прадэманстраваны зь іроніяй, сарказмам, дурной весялухай. Мы сказалі — немагчыма пастаянна дзяўбці сябе, трэба менавіта праз іронію ратавацца. І ўсё тое, што рабіла дзяржава беларуская, мы таксама праз іронію паўтаралі — герб памянялі, сьцяг»*.

З гербам ды назовам альбому — асаблівая гісторыя. Колькі год прайшло, а людзей, якія ведаюць, што значыць загадкавае слова «одзірыдзідзіна», — адзінкі. Цяпер да іх далучысься і ты. Назовам песьні ды ўсяго альбому мы абавязаныя тром складнікам. Па-першае, сяброўскаму ...чэскаму народу. Па-другое, складальнікам падручнікаў па сьпевах для трэцяе клясы савецкае сярэдняе школы. Ну і па-трэцяе, мо самае галоўнае — выдатнае памяці Іры Башнявай, якая вучылася з Лявонам ды Алезісам яшчэ ў мастацкае вучэльні. На нейкае тусоўцы менавіта яна ўзгадала і той падручнік, і сьмешную-сьмешную чэскую песьню (чаго толькі пасьля добрае порцыі віна не ўзгадаеш), якую тут жа й выканала:

*Как-то на опушке собрались подружки.*
*Песни распевали, вторит им кукушка:*
*Ку-ку, ку-ку, ла-ла-ла, одиридидина...*

Лявон: *«Я думаў — які маразм, але ж дзецьмі мы яе сьпявалі. І тады мне думка прыйшла ў галаву, што варта для маразму яе скарыстаць, уставіць у панк-песьню незразумелым рэфрэнам. Эфэкт атрымаўся такі, што ўсе ўвогуле спачатку баяліся граць «Одзірыдзідзіну», казалі: «Ну што гэта за брэд». Аднак пагадзіліся. Пазьней я нават птушку гэтую намаляваў. Атрымаўся такі геральдычны папугай».*

Паспрыяла продажам альбому і тое, што ўпершыню касэта была выдадзена са спэцыяльнай укладкай, дзе друкаваліся ўсе тэксты песень. Увогуле, па агульным меркаваньні альбом атрымаўся цікавы і разнастайны. Незразумела, якім чынам вылез прывабны альтэрнатыўны гук (якога Лявону потым не хапала на «Пашпарце...»). Гэта пры тым, што альбом запісаўся даволі хутка — меней чым за два тыдні. Юрась і Алезіс адпісаліся ці не за адзін дзень, Лявон хутка дадаў гітару і вакал, і толькі Піт затрымаўся. Хоць з гурта яго ўжо ніхто ня гнаў, ён вырашыў дамагчыся немагчымага — дасканаласьці.

Песьні атрымаліся разнастайныя, з экспэрымэнтамі. «На лініі фронту» — першы вопыт з рэчытатывам ды яшчэ адным ноў-хаў — паскораным голасам даў цікавы эфект. Рэп-мэтал у «Сьляпы, глухі, дурны», постмадэрнісцкія вопыты Алезіса ў тэксьце «Мы самі па сабе». Некаторыя песьні, канешне, хутка забыліся — тая ж «Сьляпы...», якую хлопцы беспасьпяхова паспрабавалі рэанімаваць на канцэртах праз некалькі год. Але тое дробязь у параўнаньні зь існаваньнем на альбоме гітоў кшталту «Лепей ня будзе».

Песьня, якая ўспрымаецца абсалютна супрацьлегла. Па мне, дык яна задае пэсымістычны тон усяму альбому, Лявону бачыцца проста мінорным гукам у разнастайным шэрагу кампазыцыяў, а для аўтара — Алезіса — песьня парадаксальна ўяўляецца аптымістычнай.

Лявон: *«Алезіс прынёс тэкст «Лепей ня будзе» і думаў, што зь яе выйдзе жорсткі панк. А я хадзіў, хадзіў і сказаў, што не, мы створым баляду. І ат-*

*рымалася адна зь лепшых нашых балядаў. Нават Алезісу спадабалася».*

Алезіс: *«Пачалося ўсё з фразы, якую я дзесьці пачуў: «Лепей ня будзе, будзе толькі горш». Мяне яна зачапіла. Бо, у рэшце рэшт, гэта ж сьвятая праўда. Мы ж з часам старэем, і нам падаецца, што раней было лепей. Вось, паглядзіце, як пэнсіянэры ўсё гавораць «савецкі саюз, савецкі саюз». Таму што гэта было раней. А цяперашняе — гэта ўсё горш, горш, горш.*

*Але яна на першы погляд толькі пэсымістычная. Калі прыгледзіцеся, дык гэта песьня жыцьцесьцьвярджальная, ці, прынамсі, рэалістычная. Там закладзеная думка, што ня варта строіць ілюзіі і жыць імі...»*

Лявон: *«Жыцьцесьцьвярджальная? Гэта Алезіс так сказаў? Ну, ня ведаю... Мы зараз на канцэртах калі яе граем, я ўсё думаю: «Блін, можа, мы гэтай песьняй накаркалі ўсё, што ў нас адбываецца...»*

## Прэзэнтацыя «Одзірыдзідзіны» і эміграцыя Алезіса

«У народ» альбом пачынаў сваё шэсьце зусім не трыюмфальна. На адным зь першых канцэртаў, дзе гучала большасьць песьняў з «Одзірыдзідзіны», прысутнічалі... чалавек 10. Заплянаваны ён быў у новым рок-клюбе ў адным зь інтэрнатаў БПІ. Рэкляма адсутнічала цалкам. Ды й гэты канцэрт мог не адбыцца. Напярэдадні Алезіс са швагерам сваім бадзяліся па менскіх барчыках, выпівалі, і чорт занёс іх да Цэнтральнага РУУСу. Швагера, які амаль не трымаўся на нагах, забралі ў ментоўку. Алезіс стаяў, чакаў, на працягу 15 хвілінаў тры разы заходзіў у будынак РУУСу. І калі яму ў чарговы раз не адказалі, ці выпусьцяць сваяка, пачаў усё крышыць. Далей былі наручнікі, клетка з бамжамі, сарваныя зь нейкага лейтэнанта пагоны... Зранку Алезіса павялі судзіць. І калі б судзьдзя даў яму сутак 15, можна было б забыцца на канцэрт. На дзіва ўсё абмежавалася штрафам.

Толькі вось руку менты Алезісу выкруцілі, і ня мог ён нават нармальна па талерцы ўдарыць. І яшчэ фірмовыя Levi's клёш парвалі. Прыйшлося выкінуць. Адныя страты. Мо таму Алезіс у чарговы раз кінуў піць і вырашыў... эміграваць.

Гісторыя гэта цёмная. Сам герой пра яе нікому ніколі не распавядаў, зараз узгадваць не жадае, ды й энэрэмаўцы даведаліся пра Алезісаву спробу зьехаць з краіны выпадкова і толькі праз некалькі год. А тады нават не зьвярнулі ўвагі, што той некуды зьнік на тыдзень. Алезіс між тым быў у Празе. Чаму менавіта чэская сталіца мусіла стаць трамплінам на Захад — таксама загадка. Магчыма, падавалася, што менавіта адтуль — прасьцейшы шлях у Канаду.

Менавіта туды, у Квэбэк, на колькі год раней эміграваў Алезісаў пляменьнік. І пачаў дзядзьку пісаць лісты, што супэр тут усё. А што ў Беларусі? Грошай няма, посьпеху (яшчэ) няма. Алезіс пачаў вучыць францускую мову і рыхтавацца да ад'езду. Хтосьці сказаў, што дакумэнты прасьцей аформіць у Празе. І разам зь нейкім сябрам Дземідовіч сеў на цягнік...

Далейшае гісторыі бракуе яснасьці. Адныя паўцені чутак. У Празе нешта ня склалася. Прыйшлося ехаць у Варшаву. На тамтэйшым вакзале да іх чапляецца наркаманістая мафія. Уцёкі. Куплены квіток да Менску. Ды, аказваецца, цягнік едзе ў польскі Менск-Мазавецкі. Вяртаньне назад, дарэмныя пошукі мейсца, дзе паспаць. І шлях на электрычках да свайго, роднага Менску. Радзіма не адпусьціла свайго сына. Ідэя эміграцыі была выкінутая на сьметнік...

Тым болей, што нарэшце да N.R.M. пачала прыходзіць сапраўдная папулярнасьць.

Дзякуючы Жэню Калмыкову пабачыла сьвет касэта «Made in N.R.M.» — зборка лепшых песень з двух першых альбомаў. Калмыкоў тады пачаў выдаваць музычны часопіс «Уши» і такім прадзюсарствам спрабаваў прыцягнуць увагу да праекту.

Лявон: *«Гэта быў хітры ход з нашага боку — выпусьціць зборку з двух альбомаў і тут жа зрабіць*

*прэзэнтацыю ў клюбе «Рэзэрвацыя». У першым аддзяленьні гралі «LaLaLaLa», у другім — «Одзірыдзідзіну». Клюб быў паўнюткі. Тады мы зразумелі, што запрысутнічаў прывід посьпеху».*

### Праблемы з уладамі

Папулярнасьць, набытая праз «Одзірыдзідзіну», павялічыла ня толькі кола прыхільнікаў, але й праблемы з уладамі. Дзіўна, але часьцяком яны былі нават большыя, чым за савецкімі часамі. Хаця чаго дзіўнага — пасьля вулічных шэсьцяў ды амаль удалай спробы імпічманту ўлады пачалі «завінчваць шрубкі». Музычны фронт падпаў пад моцны ўціск адным з першых.

Лявон: «*За савецкімі часамі праблемы былі меншымі, бо, здаецца, тады ня так баяліся гневу зьверху. Ну, прыехала нелітаваная каманда ў Быхаў, напрыклад. А там дырэктар ДК, які-небудзь габрэйчык, глядзіць, што можа з канцэрту атрымаць нармалёвы прыбытак. І быццам бы забаронена, але ён рукой махае і кажа: «Грайце. Пад маю адказнасьць». А пры Луку пачалося: «ДК у аварыйным стане», «няма сьвятла», «дзе дазвол на выступ...»*

*Нават на буйных фэстывалях здараліся вялікія праблемы. У Магілеве даўно ўжо праводзілі фэст царкоўнае музыкі «Магутны Божа». А аднаго году вырашылі правесьці і паралельны фэстываль «Музыкі Беларусі насустрач «Магутнаму Божа». Запрасілі рокераў розных. Мы прыехалі. Ніякіх праблемаў спачатку не было, ужо нават апаратура на сцэне стаяла, публіка нейкая тусавалася. Тут прыяжджае намесьнік старшыні выканкаму:*

*— Дзе тэксты? Ну-ка, пакажыце.*

*Мы яму:*

*— Якія тэксты?*

*Ён:*

*— Дык вось, пакуль ня будзе тэкстаў у мяне вашых, ніякага канцэрту ня будзе. Я начальнік тут, я маю права гэта запатрабаваць. Калі вы*

*ня хочаце даваць, калі вы такія крутыя зоркі, можаце ехаць назад.*

*Урэшце мы напісалі самыя бяскрыўдныя тэксты. Гэта ніяк ня вырашыла пытаньня. Бо звычайна ні на якія ня трэба йсьці саступкі гэтым людзям. Але мы напісалі. Яны марудзілі, марудзілі. Тры дні мы ў Магілеве бадзяліся, пакуль высьветлілася, што нічога ня будзе і трэба зьяджджаць. Зьехалі».*

Аднаго разу супрацьдзеяньне канцэрту амаль не прывяло да пагрому. Адбылося тое ў Гародні, у кінатэатры «Космас». Маладыя анархісты зарганізавалі N.R.M. канцэрт зь мясцовымі камандамі. І яны, паганцы, яшчэ пасьпелі па чатыры песьні адыграць свае, а выйшаў на сцэну N.R.M., толькі пачаў кантакт з заляй знаходзіць — раптам вырубаецца сьвятло. Не, ля рубільніку не стаяў мясцовы Іван Адольфавіч. Ніхто нічога не тлумачыў, і не хацелася думаць, што гэта наўмысна, але хутчэй за ўсё так і было. Хлопцы чакалі, чакалі. А панкі-анархісты між тым у цемры пачалі граміць залю. Паўсюль б'юцца бутэлькі, бойкі ўсчыняюцца. Спужаныя арганізатары забеглі на сцэну са словамі: «Давайце, хлопцы, закругляцца».

Лявон: *«У Гародні яшчэ з-за чаго такі дэбош узьняўся? Усе былі злыя, што не дачакаліся «Партызанскую». Бо 97-мы год быў, якраз песьня на ўздыме. Мы пазьней, дарэчы, калі «Партызанскую» на канцэртах і выконвалі, то не апошняй, а першай. Ідэя была супэр. На той час зьявілася шмат новых песьняў, якімі можна было зачыняць канцэрт. Але публіка заўжды патрабавала «Партызанскую», прычым цягам усяго канцэрту. А тут раз, і песьня ўжо зграная, і прасіць няма чаго. Геніяльна».*

Зрэдку толькі забароны давалі ўскосны станоўчы эфэкт. З аднаго з канфліктаў у правінцыйным ДК фактычна нарадзілася «п'еса» для альбому «Дом культуры». А з паездкі ў Магілеў, хай канцэрт і быў забаронены, прывезьлі ідэю «Кумбы» — першае песьні новага альбому, які ня толькі пацьвердзіў папулярнасьць гурта, але і заклаў моцны падмурак у ідэалёгію энэрэмаўскае дзяржаўнасьці.

### *Кумба*

Лявон: *«Калі нам забаранілі выступаць у Магілеве, мы вымушаныя былі бадзяцца там яшчэ тры дні. А па атмасфэры горад адрозьніваўся ад Менску. Менск яшчэ ня выйшаў з атмасфэры дэмакратыі, капіталізму і ўнутранае свабоды. Па вуліцах усе адрозныя адзін ад аднога хадзілі — хто валасаты, хто лысы. А ў Магілеве абсалютная большасьць народу — быццам браты — усе каратка пастрыжаныя, у скураных куртках, турэцкіх швэдрах. І мы хадзілі як белыя вароны сярод працоўнай моладзі. Заходзім у нейкае кафэ, і ўсе на нас вочы пяляць — гатовыя морду набіць. І аднойчы ўзьнікла асацыяцыя, тэма, што тут кумбы нейкія жывуць выключна. Кумбы — гэта тыпу робатаў-мутантаў зь нейкага старога чэскага фільму. Яны там накачаныя, карак такі — галава адразу ў плечы перарастае. І прыйшла ідэя песьню зрабіць.*

### *Паветраны шар*

Лявон: *«Я нават ня думаў, што яна будзе папулярнай. Цяжка нават вызначыць фармат песьні, патлумачыць, з чаго яна нарадзілася. Нас на той час пагналі з «Агату», і мы рэпэтавалі на радыё 1012, але не ў нармалёвых памяшканьнях, а ў нейкіх закінутых пакоях, якімі ніхто не карыстаўся, бо яны патрабавалі рамонту. Мы там сядзелі, было холадна, непрыемна. Хацелася ад рэчаіснасьці некуды ўцячы. І раз — напісалася песьня».*

#### *Пакуль не пачнецца вайна*

Аня Вольская: *«У нас тады толькі Адэля нарадзілася — пялёнкі, крыкі. А Лявон Radiohead наслухаўся. І я неяк зь дзіцём займаюся і раптам чую гітарны пройгрыш. І я сказала: «О, якая пры-*

*гожая мэлёдыя, ты ніколі такіх не пісаў». З таго часу ў мяне ўражаньне і засталося ад песьні: плёнкі, Адэля крычыць і Лявон найгрывае «За гэтай сьцяною наступная будзе сьцяна.»*

Лявон: *«Я тады яшчэ не зусім добра ўмеў граць на гітары, падбіраў рыфы, экспэрымэнтаваў, і раптам выскачыла з-пад пальцаў мэлёдыя. Тэкст у той жа дзень напісаўся. Супэрпесьня. Незаслужана забытая».*

## 25, 26, 27...

Лявон: *«Тэкст напісаў Міхал Анемпадыстаў. Ён папёрся неяк на мітынг. Прыйшоў і глядзіць: менты бегаюць, б'юць людзей, людзі ў адказ кідаюць камяні. Ну і што яму заставалася рабіць? Толькі ўзяць камень і кінуць, тым больш што стаяў у авангардзе народу. І здарылася тое, што мусіць здарыцца, калі батанік змагаецца з рэжымам: акуляры зваліліся, ён пачаў іх падымаць, яго штурханулі... Менты навалiліся, запіхнулі ў аўтобус. Сказалі — «мы, скаціна, знойдзем на відэа, як ты кідаеш камяні, і табе нармальны тэрмін прыпаяем». Але, дзякуй Богу, нічога не знайшлі яны на сваіх стужках і Міхала адпусьцілі. Так песьня напісалася «з падслуханага».*

*І самае сьмешнае, што калі мы гралі на Бангалоры яе, да мяне падыйшоў пераапрануты міліцыянт і сказаў: «Спасибо Вам большое от всего нашего РОВД — вот как Вы написали, так оно и есть на самом деле». Пацісьнуў руку і пайшоў.*

*Так што песьню варта ўспрымаць як зьлепак тагачаснага жыцьця. Мы яе ў апошні час перарабілі, граем максымум адзін, два разы на год, і народу падабаецца. Хоць аранжыроўка дзіка наваручаная і блізкая нават да джазу».*

### *Песьні пра каханьне*

Лявон: *«Песьня харошая. Якая папса? Пазытыўная песьня. Мы рэпэтавалі тады ў Доме мо-*

*ладзі на Камсамольскім возеры. Адэлі было месяцы два. Я нявыспаны прыходзіў а 9-й на рэпэтыцыю. І для падтрымкі добрага настрою напісалася. Хацелася ўвогуле асьвятліць сытуацыю».*

### *Добры вечар, дзяўчыначка*

Лявон: *«Песьня існуе ў трох варыянтах. І самае сьмешнае, што найлепшы — той, які зрабіўся на хуткую руку. Людзі, якія рабілі «Песнярок», запатрабавалі дэма для нейкіх мэтаў. Мы на 101.2 яго запісалі. Там машынка была замест барабанаў, а наверх пісалася ўсё астатняе. Толік Додзь за адзін вечар зьвёў, і мы адправілі гэты варыянт. Потым ужо для канчатковага варыянту «Песнярка» мы пісаліся доўга ў студыі, але зьведзена песьня на альбоме была жудасна — што непатрэбна вылезла, патрэбнае сыйшло. На «Пашпарт...» мы яе зноў перапісалі, але гэтым разам яна шэранькая атрымалася. Хаця сам па сабе кавер быў добры».*

### *Песьня юных падпольшчыкаў*

Лявон: *«Захацелася працягнуць тэму партызанкі. Але песьня атрымалася вельмі штучная, зацягнутая — на 6 хвілінаў, з разьвіцьцём нацягнутага сюжэту. Доўга яе пісалі. А калі доўга пішацца, рэдка што добрае выходзіць. Той жа «Твой партрэт» перапісваўся тры разы. Алезіс прынёс тэкст. Але музыка на яго ніяк ня клалася. Песьня так слабая і засталася».*

### *Твой партрэт*

Алезіс: *«Першы варыянт тэксту быў абсалютна іншы, там нават па ідэі не было ніякага партрэту і вобразу таго, чый гэта партрэт. Але праблема палягала ў тым, што музыка ўжо была, а тэкст да яе не дапасаваўся, ды й не спадабаўся нікому. Мне ўвогуле прасьцей, калі спачатку*

*пішацца тэкст, а ўжо потым музыка — арганічна атрымліваецца. А калі наадварот, то прыходзіцца нейкім штучным прышчэпліваньнем займацца. І ў выніку атрымалася «на злобу дня» песьня, недаўгавечная. Бо такія песьні, яны як газэта — сёньня цікава, а заўтра забываецца. І мы яе амаль ня гралі потым на канцэртах. Як, дарэчы, і «...юных падпольшчыкаў», бо таго ж кшталту тэкст быў. Хаця я ведаю, што ёсьць вялікія прыхільнікі менавіта «...партрэту». Ты ўжо сам словы забываеш, а яны памятаюць».*

### *Беларускі шлях*

Алезіс: *«Песьня пісалася як вясёлая пародыя на беларускі гімн савецкіх часоў. Задумка была ўпіхнуць туды ўсё — і буслоў на палетках як фэтыш, і савецкае выхваленьне — маўляў, усё ў нас добра і мы самыя малайцы ў сьвеце, і браваду псэўдапатрыятычную пра сякеру пад лавай... Мы ж менавіта іроніяй і адрозьніваемся ад большасьці гуртоў беларускіх — занадта сур'ёзных».*

Лявон: *«Тэкст на мяжы фолу, як заўжды ў Алезіса».*

### *Нам усім гамон*

Лявон: *«Гэта проста музычны жарт, песьня, дзе сытуацыя ў краіне разглядаецца праз дэбільны чорны гумар. Да ўсяго я, ня вельмі добры інструмэнталіст, граю тэйпінгам, і Піт дэманструе звышгітарысцкія здольнасьці. Для сьмеху».*

## «ПАШПАРТ...» У НАТАТКАХ

...Я не зьдзівіўся, калі Лявон назваў «Пакуль не пачнецца вайна» песьняй незаслужана забытай. Зьдзіўляўся я раней, калі зразумеў тое ж самае. У 2003 г. нарадзілася ідэя выдаць «Справаздачу», прычым складзеную з улюбёных песень фанаў N.R.M. Вызначалі папулярнасьць праз анкеты

Клюбу грамадзянаў на афіцыйным сайце. Зарэгістраваных сяброў клюбу тады было болей за дзьве тысячы. Колькі ж зь іх назвалі «Пакуль не пачнецца вайна» ўлюбёнай песьняй альбому? Не здагадаліся! 28! З болей чым дзьвюх тысячаў! Адным зь іх быў я, так што, лічы 27. Патлумачыць гэты факт я не магу да сёньняшняга дня.

...А другой па папулярнасьці сярод фанаў стала якая (ну, пасьля «Паветранага шару», зразумела)? «Песьні пра каханьне» — хто б меў сумнеў. Лёс ейны, дарэчы, праз год паўторыць ужо цэлы альбом «Тры чарапахі»: дзікая папулярнасьць, абвінавачваньні ў папсе, хоць нейкія ды ратацыі на радыё. Акрамя таго, яшчэ да «Трох чарапахаў» яна зрабіла N.R.M. цалкам ды Вольскага ў прыватнасьці вядомымі па-за межамі пэўнага кола людзей. Узгадваю адзін выпадак. У лютым 2000 г. зграў вясельле Алезіс. Завёз людзей пад Менск у спартовы комплекс Стайкі, а назад вяртацца прыйшлося сваім ходам. Злавілі з Лявонам ды Аняй старэнькі «фольксваген». Чаго размова зайшла пра музыку — нават не ўзгадаю. Зусім гопніцкага выгляду хлопец нават зьдзівіўся, даведаўшыся, што вязе музыку:

— І ты тожа музыкант?

— Так, — адказвае Лявон.

— І как твая группа называецца?

— N.R.M.

— Не знаю такую.

— А, дык эта ж вы, вроде, поете песни про каханне, — раптам, зьвяртаючыся да Лявона, адгукнуўся ягоны таварыш-кіроўца...

...Цікава, як часьцяком не супадаюць чаканьні і рэчаіснасьць. Лявон ня думаў, што «Паветраны шар» стане гітом. А стаў. Крыху іншая сытуацыя — з «25, 26, 27...». Памятаю, забег на адну з рэпэтыцыяў N.R.M. «Пашпарт...» яшчэ нават не пісаўся, а хлопцы рэпэтавалі «25, 26, 27...». «Во гэта будзе гіт. Вось пабачыце!» — упэўніваў усіх Лявон. Песьня атрымалася цікавенькая, але гітом так і ня стала.

...На песьню «Нам усім гамон» адзін з прыхільнікаў N.R.M. нават намаляваў мульцік. Шыкоўны. Таленавіты. Даслаў мне. Папрасіў вывесіць на сайт. Але — біце мяне, біце — я яго згубіў. Чысьціў кампутар ад усялякага сьмецьця і выпадкова забіў. Няма апраўданьня...

...«Пашпарт», як і два папярэднія альбомы, запісаўся ў студыі Славы Кораня. Хаця ўжо тады прапрацоўваліся іншыя варыянты. Так, «Паветраны шар», «Песьні пра каханьне» і «Твой партрэт» запісаліся раней ад іншых у першае студыі беларускага радыё. Зроблена гэта было праз энтузыязм Сяргея «Шлёмы» Лабандзіеўскага, які працаваў тады на радыё музычным рэдактарам.

Шлёма: *«Я як толькі пачуў «Паветраны шар» на рэпэтыцыі, адразу сказаў Лявону: «Гэта будзе гіт». Ён на мяне рукамі замахаў. Але песьня мне так спадабалася, што я вырашыў запісаць яе ў студыі. Замовіў яе, карыстаючыся службовым становішчам. Потым там жа запісалі «Песьні пра каханьне» і «Твой партрэт». Мне вынік спадабаўся, але я апынуўся ў меншасьці. Гукарэжысэрам быў Саша Марозаў, прафэсійны хлопец — пісаў канцэрты аркестру Фінберга, аднак як працаваць з рокавымі гуртамі, ён ня ведаў. І таму мы нарабілі памылак. Гітары, напрыклад, трэба пісаць праз узмацняльнік — альбо комбік, альбо стэк — і ўжо адтуль мікрафонамі здымаецца нармалёвы гук. А калі ўтыкаесься адразу ў пульт, то гук рэзкі і не такі цяжкі, як трэба. Саша ж так і зрабіў. У выніку гэта не было лажай, але гук атрымаўся нефірмовы, і ўжо ніхто не разглядаў магчымасьць запісаць на радыё ўвесь альбом».*

...На «Пашпарце...» безумоўна дасягнула свайго росквіту дзяржаўнасьць N.R.M. Музыкі атрымалі афіцыйныя міністэрскія пасады, а кожны пакупнік дыску, ды ўвогуле кожны жадаючы — магчымасьць ня проста звацца грамадзянінам N.R.M., але й атрымаць дакумэнтальнае таму пацьверджаньне. Вокладкі касэтаў і дыскаў зрабілі ў выглядзе па-

шпартоў. Наклейваеш фотаздымак, зьбіраеш аўтографы-подпісы міністраў — і ты грамадзянін. Добрая краіна. Падаткі мінімальныя — аплочваць квіткі на канцэрт. Праўда, пэнсійнае забесьпячэньне адсутнічае. Але што зробіш — не знайшлося чалавека на пасаду міністра па пэнсіях. Бо справаў шмат. А музыкаў — чатыры. Пазьней мы пачалі выдаваць пашпарты і праз інтэрнэт. Цывілізацыя... У той жа час зьявілася ідэя напісаць Канстытуцыю рэспублікі, але вучоных людзей не знайшлося. Прыходзіцца цяпер жыць па службовых інструкцыях. Цалкам сакрэтных.

...Тэхнічны прагрэс паціху дабіраўся да Беларусі, і «Пашпарт...» стаў першым альбомам, які быў выдадзены ня толькі на касэтах, але й на дысках. Праўда, гэта былі не CD, а кампутарныя CD-ROMы. І наразаліся яны, адпаведна, з кампутара, а вокладкі першага накладу дыскаў друкаваліся на каляровым прынтары. Зразумела, што такім спосабам тысячы асобнікаў зрабіць цяжка. Таму «Пашпарт...» на дыску зараз у продажы знайсьці і немагчыма.

### «Акустычныя канцэрты...» і іншыя праэкты

Увогуле, перыяд з 1996 па 1999 г. быў звышнасычаным. Акрамя ўласна энэрэмаўскіх альбомаў зьявіліся супольныя праэкты «Песнярок», «Народны Альбом», ужо згаданая складанка «Made in N.R.M.».

Акрамя таго, недзе праз год пасьля «Пашпарту...» гурт правёў экспэрымэнт, а менавіта выдаў двайны акустычны альбом. Аналягаў у Беларусі не было. За савецкімі часамі ніхто не практыкаваў так званых «кватэрных канцэртаў». Рокеры й ня думалі, што можна рабіць ціхую акустыку. Зьмены адбываліся паволі. Пачалося ўсё, магчыма, з экспэрымэнтаў на радыё 101.2. Прасунутае незалежніцкае беларускамоўнае радыё зьявілася ў Менску ў 1994 г. намаганьнямі Жанны Літвіной і купкі ейных аднадумцаў і было адзінай станцыяй, для

якой беларускі рок быў «фарматам». Больш за тое — жаданым госьцем. Часьцяком атрымлівалася так, што N.R.M. давалі гадзіну эфіру, падчас якога граліся, напрыклад, усе песьні з «LaLaLaLa» і паралельна пра іх нешта распавядалася. Усё гэта акустычна, на два мікрафоны зь дзьвюма гітарамі, Алезіс дапамагаў з пэркусіяй.

Потым згралася пару невялікіх акустычных канцэртаў. Іх ініцыяваў Піт. Першы быў на філфаку пэдінстытуту. Адразу хлопцы зразумелі, што гэта цікавы фармат і для вялікіх канцэртаў, а ня толькі для ўдзелу на радыё. Тым болей, што паралельна тое ж самае адбывалася ва ўсім сьвеце.

Лявон: *«Nirvana ў свой час зграла акустыку, і яна значна адрозьнівалася ад таго, як гурт успрымаўся звычайна. Потым неяк у Беластоку ў бары Стрых мы пачулі акустыку Alice in Chans. І гэта гучала ну проста як іншая прыступка сьвядомасьці. Нам захацелася нешта падобнае. На электрычных канцэртах — адрэналін, ты крычыш, і ўсе крычаць. А тут можна ціха пайграць, паразмаўляць з людзьмі».*

Цягам 1998 і 1999 гг. N.R.M. зграў тры вялікія акустычныя канцэрты, два зь якіх — у ДК Дзяржынскага і Белсаўпрафе — запісваліся спэцыяльна для альбому. Зводзіў усе Шлёма Лабандзіеўскі і Алег Караньков. Справа аказалася няпростая — па якасьці запісу два канцэрты вельмі адрозныя, і гэта адчуваецца на альбоме. Але экспэрымэнт ёсьць экспэрымэнт. Калі нешта робіш першы раз, невялікія недарэчнасьці нівэлююцца адчуваньнем навізны. На акустыку ўвайшлі шмат мроеўскіх песень, «Радыё Свабода» Уліс. Экспэрымэнтавалі і са стылямі — тая ж «Одзірыдзідзіна» зграная так, што, пакуль словы не пачыналіся, ніхто ня мог уявіць, што за песьня такая. Былі там і песьні, якія N.R.M. потым нідзе не выконваў і якія больш нідзе не зьяўляліся, — напрыклад «13».

Лявон: *«Хацелася напісаць нешта пірацкае, зь ірляндзкімі матывамі. Я тады якраз пару ірлян-*

*дзкіх гуртоў слухаў. Да N.R.M. такая песьня не падыходзіла, «Крамбамбулі» на той час не было, вось яна і згралася акустычна. І болей нідзе грацца ня будзе».*

## Кліпаманія

Дык вяртаючыся да таго, з чаго разьдзел пачаўся. Кліпы. На два альбомы іх выйшла тры. Аўтар быў адзін — Анатоль Вечар, — а вынік супрацьлеглы. Найбольш удалым стала, канешне, відэа на «Одзірыдзідзіну».

Лявон: *«Вечар вынайшаў добрую ідэю — ужываньне курыцы як тэму, якая знітавала ўсё відэа. Для панк-року брутальнасьць гэтых кадраў была ўдалай. Потым мы хадзілі па прашпэкце Скарыны, па падзяляльнай паласе, і гэта таксама здымалася. Менты крычэлі, а потым сказалі: «Ладна, здымайце». І нас пазнавалі. Гэта быў пачатак папулярнасьці. Медыцынскія кадры здымалі ў 7-й гарадзкой бальніцы, у апэрацыйнай і ў сутарэньнях з каталкай.*

*Бюджэт кліпу быў мізэрны. І добра, бо як толькі зьявіліся вялікія грошы, у Вечара разьвязаліся рукі і вынікам сталі «Песьні пра каханьне». Мы атрымалі грашовы прыз за перамогу на Каранацыі і вырашылі на кліп не шкадаваць грошы. Гэта была страшэнная памылка. Вечар пачаў думаць пра нешта глябальнае, перамудрагеліў. Я чытаў сцэнар і думаў: «Які жах! Сонцы нейкія, кракадзілы». Карацей, кліп атрымаўся жудасны. Зараз глядзіш — сьмешна».*

Пазьней знялі кліп на «Паветраны шар». Таксама малабюджэтны й таму клясны. Ён нармалёва закруціўся па БТ, у праграме таго ж Вечара «Акалада». Хутка яе, праўда, прыкрылі. Але стратай тое было невялікай — песьня і так даўно стала папулярнай.

Матар'ялам для наступнага кліпу стала «Чыстая, сьветлая», але гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Дакладней, зусім іншае вымярэньне. Бо песьня тая — з альбому «Тры чарапахі».

## Разьдзел 13

## 1999–2000. «ТРЫ ЧАРАПАХІ»

«Музыкальная газета»: *«Гениальный альбом. На сегодня (31.10.00) в этом году ничего лучше в Беларуси из рок-музыки выпущено не было. А по большому счету, «Чарапах» я ставлю в один ряд с «Танцамі на даху» Уліса: за всю историю белорусского рока — это два его самых великих альбома».*

«Наша Ніва»: *«Чым ёсьць альбом «Тры чарапахі»? ...Суцэльная папса! Папса, пабудаваная на зьнявечаным гучаньні нармалёвых гітар, на зайграных рытмічных зьбіўках, на мэлёдыях, дзякуючы якім N.R.M., як і спадзяваліся, прабілася ў кліпавую прастору. Брыдота тыя кліпы!»*

### «ДЗЕЙНІЧАЦЬ. І ДЗЕЙНІЧАЦЬ НЕСТАНДАРТНА...»

Такіх супрацьлеглых водгукаў не атрымліваў раней ніводзін альбом N.R.M. Чымсьці гэта нагадвала рэакцыю на перараджэньне Мроі ў N.R.M. У тым ліку і сваёй небезпадстаўнасьцю. Бо зьмены й сапраўды былі відавочнымі. «Одзірыдзідзінай» гурт займеў шырэйшае, чым раней, кола прыхільнікаў, «Пашпарт...» посьпех замацаваў, але разам з тым зьявілася адчуваньне застою, біцьця галавой аб столь. Яго трэба было пераадолець.

Мэнэджэрам N.R.M. на той час стала Аня Вольская. І менавіта ад яе найперш сыходзіла жаданьне нешта зьмяніць, перайсьці на іншы

ўзровень. Яна першай і пачала настойваць на запісе альбому за мяжой. Гэта падавалася крокам наперад, першай і найнеабходнейшай часткай тых самых зьменаў.

Піт: *«Аня была захопленая ідэяй, што трэба дзейнічаць, і дзейнічаць нестандартна. Гаварыла, што трэба браць крэдыт і ехаць запісваць альбом у Нямеччыну ці Польшчу. Я займаў збольшага скептычную пазыцыю, астатнія ставіліся аморфна»*.

Пакуль Аня «рэклямавала» варыянт з замежжам, зьявілася магчымасьць запісацца ў Беларусі, але ня ў Славы Кораня. Генадзь Сыракваш тады толькі стварыў уласную студыю X-Noise Factory, а ў якасьці раскруткі на чарговай Рок-каранацыі прэзэнтаваў N.R.M. магчымасьць бясплатна працаваць там над чарговым альбомам. Схіляючыся да замежнага варыянту, хлопцы вырашылі ўсё ж такі скарыстаць такую магчымасьць. І напярэдадні ад'езду на Басовішча '99 на X-Noise Factory быў запісаны матар'ял трох песень — «Чыстая, сьветлая», «Дзед Мароз» і «Мая мэнтальнасьць».

Амаль адразу Лявон і Алезіс зьехалі па справах у Польшчу, а зводзіць матар'ял пачалі Піт з Сыраквашам. Калі праз месяц Паўлаў прывёз дэма на Басовішча, яно не спадабалася нікому. «Дэма было проста дзікае. Зусім не было голасу, гук атрымаўся абсалютна хімічны», — узгадвае свае ўражаньні Лявон. У выніку ідэя пісацца за мяжой стала прэвалюючай. На Басовішча яе зацьвердзіў «худсавет». За прайшоўшымі часамі бакі разыходзяцца ў паказаньнях, ці было тое рашэньне аднагалосным.

Піт: *«Я разумеў, што гэта маразм — пісацца за мяжой, марнаваць грошы (і вялікія грошы) невядома на што. Дэма ў Сыракваша было запісана нармальна, толькі зьведзена кепска. І трэба было працаваць з гэтым матар'ялам далей. Астатнія? Лявон хацеў так, як хацела Аня, а Юрык і Алезіс нічога не хацелі — гэта значыць, былі «як усе»*.

*І я апынуўся адзін супраць усіх. Супрацьстаяньне было сапраўднае. Гэта было падчас Басовішча, па дарозе з Гарадку да дому Лёніка Тарасэвіча ў Валілах. Уяві: з аднаго боку стаю я, а з другога — увесь N.R.M., Аня і Караньковў. І ўсе супраць запісаў Сыраквашa, і ўсе за тое, каб пісацца ў Польшчы.*

*А ў выніку я аказаўся настолькі правы, што песьні, запісаныя на X-Noise Factory, так і ўвайшлі ў альбом. Яны нават не пераігрываліся — толькі былі перазьведзеныя».*

Лявон: *«—А Піт ня быў супраць таго, каб пісацца ў Варшаве?*

*— Ня быў ён супраць! Я дакладна памятаю, як мы ў Варшаве ў Малым тэатры гралі Народны Альбом і потым пайшлі на банкет у рэстарацыю «У Швейка». Там да нас падыйшоў наш знаёмы Яцэк Ташакоўскі і сказаў, што ёсьць недарагая студыя ў Варшаве. Усім ідэя спадабалася, і Пеця таксама сказаў : «Супэр! Будзем пісацца». Акрамя таго, Яцэк паабяцаў, што з намі папрацуе чалавек, які паставіць добры, модны гук. І гэта было дадатковым аргумэнтам».*

### Польскі запіс. Памылкі

Што б хто ні казаў ці ні аспрэчваў, рашэньне пісацца ў Польшчы было прынятае. Вызначыўся і тэрмін: канец ліпеня — пачатак жніўня.

N.R.M. прыехаў у Польшчу значна раней. У гэтым годзе Зьвяз Беларускай Моладзі Польшчы ладзіў канцэрт «Купальле» ў Нарве, на мяжы зь Беларусьсю. Адыграўшы яго, гурт падзяліўся. Піт і Юрась паехалі ў Менск. Алезіс зь Лявонам засталіся ў Польшчы. Гэта быў вымушаны крок. У пашпарце Алезіса скончыўся тэрмін дзеяньня штампу з дазволам на выезды за мяжу. Вярніся ён у Менск, і мусіў бы рабіць новы штамп, а гэта справа двух месяцаў. Запіс сарваўся б. Таму Алезіс застаўся жыць на фазэндзе ў Лёніка Тарасэвіча, цэ-

лымі днямі глядзеў у неба ды на Лёнікавых курачак з качкамі, а Вольскі склаў яму кампанію. Узьядналася каманда дзён праз дзесяць на Басовішчы, а адтуль і рванула ў Варшаву.

Алезіс: *«Мы несур'ёзна падыйшлі да гэтага запісу. Я асабіста ня быў падрыхтаваны. Я месяц сядзеў у Лёніка на фазэндзе, замест таго каб практыкавацца. І ніхто не рэпэтаваў. А потым падчас запісу й гукарэжысэр нешта наблытаў. Бубны запісаў так пагана, што нават на зьвядзеньні немагчыма было выправіць».*

Непаразуменьні з пэрсаналам студыі ды ўмовы працы — другая прычына сумнага выніку. Студыя «Złota Skala» ад Сыраквашавай і сапраўды адрозьнівалася ў лепшы бок — найперш тым, што была абсталявана гукапаглынальнымі матар'яламі, мела клясныя бубны ды ўзмацняльнікі. Але вялікі мінус — месьцілася яна на тэрыторыі нейкае фабрыкі. Акрамя ўласна студыі там мелася толькі пару пакояў для адпачынку, якія, аднак, не былі прыстасаваныя для жыцьця. У іншае сытуацыі — нічога страшнага, але N.R.M. дзеля эканоміі сродкаў вырашыў жыць не ў гатэлі, а непасрэдна ў студыі. Акрамя пабытовых складанасьцяў — як то адсутнасьці нармалёвага душу, узьдзейнічала й псыхалягічная абстаноўка — не было магчымасьці пасьля цяжкага дню прыйсьці дадому, адпачыць на нейкае канапе і ад музыкі і ад іншых твараў.

Піт: *«Гэта было цяжка. Мала таго, што ўвесь час разам, увесь час у студыі, дык яшчэ цікаў гэты «лічыльнік» — гадзіна-грошы, гадзіна-грошы. Мы вымушаныя былі рабіць пэўны кавалак працы за абмежаваны час — тое, да чаго мы не былі прызвычаеныя, бо ў Менску час ніхто не лічыў — пісаліся датуль, пакуль не лічылі вынік здавальняючым».*

Піт пацярпеў меней за ўсіх. Ён адпісаў свае партыі за адзін дзень і зьехаў на польскія канцэрты Крыві. Усім астатнім было цяжэй. Тым болей, што

хлопцы так і не паразумеліся з гукарэжысэрам студыі, які гук яны хацелі мець у выніку.

Лявон: *«Калі мы туды прыехалі, убачылі, што студыя ўсё ж такі аматарская. Праца была даволі нэрвовая. Алезіс зацяўся. Усё гэта было даволі няўпэўнена. Гукарэжысэр ня ведаў мовы беларускай. І яму падавалася, што слова чуваць, а аказвалася, што яго не чуваць. Калі мы слухалі ў студыі ды на вялікай магутнасьці, нам падабалася, а потым...*

*Прычына тут тая, што «Złota Skala» пісала ў асноўным каманды мэтальныя. А ў нас на «Трох чарапахах» былі дзьве песьні зь цяжкімі рыфамі — «Катлет-матлет» і «Худсавет», а сярод астатніх, як заўсёды, абсалютна іншай групы песьні. І неяк не атрымалася. Кампрэсіі многа было, забіваўся вакал, бубны гучалі вельмі спэцыфічна, вельмі высокі сольнік быў. Ня склалася, карацей.»*

## Самотнік

Вынік польскага запісу расчараваў усіх. Стала зразумела, што ў такім выглядзе альбом выдаваць нельга. Аднак час ішоў, публіка чакала даўно абяцанага дыску. Некаторыя песьні ўжо паўгода круціліся на канцэртах, у тым ліку на Басовішчы. Акрамя таго, ніяк не адбіваліся грошы, страчаныя на запіс у Польшчы. Тут і ўзьнікла прапанова выдаць сынгл, а дакладней — «самотнік». Да гэтага часу шмат хто ўпэўнены, што N.R.M. спэцыяльна прыдумляў назоў для максі-сынгла. Насамрэч пасьля доўгіх лінгвістычных вышукаў энэрэмаўцы прыйшлі да высновы, што слова «самотнік» і ёсьць прамым беларускім перакладам ангельскага single.

У рэшце рэшт у яго ўвайшлі «Мэнтальнасьць», «Чыстая, сьветлая», «Дзед Мароз», польская вэрсія «Чыстай, сьветлай» (на думку Лявона, ня вельмі ўдалая, бо першапачаткова прызначалася яна для

раскруткі на польскіх радыёстанцыях, але ў перакладзе на польскую загучала надта ж салодка ды папсова) і радыё-рэмікс «Мэнтальнасьці». Самотнік выйшаў вельмі абмежаваным накладам у 500 асобнікаў. І ягоная рарытэтнасьць палягае ня толькі ў гэтым, але і ў тым, што толькі яго ўладальнікі маюць магчымасьць параўнаць польскі і беларускі запіс некаторых песень. Бо на самотніку скарыстоўваўся ў асноўным менавіта матар'ял, запісаны на студыі «Złota Skala». Праўда, зводзіліся трэкі ўжо ў Менску Шлёмам Лабандзіеўскім. У падтрымку самотніку быў дадзены і вялікі канцэрт.

*«Все белорусские так называемые андеграундные исполнители могут засунуть свои амбиции куда-то очень далеко и смело продолжать играть в клубах и подвалах. Пока в Минске есть N.R.M., эта команда будет считаться и лидером рока «официального», и рока «подпольного». Чтобы убедиться в этом, вам нужно было только сходить 29 мая в КЗМ на презентацию сингла «Самотник». Ничего более мощного по драйву и концертно-цельного за последние лет сколько-то там (исключения в какой-то степени составляют Алексей Шедько и Крыви) мне слышать и видеть в столице Беларуси не приходилось. N.R.M. просто раздавили своей агрессией и звуком пришедшую лицезреть сие действо публику»* («Музыкальная газета», май 2000 г.).

### Канчатковы запіс «Трох чарапахаў»

Фіяска з польскім запісам вымусіла N.R.M. павяртацца да Сыракваша, хаця мала каму гэтага хацелася — прыгадвалася няўдалае дэма. Аднак грошай на перазапіс не было. Прыйшлося падпарадкавацца лёсу, і ў выніку ўсё атрымалася лепш, чым меркавалася.

Лявон: *«Аказалася, што Сыракваш хоць са скрыпам, але ўлічвае нашыя пажаданьні. Мы ра-*

*зам вельмі доўга сядзелі над матар'ялам. Ён упіраўся — маўляў, «так ніхто ня робіць, як вы хочаце». А мы ўсё адно настойвалі.*

*Не абыходзілася і бязь іншых праблемаў. Кожны з нас меў сваё бачаньне, як павінен гучаць альбом. Басіст хацеў, каб шмат басу было. Вакаліст хацеў разборлівы вакал. Усім астатнім здавалася, што вакал і так разборлівы, таму што яны дакладна ведалі словы. Гітарысту мала сола ўвесь час, і калі ён адзін з гукарэжысэрам сядзеў на зьвядзеньні, а потым прыносіў паслухаць, усе гаварылі: «Ды што гэта такое! Што за засільле сольных партыяў...». Алезіс катэгарычна быў супраць запісу ў Сыракваша яшчэ й таму, што лічыў: бубны абавязкова павінны пісацца жыўцом. А Гена піша іх жыўцом, а потым падкручвае штосьці электроннае, і гук гэты Алезіса не задавальняў.*

*Карацей, цяжка ўсё ішло. Але на пэўным этапе раптам карцінка зрабілася больш чалавечай, чым была, і нават Алезіс сказаў, што нармальна. Збольшага ўсіх задаволіла».*

Піт: *«Ва ўсёй гэтай гісторыі з запісам Лявонава віна ёсьць. Бо як ідзе творчасьць, ініцыятыва за ім. Як толькі даходзіць да рэалізацыі — яму пофіг: маўляў, «і так добра». Калі б не такая ягоная пазыцыя, мо і ў Польшчы б дамагліся лепшага запісу».*

Генадзь Сыракваш (зь інтэрвію «Музыкальной газете»): *«По концепции звука альбома мы больше всего общались с Питом Павловым... Фундаментом альбома мы посчитали его гитарное звучание. Были моменты, когда мы по три-четыре раза переписывали одно гитарное соло, искали определенный звук, палитру звуков, и альбом по гитарному звуку вышел у нас очень разным.*

*Вольский работал очень профессионально, причем писали его с одного дубля, ну максимум с двух. То есть с Лявоном я работал меньше,*



■ *1.* Лявон. 16 год



■ *2.* Першы склад гурта — тады яшчэ «Эскалатара»

7. Зак. 1532. Вкл. 1



■ *3.* Алезіс за часамі стварэньня «Мроі»



■ *4.* Уладзя часоў «Эскалатару». Наверсе фотаздымку ледзь бачны надпіс «Эскалатар». Ён выкалываўся іголкай на негатыве здымку



■ *5*. Рэпетыцыя ў Дзегтяроўцы



■ *6*. Рэпетыцыя ў Дзегтяроўцы



■ 7. Шлях на Дзегцяроўку. Ад аўтобуснага прыпынку па калгасным полі



8. Юрась пад час рэпетыцыі. Яшчэ на лідар-гітары, а не на басу. 1982 г.



9. Лявон і Юрась перад арміяй. У кафетэрыі



■ *10*. Лявон на пабыўцы з арміі. У кампаніі з адкасіўшым Юрасём



■ *11*. Лявон, Юрась і Уладзя. Рэпетыцыя на кватэры ў Лявона



12. Юрась на кватэрнае рэпетыцыі



# ВЕРНІСАЖ У ТРАЕЦКІМ ПРАДМЕСЦІ

Што такое выстаўка аднаго дня? Адказ на гэтае пытанне могуць даць цяпер мінчане і госці Мінска, якія пабывалі ў мінулую нядзелю ва ўтульным Траецкім прадмесці. Удзельнікі гэтага свята ўбачылі незвычайную карціну: на беразе Свіслачы мастакі расставілі мальберты, развесілі на спецыяльных драўляных стэндах пейзажы і нацюрморты, партрэты і графічныя лісты. Побач экспанаваліся вырабы з дрэва, саломы, шкла... Так ішла падрыхтоўка да своеасаблівага вернісажа, які завяршыў Тыдзень выяўленчага мастацтва на Беларусі, прысвечаны 114-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 40-годдзю вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў.

На суд шматлікіх гледачоў свае творы вынеслі маладыя жывапісцы, графікі, скульптары, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод іх

...рыць з гаспадарамі свята ля мальбертаў, атрымаць адказы на розныя пытанні.

Прыняць удзел у выстаўцы аднаго дня былі запрошаны і прадстаўнікі іншых галін мастацтва. Са сваімі творамі пазнаёмілі прысутных кампазітар Л. Шлег, інструментальная група «Мроя», створаная ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава, вакальны дуэт «Надя і Алеся», які нядаўна стаў лаўрэатам фестывалю маладых спевакоў у Маладзечне. Свае вершы чыталі маладыя паэты І. Багдановіч і А. Глобус, якія, дарэчы, прадставілі на выстаўцы некалькі калажаў як жывапісцы.

У час свята адбылася віктарына «З гісторыі беларускай культуры», у якой актыўна ўдзельнічалі госці вернісажа. А салон-магазін Мастацкага фонду БССР арганізаваў на плошчы выстаўку-продаж разнастайных вырабаў мастакоў.

13. «Літаратура і мастацтва» пра першы вялікі канцэрт «Мроі» ў Траецкім



14. Знакаміты канцэрт у Траецкім



15. Алезіс



*16*. Уладзя



■ *17*. Лявон



■ *18*. Юрась



■ *19.* У кампаніі талакоўскіх дзяўчат Віялеты і Вікі Казловай. 1988 г.




■ *20.* Адзін з першых плякатаў «Мроі». Здымак зроблены ля Дому-музею Максіма Багдановіча ў Гародні. На верхняе прыступцы — Віка Казлова



■ *21.* Лявон перад канцэртам «Мроі» ў Менскай мастацкай вучэльні. 1988 г.



■ *22.* «Мроя-88». Перад канцэртам напярэдадні зьезду Беларускіх маладзёжных арганізацыяў



23. Канцэрт пасьля зьезду Беларускіх маладзёжных арганізацыяў. Менск, 1988 г.



24. Канцэрт пасьля зьезду Беларускіх маладзёжных арганізацыяў. Менск, 1988 г.




25. Першы прафэсыйна зроблены плякат «Мроі»



УВАЖАЕМЫЙ ТОВАРИЩ!

Молодежный музыкальный клуб "Мелодия" Минского среднего ПТУ-24 им. Н.Кедышко приглашает Вас на Музыкальный ринг рок-группы «Мроя».

Начало в 19.30. 9 декабря в 18.30.

Комитет комсомола
Профком

26. Запрашэньне на канцэрт «Мроі» ў адным з менскіх ПТВ



гім — 1, у трэцім — ніводнай. Што чакаць у
чацвёртым выпуску? Я прапаную даваць у хіт-
парадзе песні [групп] мінскага рок-клуба „Няміга".
Ну і, нарэшце, вынікі міні-фінала
1. „Ён яшчэ вернецца" — група „Мроя"
2. „Хто вы" — група „Адлюстраванне"
3. „Публічнасць" — група „[illegible]"
Песні „Публічнасць" і „Кароль і блазан", „Сузор'е"

■ 27. Ліст у гіт-парад «Беларускай маладзёжнай» з голасам за песьню «Ён яшчэ вернецца»



прак- / чарах, / нашы- / — Г. / і і на / радачы. / ы за / вы- / лухаць / А. Ва- / Вапра- / прад- / анскай / асаблі- / савета / та вы- / . рыб- / інскай / та пра- / жур-

савіку звесці па тры кампазіцыі-пераможцы з кожнай перадачы ў квартальны хіт-парад — такі своеасаблівы міні-фінал, які вызначыць першыя кандыдатуры на ...

... папага хіт-парада далучаюцца, дзякуючы перадачам радыёстанцыі «Савецкая Беларусь», зарубежныя слухачы Беларускага радыё.

**В. СЯМАШКА.**

**ТАБЛІЦА ПАПУЛЯРНАСЦІ**
**ЛЮТЫ**

| месца | кампазіцыя, выканаўца | колькасць галасоў |
|---|---|---|
| 1. | «Мроя». «Ён яшчэ вернецца» — група «Мроя». | 1423 |
| 2. | П. Харэвіч. «Мая сям'я» — П. Харэвіч і група «Трохкутнік». | 268 |
| 3. | Я. Магаліф. «Пакліч мяне» — Таццяна Арлоўская і група «Праспект». | 264 |
| 4. | В. Наўлік, В. Перадрасў. «Раманс» — група «Квінта». | 188 |
| 5. | А. Шыцько. «Веласіпед» — А. Шыцько і група «Капітан». | 61 |
| 6. | М. Кадол. «Пакаленне» — М. Кадол. | 22 |

■ 28. «Ён яшчэ вернецца» на першым месцы ў гіт-парадзе «Беларускай Маладзёжнай»



СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

1998 г.

# Пена на волне перестройки

■ *29.* Сумнавядомы артыкул у «Советской Белоруссии»



■ *30.* Лявон і Кася. 1991 г.



■ *31.* Юрась на рок-фэсьце ў Маладзечне. 1993 г.



*32.* Юрась пад час канцэрту «Рок вітае незалежнасьць». 1992 г.



*33.* Юрась на апошнім канцэрце «Мроі» ў Альтэрнатыўным тэатры. 1994 г.



*34.* Алезіс на рок-фэсьце «Маладзечна-93»



*35*. Інтэрвью Віталю Сямашку пад час рок-фэсту ў Маладзечне. 1995 г.



*36*. Піт за дзень да адпраўкі ў армію



■ *37*. Піт і ягоныя аднакласнікі Зміцер Ціханчук і Аксана Міцкус. 8 сакавіка 1983 г.



■ *38*. Канцэрт «N.R.M.», зарганізаваны БМА ў скверы Янкі Купалы



■ *39*. Канцэрт «N.R.M.», зарганізаваны БМА ў скверы Янкі Купалы



■ *40*. «N.R.M.» у Беластоку на сьвяце гораду. На майцы Лявона — «рэклама» тагачаснага гурта Юркі Асеньніка «R.F.Braha»



41. Лявон на канцэрце ў скверы Я. Купалы



42. Лявон і Лёнік Тарасэвіч. На фазэндзе Лёніка ў Валілах пад час «Басовішча-2000»



■ *43*. Будні Басовішча. Лявон у вольны ад канцэрту дзень



■ *44*. Саша Памідораў уручае «N.R.M.» Рок-карону-2000



■ *45*. Ігар Варашкевіч віншуе рок-каралёў-2000




■ *46*. Вокладка «Музычнай газеты» пасьля Рок-каранацыі-2000



Мітусьня кароткіх дзён
Адыходзіць у небыцьцё
Нехта шле табе праклён
На ўсё тваё жыцьцё

Зной малююць абразы
Над царквою ставяць крыж
Прыкусіўшы свой язык
Ты пакорліва маўчыш

Пагляд зі,
Што вакол.
Хто за кім,
Хто каго Гэты сьвет
~~За цябе~~ Упраць час
~~Гэты сьвет?~~ Гэты сьвет
~~Можа так,~~
~~Можа не~~

Нам ня трэба шмат казаць,
Ці рабіць наадварот
Нам ня трэба прадстаўляць
Свой заторганы народ,

Гэта наш з табою час
Гэта наш з табою лёс
Мы жывем апошні раз
Мы жывем у поўны рост

■ *47.* «Мітусьня». Уласнаручны чарнавік Алезіса



25 26 December

Ŭrešcie

Kali ŭsłodyč adčuješ i kazionnuju
kamunalnyja žachi
i ŭsio toje, što ja nie lublu,
zrazumieješ tady,
što 3 čarapachi
pa-raniejšamu ciahnuć ziamlu

Kali vyjdzieš u horad
ci zajedzieš u hory
i z ludźmi ŭstalueš kantakt,
zrazumieješ tady,
što i sionnia, i ŭčora
my . . . na 3-ch kitach.

Nie było Halileja,
Jak i Boba Marlieja,
Nie było Salvatora Dali,
Ni Lenina, ni Lenana, ni Karla Linieja
A kity j čarapachi byli.

27

28

■ *48*. Першы варыянт «Трох чарапахаў» Вольскага



*49.* Вельмі рамантычны Лявон пад час Рок-каранацыі-2000



*50.* Лявон, Піт і Юрась у Францыі пад час гастроляў з «Народным Альбомам»



■ *51.* «N.R.M.-2001»



■ *52.* «N.R.M.-2001»



■ *53.* Ранак пасьля ўласнага вясельля. Алезіс з жонкай Інгай



■ *54.* Піт з тортам пад час Рок-каранацыі-2001



55. Юрась і Діна Ляўковы на канцэрце «Крыві» ў КЗ «Менск», 2001 г.



56. «Сэсійны» гукарэжысэр «Мроі» і «N.R.M.» Анатоль Додзь на вясельлі Алезіса



■ *57.* Гукарэжысэр «Мроі» і «N.R.M.», гупі-ненавісьнік Алег Караньκоў



■ *58.* Алезіс пасьля канцэрту ў гарадзенскім клюбе «Адрэналін». 2002 г.



■ *59.* Валодзя Шаблінскі і Алезіс. Глыток «чарліку» на прыродзе. Пад час туру-2002



■ *60.* Таварыш «Дырэктар». Уладзімір Шаблінскі — акула шоў-бізнэсу і дырэктар «N.R.M.» ад 2001 г.



■ *61.* Юрась і Піт. Сьняданак перад канцэртам. Тур-2002



■ *62.* Пасьля канцэрту «Народнага Альбому» ў амбасадзе Польшчы ў Менску: Слава Корань, Саша Памідораў, Кася Камоцкая, Лявон, Міхал Анемпадыстаў, Толя Додзь і Юрась



■ *63.* «N.R.M.-2002». Вынік супрацоўніцтва са стылістамі HUGO BOSS



■ *64.* «N.R.M.-2002». Вынік супрацоўніцтва са стылістамі HUGO BOSS

*чем с другими, записав вокал, подпевки, бэки в считанные часы. Вольский сказал мне: «Гена, делай так, как считаешь нужным, а потом посмотрим». Было сделано четыре варианта микширования, последний из которых и был оставлен.*

*..Я перед записью прослушал все альбомы N.R.M., каждый раз по пять точно. Лично меня не устраивало их «мыльное» звучание, когда звук не локализовался, когда не было конкретной бас-гитары, конкретного большого барабана, а шла общая каша, не было плотности звука. Я же добивался конкретности звучания каждого инструмента и конкретности звучания суммы инструментов».*

Пазьней за ўсё астатняе запісаліся перабіўкі між песьнямі (і ўжо не ў Сыракваша, а ў студыі «Радыё Рацыя» — былога 101.2). Дзіўнаватая і арыгінальная, гэтая ідэя нарадзілася з даўняе любові Вольскага да драматургіі. Канешне, ніхто не зьбіраўся разьвіваць «Трох чарапахаў» у п'есу, як гэта было з «Народным Альбомам», аднак мізансцэны, якія ў выніку сталі няцотнымі трэкамі альбому, прыдалі яму павалоку канцэптуальнасьці, завершанасьці — гэткі дзень жыхара Незалежнай Рэспублікі Мроя ад сьвітанку да ночы. Тым болей, што матар'ял сам валіўся ў рукі. Бо найперш нарадзілася менавіта большасьць гэтых іранічных мініяцюраў, а ўжо потым — ідэя выкарыстаць іх у альбоме.

Лявон: *«Быў час, калі мы вельмі шмат езьдзілі з канцэртамі — што з N.R.M., што з «Народным Альбомам». І вандроўкі былі жудасна цяжкімі — на цягніках, аўтобусах. Кампанія адна і тая ж. І мы падчас гэтых паездак так надакучылі адзін аднаму! У карты нават немагчыма было ўжо граць. А трэба ж хоць нейкія зносіны мець. І ў нас размовы зьвяліся да сьцёбу і нараджэньня ўсялякіх прыколаў. Чаго там толькі не было. Усе носяцца, гавораць абсурд поўны і сьмяюцца. Звонку*

*мы, магчыма, паходзілі на дурняў, але для нас гэта быў адзіна магчымы спосаб кантактаваньня. Так нарадзілася «Настройка барабанаў», «Магільны». І нават песьні некаторыя. Тыя ж «Тры чарапахі». Усё пачалося неяк у цягніку з таго, што мы пачалі парадыраваць Ельцына — нібыта ён гаворыць: «Россия, понимаешь, зиждеца на трех китах: на первом ките, на втором ките и, понимаешь, на третьем ките». І мяне гэтая фраза неяк зачапіла, потым усплыла ў галаве, так і пачала пісацца песьня».*

## Рэакцыя

Лявон: *«Пашпарт...» быў няроўным альбомам. На ім акрамя «Паветранага шару», «Песьняў пра каханьне», «Гамону» і «Я еду» ёсьць абсалютна правальныя песьні. «Добры вечар, дзяўчыначка» з «Песнярку» мы туды паставілі проста таму, што не было чаго ставіць, «25, 26, 27...» таксама прыкольная песьня, але слабенькая.*

*У параўнаньні з «Пашпартам...» «Тры чарапахі» былі, канешне, крокам наперад. Песьні былі магутныя, і тэксты зьмяніліся ў лепшы бок. І альбом быў больш цэльны. Мы разумелі, што ён гучыць больш кругла і папсова, чым ранейшыя альбомы, але і гэта быў таксама крок наперад».*

Ня ўсе так думалі. У разуменьні тых, хто альбом не прыняў, гэты крок наперад быў двума крокамі назад. Рахунак ад імя самых зацятых барацьбітоў за ідэю выставіла гурту «Наша Ніва». Гэта была нават не рэцэнзія — прысуд.

«Наша Ніва». Аўтар: «Слухач у панцыры»: *«Пра новыя выданьні такіх культавых калектываў прынята пісаць зь піетэтам ды прыдыханьнем. А вось мяне тая рок-н-рольная канцэптуальнасьць дастала ўжо! Мне б музыкі болей замест рок-н-ролу. А то чую на кожным кроку такія дыялёгі. Пытаньне: «Як бы вы самі назвалі музыку, якую выконваеце?». Адказ: «Ну, гэта такі рок-н-*

*рол у цэлым...» Так звычайна гавораць тыя, хто ня ў стане ствараць музыку. А ўсялякую брыдоціну лягчэй за ўсё назваць рок-н-ролам. Маўляў, на тэрмін усё і сьпішацца.*

*Гэта я, вядома, не пра хлопцаў з N.R.M., якія, як заўсёды, стварылі праграму яркую, зьмястоўную, грунтоўную, зрабіўшы вялікі ўклад і ўнёсак у сучаснае беларускае музычнае мастацтва. «Бульба-Рэкардз», якая трымае бацьвіньне па ветры, стыражавала той альбом, няблага, трэба думаць, на тым падзарабіўшы. Хоць я буду шчыра зьдзіўлены, калі ягоны наклад дасягне, скажам, тысячаў ста штук. Далібог, не дасягне!*

*Варта спыніцца на пытаньні: чаму? N.R.M. — гэта каманда дасьціпных, разумных, сымпатычных людзей. І я разумею, што іронія — гэта часам ці не адзіны сродак як-небудзь супрацьстаяць паскуднай у цэлым рэчаіснасьці. Асабліва тады, калі з задуманага атрымліваецца далёка ня ўсё. Сьцёб — таксама пэўная зброя ва ўмелых руках. Сьцёб разам зь іроніяй — сумесь, па моцнасьці роўная кактэйлю Молатава. «Манго-Манго» і «Мотаргед» у адной шклянцы. Але, як вядома з працаў патолягаанатамаў, пастаяннае ўжываньне моцных напояў прыводзіць да алькагалізму. Пазьней ці раней. Алькагалізм — той стан, калі табе здаецца: усё, што ні робіш, — гэта клясна! Дасканала! Геніяльна!*

*Мне здаецца, што Лявон Вольскі з дружбакамі «Бурацiны» перабралі шмат і даўно. Бо чым ёсьць альбом «Тры чарапахі»? Шмат у чым — сьцёбам, час ад часу нават пуставатым, як тыя «пракладкі» бяз творчых крылцаў паміж песьнямі. Яны нібыта надаюць цэламу той самай канцэптуальнасьці, ліха на яе! Рэшта ж амаль уся — суцэльная папса! Папса, пабудаваная на зьнявечаным гучаньні нармалёвых гітар, на зайграных рытмічных зьбіўках, на мэлёдыях, дзякуючы якім N.R.M., як і спадзяваліся, прабілася ў кліпавую прастору. Брыдота тыя кліпы! І тое, што на тэле-*

*бачаньні кліпамана Вечара ператварылі ў супэрпаглынальніка тлушчу, — абсалютна правільна! А то ён ранкам, маўляў, сьвядомы: кліп для N.R.M. мантуе — а вечарам ужо такі правільны-правільны: тлушч пляжыць.*

*Тлушчам тым, здаецца, ці ня ўсе песьні пазаплылі. «Бамжы», напрыклад: нібыта злая-злая песьня, актуальная да самага рыльца! Папса! Ці «Мэнтальнасьць». Піт, блін, знаходка для Азаронка! У словы песьні «Дастала» — ня веру! Бо сьцёб скрозь. «Катлет-матлет» выбіваецца з цэлага. І за кошт чаго? Вой, як арыгінальна! Арабскі матыўчык у прыпеве. Знаходцы той столькі ж гадоў, як і Памідораву, які тутака азэрбайджанскага араба агучвае. А «Тры чарапахі», я чуў, зьбіраюцца наагул зрабіць пераможцам у тэлеконкурсе «Песьню загарніце з сабой». Дажыліся, рокеры!*

*Таму найлепшы твор альбому — трэк № 20, які называецца коратка і выразна: «P. S.». Гэты высокамастацкі безнадзейны храп гаворыць пра зьмест альбому выразьней за ўсё. Можна нават і альбом увесь ня слухаць, а толькі трэк № 20: і ўся карціна перад вачыма!*

*Бо яшчэ раз паўтару: аднойчы збочыўшы на выратавальны, здавалася б, сьцёб і такую зручненькую іронію, потым больш нічога сур'ёзнага, шырокага грамадзянскага гучаньня, ня зробіш, як ні напінайся. Ні ўкладку ня будзе больш, ні ўнёску. Хоць катуй, хоць ратуй».*

Абвінавачваньне высунута, доказы раскладзеныя па палічках. N.R.M. не прабачаюць выхад з андэграўнду ў шоў-бізнэс (нават не сапраўдны шоў-бізнэс, а яго бляклае падабенства, што існуе ў Беларусі). Доказы кожны можа пабачыць на свае вочы: кліпы круцяцца па тэлебачаньні; музыка — ня музыка, а папса суцэльная; і што самае страшнае — касэты й дыскі (сам здабытак якіх раней быў амаль геройствам і адразу пацьвярджаў статус чалавека-барацьбіта) цяпер пра-

даюцца ці ня ў кожнае краме. Купляй — не хачу.

Мне ў гэтае сытуацыі ўзгадалася даўняе эсэ Валянціна Акудовіча «Вечныя дзеці Беларусі». Злаваўся ён там на зацятых адэптаў беларушчыны за тое, што спаганілі яны добрага пісьменьніка Уладзімера Арлова, падпарадкаваўшы ўласным чаканьням і жаданьням: *«...Гэта яны, вечныя дзеці Беларусі, адабралі ў мяне майго пісьменніка, які з сярэдзіны васьмідзесятых да сярэдзіны дзевяностых ( і трохі яшчэ пазней) пісаў менавіта для мяне, з якім я прамінуў ягоны (як свой) шлях ад гістарычнай белетрыстыкі і папулярызатарскай гістарыяграфіі да вытанчанай эсэістыкі, сучасна актуальнай прозы ды гэткага ж эстэтычнага вымеру паэзіі. А потым з'явіліся яны, тыя, каму ўжо не патрэбныя былі ні адмысловая стылістыка, ні складаныя культуралагічныя алюзіі, ні, тым болей, вольнае мысленне — даволі было адно граматыкі ў дзесяці параграфах Вячоркі і Катэхіза ў дзесяці гераізаваных міфах Арлова».*

N.R.M. прайшоў адваротным шляхам. Бо калі Уладзімер Арлоў (паводле Валянціна Акудовіча) патрапіў у пастку зацятых адэптаў беларушчыны толькі ў апошнія гады, то N.R.M. быў у гэтым асяродзьдзі прапісаны, меў нават уласны, асобны пакой у гэтым інтэрнаце. І, маючы на мэце вынік адваротны, чым Арлоў (зноў жа паводле Акудовіча), — выйсьці на шырокую прастору, — N.R.M. пайшоў тым жа шляхам: ад складанасьцяў да пэўнага спрошчваньня. І вырваўся ўсё ж з палону людзей, для якіх быў фетышам, любімай цацкай, «іхнім усім». Тым большага пакараньня заслугоўвае Вольскі за тое, што прызнае: рабілася гэта наўмысна.

Лявон: *«Такія запісы, як «LaLaLaLa», «Одзірыдзідзіна», — гэта андэграунд. Але мы не хацелі і далей працаваць на ранейшую аўдыторыю. Яна вялікая і маленькая адначасова. Гэта моладзь, якая будзе два-тры гады хадзіць на кан-*

*цэрты і супольныя акцыі ў якім-небудзь парку 50-годзьдзя кастрычніка. А потым яна вырасьце, пойдзе працаваць, ня будзе хадзіць на канцэрты, і ўсё гэта затухне.* (Праз чатыры гады Вольскі дасьць «паэтычны» варыянт гэтых тлумачэньняў, напісаўшы «Рок-н-рол не ўратуе»: «А заўтра клеркамі ў банку / Стануць былыя панкі / І скончыцца маладосьць». — *В.Д.*)

*Тым болей, што нас цікавіла вынясеньне нашае ідэі на больш шырокае кола народу, а ня толькі на людзей, якія і так беларускаарыентаваныя, і думаюць пра тое ж, што і мы. І ў нас атрымалася. Людзі, якія раней увогуле ня думалі, што на беларускай мове можа стварацца нешта якаснае і рэйтынгавае, раптам павярнуліся да гэтага тварам. А ясна, што таму вузкаму колу, якое слухала да гэтага N.R.M., абсалютна не падабаліся ўсе гэтыя працэсы. І хтосьці з нашых адданых прыхільнікаў гэтага нам не прабачыў. Ясна, што для прыхільнікаў падпольнай музыкі, кепска запісанай, гэта была дзіка галімая папса.*

*Ім падавалася, што на канцэрты пачалі хадзіць гопнікі, што мы здрадзілі іхняму вузкаму колу, бо пачалі рабіць вялікія акцыі, тысячнікі зьбіраць. А туды пачалі розныя людзі хадзіць, розных узростаў. Былі сярод іх і сапраўды гопніцкага складу, таму што N.R.M. — гэта было «моцна» і «крута». І я спадзяюся, што ў іхняе сьвядомасьці гэта нешта мяняла».*

Піт: *«N.R.M. ня мог не мяняцца. Бо каб не было розьніцы — трэ было творчасьць спыніць на першым альбоме. І гэта нельга было б назваць творчасьцю. Апошні наш альбом значна адрозьніваецца ад першага, але гэта зьмены натуральныя, гэта эвалюцыя — калі ідэі пераходзяць з альбому ў альбом, але на кожным этапе крыху зьмяняюцца».*

Юрась: *«Таму ж Макарэвічу ці БГ пастаянна гаварылі: «Вось папярэдні альбом быў супэр —*

*глыбіня, думка ў тэкстах, а зараз — такое гаўно...» Тое самае і тут адбываецца. Для большасьці людзей самыя моцныя ўражаньні ад музыкі — першыя некалькі год, як яны ёй пачынаюць цікавіцца. Потым усё спакайнее, гармонаў меней становіцца, і чалавеку падаецца — «не, раней было лепш». Вось адсюль і ўсе прэтэнзіі да нас».*

«Музыкальная газета», Алег Клімаў: *«Наконец коллектив прозвучал на записи так, как он звучит на самом деле «живьем»: сочно, животрепещуще, вечно, жесточайше-мелодично. Низкий поклон отцу «X-Noise Factory» Геннадию Сыроквашу: звук современен, отвечает сегодняшнему дню — и альтернативщики не смогут упрекнуть группу в продажности, и предпочитающие хардованный MTVшный саунд тоже останутся довольны. То есть альбом вышел, с одной стороны, реально коммерческим, с другой — музыканты ни на йоту не изменили своим художественным и жизненным принципам. Удался и эксперимент именно с таким построением пластинки. В своих прошлогодних «Ворсинках и катышках» лидер Нейро Дюбеля Александр Куллинкович едва ли не впервые на Беларуси разбавил рок-альбом литературной частью: собственными стихами. Ни одной проходной вещи в контексте всего альбома мы от N.R.M. не услышали. Будь работа составлена исключительно из песен, в ней можно было бы отыскать композицию, чуть проигрывающую своим соседям, но текстовые связки нивелируют вот эту якобы «лучшесть-хужесть».*

Лявон: *«І не мяняўся ніяк наш музычны фармат. Зьмянілася гучаньне на дыску. У нас проста featurenastyлёвая альтэрнатыва — вось наш фармат. І ледзь не мэтал і ледзь ня чысты панк граем. І нешта блізкае да U2 ці старога польскага року зьяўляецца. У нас вельмі багатая палітра, таму што нас цікавіць ня форма, а ідэя, якую мы нясем, перш за ўсё беларуская ідэя, потым ідэя*

*распрыгоненасьці і г. д. І мы выкарыстоўваем розныя сродкі для данясеньня гэтае ідэі. І гэта ўсё адно не папсовыя сродкі, а сродкі з альтэрнатыўных стыляў. І я зараз наш стыль вызначаю як «альтэрнатыўная эклектыка»*.

### «Бульба-рэкардз»: рэкордныя падманы

Яшчэ адна супярэчлівая рэч, што зьнітаваная з «Трыма чарапахамі» — супрацоўніцтва з «Бульба-рэкардз». У 2000 г. гэта быў ці ня першы беларускі лэйбл, які ствараў хаця б ілюзію сур'ёзнасьці. Ён пачаў супрацоўнічаць зь некаторымі вядомымі выканаўцамі (Палац, DJ Mors), спрабаваў прасоўваць беларускую музыку ў Расеі, маючы там нядрэнных партнэраў. Выданьне «праз лэйбл», а ня ўласнымі намаганьнямі было яшчэ адной «звышідэяй» Ані Вольскай. Аргумэнты супраць высоўваў толькі Піт. Ён настойваў на выданьні «Трох чарапахаў» за свае грошы з далейшым продажам накладу каму заўгодна — той жа «Бульбе...». Аднак Аня чарговы раз перамагла.

Пасьля запісу альбому з «Бульбай-рэкардз» была падпісаная дамова. Усе сумневы, канешне, нікуды ня зьніклі, таму, каб зразумець, ці варта гэтым займацца, вырашылі пачаць з самага мінімуму — кампаніі дазвалялася выдаць і прадаць дзьве тысячы дыскаў і некалькі тысячаў касэтаў. Напачатку ўсё ішло добра.

Лявон: *«Бульба» сапраўды добра працавала. Шмат у чым дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву мы займелі шырокую папулярнасьць. Істотна, што матар'ял масава пайшоў па Беларусі. У іх было шмат рэгіянальных кропак — ня толькі Менск, але й Горадня, Берасьце, шмат іншых гарадоў. Атрымлівалася — мы прыяжджаем у горад, а там ужо ў шапіках і касэткі і дыск стаяць. Раней такога не было ніколі. Толькі пазьней з-за гэтага ў нас былі істотныя фінансавыя страты»*.

Страты тлумачацца проста — атрымаўшы дазвол на выданьне пэўнае колькасьці дыскаў, «Бульба...» на гэтую лічбу забылася... І пракантраляваць аб'ёмы продажу было немагчыма. Адсутнасьць мэханізму кантролю была, безумоўна, найгалоўнейшай хібаю тае дамовы. Сьпісаць яе можна выключна на адсутнасьць вопыту ў такога кшталту справах. «Бульба...» пераўтваралася з ЗАО ў ОАО, мяняла «крышу», адрас і г. д. Скончылася тым, што яна прадала правы на N.R.M. зусім іншаму чалавеку, які гандляваў дыскамі і касэтамі. А сама хутка сканала.

Акрамя фінансавых стратаў ёсьць і яшчэ адна прычына, зь якой варта шкадаваць: не атрымаецца высьветліць, якім жа быў дакладны наклад «Трох чарапахаў». Відавочна, што гэта самы камэрцыйна пасьпяховы альбом за ўсю гісторыю беларускага року. Аднак лічбамі гэта не пацьвердзіш.

Між тым дзякуючы «Тром чарапахам» N.R.M. на Каранацыі 2000 г. бярэ рок-карону і прыз за лепшыя тэксты. Гэта становіцца падставай для яшчэ адной дыскусіі, якая, як на маю думку, дык пераўзыходзіць і завочную палеміку «Нашай Нівы» і «Музычнае газэты» і нават наваполацкі скандал часоў Мроі. Дыскусія настолькі выбітная, што варта прывесьці яе без купюраў.

## Разьдзел 14

## «ГАЛІМАЯ ПАПСА». ДЫСКУСІІ Ў ПРЭСЕ

*«Тры чарапахі» разварушылі кампанію музычных крытыкаў. Гэта таксама можна лічыць паказчыкам посьпеху. Ранейшыя невялічкія зацемкі ды рэцэнзіі зьмяніліся на шматслоўныя артыкулы зь лінгвістычным аналізам ды стогнамі пра лёс рок-н-ролу. Першы зьявіўся напачатку 2001 г. у «Музыкальной газете» — неўзабаве пасьля Рок-каранацыі.*

### «Откуда у хлопцев рок-н-ролльная грусть...»

*Евгений Долгих, шеф-редактор журнала «Джаз-квадрат», когда-то рок-фанат.*

«Прошла очередная «Рок-коронация», и опять стало грустно и безнадежно. Оттого, что белорусский рок именно по итогам этих мероприятий последних лет все больше и больше сползает в стандартно-попсовое болото. Причем не по форме, а по сути — не надо ловить меня на слове — совершенно не обязательно, чтобы N.R.M. или ЛЯПИС ТРУБЕЦКОЙ были внешне (мелодически, ритмически) похожи на SPICE GIRLS, достаточно того, что они точно так же внутренне настроены под вкус толпы. Доказательства? Они будут. Вообще-то не все так плохо, но давайте по порядку...

Скажу честно: я бы не стал публично излагать свои мысли, если бы не послушал в прошлом го-

ду два этих альбома: «Не смотря ни на что» группы СЕСТРА А. Шедько и «Тры чарапахі» N.R.M. Моя теперешняя «епархия» ведь вовсе не рок, а джаз, но даже редактируя журнал «Джаз-квадрат», я стараюсь не забывать о том, что начинал-то ведь с рока и блюза (зарубежного и нашего) 70-х и 80-х.

...При упоминании о роке и блюзе двадцатипятилетней давности половина нынешней тусовки дружно заноет: а-а-а, старик, ну что ты рубишь в теперешней музыке — на здоровье, чуваки, нонче демократия более-менее на культурном поле, вы можете слушать и говорить почти все, что хотите, но! Я рос в то время, когда рок-н-ролл задавал планку в современных жанрах, и те, кто воспитан на ТОЙ музыке — ROLLING STONES, BEATLES, LED ZEPPELIN, NAZARETH, DEEP PURPLE, PINK FLOYD, DOORS, YES, JETHRO TULL, АКВАРИУМЕ, ЗООПАРКЕ, ДДТ, ЧАЙФЕ, очень хорошо знают разницу между настоящей музыкой и попсой, в какие бы одежды она ни рядилась.

Так вот. Разговор пойдет всего-навсего о победителе нынешней «Рок-коронации» в нескольких категориях группе N.R.M. и Алексее Шедько с его группой СЕСТРА, а если еще точнее, то об их последних альбомах, о которых я упоминал в начале. Я много разных претензий слышал от рок-фанатов и просто рок-слушателей в адрес альбома «Не смотря ни на что» — он, мол, и чересчур спокойный, недрайвовый, и собственно рока там мало, много бардовских интонаций, и подражаний изрядно, и... короче, до хрена всяких недовольных словес. Понимаю, понимаю — то, что не бьет по сознанию сразу же, не сходя с места, вы уже рок-н-роллом не считаете. Ну-ну. Значит, вы и АКВАРИУМ, и ЧАЙФ самый ранний весь в ту же мусорную корзину сбросите... первый гениальный альбом DOORS тоже — в нем драйва точно не больше, чем у Шедько... впрочем, не буду поднимать до таких образцов, не в них дело.

Теперь читаю в газетном репортаже: в категории «Тексты» «Рок-корону» получил все тот же N.R.M., и начинает тихо ехать крыша. Ну ладно, музыка музыкой, но элементарную поэзию в текстах вроде бы еще никто не отменял. Господа, заявляю со всей ответственностью человека, занимающегося кроме джаза еще и литературными переводами, в том числе поэтическими, и изучавшего поэзию, да чего уж там, и отдавшего ей немало времени: ВАС ОБМАНУЛИ! Как стихи тексты Шедько не просто на две головы выше, скажу резче: они есть поэзия — и сама по себе, и рок-поэзия тоже, а вот N.R.M.'овские опусы (стихами их называть язык не поворачивается) слабы, банальны и стилистически беспомощны. Но зато — они на белорусском языке! Не кажется ли вам, что именно в этом все дело?

Доказать то, что я утверждаю, я не могу — в музыкальной популярной газете не место литературному анализу, да и никому из фанатов с любой стороны это не надо. По-моему, достаточно просто взять и сравнить: кто имеет хоть минимум литературного вкуса, тот почувствует разницу, а кто не имеет, тому на самом деле до фени, что слушать — все едино, лишь бы по мозгам валило, а тексты — дело десятое. Смею утверждать, и я тут не одинок, что в нашем неанглоязычном рок-н-ролле стихи — все-таки на первом месте.

Для начала — заглавная вещь с альбома N.R.M. (не худшая, напротив — получившая «Рок-корону» в номинации «Песня»). Читайте.

*Калі раптам адчуеш камунальныя пахі,*
*І жыццё цябе возьме ў пятлю —*
*Зразумееш тады, што тры чарапахі*
*Па-ранейшаму цягнуць зямлю...*

Занятная картина. Это что получается — достаточно спекульнуть внешне наивно, но ловко

известными словами про «Беларусь, нашу мілую маму», а также ввернуть вперемешку Ленина и Сальвадора Дали — и текст сразу станет актуальным, интересным и оригинальным? Вот уж нет. А что это за «камунальныя пахі» и «жыццё, якое возьме ў пятлю»? Господа, да сколько ж можно банальщину и писанное-переписанное сотни раз выдавать за высокие образцы? Ну, если б этот альбом не получил приз за тексты, я бы молчал себе в тряпочку — это вовсе не худший образец нашего рока, даже где-то, я бы сказал, повыше среднего, но... noblesse oblige — как говорится, положение обязывает. Кстати, а кто автор? Из буклета диска совершенно не ясно, кто сочинял слова, кто музыку, кто делал аранжировки — что, все скопом? Похоже на то.

А теперь вчитайтесь в текст одной из песен Шедько с последнего альбома. Трудно было выбрать... ну, короче, взял в качестве примера не ту, что впечатлила больше всего, потому что и этой должно быть вполне достаточно для того, чтобы ощутить принципиальное отличие рок-поэзии от не-поэзии.

*Я рядом, я не далеко*

*Не знаю, куда же летят эти птицы,*
*наверно, куда-нибудь, где нелегко.*
*Все перед глазами какие-то лица —*
*не знаю, всегда среди них кто есть кто...*
*Не знаю, зачем отправлять телеграммы,*
*в которых слова, остальное — не то.*
*Не знаю, считать ли мелодией гаммы,*
*но все же я здесь, я не далеко.*

*Зачем говорят, что дышать — это вкусно,*
*а сами горазды проглатывать яд?*
*И как объяснить, почему это грустно,*
*когда вообще где-нибудь что-нибудь говорят?*

*Да все ни о чем. Отчего же так больно*
*за собственным счастьем нырять в молоко?*
*И хочется громко скомандовать — вольно!*
*И я здесь рядом, я не далеко...*

*Забытый колодец да старая вишня.*
*Привет, одиночество — крашеный гвоздь.*
*Не знаю, какая ты — прошедшая иль нынешняя,*
*не знаю, хозяин я здесь или гость?*

*Не вовремя, незачем, не за что, нечем...*
*Спасибо хотя бы, что так широко*
*упрямая стерва ложится на плечи —*
*ведь я здесь рядом, я не далеко...*

...Бог ты мой... это даже не обычный нормальный рок-текст — это просто настоящие стихи. Не гениальные, даже не выдающиеся, не стану льстить, но — подлинные, в них все на месте. Вот в этом-то, похоже, все и дело. Тексты Шедько из этого альбома слишком хороши для нашей рок-тусовки, где шедевром нынче считаются такие строки:

*Ты будзеш самая сьветлая,*
*Ты будзеш самая чыстая,*
*Ты будзеш самая белая,*
*Ты будзеш самая-самая...*
(N.R.M., «Чыстая, сьветлая» — официально — лучший текст в альбоме)

Поэтому и грустно. И не надо меня упрекать за то, что я рассматриваю тексты отдельно от музыки. Лучшие образцы нашего рока — повторюсь — всегда отличались именно текстами, а мы сейчас говорим о лучших, а не о худших и даже не о средних.

Рассуждать о музыке этих двух альбомов (да и групп в целом) долго не стоит. Здесь придется вообще обходиться словесными описаниями,

а это не дело. Стили у них совершенно разные, это ясно, но я бы не хотел ставить какой-то (любой) стиль как таковой выше другого. У N.R.M. есть главный козырь «сучаснага беларускага рока» — драйв, напор, профессиональное умение показать себя минимальными средствами, что вызывает уважение, но никак не отменяет фантазию и музыкальное воображение. А их и нет — мелодии примитивны, если не заменены просто стандартными для рока созвучиями. Кстати, все вещи рассчитаны на то, что их припевы будут непременно подхвачены залом — они идут мощнейшим рефреном, пусть порой «не в струю» к самой песне, зато для массовости самое то. И что это, если не попса?

У Шедько в «Несмотря ни на что» — отточенные, красивые мелодии, ярко и, я бы сказал, филигранно сделанные аранжировки и лучшие на сегодняшний день музыканты-профессионалы города Минска, которые могут легко сыграть и гораздо более сложную музыку (и играют, без дураков). Да, согласен, в его последнем альбоме (да и на последних концертах, что я слышал) нет той энергии, которая заставляет вскакивать, орать, прыгать, срывать с себя футболки, швырять бутылки на сцену. Если это недостаток, то прошу прощения — я обращаюсь к другой аудитории. Временами (далеко не всегда), и правда, его песни недостаточно эмоциональны и в них чувствуются стилистические заимствования, но это, пожалуй, единственные два небольших упрека, которые я могу предъявить Алексею. Но они не являются помехой внимательному слушателю, который в рок-н-ролле видит не просто средство для балдежа, а искусство все-таки. Увы, и музыка, которую играет Шедько со товарищи — это тоже слишком хорошо для нашего рок-н-ролла, привыкшего к тяжести, а не к изяществу, к приземленности, а не к возвышенности.

Хотя чего там уж — это касается не только белорусского, но и российского, и западного со-

временного рока в целом — он весь так и не пережил последствий панк-революции, когда на сцену вылазили все, кому не лень, в том числе абсолютно немузыкальные люди, и «высказывали свой протест» против окружающей действительности. Почему «протест» в кавычках? Потому что хрена лысого это был настоящий протест. В 99 % случаев это банальное желание вые...нуться — когда-то это было недоступно сделать на широкой публике, приходилось орать дурным голосом под гитару во дворе, а тут какой случай подвернулся — играть не умеешь, а можно было выйти и перед тысячной толпой валять дурака, и они тобой восторгались... Только вот какое это отношение имело к музыке? Отдельные редкие таланты типа SEX PISTOLS или Петра Мамонова стали-таки настоящими профессионалами, но они хотели научиться ими быть, что нелегко — надо работать над собой и совершенствоваться ежедневно.

Мы теперь пожинаем плоды того бардака — современный рок и мелодически, и поэтически так и не поднялся хотя бы до высоты DEEP PURPLE... и если вдруг ВОПЛІ ВІДОПЛЯСОВА сыграют какую-нибудь красивую «Весну», то все восторгаются, а чему, собственно? Точно так, да и получше, рок играли те самые двадцать пять и тридцать лет назад — послушайте хотя бы «Ruby Tuesday» ROLLING STONES... примеров приводить устать можно. Искусство развиваться должно, а не перепевать старые приемы и темы, а если уж свое трудно сразу найти, ведь начать можно и с подражания лучшим, а не самым примитивным образцам.

М-да, что-то я отклонился от разговора о «Рок-коронации». Шедько, как мне кажется, поступил совершенно правильно, что отказался играть на «коронационном» концерте. Он уже вырос из этих штанишек местечковости, которые до сих пор носит почти весь наш рок-н-ролл, —

ну, это примерно то же, как если профессиональную футбольную команду пригласить участвовать в междузаводском соревновании. Смешно. Можете делать со мной все, что хотите, но я, наслушавшись серьезного джаза — штуки куда сложнее и изощреннее рока, — слышу четко, где есть музыка, а где по сути самодеятельность. А то, что, скажем, тот же ЛЯПИС ездит по России и изображает профессионализм, то это не показатель — раскрутка есть раскрутка, а есть и гамбургский счет. И по этому счету то, что делает Алексей Шедько, является настоящим ИСКУССТВОМ. Так держать!

И последнее, уже немного «в сторону». Сильно посмеялся я, когда узнал, что ПЕСНЯРЫ стали «рок-группой столетия». Милые мои белорусы! Ну зачем такая бессмысленная лесть! Про «столетие» ладно, хотя рок-н-роллу и пятидесяти нет — все же красиво звучит, зато другое изумляет. ПЕСНЯРЫ — прекрасный вокально-инструментальный эстрадный ансамбль, действительно один из лучших в бывшем Советском Союзе, но при чем здесь РОК-Н-РОЛЛ? Таки теперь и Аллу Пугачеву будем считать рок-певицей?

Все, больше комментариев не имею, а то побьют. Откровенность опасна. Но нужна ведь иногда, черт побери — хватит дружно изображать из себя хотя бы музыкальный пуп земли...»

*Адказ на гэты шэдэўральны артыкул зьявіўся праз некалькі тыдняў у той жа «Музыкальной газете». Ён таксама варты поўнае перадрукоўкі.*

### «ОТКУДА У ХЛОПЦЕВ РОК-Н-РОЛЛЬНАЯ ГРУСТЬ»-2

*С. Клюцки, В. Краснагир, закоренелые любители*

«Иногда так бывает, что новое — это хорошо забытое старое, но в нашем случае мы надеемся, что статью шеф-редактора «Джаз-квадрата» Е. Долгих «Откуда у хлопца...» вы еще не забыли.

Более того, вырезали или законспектировали (отреферировали), ибо подобные шедевры попадают на страницы «МГ» не чаще чем раз в три года. Главный предмет статьи — искренняя попытка выяснить, кто более заслуживает в Беларуси рок-корону и сопутствующие ей атрибуты — внимание и любовь журналистов, девушек, бабок (на выбор) — Шедько или N.R.M. Господина Долгих до глубины души потрясла абсурдность ситуации, при которой организаторы «Коронации» «втюхали» недалекой публике под видом рока откровенную (или как выражаются в данной среде «галимую») «попсу», N.R.M. то бишь. Как же так? Где справедливость и здравый смысл? Почему возводят на пьедестал не профессионалов, посвятивших себя служению искусству, а ловких коммерсантов, весь профессионализм которых заключается в том, чтобы вовремя сориентироваться в рыночной конъюнктуре и подсунуть неразборчивой публике очередной симулякр вместо оригинала?

Давайте отбросим эмоции и попробуем максимально беспристрастно разобраться во всем этом. А, собственно, в чем здесь разбираться? Человек высказал с максимальной прямотой все, что наболело, и не его вина в том, что сделанные им выводы породили большие сомнения в его способностях адекватно описывать происходящие в современной музыке процессы. Но каких других выводов можно ожидать от человека, выросшего на DEEP PURPLE, BEATLES, ROLLING STONES, JETHRO TULL, NAZARETH, YES — золотом суповом наборе 60—70-х? Правда, в последние 10 лет он обслушался «сложного джаза», что, казалось бы, должно было несколько изменить его доисторические представления, в том числе и о рок-музыке (кстати, существует ли таковая, не журналистский ли это штамп?). Но то ли слушал как-то формально (по долгу службы), то ли слушал не «тот джаз», а результат налицо: SLY & ROBBY нынче самая

модная ритм-группа с Ямайки, Bill Laswell — суперпопулярный басист-электронщик, а Мамонов — панк! SEX PISTOLS же молодцы, настоящие «профи», не побоявшиеся научиться играть, в особенности Сид Вишес (бедняга уморил себя до смерти игрой на басу).

К музыке мы еще вернемся, а пока поговорим о поэзии, тем более, что Е. Долгих специалист широкого профиля (джаз, рок, поэзия, лит. переводы и лит. критика). Мы вынуждены согласиться с тем, что в поп-газете не место лит. анализу. Но это тот самый случай, когда и без анализа диагноз может поставить даже непрофессионал. «Элементарной поэзии»(?) в опусах N.R.M. нет — муза испугалась Пита Павлова и убежала к Шедько. Нет у них и высокого слога типа «Когда вообще где-нибудь что-нибудь говорят» или «не вовремя, незачем, не за что, нечем...» Наоборот, все как-то слишком прозрачно, недвусмысленно, в рифму. А где же аллюзии, параллели, гиперболы, метафоры (да «фига в кармане» наконец!)? А впрочем, чего ожидать от групповой (писали скопом, да еще, поди, на пьяную голову) мужской поэзии. То ли дело одинокий романтик, эзотерик-визионер А. Шедько! Сколько тумана, воды, вторых и третьих смыслов и надсмыслов (не говоря уже о подсмыслах), междометий, местоимений, вводных, обводных и выводных слов-паразитов (не дают, паразиты, выразить всю глубину, бездну чувств и переживаний измученной души поэта). А если серьезно, то тексты N.R.M. лучше не потому, что они на белорусском языке, а потому, что они — лучше.

Только не подумайте, что мы внешне наивно (но с кирпичом за пазухой) издеваемся над профессионалами. Отнюдь. Мы просто слушали не то, не там, не с теми, всякие GONG, CAN, FAUST, GODZ, VELVET UNDERGROUND, HENRY COW, CABARET VOLTAIRE, RESIDENTS, Sun Ra, Frank Zappa, John Cage, Yoko Ono, Brian Eno, Nico, Philip Glass, Bill Laswell, KRAFTWERK, CAPTAIN

BEEFHEART, Курехина и других панков-любителей, так и не достигших уровня SEX PISTOLS, а тем более музыкантов (без дураков) группы СЕСТРА. Но исходя из того, что «на культурном поле нонче демократия более-менее» и «можно слушать и говорить почти все», мы и решили слегка пополемизировать с уважаемым шеф-редактором. Свои замечания и комментарии мы постарались систематизировать, и вот что из этого получилось.

1) Нам не кажется, что N.R.M. и А. Шедько образуют некую оппозицию (одни другому не мешают, ибо «работают» на разные аудитории). Следовательно, некорректно сталкивать артистов и их поклонников лбами (проводить разборки типа «хто тут кручэ?»). В этом свете нехождение Алексея на «Рок-коронацию» демонстрирует лучшее понимание им ситуации в сравнении с его «защитником» господином Долгих.

2) Попытка поставить творчество Шедько в один ряд с «нашим» русскоязычным роком (ЗООПАРК, АКВАРИУМ) также не кажется нам убедительной. При всей абстрактности и метафоричности текстов Шклярского, Борзыкина, Гуницкого, Мамонова и Гребенщикова мы всегда понимаем, что они нам говорят, на что намекают (или умалчивают). А тексты Майка Науменко, если руководствоваться логикой Евгения Долгих до конца, в большей степени отдают «коммунальностью» N.R.M., чем «элитарностью» Шедько.

3) Мы категорически возражаем против использования таких терминов (которые не более чем клише), как «джаз», «рок», «попса», «настоящее Искусство». Абсурдно противопоставлять друг другу то, что не имеет никакого конкретного содержания. Что позволяет объединять в «джаз» такие разные явления, как Sun Ra и Chick Corea, ECM и Knitting Factory, А. Козлова и В. Чекасина? Аналогично и даже более трагично обстоят дела с «роком», особенно последние 20 лет.

На самом деле никогда не существовало четких границ между жанрами, стилями и направлениями, особенно в музыке, предназначенной для массовой аудитории. То, что принято называть джазом и роком, изначально было коммерческим продуктом, поэтому некорректно причислять их к элитарной культуре, это культура массовая, это поп-культура. И совсем глупо придавать слову «pop» (в русско-совковой фене — «попса») уничижительный оттенок. В большинстве случаев за этим стоит снобизм и зависть к успеху коллег по цеху. Таким образом, ВСЯ современная музыка (и культура) — это поп-музыка по преимуществу. К этому предрасполагает ситуация постмодерна. Современное общество потребления не имеет непреодолимой социальной стратификации (нет четких иерархий, характерных для доиндустриального и индустриального общества), это социально мобильное общество. Соответственно не может быть деления на элитарную и вульгарную культуры. А значит, потреблять «элитарные» культтовары могут как «престижные», так и «маргинальные» социальные группы, что никак не отражается на эстетических достоинствах (недостатках) продуктов. Сантехник может серьезно увлекаться «авангардным джазом», а редактор музыкального журнала «для умных» вполне может обходиться стандартным набором из классиков хард-рока.

4) Очень нас повеселило утверждение господина редактора о том, что «современный рок так и не пережил последствий панк-революции». Да современный рок и существует-то исключительно благодаря последствиям этой революции, вдохнувшей жизнь в умиравший рок 70-х. А иначе слушали бы и по сей день профессиональную мертвячину а-ля Ричи Блэкмор и Ингви Мальмстин и молились на NAZARETH. Не менее комично выглядит обвинение «повылазивших на сцену немузыкальных людей» в банальном желании

вые...нуться». Возможно, мы заблуждаемся, но что, как не это «нехорошее» желание, стоит почти за всеми поступками если не всех homo sapiens, то, по крайней мере, людей творческих? И ничего предосудительного в этом нет.

5) Ошибочным нам представляется рефреном звучащее противопоставление «профессионализма» «любительству», а в особенности ничем не обоснованное отождествление профессионализма с высоким качеством и эстетической ценностью культурного продукта. Не следует путать промышленное серийное производство с индивидуальным творческим процессом. Если профессиональный слесарь заслуживает всяческого уважения, то профессиональный музыкант, в течение 20 лет пытающийся приблизиться к уровню NAZARETH, не заслуживает ничего, кроме сожаления. Вы уж извините нас, дилетантов, но мы скорее отдадим предпочтение «самодеятельности» Кустова, Бубна, Худякова, НАИЗНАНКУ, NITKIE, AUTISM, ENERGUN 22, RABBIT EGGS, ZYGIMONT VAZA, ANGRY ROSE 2000, КУКОЛ и других «любителей», чем «профессионалам» из СЕСТРЫ, КАЛИ ЮГИ и прочих звезд «Стар-Клуба».

И последнее, уже немного в сторону. Мы не претендуем на то, что знаем истину или можем ее познать. Мы всего лишь протестуем против пугающей серьезности здравого смысла, с его тоталитарной установкой на то, что «истина—одна» (а именно это и пытается навязать читателям редактор «Джаз-квадрата»). Каждый человек имеет право на свою истину, поскольку это позволяет ему ориентироваться в мире, отличать хороших людей от плохих, хорошие образцы поп-культуры от посредственных. Единственное требование, которое может иметь значение, — это необходимость самореализации и творчества, которые позволяют человеку быть тем, что он есть, без оглядки на диктат прошлого или претензии настоящего. Быть собой, быть уникально особен-

ным, означает быть поэтом, то есть ценить свободу метафоры превыше истины, воспроизводить жизнь не такой, какой она была, а такой, какой ты хочешь ее видеть.

В этой связи советуем господину Долгих и всем читателям «МГ» снисходительнее относиться к себе и другим. В эпоху постмодерна без самоиронии — как без автомата в Чечне. А еще неплохо бы избавиться от провинциального мышления. Минск действительно является пупом земли. В том смысле, что времена двухполюсного мира прошли. Центров теперь, слава Богу, много (читайте Делеза, Эко, Бодрийяра, Дерриду). Сегодня можно жить в деревне и быть при этом «в центре», а можно жить в Минске (Варшаве, Москве, Нью-Йорке) и оставаться провинциалом. Центр — понятие скорее субъективно-психологическое, чем объективно-географическое. Перефразируя группу HIS NAME IS ALIVE — Center is in your head.

P. S. Если «рок» все-таки существует, то ПЕСНЯРЫ и А. Пугачева, несомненно, рок».

## Разьдзел 15

## 2000. ТУР ПА БЕЛАРУСІ

Посьпех «Трох чарапахаў» і хуткае (дзякуючы «Бульба-рэкардз») распаўсюджаньне альбому па ўсёй Беларусі прывялі да сьмелае, але невыносна прывабнае думкі — правесьці сапраўдны тур па краіне. На той час хлопцы пазнаёміліся з Валодзем Шаблінскім, кіраўніком музычнага агенцтва «Лінія гуку». Акрамя несумненных вартасьцяў чалавечых ён меў яшчэ й ліцэнзію на правядзеньне канцэртаў. Ды толькі да ідэі туру паставіўся даволі скептычна. Уламалі.

Празь месяцы падрыхтоўкі сфармаваўся графік гастроляў. Амаль два тыдні безь ніводнага перапынку:

15.11 Пінск;
16.11 Слуцк;
17.11 Салігорск;
18.11 Гомля;
19.11 Бабруйск;
20.11 Магілеў;
21.11 Віцебск;
22.11 Наваполацак;
23.11 Ліда;
24.11 Горадня;
25.11 Слонім;
26.11 Бярэсьце.

Ужо потым рэчаіснасьць пачала ўносіць свае зьмены. Адмяніліся па розных прычынах Салігорск, Віцебск, Ліда і Наваполацак (праўда, дадаліся Баранавічы). Аднак гэта не перашкодзіла вы-

значыць падзею як эпахальную. Раней ніводзін зь беларускіх рок-гуртоў не наважваўся нават вымавіць слова «тур». У N.R.M. атрымалася. А ў гарады, дзе канцэрты былі адмененыя, гурт цягам наступнага году ўсё адно даехаў.

Першыя ўражаньні ад таго туру хлопцы па маёй просьбе занатавалі па гарачых сьлядох. Праз колькі год тыя нататкі ўжо можна падаваць як гістарычны дакумэнт. Безь вялікіх купюраў і камэнтароў.

### Лявон Вольскі: «Ну, усё, — падумалі мы, — зараз будзе дзікая бойка»

«Першым быў горад Пінск. Для мяне гэты канцэрт быў самы цяжкі, бо я толькі а 6-й раніцы прыехаў з Варшавы і быў дзіка нявыспаны, так што працаваць давялося ў атмасфэры працоўнага подзьвігу. Подзьвіг адбыўся, хаця народу было ня дужа многа, далёка не аншляг. Я пэсымістычна падумаў, што ўсё, гамон, так будзе й далей. Гэтак жа падумаў і арганізатар гэтага ўсяго «безабразія» сп. Шаблінскі і сказаў, што трэба ўсё адмяняць і г. д.

Яшчэ адна акалічнасьць: прыехаўшы ў Пінск, я быў вельмі зьдзіўлены адсутнасьцю ўсякага ацяпленьня ў Доме культуры. Як потым высьветлілася, гэта агульная рыса большасьці беларускіх ДК (прыемнае выключэньне — Бабруйскі Дом афіцэраў). А так да сярэдзіны канцэрту, пакуль народ сваім подыхам не ацяпляў залю, падчас сьпеваў ажно пара з роту йшла.

Дырэктара пінскага ДК завуць Аляксандар Лукашэнка. Ён ведае плюсы й мінусы свайго супразванства з ППРБ. Плюсы — гэта, напрыклад, калі ён прыяжджае ў стольны Менск і яго спыняе ГАІ за перавышэньне хуткасьці, дык пасьля праверкі дакумэнтаў да патрэбнага мейсца Аляксандра Мікалаевіча суправаджае гаішны эскорт. А мінусы — гэта тое, што ў выпадку падзеньня сёньняшняга рэжыму эфэкт будзе абсалютна адваротны.

Але пакінем Пінск. Сядзем у РАФік і паедзем дадому, у Менск. А назаўтра даведаемся, што наступны канцэрт адменены.

Дарэчы, некалькі канцэртаў адмяніліся з-за розных бздураў. Напрыклад, у Слуцку адна адказная асоба сказала, што прададзена толькі 200 квіткоў. Давялося адмяняць канцэрт. Калі ж арганізатар запытаўся, чаму так мала прададзена, тая асоба нам паведаміла, што ў продаж дала квіткі толькі па 500 акупацыйных зайцоў, а па 2000 ці, крый Божа, па 3000 нават і не выстаўляла. Проста замкнула ў сэйф ды ўсё. Бо, маўляў, што гэта такое — такія дарагія квіткі! — гэта натуральны зьдзек са слуцкага народу. Шчасьлівы народ скупіў усе гэтыя танныя квіткі, але гэтае сумы нам бы хапіла хіба на арэнду апарату. Праз гэтую недарэчнасьць Піт ня зграў канцэрт на сваёй, як той казаў, маленькай радзіме.

Ладна. Бабруйск уразіў колькасьцю Леніных(аў?). Іх там шмат — скульптурных, маляваных, у кожнага свой характар. Ёсьць там:

1. Ленін, які няўдала згуляў у кегельбан (правая рука толькі-толькі выпусьціла шар, постаць выдае прыкрасьць пройгрышу);

2. Ленін з «ходокамі» (карціна ў Доме афіцэраў);

3. Ленін, засраты птушкамі (тое ж, што і ў № 2). Відаць, яго на 7 лістапада выстаўлялі на вуліцу;

4. Яшчэ нейкі скульптурны Л., але на яго адметныя рысы я чамусьці забыўся.

Мясцовыя маладыя людзі — аматары нашае творчасьці вельмі пастараліся, прадалі шмат квіткоў, самі зрабілі афішы (мяне пастаянна ўпікалі, што афішы паганыя, і за постмадэрнісцкімі «палётамі на Возера Трох Чарапахаў» не відаць сутнасьці — таго, што гэта рок-канцэрт, а не якаясьці рэйв-вечарынка, але потым, у Магілеве, гэтыя афішы нас выратавалі). Дык вось, бабруйчане зрабілі нармальныя чорна-белыя афішы, дзе было напісана чорным па беламу, што гурт N.R.M. ладзіць канцэрт у бабруйскім ГДА. Дзякуючы гэтаму

народу было шмат, прычым рознага. Пасьля канцэрту я расьпісваўся аднаму маладому чалавеку ў ваенным білеце. Малады гэты чалавек зусім не выдаваў на сталага аматара нашае творчасьці, наадварот, быў падобны да гопніка, альбо, як мы кажам, кумбу, але было відаць, што ён вельмі захоплены ды ўражаны канцэртам, хаця і патрапіў на яго выпадкова. Вось яно — выхаваньне маладога пакаленьня.

Калі мы прыйшлі засяляцца ў гатэль пасьля канцэрту, дык мясцовая абслуга — бабка ды цётка неахайнага выгляду рабілі ўсё дзеля таго, каб выгнаць нас і не засяліць. Апошняя кропля: на пытаньне «Дык у вас тут, можа, клапы ёсьць?» яны адказалі: «І клапы, і тараканы, і ўсё ёсьць». Карацей, мы знайшлі новы маленькі дарагі, але абсалютна эўрапейскі гатэльчык, дзе і заначавалі.

Далей быў Магілеў. У яго мы ехалі на рэйсавым аўтобусе. Гулялі ў тысячу. Я, Юрась і Вова Шаблінскі. Я перамог (ня здолеў не пахваліцца!).

У Магілеве — свой Ленін. І свой дом ураду — клянаваны зь менскага. А хутчэй наш клянаваны з магілеўскага, бо ж плянавалася зрабіць Магілеў сталіцаю. Калісьці.

Магілеўская публіка знакамітая тым, што розныя хлопчыкі-эксгібіцыяністы любяць выскокваць на сцэну, а як толькі ахова набліжаецца да іх, занырваць у натоўп, што стаіць перад сцэнай.

У Магілеве нарадзіўся тэрмін «дзеці». Так наракалі Алезіса й Піта, якія ня п'юць. Калі мы куплялі сабе па бутэльцы піва, дык дзеці казалі: ну вось, сабе купілі пойла, а нам чакалядку ці яблычак — забыліся? Вось так заўсёды гэтыя дарослыя...

У Магілеве дзікая й абсурдная, нават для нашай дзікай ды абсурднай краіны, сытуацыя зь міліцыяй і КГБ. Перад канцэртам дырэктар ДК выклікаў наш дырэктарат і пачаў папярэджваць: не рабіце гучна, бо гук узьдзейнічае на «мозжечок», папярэдзьце публіку, каб не крычала «Жыве Беларусь!» і не размахвала сьцягамі. У адваротным выпадку канцэрт

будзе спынены. Мы пагналі Піта (ён ня вельмі супраціўляўся) на сцэну з папярэджаньнямі для публікі, кшталту:

...не залазіць на крэслы, бо канцэрт будзе спынены назаўсёды.

Цалавацца і ўсё астатняе толькі на мейсцах, адведзеных для пацалункаў і ўсяго астатняга... і г. д.

І ўсё адно, знайшліся ў залі нейкія КГБісты, якія выклікалі міліцыю: маўляў, у залі адбываецца мітынг. Гэтая міліцыя прыехала, праклінаючы ўсё на сьвеце (гэта быў выходны дзень), гатовая разабрацца з усім, што варушыцца. Далейшыя падзеі я прапушчу, скажу толькі, што было шмат пагрозаў, вяліся апэратыўныя здымкі канцэрту (мітынгу), пакралі нашыя праграмкі, што мы кладзем сабе пад ногі, каб не забыцца на парадак песень і адбівак (рэчавыя доказы), арыштавалі ўвесь наклад касэтаў ды кампактаў, якія прадаваліся ў фае, карацей, наступны, віцебскі канцэрт адмяніўся цераз гэты ідыятызм. Трэба было вытрымаць паўзу. Дарэчы, пра афішы. Тут яны вельмі прыдаліся. За абстрактнымі «экзатычнымі турамі на Возера Трох Чарапахаў» пільныя, але тупыя ўлады Магілеву не заўважылі рок-канцэрту. А то ён быў бы адменены значна раней, як адмяняліся калісьці выступы на фэстывалю «Магутны Божа». Дальбог, дзіўны, непрадказальны горад Магілеў!

А ўвогуле, гэта добры, прыгожы горад. Публіка чуйная й адукаваная. Адно што начальства ідыятычнае — ад вахцёркі да дырэктара.

Пасьля паўзы была Гародня. Гародня — гэта мой сантымэнт. З Гародні пачалася нашая музычная, так бы мовіць, кар’ера. Бо менавіта ў гэтым месцы калісьці папулярны рок-гурт «Мроя» зграў на фэстывалі «Рок-крок» свой першы пасьпяховы канцэрт. Праз Гародню мы заўсёды праяжджаем па дарозе ў Польшчу й ніколі не спыняемся.

Ну вось. Да Гародні я, мэнэджэр Анечка і гукарэжысэр Алег ехалі на «Волзе» (колькі мы заплацілі, няхай застанецца на нашым сумленьні й на

сумленьні кіроўцы), бо мы везьлі плякаты й кампакты, астатнія ж музыкі ехалі рэйсавым аўтобусам. Мы сустрэлі іх у ПК «Хімік» у піцэрыі. Хлопцы былі ўжо сытыя й задаволеныя жыцьцём. Раптам да іхняга століку падыйшоў нейкі супэркумба. Ён трымаў у руцэ партрэт Лукашэнкі. Гэты партрэт, відаць, ляжаў на ягоным століку. Да нас ён зьвярнуўся наступным чынам:

— Эй, неформальное объединение! Вы уважаете этого человека?

— Я асабіста не паважаю, — адказаў наш дырэктар.

«Ну, усё, — падумалі мы, — зараз будзе дзікая бойка». Але бойкі не было. Малады чалавек кінуў партрэт на падлогу й пачаў яго са злосьцю таптаць. На гэтае сьмелае дзеяньне афіцыянтка будзённым тонам прамовіла: «З вас 280 рублёў за партрэт».

Публіка ў Гародні эўрапейская. Нічым не адрозьніваецца ад, напрыклад, польскай.

Пасьля канцэрту частка музыкаў паехала ў Менск, а я, Караньскоў (гук), Шаблінскі (арганізацыя) і Анечка(мэнэджмэнт) засталіся ў Гародні, бо ня бачылі сэнсу на дзень перад берасьцейскім канцэртам вяртацца ў Менск. Цэлы дзень мы цягаліся па Гародні, зайшлі ў касьцёл, пахадзілі па гістарычных мясьцінах, наведалі мяйсцовыя барчыкі. Пасядзелі ў рэстарацыі. Але адтуль нас выжылі музыканьцікі, якія пачалі граць розныя «рукі ўверх».

А шостай раніцы паехалі на аўтобусе ў Бярэсьце. Як высьветлілася, дарога ад Гародні да Бярэсьця займае 6 (!) гадзінаў.

У Бярэсьці быў перааншляг. Людзі сядзелі нават у аркестровай яміне. Раздача аўтографаў заняла вельмі шмат часу.

А шостай раніцы (прыкрая завядзёнка) мы выехалі ў Баранавічы. Тут я быў першы раз. Запомніліся мяйсцовыя няўрадавыя арганізацыі, абгрэйчаныя, абстаўленыя кампутарамі, падлучаныя

да інтэрнэту. Народ там працуе абсалютна не мястачковага выгляду. І гэта радуе.

Канцэрт прайшоў супэр, але пасьля нас падпісаліся граць маладыя музыканьцікі. І нармальныя былі каманды, але так гэта ўсё зацягнулася... Калі яшчэ ўлічыць, што два дні запар мы падымаліся а 6-й і клаліся а 2-й, дык фінал мерапрыемства быў даволі цяжкі. І, як заўжды, глухой ноччу мы прыперліся ў свой горад-герой Менск і разьехаліся па сваіх канспіратыўных кватэрах.

Назіраньні й вынікі туру: у кожным горадзе свой Ленін, а ў некаторым іх некалькі. За сцэнай любога ДК абавязкова стаіць брудна-белы бюст правадыра. У кожным горадзе свая аўра і свой народ, не падобны да насельніцтва іншых гарадоў. Усе гарады даволі прыгожыя і, каб нехта дбаў пра гэта, не саступалі б эўрапейскім. Да беларускае мовы большасьць насельніцтва ня ставіцца агрэсыўна, а, наадварот, прыязна. Рэстарацыі і гатэлі ў правінцыі (апроч Бярэсьця) даволі недарагія, можна сабе дазваляць гэтыя маленькія радасьці. На канцэртах публіка падпявае большасьць песень, нават новыя.

Становішча прымушае быць аптымістам. Наступным прэзыдэнтам Беларусі буду я!»

### Алезіс Дземідовіч: «Проста трэба мейсцы ведаць»

«Такое ўражаньне, што Возера Трох Чарапахаў разьлілося па ўсёй тэрыторыі цяперашняе РБ, а N.R.M. грае з драўлянай палубы тым, хто на беразе. Нават «непатапляльны» Магілеў ня вытрымаў магутнага націску экалягічна чыстага возера.

Зь вялікіх гарадоў «неахопленымі» засталіся два — Гомля й Віцебск, але гэта часова. Наколькі я ведаю, гамяльчане й віцябляне актыўна набываюць ласты, надзьмуваныя лодкі, гумовыя боты й запасаюцца ежай на выпадак стыхійнага бедства. І правільна робяць, бо ўсё гэта можа спатрэбіцца ў гаспадарцы.

Літаратурна-музычнае шоў N.R.M. дзякуючы гастролям папоўнілася выхаваўчымі натацыямі на тэму: «Як трэба сябе паводзіць, каб канцэрт ня быў спынены». Такія спэцыяльныя правілы паводзінаў ёсьць, але яны засакрэчаныя. Як высьветлілася — людзям, якія купілі «дарагастояшчы» білет, ніхто не растлумачыў, як трэба сябе паводзіць. Так і хочацца запытацца ў невядомага аўтара (ці аўтараў) «спэцыяльных» правілаў: «Калі на канцэрце нельга сьпяваць і таньчыць, дык дзе гэта рабіць? На дне ўсё таго ж віртуальнага возера?»

А паколькі возера віртуальнае, мы карысталіся наземнымі гатункамі транспарту — міжгароднімі аўтобусамі, мікрааўтобусамі, тралейбусамі, легкавымі аўтамабілямі і цягнікамі. Два разы мы ехалі на адным і тым жа расейскім цягніку «Сьвярдлоўск–Брэст» (у Брэст і з Брэсту) і сутыкнуліся зь невырашальнай праблемай — немагчымасьцю замовіць у правадніцы звычайнае гарбаты. Беларускія рублі не прымаюцца. Тое самае адбываецца, калі едзеш у польскім WARSe. Разьлік ідзе на польскія злотыя й даляры. Прыехаўшы ў Менск, я даведаўся, што, напрыклад, у эстонскім цягніку Менск–Талін прымаюцца любыя прыбалтыйскія грошы, расейскія, даляры з марачкамі, але толькі не беларускія. А на Беларускім вакзале ў Маскве ў пунктах абмену валютаў спэцыяльная шыльда папярэджвае: «Белорусские рубли не принимаются». Ну, проста абклалі нас, беларусаў, з усіх бакоў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі былі акупацыйныя рэйхсмаркі. Зараз гэтую ролю выконваюць нашыя беларускія «зайчыкі». Вось толькі хто так умела захапіў нашую тэрыторыю? Напэўна, нехта вялікі ды магутны. Мяняюцца назвы банкаў на паперах, а пытаньне незалежнасьці так і застаецца адкрытым. І калі носу не паказваць за межы РБ, то можна сьмела карыстацца нашымі «акупацыйнымі зайчыкамі».

Скажам, у Гародні можна смачна й нядорага павячэраць, а ў Бабруйску пераначаваць ва ўтуль-

ным гатэлі. Проста трэба мейсцы ведаць. Бо жывем мы някепска.

N.R.M. актыўна запрашае ў экзатычны тур, дзе ёсьць добрая сьцюардэса і злы тэрарыст, і цьвярозыя пілёты, і п'яны татарын, і казкі для маленькіх слухачоў. Вельмі цёпла нас прымалі ва ўсіх гарадох, незалежна ад тэмпэратуры паветра. У некаторых залях было халодна, як на вуліцы. Але тыя, хто прыйшоў на канцэрт, не пашкадавалі, а для нас раздача аўтографаў зрабілася адначасова цяжкай і прыемнай працай.

Можна з упэўненасьцю сказаць: доўгачаканы тур па РБ пачаўся і будзе працягвацца, бо любяць на Беларусі чарапахаў.

Вось і казцы гамон, а хто слухаў — чэмпіён (працяг у наступным нумары)».

## Юрась Ляўкоў: «Аўтографы, фотаздымкі, машына, гатэль...»

«ПІНСК. Са спазьненьнем выехалі зь Менску на люксовым РАФіку. Трэйлер з апаратам нас апярэдзіў на 1 гадзіну, але ў Пінску яны прыехалі да іншай залі. Таму саўнд-чэк у нас пачаўся за некалькі хвілінаў да канцэрту, і мы не пасьпелі нармальна адладзіць маніторную лінію. Не зважаючы на гэта, канцэрт пачаўся амаль сваечасова, і на якасьць гуку ў залі гэта не паўплывала.

Рады быў бачыць рэакцыю моладзі на фенькі ад N.R.M., бо было невядома, як успрымуць за межамі Менску тое, што мы рабілі ў КПЗ «Мінск» на прэзэнтацыі альбому «Тры чарапахі». Экспэрымэнт завяршыўся перамогаю, як і канцэрт.

Пасьля канцэрту: аўтографы, фотаздымкі, машына, дарога. Уначы мы ў Менску разьехаліся па хатах.

МАГІЛЕЎ. Дапамагалі з грамадзкага аб'яднаньня «Кола сяброў». Да нашага прыезду горад падрыхтавацца не пасьпеў, але канцэрт прайшоў як па сцэнары.

Пасьля канцэрту: аўтографы, фотаздымкі, «Кола сяброў», матор, цягнік, Менск. Ура — Хай Гэ.

ГАРОДНЯ. Сьветлы горад. Ён мне падабаецца больш за іншыя гарады. Слухачы вельмі адукаваныя й культурныя. З радасьцю еду ў гэты горад. Мае чаканьні спраўдзіліся. Канцэрт — супэр. Слухачы — супэр.

Пасьля канцэрту: аўтографы, фотаздымкі (але мы спазьняліся на цягнік, таму іх было мала). Абяцаю наступным разам затрымацца ў Гародні, каб не было пакрыўджаных.

БЯРЭСЬЦЕ. Па праўдзе, гісторыя гораду накладае адбітак на насельніцтва, таму невялікая розьніца ўсё ж была (у параўнаньні з Гародняй). Але блізкасьць Захаду адчуваецца.

Пасьля канцэрту: аўтографы, фотаздымкі, матор, гатэль.

БАРАНАВІЧЫ. Гэты канцэрт быў па-за межамі туру. У адрозьненьне ад іншых выступаў, гэты быў у залі з танцпляцоўкаю і па адчуваньні вельмі нагадваў выступ у клюбе. Канцэрт — супэр. Слухачы — малайцы.

Пасьля канцэрту: аўтографы, фотаздымкі, матор, штаб-кватэра БНФ, матор, цягнік.

Мы ў Менску. Ура — Хай Гэ.

На маю думку, тур можна назваць адным словам — «азнаямленчы». Паколькі тур рабіўся з дапамогаю агенцыі «Лінія Гуку» на ўмовах самаакупнасьці, частка канцэртаў была перанесеная. Нягледзячы на адсутнасьць нашае прадукцыі на тэлевізіі, слухачы ведаюць нашыя песьні і сьпяваюць разам з намі. Трэба рабіць болей канцэртаў за межамі Менску. Я — за».

### Піт Паўлаў: «Не, я не расеец...»

«Пад грукат колаў заўсёды засынаеш. Апошнія думкі перад тым, як заснуць, былі ня надта вясёлыя: канцэрт у Слуцку, пра які марыў усю сваю кар'еру, сёньня адмяніўся, і мы едзем у іншы го-

рад. Расплюшчваю вочы і са зьдзіўленьнем бачу, што заснуў на хвіліну ў акопе, нягледзячы на тое, што манатонна дзяўбе варожая артылерыя. Калі на аўтамат начапіць шапку і высунуць яго з акопу на кароткае імгненьне, у яго патрапіць куля. Невядома, дзе яны навучыліся так страляць. Рабіць што-кольвек немагчыма, таму вяртаюся да размовы, якую распачалі ўжо даўно. Мой суразмоўца — адзін з выдатнейшых адміністратараў і, напэўна, адзіны з прадзюсараў, які здолеў арганізаваць у свой час канцэртны тур — Валодзя Шаблінскі. Я і сам у мінулым даволі заўважная постаць у нашым шоў-бізнэсе, таму ўсе размовы таўкуцца вакол тэмы шоў-бізнэсу на Беларусі.

— Слуцак — горад майго маленства, калі я зноў цябе ўбачу? — думаю я ўслых.

Але мае думкі перапыняе голас Валодзі Шаблінскага:

— Ды што табе гэты Слуцак? Зальчык там усяготкі на дзьвесьце мейсцаў!

...Ізноў цягнік «Масква–Бярэсьце». Ехаць яшчэ далёка, і мы з Алезісам вырашылі папіць салодкае гарбаты і крыху прайсьціся, бо сядзець у задушным купэ надакучыла. У вагоне-рэстарацыі сядаем за вольны стол і замаўляем гарбату й канапкі. Расейская кельнэрка робіць выгляд, што не разумее па-беларуску, перапытвае, але я ў сябе дома! Як жорстка я памыляюся! Калі мы зьбіраемся сыходзіць, нам прыносяць рахунак. Толькі тут я разумею, што я маю ў сваіх кішэнях любыя плацёжныя сродкі (зайцы, злотыя, маркі, нават некалькі франкаў, што засталіся ў якасьці сувэніраў), акрамя расейскіх рублёў. Выцягваю з кішэні пачак нашых сьмешных грошай, але ў вачох кабеты заўважаю халодны мэтал:

— Акупацыонные рубли не принимаем, тока рэйхс-рубли!

Узгадваю, што ў 41-м годзе, калі немцы ўвялі ў нас акупацыйныя маркі, такіх абмежаваньняў не было, але ж гэта немцы, цывілізаваная нацыя...

Пасьля даволі цяжкае размовы акупанцкая прысьпешніца згаджаецца ўзяць у нас даляры па самым нізкім курсе за ўсю гісторыю йснаваньня гэтае грашовае адзінкі. Наш тур усё болей нагадвае мне дывэрсанцкі рэйд па акупаванай тэрыторыі.

Магілеў — горад начальнікаў. Бліжэйшае ад палаца, дзе мы мусім граць, мейсца, дзе можна пад'есьці, — гатэль «Магілеў». Там ёсьць і рэстарацыя, і кавярня. Я вырашыў, пакуль паднясуць замовы, пайсьці знайсьці прыбіральню. На адных дзьвярох — «кола», на другіх — «трохкутнік». Даволі двухсэнсоўна: калі сыходзіць з натуры, дык дамы — гэта, безумоўна, «кола», але тады чаму я — «трохкутнік»? Калі наадварот — наогул нічога не зразумела. Вырашаю, што ў такі час усё адно нікога няма, можна спраўдзіць і так. Зазіраю ў «трохкутнік» і адразу зачыняю дзьверы: тут дама. Іду ў «кола». Але гэта дакладна дамскі пакой — няма нават намёкаў на пісуар. Разгублены, выходжу на калідор, але тут з «трохкутніка» зьяўляецца тая самая дама, што мяне напалохала. Яна апранутая ў зялёны халат і гумовыя пальчаткі, значыцца, прыбіральшчыца. Уваходжу, яна за мной. Спыняюся.

— Вы адкуль?

— У якім сэньсе? — я разгублены, пачуваюся ніякавата.

— Вы з рэстарацыі?

— Так, так, безумоўна, з рэстарацыі!

— А сёньня рэстарацыя не працуе, — на твары — моц пераможцы.

— Але я толькі што замовіў сабе абед.

— Гэта не рэстарацыя. Гэта кафэ.

— Вам лепей ведаць, — ужо даволі груба адказваю я, каб хутчэй скончыць гэтую дзікаватую размову ў мужчынскай прыбіральні. Але гэта толькі кветачкі.

— Вы пісяць альбо какаць?

Я нават не пасьпеў пачырванець, як адказаў: «Пісяць».

— Ну, дык ідзіце, я глядзець ня буду, мне нецікава.

Нібыта пад гіпнозам, іду да пісуару. Станаўлюся сьпінаю, каб нічога не было відаць, і пачынаю сваю справу, але тут чую той самы голас, але значна бліжэй.

— Рэстарацыя не працуе, а я вось вымушаная працаваць.

Хуценька хаваю сябе ў джынсы, зашпільваю гузікі ды іду да рукамыйніка.

— А мыла няма, — чую. Ня вельмі зьдзіўляюся, але пытаюся:

— Чаму?

— Таму што рэстарацыя сёньня не працуе!

— Але ж прыбіральня працуе?!

— А я не абавязаная...

Пачынаю разумець сэнс, мыю рукі халоднай вадой бяз мыла.

Нечакана дырэктарка прыбіральні прыносіць са свайго ўласнага габінэту даволі падазроны кавалачак мыла і такі ж падазроны ручнік. Але я ўдзячны. Дасканала мыю рукі, потым выціраю ручнікам. Дастаю з кішэні ўсю дробязь, якую маю, даю дырэктарцы. Яна адмаўляецца, але ня вельмі настойліва. Іду да сяброў, напэўна, мая замова ўжо стыне.

...Наш дывэрсанцкі рэйд па акупаванае тэрыторыі завяршаецца. Апошні горад. Камандзір мясцовага партызанскага атраду (лідар вячоркаўскага фронту) сустракае нас уласнай пэрсонаю. Для шарагоўцаў — гэта канцэрт, для яго — адказнае мерапрыемства. Адчувае дыстанцыю. Усё ж такі мы — адтуль, зь «Вялікай Зямлі», ад «Юстаса». Пасьля канцэрту — імпрэза. Чым болей п'ецца гарэлкі, тым інтымнейшай робіцца атмасфэра. Маладыя «санітаркі» зь цікавасьцю пазіраюць у наш бок. Часу на тое, каб азнаёміцца з тым, як выглядае «медсанбат», няма, таму іду з камандзірам на кухню. Бачу, што яго сьвярбіць нейкае пытаньне, але ён яшчэ не дасягнуў патрэбнае кандыцыі. Пасьля

чарговага келіха гарэлкі ён сам не вытрымлівае.

— Піт, — ён глядзіць на мяне, як на маленькае дзіця, якое безнадзейна хварэе, вядома, што памрэ, і нічога зрабіць нельга.

— Піт, прабач, калі ласка, але я чытаў у нейкай газэце, што ты, прабач... (Вялікая паўза, мне ўжо бачыцца, што недзе напісалі, што я — «блакітны». Цікава, як ён на гэта зрэагуе?) Не, шчыра выбачаюся, але я чуў, што ты — рускі?!

Гэтага я не чакаў. Мы ж у Беларусі — самым лагодным і талерантным мейсцы ў сьвеце.

— А якая розьніца, ты ж ведаеш, што я раблю і як я жыву, — я нават абражаны за расейцаў.

— Дык гэта праўда?! — ягоны твар камянее.

Разумею, што тлумачыць сваю пазыцыю бессэнсоўна, таму мякка, каб не абразіць «брата па зброі», адказваю:

— Не, я не расеец. Усё сваё жыцьцё лічыў сябе беларусам, нягледзячы на сваё прозьвішча і на сваю павагу да бацькі.

У камандзірскіх вачох зьяўляецца такая колькасьць цяпла, што я амаль фізычна адчуваю, як цяплее паветра паміж намі. Пасьля моцнага паціскання далоні сьпяшаюся да «санітарак». Ім, напэўна, усё роўна, што акрамя расейскае я маю яшчэ і жыдоўскую, і нямецкую кроў. Можа, яны пасьпеюць падлекаваць маю душу?»

# ТЭКСТЫ

## Мроя

## 1981—1986

### Настальгія

*Калі пагасьне сьвет ліхтарны*
*І ноч размые колер фарбаў,*
*Адчуеш ты і боль, і смутак,*
*Ды не пытай сябе: «Чаму так?»...*

Рэфрэн:
*Настальгія — няма зноў спакою*
*Па зямлі той, што стала ўжо мрояй,*
*Дзе жыве памяць продкаў і мова.*
*Толькі горыч... Толькі горыч...*

*З прычын якіх жыцьця абставін*
*У роднай хаце госьцем стаў ты,*
*На абразах прарок маны,*
*І твой гадзіньнік рух спыніў?..*

Рэфрэн.

*У вопратцы абагульненьняў*
*Ты існуеш, але дарэмна*
*Згаджацца зь цемрай гэтай ночы,*
*Бо ранак прыйдзе...*
*Ранак прыйдзе.*

## Не згубі!

*Мару сваю сярод шэрых аблокаў,*
*Сярод чужых твараў, далоняў,*
*Блытаніны шляхоў, нават і ў забыцьці*
*Не згубі, не згубі, не згубі!!!*

*Памяць, што нам засталася ад продкаў,*
*І голас зямлі сваёй роднай*
*На стракатых палях незнаёмай зямлі*
*Не згубі, не згубі, не згубі!!!*

Рэфрэн:
*У шчасьці і ў бядзе,*
*Ад Радзімы далёка,*
*На чужых дарогах*
*Не згубі сябе,*
*Не згубі сябе,*
*Не згубі сябе!!!*

*Надзея ў цемры дарогу асьвятліць,*
*Яе не пагасіць ветрам,*
*І калі ты надзею нарэшце здабыў,*
*Не згубі, не згубі, не згубі!!!*

*Мову сваю ў бясконцых вандроўках*
*Сярод міліёнаў крокаў*
*На пыльных гасьцінцах далёкай зямлі*
*Не згубі, не згубі, не згубі!!!*

Рэфрэн.

## Чужы горад

*Халодная зямля, засьнежаны вакзал.*
*Тут цеплыні няма ў сэрцы і ў душы.*
*Здаецца, што ўлетку хапае ўсім цяпла,*
*Але ня здолеў з вас ніхто яго зімою зьберагчы.*

Рэфрэн:
*Як хацеў я знайсьці цеплыні, каб хоць рукі пагрэць!*
*І я бег без дарогі адсюль, прэч ад горада, прэч.*
*Але брамы зачынены, трапіў я раптам у палон.*
*Я на плошчу выходжу, шурпатую, нібы далонь.*

*Гук цягніка ўначы, нібы ўздых гаротны,*
*Пануе холад злы, адзіны гаспадар.*
*У цёмным небе зоркі ня бачу я ніводнай,*
*І нават маладзік схаваўся сярод хмар.*

Рэфрэн.

*А ў горадзе маім усё зусім ня так.*
*Там кожны сябар мой, там кожны мне ўсьміхнецца.*
*Няма ўсьмешак тут на тварах, у вачах,*
*Замерзьлі вокны, твары, сэрцы...*

Рэфрэн.

## **Бэльвэдэр**
(сл. С. Сокалаў-Воюш)

*Знаёмы новы да мяне*
*Прыходзіць кожны дзень.*
*Ад раньня бачу я ў вакне*
*Ягоны чорны цень.*

*Ужо пасьпеў маім сябрам*
*Абрыдзець гэты тып —*
*Аматар танных жорсткіх драм,*
*Ён да мяне прыліп.*

Рэфрэн:
*Яго*
*Ня зьнішчыць скразьняком*
*І словам не забіць.*
*Калі б,*
*Калі б я быў чараўніком,*
*Я б ведаў, што рабіць...*

*Ён мае дом шыкоўны свой*
*На тысячу кватэр.*
*І плюс яшчэ адзін пакой*
*Складае бэльвэдэр.*

*Той бэльвэдэр здалёк відзён,*
*Ды так, што будзь здароў!*
*Ён — візытоўка нашых дзён*
*На мапах у сяброў.*

Рэфрэн.

*Пакуль зямля ляжыць у сьне*
*І цёмна на двары,*
*Пакуль няма яго ў вакне*
*І сьпяць мае сябры,*

*Я нашаптаў бы сто замоў*
*І тысячай сякер*
*На даху кожнага з дамоў*
*Узьвёў бы бэльвэдэр.*

Рэфрэн.

## Мая мяжа

*Упарта ўперад бег мой шлях,*
*Я шмат чаго зрабіць жадаў,*
*Адкуль зьявілася яна — мая мяжа?*
*І больш мне ў неба не ўзьляцець*
*І не зрабіць чаго хацеў...*
*Такога лёсу для сябе я не чакаў.*

Рэфрэн:
*Мая мяжа*
*Узьнялася доўгаю сьцяною на шляху.*
*Які жах!*
*Ніколі я згадзіцца з гэтым не змагу.*
*І для таго,*

*Жыцьцю і руху каб майму перашкаджаць,*
*Стаіць яна —*
*Не разбурыць, не абысьці, —*
*Мая мяжа.*

*Няма ні сонца, ні жыцьця,*
*Абмежаваны стаў мой шлях,*
*Сябры мяне ня чуюць, голас мой ахрып.*
*Мой шлях — зачараваны круг.*
*Сьмяецца лёс, спыніўся рух.*
*Калі б я мог мяжу як-небудзь разбурыць!*

Рэфрэн.

*Але, здаецца, выйсьце ёсьць,*
*Хоць праціная змрок наскрозь,*
*Здаецца, што адказ я ўсё ж такі знайшоў!*
*Патрэбны моцны мне рывок!*
*Зрабіў я крок, яшчэ раз крок*
*І неўзабаве апынуўся за мяжой.*

Рэфрэн:
*Мая мяжа*
*Стаяла на шляху маім, як той міраж.*
*Ня ведаў я,*
*Што доўгія гады я сам яе стварав.*
*Як часта мы*
*Самі абмяжоўваем сябе!*
*Няма мяжы,*
*Якую ты ня здужыш і не разаб'еш.*

## Белы сьцяг

*У сьвятле халодным*
*Зіхаціць рака.*
*Я ў жыцьці даволі*
*Бедаў напаткаў.*

*Подых злога лёсу*
*Твар мой апаліў,*
*Ды ня страціў моц я,*
*Мэту не згубіў.*

Рэфрэн:
*Белы сьцяг*
*Не ўратуе.*
*Белы сьцяг —*
*Ганьба штодня.*
*Белы сьцяг*
*Не падыму я.*
*Белы сьцяг —*
*Слабых штандар.*

*Бачыў сьмех і сьлёзы,*
*Цемру і сьвятло.*
*І змагаўся зь лёсам,*
*Колькі сіл было.*

*Падаў у сутоньні*
*Мокры шэры сьнег.*
*Не зважаў на стому я*
*І на крыўдны сьмех.*

Рэфрэн.

*Ні ўсьмешкі злыя,*
*Ні варожы сьмех*
*Рух ужо ня спыняць,*
*Мой ня зьменяць сьвет.*

*Ведаю адно я:*
*У гэтай барацьбе*
*Пераможа той, хто*
*Верны быў сабе.*

Рэфрэн.

## 1987—1990

### Вайна

*Мы рушым на захад, мы крочым на ўсход,*
*Куды загадаюць нам.*
*Халодным паглядам сталёвых вачэй*
*У твары глядзіць вайна.*

*Ззаду вагонь, уперадзе дым,*
*Абвугленая вясна.*
*Мы крочым няспынна, напрамак адзін.*
*Напрамак адзін — вайна.*

*Пануе над выпаленай зямлёй,*
*Цісьнецца ў думкі і сны.*
*Халодны бязьлітасны мэханізм,*
*Тупая машына вайны.*

*Яна падначальвае нас сабе,*
*Душы нішчыць яна.*
*Наш боль, наша роспач, наш жах — няўзнак:*
*Тут гаспадарыць вайна.*

Рэфрэн:
*Паслухай, брат, мне б азірнуцца,*
*Убачыць знаёмыя вочы.*
*Я ведаю, брат,*
*Нам не вярнуцца з гэтае ночы.*

*Мне мая зброя рукі пячэ,*
*Я б кінуў яе і пракляў.*
*Але ў жаўнера на кожнай вайне*
*Ёсьць абавязак страляць.*

*Ёсьць абавязак страляць у людзей,*
*І гэты закон не зьмяніць.*
*І ёсьць у нас права, права на сьмерць*
*У сьнезе, гразі ці ў вагні.*

Рэфрэн.

## Паляваньне на вядзьмарак

*Сёньня мэта апраўдвае сродкі,*
*Дык сьцеражыся, вар'ят.*
*Ты сабе незалежнасьць дазволіў,*
*Мы сабе дазваляем гвалт.*

Рэфрэн:
*Паляваньне на вядзьмарак!*
*Паляваньне на вядзьмарак!*
*Паляваньне на вядзьмарак!*
*Паляваньне...*

*Мы ня здольны спакойна ўспрымаць*
*Думкі твае і выгляд.*
*Час прыйшоў, і сёньня наш дзень,*
*Мы прынялі твой выклік.*

Рэфрэн.

*Уздымем нашыя лёзунгі ў неба,*
*Нас апраўдаюць законы.*
*Сёньня суд над непатрэбнымі,*
*Мы не кранаем спакойных.*

Рэфрэн.

## Хто верне?

*Можна скласьці жалосны рэквіем і апрануцца ў чорнае.*
*Ды жыцьцё абарванае стрэлам,*
*Хто верне? Хто верне?*

*Можна не турбаваць сумленьня і ўсё сьпісаць на час.*
*Але згвалтаваную веру*
*Хто верне? Хто верне?*

*Белае сонца лунае над горадам,*
*Чырвань фіранак.*

*Дзень сустракаю белым позіркам*
*У шэры бязглузды ранак.*

*Можна забыцца на крыкі птушак,*
*Можна прыняць дасканаласьць кратаў.*
*Можна забыцца на крыкі птушак,*
*Нельга прыняць дасканаласьць кратаў.*

*Казалі, што шлях вядзе да сьвятла,*
*А шлях замкнуўся ў кола.*
*Мы паверылі ў рай на зямлі,*
*Ды зведалі лютасьць законаў.*

*Мы самі сабе сапсавалі зрок,*
*Паверыўшы ў новага бога.*
*Мы ўспрымалі словы прамоў,*
*Ды былі глухія да стогнаў.*

*Адчынены дзьверы, ды я ня чую*
*Словаў і галасоў.*
*Час вяртае толькі імёны ў рэквіем*
*Газэтных радкоў.*

## Белая вежа

*Белая вежа — мур перамог,*
*Край і пачатак вечных дарог.*
*Белая вежа — страты і боль,*
*Ты і ў бядзе засталася сабой.*

*Белая вежа як запавет,*
*Даўніх вякоў незаглушаны шэпт.*
*Белая вежа, хай не настане*
*Дзень твайго скону ды руйнаваньня.*

*Белая вежа — мур нашай веры,*
*Не пахіснуць цябе здрады і ветры.*
*Белая вежа — прэч стары боль,*
*Золак разгорне свой сьцяг над табой.*

## Горад

*Думкі закавалі ў асфальт*
*Надзейна.*
*Думкі закавалі ў асфальт.*

*Слухайце кантаты сірэн,*
*Балдзейце.*
*Слухайце кантаты сірэн.*

*Горад! Горад! Горад!*
*Горад! Горад! Горад!*

*Гвалт люмінесцэнтных залеў*
*Так звыклы.*
*Гвалт люмінесцэнтных залеў.*

*Зьдзеклівыя твары вітрын*
*Як выклік.*
*Зьдзеклівыя твары вітрын.*

*Горад! Горад! Горад!*
*Горад! Горад! Горад!*

*Чэргі за чырвоным вінам.*
*Хто крайні?*
*Чэргі за чырвоным вінам.*

*Вас задавальняе жыцьцё —*
*Бог з вамі.*

*«У сувязі з правядзеньнем сьвята гораду*
*рух транспарту па Ленінскім прашпэкце забаронены».*

## Зондэркаманда

*Вачамі б'юць, як салдаты з гарматы.*
*Не трапляй пад прыцэл, небарака.*

*Твар усьміхаецца губной памадай,*
*Нават слова пад слоем лаку.*

*Яе мужчыны маюць машыны,*
*А ў цябе ні граша за душой.*
*Яе цікавіць усё, што зараз модна,*
*Яна б магла пайсьці з табой.*

Рэфрэн:
*Зондэркаманда — армія любові.*
*Зондэркаманда — служба ўначы.*
*Зондэркаманда — жалезная лёгіка.*
*Зондэркаманда — зграя жанчын.*

*Ёй падабаюцца іншаземцы,*
*Яна ўсім целам змагаецца за мір.*
*Yamaha, Black Horse, Winston, Seyko —*
*Яна не заблытаецца ў назвах фірм.*

*Яна штодня пры поўным узбраеньні,*
*Усё што трэба, знаходзіцца пры ёй.*
*У яе вачох зьяўляецца натхненьне,*
*Калі апускаецца ноч над зямлёй.*

Рэфрэн.

## Званы

*Ты жадаў салодкіх сноў,*
*Ты хаваўся ад залеў*
*У хаце, дзе шыкоўны стол*
*І гарэлка на стале.*

Рэфрэн:
*Калі гукам трывожным разбураны сны,*
*Запытайся ў ветра, па кім б'юць званы,*
*Званы.*
*Ведай, ён не змаўчыць,*

*Ён адкажа ў журбе:*
*«Не хвалюйся, званы плачуць не па табе».*

*Ты імкнуўся зноў і зноў*
*Быць заўсёды ні пры чым.*
*І калі чакалі слоў,*
*Ты казаў сабе: «Маўчы!»*

Рэфрэн.

*Хоць у гэты белы сьвет*
*Ты дабра не прынясеш,*
*Добра ведаем мы ўсе,*
*Што ты нас перажывеш.*

Рэфрэн.

## Пераможцы

*Мы гулялі ў вайну кожны дзень са сьвітанку,*
*Мы стралялі з драўляных гарматаў па шклянках.*
*Мы давалі сабе ўзнагароды і званьні,*
*Не было ў сьвеце тых, хто цягацца мог з намі.*

*Пераможцы! Пераможцы! Пераможцы!*

*Мы зьмянілі цукеркі на цыгарэты,*
*Мы забылі панамы, надзеўшы берэты.*
*Толькі болей сабе мы ўжо не належым,*
*Ад кагось ды чагосьці пачуўшы залежнасьць.*

*Пераможцы! Пераможцы! Пераможцы!*

*І паўзком па гразі кожны дзень са сьвітанку*
*Нас раўняюць зь зямлёй кулямёты і танкі.*
*Пасьмяротна ідуць ўзнагароды і званьні,*
*Тут услодыч вайна нагулялася з намі.*

*Пераможцы! Мы! Пераможцы! Мы! Пераможцы! Мы!*

## Дызэнтэрыя

*У гэтым горадзе ўдосталь бруду,*
*Тут гніе і сьмярдзіць паветра.*
*І, нібыта закляты, паўсюдна*
*Я шукаю чыстага ветру.*

*Ды ня вырвацца з-пад абцасаў*
*Маналітных іржавых дамоў,*
*А калі застаесься сам-насам,*
*Усё зьнікае, ды хтосьці вяртае наноў,*
*Вяртае наноў.*

*«Тут усё чыста», — крычаць людзі з вокнаў,*
*І працягваюць рукі ў крывавых пацёках.*
*Тут усё чыста, ды я не абдзелены зрокам.*
*Ды чамусьці я пацiскаю руку, тую, што ў крывавых пацёках.*

*На твары маім прачытаўшы згубу,*
*Хтосьці ўжо прапануе выйсьце.*
*У гэтым горадзе надта брудна*
*Для таго, каб застацца чыстым.*

*У гэтым горадзе ўсе не сьвятыя,*
*Але штосьці павінна яднаць.*
*Мы раўня перад дызэнтэрыяй,*
*Мы адзіны ў жаданьні не заўважаць.*
*Не заўважаць.*

*«Тут усё чыста», — крычаць людзі ў шэрым,*
*І я ў захапленьні ад ладнага хору.*
*«Тут усё чыста», — крычу і ўжо веру.*

*Тут усё чыста, тут усё чыста.*

## Манэтны двор

*Што мне захад і што мне ўсход,*
*Што мне фунты і сьцерлінгі.*

*Гераічны савецкі народ —*
*Не прадажная сьцерва.*

*Я раблю на манэтным двары,*
*Як і ўсе, сваю працу люблю.*
*Відавочцам вялікіх падзей*
*Я гатовы раздаць па рублю.*

*Мой канвеер ня спыніць свой рух,*
*Ну а хто не захоча рублёў,*
*Каб ня ўпаў рэвалюцыі дух,*
*Я адсыплю таму мэдалёў.*

*Не шкада мне каштоўных мэталаў,*
*Зьнікні прэч, дэвальвацыя!*
*Мэдалёў наштампуем звыш пляну,*
*Хай замежжа зьдзіўляецца.*

## Амбіцыі

*Прагнуць прызнаньня шматлікія геніі,*
*Карлікі лічаць сябе гігантамі.*
*Валацуга крычыць: «На калені!» —*
*Ён сябе бачыць вялікім магнатам.*
*Надрываюцца лаўрэаты,*
*Цягнуць у неба свае дыпломы.*
*Мастак-дальтонік лаецца матам:*
*Ён хоча быць сусьветна вядомым.*

*Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі.*

*Стары альфонс крычыць пра каханьне*
*І прэтэндуе на ролю знаўцы.*
*Паэты змаганьне вядуць за званьні,*
*Цягнуць да мэты дрыжачыя пальцы.*

*Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі.*

*Сотні ратоў, скрыўленых крыкам,*
*Сотні вачэй, сотні ілюзій.*
*Пнуцца, крычаць, лаюцца брыдка*
*Хворыя маніяй велічы людзі.*
*Кожны мецъ зубы вострыя хоча,*
*Зубы — гэта надзейная зброя.*
*Божа, ня дай напаткаць мне ўночы*
*Гэтай вайны героя́ў.*

*Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі. Амбіцыі.*

## Усё напалову

*Напалову ты сьвяты,*
*Напалову грэшны ты.*
*Напалову белы брат,*
*Напалову чорны кат.*

*Напалову жыў,*
*Напалову ўмёр,*
*Напалову сьмех,*
*Напалову жах.*
*Напалову ты — генерал-маёр,*
*Напалову ты — малодшы сяржант.*

Рэфрэн:
*Усё напалову ў тваім жыцьці,*
*Усё напалову — паглядзі.*
*Усё напалову ў тваім жыцьці,*
*Усё напалову.*

*Па калена ў дрыгве*
*І з дрыгвою ў галаве.*
*Ты запальваў свой вагонь*
*Ды хутчэй гасіў яго.*

*Напалову жыў,*
*Напалову ўмёр.*
*Праваруч вясна,*

*Леваруч вайна.*
*Напалову ты ля высокіх зор,*
*Напалову ты ля самага дна.*

Рэфрэн.

*Напалову ты сьвяты,*
*Напалову грэшны ты.*
*Напалову белы брат,*
*Напалову чорны кат.*
*Па калена ў дрыгве*
*І з дрыгвою ў галаве.*
*Ты запальваў свой вагонь*
*Ды хутчэй гасіў яго.*

Рэфрэн.

## 28-Я ЗОРКА

*Нетрывалыя лёзунгі трывалых сістэм*
*І атрутныя фарбы сацыяльных праблем*
*Рэжуць вушы, рэжуць вочы.*

*Як ахвота крычаць, хоць і лепей маўчаць,*
*Ды ніхто, безумоўна, ня будзе пытаць,*
*Што ты мусіш, што ты хочаш.*

Рэфрэн:
*28-я зорка ўпала з нябёсаў.*
*Восень, восень, панове,*
*Халодная восень.*

*Чорна-белыя вочы, каляровыя сны,*
*Неспакойныя ночы, набліжэньне вайны*
*Адчувае кожны трэці.*

*Кожны трэці стаіць у чарзе па віно,*
*Каб была спакайнейшай наступная ноч,*
*Каб суцішыць грукат сэрца.*

Рэфрэн.

*Не хадзі ў гэты горад, вандроўны манах,*
*Не тлумач, што ёсьць праўда і што ёсьць мана,*
*Тут ня любяць гэтых справаў.*

*Не пачуюць у горадзе слова твае,*
*Закрычыць табе ўсьлед звар'яцелы маёр:*
*«Успышка зьлева! Успышка справа!»*

Рэфрэн.

*Іранічныя словы, абыякавы сьмех,*
*Недалёка ляжыць пазалеташні сьнег —*
*Падарунак вашым дзецям.*

*Цёмны горад ня зможа мне дапамагчы,*
*Але ўсё ж такі ў гэтай бясконцай начы*
*Нешта сьвеціць, нешта сьвеціць.*

Рэфрэн.

### Мама-мафія

*Цякуць у рукі тавараў рэкі,*
*Квітнее сёньня айчынны рэкет.*

Рэфрэн:
*Мама-мама-мафія, ма-ма-ма-мафія,*
*Мама-мама-мафія, ма-ма-ма-мафія.*

*Пажартаваць я вялікі майстар,*
*Заўжды са мною трафейны «шмайсар».*

Рэфрэн.

*Ня бойся, Пецся, нас не засудзяць,*
*Бо ёсьць наверсе й нашы людзі.*

Рэфрэн.

*Хадзем да бабкі, возьмем банку,*
*Ляжаць у банку нашыя бабкі.*

Рэфрэн.

*Купляйце морфій, гашыш купляйце,*
*Расьці, расьці, маё багацьце.*

Рэфрэн.

*У нашым бары кабет хапае,*
*Каго захочам, таго кахаем.*

Рэфрэн.

*Каапэратар мае грошы,*
*Я за яго нічым ня горшы.*

Рэфрэн.

## Шмат

*Шмат вякоў цэрквы будавалі,*
*Шмат вякоў продкаў шанавалі,*
*А цяпер брудна лаемся.*

*Шмат ідэй новых, прагрэсіўных,*
*Шмат людзей ім аддала сілы,*
*А цяпер болей сіл няма.*

*Шмат тамоў у навукі нашай,*
*Шмат галоў на навуку паша,*
*А паўсюль — радыяцыя.*

*Шмат зямлі — кожнаму хапае,*
*Хлеба шмат на палях зьбіраем*
*Для краін слабаразьвітых.*

*Шмат гадоў музыка іграе,*
*Шмат людзей хорам падпявае,*
*А Ільіч усьміхаецца.*

*Шмат сясьцёр у сям'і адзінай,*
*Шмат бацькоў у маёй Радзімы.*
*Шмат бацькоў — безбацькоўшчына.*

## Кастрычніцкі цягнік

*У старым запэцканым вагоне*
*Поўзаюць па сьценах павукі.*
*Па падлозе ў прывідным сутоньні*
*Тоўстыя гуляюць пацукі.*

Рэфрэн:
*Кастрычніцкі цягнік,*
*Цягні сябе, цягні,*
*Кастрычніцкі цягнік.*

*Ляскае, грыміць цягнік іржавы,*
*Па цямрэчы восеньскай бяжыць.*
*Па гнілых паліцах скачуць жабы,*
*А па столі поўзаюць смаўжы.*

Рэфрэн.

*Восень над вагонамі віруе,*
*Б'е у шыбу зморшчаным лістом.*
*Машыніст упэўнена кіруе,*
*Графік не парушыць нізашто.*

Рэфрэн.

## Аўстралійская полька

*Неяк сябры мне ў кавярні сказалі:*
*— Што ты сядзіш тут пануры такі?*

*Лепей паехалі з намі ў Аўстралію,*
*Там нас чакаюць даўно землякі.*

*Там зіхаценьне каралавых рыфаў,*
*Там залаты акіянскі прыбой.*
*А тут табе што? Толькі цёплае піва*
*І дама, якая пакуль што з табой.*

*Сэрца нам параніла*
*Сьветлая Аўстралія!*

*Там беларусаў вельмі багата,*
*Хоць у гасьцёх ты гадамі сядзі.*
*Там валацугі ня лаюцца матам,*
*Там нарадзілася AC/DC.*

*Там кенгуру ёсьць і качкадзюбы,*
*Ты ж іх ня бачыў ніколі жыўцом.*
*А тут радыяцыя вынішчае нацыю,*
*Не ўратавацца чырвоным вінцом.*

*Едзем у Аўстралію,*
*Гэта будзе правільна!*

*Я цэлы тыдзень цёгаўся ў трансе,*
*Рукі і ногі дрыжалі ў мяне.*
*І ўжо зусім на чужыну сабраўся,*
*Толькі рашуча сказаў сабе: «Не».*

*Я патрыёт, я правёў іх на станцыю,*
*Я ім сказаў: «Хай я хутка памру,*
*Толькі, панове, свая радыяцыя*
*Мне даражэй за чужых кенгуру».*

## Апошні інспэктар

*Пахне горкім палынам п'янное віно.*
*Пахне цьвільлю балотнай учорашні хлеб.*

*Пахнуць кветкі ў полі мінулай вайной.*
*Пахне новым расстаньнем мой прывідны сьлед.*

*Я стамлюся ад доўгіх і нудных размоў.*
*Я пайду у той бок, дзе скончаецца дзень.*
*І сьляпыя вачніцы забытых дамоў,*
*Як заўжды, расстраляюць мой прывідны цень.*

Рэфрэн:
*Дай мне шанц на вяртаньне, апошні інспэктар!*
*Дай мне шанц на вяртаньне.*
*Дай мне шанц на вяртаньне, апошні інспэктар.*
*Дай!*

*Я ішоў і ня бачыў, куды я іду.*
*І мяне сустракалі крывыя слупы.*
*Я з калюжынаў піў дажджавую ваду.*
*Я хапаўся за дрэвы, глухі і сьляпы.*

Рэфрэн.

## Зямля

*Вось мая зямля пад нагой бяжыць.*
*Вось мая зямля ў сьнягох ляжыць,*
*Закаваная лютым холадам,*
*Падуладная чужым волатам.*

*Вось мая зямля запаветная,*
*Занядбаная, непрыкметная.*
*Хоць багатая на малітвы,*
*А крывёю шчодра палітая.*

*А сыны яе незьлічоныя —*
*Бесклапотныя, нехрышчоныя.*
*Не турбуюцца, не хвалююцца,*
*Толькі піць ды спаць не лянуюцца.*

*Як пачнеш сьпяваць — не абудзяцца.*
*Як пачнеш крычаць — не дачуюцца.*
*А спытаеш піць — не дадуць вады,*
*А захочаш бегчы — няма куды.*

*Я іду наперад па ўзбочыне,*
*Я пяю свае песьні змрочныя.*
*А зямля мая пад нагой бяжыць,*
*А зямля мая ў сьнягох ляжыць.*

## 1991—1994

### Рок са мною

*Ранішняе сонейка сагрэла зямлю,*
*Людзі абудзіліся, і я ўжо ня сплю.*
*Выйду я на вуліцу, сябе пакажу,*
*Выйду я на вуліцу, людзей пагляджу.*

*Толькі мне чамусьці ў гэтым сьвеце цесна,*
*Іду я па бульвары, сьпяваю сваю песьню.*

*Дужыя рабочыя будуюць дамы.*
*Мудрыя пісьменьнікі друкуюць тамы.*
*Мужныя вайскоўцы абавязак нясуць.*
*Пільныя кіроўцы пасажыраў вязуць.*

*Толькі мне чамусьці ў гэтым сьвеце цесна,*
*Іду я па бульвары, сьпяваю сваю песьню.*

*Рок са мною, рок, са мною рок.*
*Рок са мною, рок, са мною рок.*

*Гаспадыні хатнія гатуюць абед.*
*Мастакі выдатныя малююць кабет.*
*Піянеры юныя зьбіраюць мэтал.*
*Журналісты шчырыя здаюць матар'ял.*

*Толькі мне чамусьці ў гэтым сьвеце цесна,*
*Іду я па бульвары, сьпяваю сваю песьню.*

*Скончыўся рабочы дзень, і вечар прыйшоў,*
*Сьвеціцца рэкляма, запрашае на шоў.*
*Шчодрыя бармэны наліваюць каньяк.*
*Дружныя дружыньнікі працуюць за так.*

*Толькі мне чамусьці ў гэтым сьвеце цесна,*
*Іду я па бульвары, сьпяваю сваю песьню.*

*Рок са мною, рок, рок, рок, са мною рок,*
*Рок са мною, рок, рок, рок, са мною рок.*

*Ціха стала ў горадзе, ноч надыйшла.*
*Тупа манекены пазіраюць з-за шкла.*
*Заўтра будзе дзень, і ўсё паўторыцца зноў,*
*А другой гадзіне я вярнуўся дамоў.*

*Два рабочых на пагорку*
*Паляць мокрую махорку,*
*Паляць мокрую махру,*
*Чык-чырык, ля-ля, хру-хру.*

### Краіна крывавых дажджоў

*Дзьве пары маіх шкарпэтак*
*Сохнуць на батарэі,*
*Шэрыя майскія будні*
*Робяць уражаньне сьвята.*

*Тупат начышчаных ботаў*
*Па гарадзкіх галеях.*
*Крок за крокам няспынна*
*Будуецца помнік часу.*

*Рэшткі магільных крыжоў*
*Маюць права на існаваньне.*

*Дзетак вучаць, як трэба*
*Жыць у забруджанай зоне.*

*Месяц халодным сьвятлом*
*Шчодра нам сьвеціць уночы,*
*Мы аўтаматам гаворым*
*«Дзякуй» на разьвітаньне.*

Рэфрэн:
*Краіна крывавых дажджоў*
*Зьбірае свой ураджай.*
*Краіна крывавых дажджоў*
*Высока нясе свой сьцяг.*

*Зьзяюць сваёй чысьцінёю*
*Платныя прыбіральні.*
*Крамы мінулых стагодзьдзяў*
*Зьзяюць дзіркаю чорнай.*

*Вуліцы, поўныя сьмецьця,*
*Моўчкі сьмяюцца над намі.*
*Нам няма дзе падзецца*
*Ад надакучлівых думак.*

*Час ня любіць спазьненьняў.*
*Вера сьцерпіць і зьдзекі.*
*Пад мажорныя гукі маршаў*
*Таньчаць кабеты.*

*Хутка зьнікаюць крывавыя пляміны*
*У тых, хто пераможа.*
*Каб пачаць разбурэньне,*
*Патрэбна толькі каманда.*

Рэфрэн.

## Я Ў ЛЕСЕ ЯГАДЫ ЗЬБІРАЎ

*Я ў лесе ягады зьбіраў,*
*А знайшоў цыстэрну з брагаю.*
*Я і ня ведаю, хто яе схаваў.*
*Што было рабіць са смагаю?*

*Я адразу наліў сабе ў бідон.*
*Хай я выпіў — няма маёй віны.*
*Потым пачалося — ява ці сон,*
*Хвастатыя русалкі лезуць у штаны.*

*Эх, нягода, ягада,*
*Там, дзе брага, — там бяда.*
*Эх, нягода, ягада,*
*Там, дзе брага, — там бяда.*

*Ну, паганкі, я вам пакажу,*
*Я ў цыстэрну ўсіх вас пасаджу.*
*Раптам зьявіўся аднекуль лясун*
*І пачаў вяршыць над намі суд.*

*«Хто пасьмеў у маім лесе піць,*
*Хто дазволіў распусту і пікнік?»*
*А я іх усіх да чорта паслаў,*
*Вось я як аднойчы ягады зьбіраў.*

*Эх, нягоды, ягады,*
*Поўна брагі, як вады,*
*Эх, нягоды, ягады,*
*Поўна брагі, як вады.*

## ПРАДЧУВАНЬНЕ КРЫВІ

*Цемра сыйшла на зямлю ціхімі крокамі,*
*І ня чутна званоў, і ня бачна званьніц.*
*Месяц чырвоны ўзыйшоў над прыціхлай краінаю,*
*Ды крычаць крумкачы ў прадчуваньні крыві.*

*Воблака пылу ўзьнялося да зор,*
*Чорнае войска нібы акіян.*
*Коней чырвоных не пералічыць,*
*Пад капытамі грукоча зямля.*
*Змрочныя вершнікі князя-начы,*
*Іх набліжэньне чуваць за сто вёрст.*
*Крыкі і стогны ня чуе ніхто,*
*Льецца ў зрэнках пякельны агонь.*

*Божа, выслухай нас, дай нам надзею,*
*Што зьменіцца сьвет, што зьменімся мы.*
*Божа, ты можаш усё, будзь да нас літасьцівы,*
*Пашкадуй здарожаных і грахі адпусьці.*

## Гуляй, душа

*Тыя, што верай і праўдай служылі і служаць,*
*Тыя, што дзеляць людзей на праслойкі і клясы,*
*Дораць галодным ільвам папяровыя ружы,*
*Дораць прыгожым жанчынам крывавае мяса.*

*Дамы ня любяць спазьненьні, чаканьні і чэргі,*
*Ім усё роўна якія — абы падарункі.*
*Дам па дарозе дамоў сустракаюць паэты,*
*Вершы крычаць і цалуюць жаночыя рукі.*

Рэфрэн:
*Гуляй, душа, гуляй,*
*Хоць тут зусім ня рай.*
*Але, прынамсі, родны край.*
*Гуляй, гуляй, душа,*
*Звіні, струна, у вушах,*
*Пляваць, што ходзім без граша.*

*Музы паэтаў прысыпаны леташнім сьнегам.*
*Што тут паробіш, калі ні каханьня, ні грошай.*
*Месца жыхарства паэтаў — вялізарны сьметнік.*
*Гэта пачатак любой біяграфіі творчай.*

*Выйдзі на вуліцу і адчувай, як паветра*
*Мокрым халодным нажом паласуе па венах.*
*Выйдзі на вуліцы, выйдзі ў каменныя нетры*
*І назірай, як нудота сьцякае па сьценах.*

Рэфрэн.

*Прэса надсадна крычыць: «Што з краінаю будзе?!»*
*А над праспектам вісяць хмарачосы з плястмасы.*
*З вокнаў на горад глядзяць працавітыя людзі,*
*Што падзяляюць усіх на праслойкі і клясы.*

Рэфрэн.

## Марш гопніка

*Учора я выпіў віна,*
*Учора я быў выхадны.*
*Нас было сем пацаноў,*
*Бац, глядзім, два хіпаны.*

*Мой раён, я тут жыву.*
*Гадам я ходу ня дам.*
*Гэта вам не Люксэмбург,*
*Гэта вам не Амстэрдам.*

Рэфрэн:
*Ачысьцім наш горад ад бруду!*
*Я першы ім морды біць буду!*

*Толькі раз ляснуць пасьпеў,*
*Ды менты сталі вязаць.*
*Ты чаго вяжаш мяне?*
*Гэта іх трэба саджаць!*

*Валасы ў іх да плячэй,*
*Ім усё «мэтал» давай.*
*Ганьбяць наш горад-герой,*
*Колькі ўжо можна трываць.*

Рэфрэн.

*Я ня рокер і ня панк,*
*Я не нацыяналіст.*
*Я савецкі чалавек,*
*Малады спэцыяліст.*

*Лай-лай-лай фэлічыта,*
*Лай-лай-лай.*
*Лай-лай-лай ласкавы май,*
*Лай-лай-лай.*
*Лай-лай-лай асеньні букет,*
*Лай-лай-лай.*
*Лай-лай-лай сіні туман.*

Рэфрэн.

## Біяполе

*Маё біяполе — кожнаму воля,*
*На ім штодня адзначаюць вясельле.*
*На ім расьце экзатычнае зельле,*
*Над ім уначы зьяўляецца прывід.*

Рэфрэн:
*Біяполе, бія-біяполе, поле.*
*Біяполе, бія-біяполе, поле.*
*Маё біяполе — мая біясфэра,*
*Маё біяполе — новая эра.*

*Маё біяполе — замкнёнае кола.*
*На ім растуць чырвоныя ружы.*
*Яно занесена сьнегам і сьцюжай,*
*Яно чакае свайго пакараньня.*

Рэфрэн.

*Ці боль, ці дабро маё біяполе,*
*На полі варожым мой розум і сэрца.*

*Маё біяполе ратуе ад сьмерці.*
*За ім іншаземцы ўпэўнена сочаць.*

Рэфрэн.

## Я на сямі вятрах

*Я на сямі вятрах, я толькі сьпяваю.*
*Я на сямі шляхах, я волі ня маю.*
*Мне не знайсьці свой дом, не знайсьці сабе прытулку.*
*Ты не глядзі мне ўсьлед...*

*Я над зямлёй лячу, ўсім незразумелы.*
*Я на зямлю гляджу, на сьнег чорна-белы.*
*Мёртвыя гарады, неабсяжныя прасторы.*
*Вечна няшчасны край...*

*Сем чорна-белых хмар, хто мне дапаможа?*
*Сем каляровых мар, іх зьдзейсьніць няможна.*
*Мне на зямлі ня жыць, на зямлю няма вяртаньня.*
*Не даляцець да зор...*

*Я на сямі вятрах, я толькі сьпяваю.*
*Я на сямі шляхах, я волі ня маю.*
*Мне не знайсьці свой дом, не знайсьці сабе прытулку.*
*Ты не глядзі мне ўсьлед...*

## Крык

*Я чуў праз крохкую шыбу*
*Крокі тых, хто ішоў на працу.*
*Крокі тых, хто ішоў у краму,*
*Крокі тых, хто ішоў дамоў.*

*Я чуў празь сьцены з паперы*
*Галасы мужчын нецьвярозых,*
*Галасы кабет раздражнёных,*
*Галасы знэрваваных дзяцей.*

*Я чуў праз кардонную столю*
*Стук цяжкіх дажджавых кропляў,*
*Шолах крылаў вільготных птушак,*
*Самалётны узьлётны сьпеў.*

*Я чуў праз гнілую падлогу*
*Мэтрабудаўцаў нудную песьню,*
*Мышэй асьцярожныя крокі,*
*Цяжкія ўздыхі зямлі.*

*І тады я заціснуў вушы,*
*Але чуў праз свае далоні*
*Скавытаньне халоднага ветру*
*І бразгат пабітага шкла.*

*І растварыўся ў прасторы,*
*У бразгаце, шолаху, стуку,*
*Сярод мільёнаў гукаў*
*Мой надарваны крык.*

## Свабода

*Бледны і гарбаты, заўтра прыйдзе новы дзень,*
*Праваднік надзей сьляпых.*
*Дзьверы, сьцены, краты стрымліваюць шмат людзей,*
*Непрыкметных і крутых.*

Рэфрэн:
*Твая штодзённая работа —*
*Капай, насі, будуй, ламай.*
*Сядзіш у пекле, а зьбіраесься ў рай.*
*Свабоды жадаеш ты, нібы маньяк,*
*Свабоду шукаеш ты, яна твая.*
*Свабода — каляровы сьвет,*
*Свабода — гэта вусны кабет.*
*Свабода, як знайсьці твой сьлед?*
*Свабода.*

*Сьвежыя газэты, чорна-белыя радкі*
*Пахнуць вільгацьцю зямлі.*
*Вольнае паветра, шум нястрыманай ракі.*
*Выпі і яшчэ налі.*

Рэфрэн.

## Глыток віна і луста хлеба

*Вільгаць шэрых сьцен,*
*ды халодны цень,*
*ды няпэўная туга.*
*Старажытны брук,*
*дым заводскіх труб,*
*саслабелая рука.*

*За вакном відно*
*толькі ўсё відно,*
*на душы цямрэчы сьлед.*
*У пакоі дым,*
*мы ў вакно глядзім,*
*на стале віно і хлеб.*

*Заваконны край —*
*індустрыйны рай,*
*ды ў аблоках небакрай...*
*Пакаёвы дым,*
*шэры дым нуды,*
*шэры пах былой бяды.*

*Не шукай шляхоў,*
*каб вярнуць ізноў*
*у мінулае білет.*
*Ёсьць у нас з табой*
*паўцьмяны пакой,*
*на стале віно і хлеб.*

Рэфрэн:
*Глыток віна і луста хлеба — мая надзённая патрэба.*
*Глыток віна і луста хлеба — зямлі і неба дар.*

*Не кажы пагроз*
*і ня лай свой лёс,*
*я пакуль што не сасьлеп.*
*Час даўно прысьпеў,*
*будзе новы сьпеў,*
*покуль ёсьць віно і хлеб.*

Рэфрэн.

*Глыток віна і луста хлеба — чароўны дар зямлі і неба.*
*Глыток віна і луста хлеба — мой найкаштоўны скарб.*

## Дзеўчына з чароўнаю усьмешкай

*Такая праграма, што ў горадзе п'яных*
*Я не выпʼю ні грама.*
*Такая праграма, што ў горадзе гандлю*
*Я не пайду ў краму.*

Рэфрэн:
*Хай сьмяюцца, хай сабе.*
*Гэта іхняе права.*
*Хай злуюцца, хай сабе.*
*Гэта іхняя справа.*
*Дзеўчына з чароўнаю усьмешкай,*
*Прывітаньне і бывай.*

*Такое крэда, што ў горадзе прозы*
*Я зраблюся паэтам.*
*Такое крэда, што ў сьвеце распусты*
*Я зраблюся аскетам.*

Рэфрэн.

*У абавязковых мерапрыемствах*
*Я не бяру удзелу.*
*І мушу зазначыць, што гэтая звычка*
*Ня шкодзіць душы і целу.*

Рэфрэн.

## Ноч за вакном

*Неспакойны сон, ноч абвастрае слых.*
*Неба зорны трон, позірк вачэй чужых.*
*Сілуэты дрэў ды непраглядны змрок.*
*Аглушальны рэў раптам і незнарок.*

*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*
*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*
*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*

*Адзіноты смак, вуліца без машын.*
*Таямнічы знак, голас тваёй душы.*
*Ліхтароў сьвятло, мроіцца шэпт замоў.*
*Ноч глядзіць праз шкло, ноч заварожыць зноў.*

*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*
*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*
*Ноч за вакном. Ноч за вакном.*

•

## Так і трэба

*Цікавая карціна, цікавая гульня —*
*Машына без бэнзіну, пажарнік без агня.*

Рэфрэн 1:
*Дык, значыць, так і трэба.*
*Трэба так і будзе так.*

*Гармата без снарадаў, карова безь сядла.*
*Будынак без фасаду, калгасьнік безь сяла.*

Рэфрэн 2:
*Дык, значыцъ, так і трэба.*
*Трэба так і будзе так.*
*Цяжкія гантэлі, хісткія арэлі,*
*Мокрыя макрэлі.*
*Назаўжды.*

*Прыемныя навіны, прыемнае жыццё.*
*Кераміка бяз гліны, без чугуну ліццё.*

Рэфрэн 1.

*Даведка бяз пячаткі, пальчатка без рукі.*
*Пачатак без канчатку, караблік без ракі.*

Рэфрэн 2.

*Магнаты без магніту, і племя вінету.*
*Пэрыяд нэаліту, і ваш цягнік ту-ту.*

Рэфрэн 1.

*На захад мы глядзелі, на ўсходзе мы жылі.*
*Сьпявалі як хацелі, і гралі як маглі.*

Рэфрэн 2.

## Беларуская Афрыка

*Чорныя цені бягуць па зямлі,*
*Жоўтыя плямы плывуць па вадзе.*
*Неба палае зялёным вагнём,*
*Аўтапагружчык глытае бэнзін.*

Рэфрэн:
*Беларусачка, паглядзі вакол — Афрыка.*
*Беларуская Афрыка, Беларуская Афрыка.*

*Маршрутны аўтобус занесла ў кювет,*
*Горла баліць ад нясьвежай вады.*
*Дзяўчынка стаіць на гарачай шашы,*
*На даляглядзе груваскі завод.*

Рэфрэн.

*Ветрам разносіць чырвоны пясок,*
*Чорная птушка над полем вісіць.*
*Сумную песьню тубыльцы пяюць,*
*Сьпеў гэты цягнецца сотні гадоў.*

## N.R.M.

### «LaLaLaLa», 1995

#### Белыя лебедзі

*Радуйцеся, людзі, да халадоў,*
*Да лютых маразоў,*
*Няшчадных і пранізлых, як вострае лязо,*
*Як вострае лязо.*

*Радуйцеся, людзі, як да вайны.*
*Пакуль мы не адны,*
*Пакуль яшчэ ня страчаныя подыхі вясны,*
*Подыхі вясны.*

Рэфрэн:
*Будзьце гатовы да любых паваротаў,*
*Белыя лебедзі, мухі ды коткі,*
*Будзьце гатовы да сусьветнага скону,*
*Белыя лебедзі, сьвіньні ды коні.*
*Будзьце гатовы да скону сусьвету,*
*Белыя лебедзі, белыя лебедзі.*
*Будзьце гатовы да скону сусьвету,*
*Белыя лебедзі, белыя лебедзі!*

*Радуйцеся, людзі, каб не хварэць,*
*Каб не заіржавець.*
*Прыгожыя машыны кожны будзе мець,*
*Кожны будзе мець.*

*Радуйцеся, людзі, добра жывем,*
*Дабра мы нажывем.*
*Таньчым, весялімся, ніякіх праблем.*
*Ніякіх праблем.*

Рэфрэн.

**Нацыя**

*Нацыя, нацыя, нацыя.*
*Інфляцыя, дэвальвацыя.*
*Фракцыя, эміграцыя,*
*Я-я-я...*

*Камуністы, манархісты,*
*Нацыянал-сацыялісты,*
*Гуманісты, экстрэмісты,*
*Ты-ты-ты...*

Рэфрэн:
*Тым часам там, за вакном,*
*Жыццё па-старому ідзе.*
*Згарае чырвоным агнём*
*Чарговы восеньскі дзень...*

*Нацыя, нацыя, нацыя.*
*Абстракцыя, прастрацыя.*
*Дзе розум твой,*
*Дзе рацыя твая?*
*Мы стаім па калена ў зямлі,*
*Здольныя ўзяць,*
*Ды ня здольныя даць.*
*Над нашай зямлёй*
*Чорныя вакі гараць.*

Рэфрэн:
*Тым часам там, за вакном,*
*Жыцьцё па-старому ідзе.*
*Згарае чырвоным агнём*
*Чарговы восеньскі дзень...*

*Галодны крук*
*Чуе сьвежую кроў.*
*Сьвята брудных рук,*
*Сьвята чыстых зубоў.*

*Нацыя, нацыя, нацыя.*
*Кепская інфармацыя,*
*Мне не зразумець,*
*Мне не зразумець яе.*
*Толькі крок — і неба ўнізе.*
*Крок яшчэ — і я ўверсе.*
*Мы ў перакуленым сусьвеце.*

Рэфрэн.

## Дарога

*Маю дарогу не прайсьці*
*Без дапамогі танкаў.*
*На ёй нічога не знайсьці*
*Без указальных знакаў.*
*Маю дарогу замяло*
*Зыбучымі пяскамі.*
*А мы сядзелі за сталом,*
*І ноч плыла над намі.*

Рэфрэн:
*Чакала дарога,*
*Чакала дарога,*
*Чакала дарога нас.*
*А мы гэтым часам,*
*А мы бесклапотна пілі*
*Смачны квас.*

*Матляецца дарога зноў,*
*Нібыта хвост сабачы.*
*Я сёньня не пайду дамоў,*
*А потым мы пабачым.*
*Няма таго, што быць магло,*
*Няма нідзе нічога.*
*А мы сядзелі за сталом,*
*Чакала нас дарога...*

Рэфрэн.

**Мітусьня**

*Мітусьня кароткіх дзён*
*Адыходзіць у небыцьцё.*
*Нехта шле табе праклён*
*На ўсё тваё жыцьцё.*
*Зноў малююць абразы,*
*Над царквою ставяць крыж.*
*Прыкусіўшы свой язык,*
*Ты пакорліва маўчыш.*

Рэфрэн:
*Паглядзі, што вакол:*
*Хто за кім, хто каго...*
*Гэты сьвет супраць нас,*
*Супраць нас.*

*Нам ня трэба шмат казаць*
*І рабіць наадварот,*
*Нам ня трэба прадстаўляць*
*Свой заторганы народ.*
*Гэта наш з табою час,*
*Гэта наш з табою лёс.*
*Мы жывем апошні раз,*
*Мы жывем у поўны рост.*

Рэфрэн.

## Не хадзіце ў цёмны лес (Зомбі)

*Зомбі, зомбі маршыруюць.*
*Зомбі, зомбі маршыруюць.*
*Зомбі ціха маршыруюць,*
*Зомбі ўночы шпацыруюць.*
*Зомбі ціха маршыруюць,*
*Зомбі ўночы шпацыруюць.*

*Восень. Страшна і халодна.*
*Восень. Страшна і халодна.*
*Зомбі знойдуць дзе заўгодна.*
*Зьбегчы малаверагодна...*

Рэфрэн:
*Не хадзіце ў цёмны лес*
*Па начах гуляць адны, не, не!*
*А сядзіце лепей дома*
*І чакайце ў госьці зомбі,*
*Зомбі, зомбі, зомбі!*

*Неба, неба пачарнела.*
*Неба, неба пачарнела.*
*Нешта неба пачарнела,*
*У сэрцы нешта забалела, о...*
*Нешта неба пачарнела,*
*У сэрцы штосьці забалела, а...*

*Трэба выключыць сьвятло,*
*Трэба выключыць сьвятло,*
*Трэба выключыць сьвятло,*
*Бо дрыжыць у доме шкло.*

Рэфрэн.

*Зомбі грукаюцца ў дзьверы,*
*Знаю іхнія намеры я.*
*Зомбі грукаюцца ў дзьверы,*
*Знаю іхнія намеры я.*

*Трэба, трэба іх спыніць.*
*Трэба, трэба іх спыніць.*
*Трэба, трэба іх спыніць.*
*Людзі, падкажыце, што рабіць!*

Рэфрэн.

## Бацька

*Застрахуй мяне, бацька, ад халоднага ветру,*
*Ад марозу ды сьнегу застрахуй ты мяне.*
*Застрахуй мяне, бацька, ад зімовага сонца,*
*Ад сьцюдзёнага лёду ты мяне застрахуй.*

*Халаднее надзея, і зямля халаднее,*
*І зямля халаднее ўсё хутчэй і хутчэй.*
*Толькі чорныя дрэвы цягнуць крохкія пальцы*
*Да халоднага сонца, да сьляпога сьвятла.*

*З кожным крокам і ўздыхам усё бліжэй да завеі.*
*З кожным крокам і ўздыхам усё бліжэй да зімы.*
*У зімовую сьпячку адыходзіць рабочы,*
*Адыходзіць калгасьнік, адыходзіць жаўнер.*

Рэфрэн:
*Сьпі спакойна, дарагі таварыш.*
*Сьні спакойна сонечныя сны.*
*Сьпі спакойна, дарагі таварыш.*
*Сьпі спакойна, дружа, да вясны.*

*У зімовую сьпячку адыходзіць краіна,*
*Хіліць вузкую сьпіну, смокча лапу сваю.*
*Застрахуй мяне, бацька, ад заснулай краіны,*
*Ад зімовае сьпячкі застрахуй ты мяне.*

Рэфрэн.

## Трактар

*Дарма працуе трактар у полі пад Гародняй,*
*Дарма працуе токар на трактарным заводзе,*
*Дарма працуе лекар лякарні № 9,*
*Дарма працуе пекар пякарні № 6,*

*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому...*

*Дарма каналі немцы у лесе пад Лагойскам,*
*Дарма каналі туркі сярод Балканскіх гор.*
*Дарма ты пішаш вершы, дарма чытаеш кнігі:*
*Калі ты будзеш першы,*
*Ніхто і не заўважыць,*

*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому нічога не патрэбна,*
*Таму што тут нікому...*

*Хіба што толькі выпіць,*
*Хіба што толькі зъесьці,*
*Хіба што толькі думаць*
*Пра тое ды пра гэта.*

*Хіба што толькі верыць,*
*Хіба што толькі марыць —*
*Вось тое, што патрэбна,*
*Ня так ужо і мала.*

*Няхай працуе трактар,*
*Няхай працуе токар,*
*Няхай працуе лекар,*
*Няхай працуе пекар,*

*Няхай усе працуюць,*
*Няхай адпачываюць,*

*Няхай сьпяваюць песьні*
*Пра тое, што захочуць.*

**Дзе тое слова?**

*Маё каханьне забівае цябе,*
*Маё каханьне забівае цябе,*
*Маё каханьне забівае цябе*
*Лязом салодкім.*
*Мы пазіраем на жыцьцё і на сьмерць,*
*Наўкол ня тое, што мы мусілі мець.*
*Маё каханьне забівае цябе*
*Лязом салодкім.*

Рэфрэн:
*Дзе тое слова, дзе той сказ,*
*Дзе той адказ?*
*Зьмей папяровы, дай нам шанц,*
*Выратуй нас, нас!*
*Дзе тое слова, дзе той сказ,*
*Дзе той адказ?*
*Зьмей папяровы, дай нам шанц,*
*Выратуй нас, нас!*

*Тваё каханьне забівае мяне,*
*Тваё каханьне забівае мяне,*
*Тваё каханьне забівае мяне*
*Быльной атрутай.*
*Глынеш атруты, усьміхнесься, і ўсё.*
*Зь мяне па кроплі выцякае жыцьцё.*
*Тваё каханьне забівае мяне*
*Быльной атрутай.*

Рэфрэн.

*Скажы мне слова*
*Ці зацята маўчы,*
*Скажы мне слова*
*Ці зацята маўчы,*

*Навошта сьлёзы, сьлёзы, сьлёзы?*
*Ты прасядзіш*
*Каля вакна давідна,*
*І ўбачыш ты,*
*Што засталася адна,*
*І ўбачыш ты,*
*Што засталася адна,*
*Ды будзе позна, позна, позна.*

Рэфрэн.

**Дайце!**

*Дайце людзям хлеба,*
*Хай сабе ядуць.*
*Дайце людзям неба,*
*Хай сабе лятуць.*
*Дайце неба, хай лятуць.*

*Дайце людзям хаты,*
*Дайце ім агонь,*
*Дайце людзям рады,*
*Дайце хоць чаго.*
*Дайце людзям хоць чаго.*

Рэфрэн:
*Я не пачвара, я не герой,*
*Я не ахвяра!*
*Дайце мне мару, дайце настрой,*
*Дайце мне веры!*

*Дайце людзям зроку,*
*Каб маглі глядзець.*
*Дайце людзям року,*
*Каб маглі балдзець.*
*Дайце людзям пабалдзець!*

*Дайце хлопцам моцы,*
*Дамам дайце шарм.*

*Дайце дамам хлопцаў,*
*Хлопцам дайце дам.*
*Дайце хлопцам, дайце дам.*

Рэфрэн.

*Кожнаму патроху,*
*Кожнаму свайго.*
*Тут няма нічога —*
*Дайце хоць чаго!*
*Дайце людзям хоць чаго!*

*Тут няма нічога —*
*Дайце хоць чаго!*
*Кожнаму патроху,*
*Кожнаму свайго.*
*Дайце, дайце хоць чаго!*

Рэфрэн.

## Бывай

*Нахіляецца долу невысокае неба,*
*Нахіляецца долу, пахне шэрай імжой.*
*Надыходзячы ранак пахне дымам і хлебам,*
*Надыходзячы ранак пахне ўладай чужой.*

Рэфрэн:
*Бывай, мой родны край!*
*Бывай, мой родны горад!*
*Бывай, мой брыдкі брат!*
*Бывай, мой любы вораг!*

*Нас хісталі арэлі, ды вагні дагарэлі.*
*Нас хісталі арэлі ад вады да зямлі.*
*Мы ў люстэркі глядзелі, ды ня ведалі, дзе мы —*
*На якой паралелі, на якім караблі.*

Рэфрэн.

*Мой апошні тралейбус па праспэкце паедзе,*
*Загрукоча ўночы мой апошні трамвай.*
*Да наступнай сустрэчы пройдзе пару стагодзьдзяў,*
*Пройдзе пару стагодзьдзяў, а пакуль што бывай.*

Рэфрэн.

## ЛаЛаЛаЛа

*У нашым мястэчку восень,*
*І прыхадні розныя лазяць па хатах,*
*Тыцкаюць пальцамі ў сала*
*І наводзяць свае парадкі.*

*У мяне на душы паскудна,*
*І словаў бракуе, каб выказаць гэта.*
*І не хапае моцы,*
*Каб далей гэта моўчкі трываць.*

*Лепей пайду па мястэчку,*
*Вазьму ў рукі кала*
*І засьпяваю ўголас,*
*Каб чулі ўсе: ЛАЛАЛАЛА!*

## Халі-галі

*Я ўключаю «Depeche Mode»,*
*Каб ня слухаць*
*Вулічнага шума.*
*Галавой аб сьценку — бах!*
*І чытаю пра анашу.*

*Халі-галі, халі-галі,*
*Халі-галі, халі-галі...*

*Я танцаваць цэлы вечар хачу,*
*А таксама залезьці на дах.*

*Я вылiваю ў прыбiральню ваду*
*I адчуваю паганы пах.*

*Халi-галi, халi-галi,*
*Халi-галi, халi-галi...*

*У галаве — цыгарэтны дым,*
*На палеце — сухое вiно.*
*Дзе ж вы, мае маладыя гады,*
*Дзе ж ты, дзе ж ты, бацька Махно?*

*Халi-галi, халi-галi,*
*Халi-галi, халi-галi...*

*Я танцую ўжо цэлую ноч,*
*Разам са мной танцуеш ты.*
*Я звалюся ранiцай з ног,*
*Хай мяне забiраюць менты!*

## «Одзiрыдзiдзiна», 1996

### Песьня падземных жыхароў

*У нашай краiне нiколi ня ўзыйдзе сонца.*
*У нашай краiне нiколi ня ўзыйдзе месяц.*
*У нашай краiне нiколi ня бачна зораў.*
*У нашай краiне нiколi ня будзе сьвятла.*

Рэфрэн:
*Мы жывем пад зямлёю,*
*Мы жывем пад асфальтам,*
*I нам з табою ня трэба*
*Лiтасьцi i шкадаваньня.*
*Мы жывем пад зямлёю,*
*Мы — пацукi ды мышы.*
*Мы добра бачым у цемры,*
*Мы чуем кожны шолах.*

*У нашай краіне ня чутна ўрачыстых гімнаў,*
*У нашай краіне няма праграмы навінаў.*
*У нашай краіне ня трэба анкеты зь пячаткай,*
*У нашай краіне няма палымяных прамоў.*

Рэфрэн.

*У нашай краіне няма бананаў ды ківі.*
*У нашай краіне няма рыпучага сьнегу.*
*А недзе наверсе над намі жыве краіна,*
*Там людзі жывуць, якія ня любяць нас.*

Рэфрэн.

## Мы самі па сабе

*Я не хачу ведаць, што будзе заўтра.*
*Я ўздымаю высока свой сьцяг.*
*Тое, што ёсьць, адбылося ня раптам,*
*Тое, што будзе, ня зьменіш ніяк.*

*Што трэба ведаць, каб потым ня схлусіць,*
*Каб не пакрыўдзіць самога сябе?*
*Дзе ўзяць уменьне ўважліва слухаць,*
*Як не забрудзіцца ў барацьбе?*

Рэфрэн:
*Мы самі, мы самі, мы самі па сабе,*
*Мы самі — Маямі, Ямайка і Квэбэк.*
*Мы самі, мы самі, і ты нас не чапай.*
*Амэрыка, Эўропа, Індыя, Кітай.*

*Птушкі ня маюць прытулку ў небе,*
*Людзі згубілі спакой назаўжды.*
*Пена марская заўсёды на грэбні,*
*А карабель не плыве без вады.*

Рэфрэн.

*Не палюбіць мне чужую краіну,*
*Не зразумець мне варожых людзей.*
*І не пазьбегнуць удара ў сьпіну,*
*І не праспаць гістарычных падзей.*

Рэфрэн.

## Сьляпы, глухі, дурны

*Я кажу табе: ты сьляпы,*
*Бо ў вачах тваіх адно ночы цень.*
*Я кажу табе: ты сьляпы,*
*Бо ты глядзіш на дзень і ня бачыш дзень.*
*Я кажу табе: ты сьляпы,*
*Бо ты глядзіш на дождж, а гаворыш: сьнег.*
*Я кажу табе: ты сьляпы,*
*Бо ты глядзіш на плач, а гаворыш: сьмех.*
*Я кажу табе: ты сьляпы —*
*Ты мроіш пра карону і пра палац.*
*Я кажу табе: ты сьляпы —*
*Навокал бруд, каровы, глухі калгас.*

Рэфрэн:
*Плакаць ня трэба, плакаў бы раней.*
*Позна ўжо плакаць.*
*Выпі, ня грэбуй, толькі безь мяне.*
*Мутную вадкасьць.*

*Я кажу табе: ты глухі,*
*Бо чуеш ты сябе і нікога больш.*
*Я кажу табе: ты глухі,*
*Бо твае песьні — гэта суцэльны фальш.*
*Я кажу табе: ты глухі,*
*Бо чуеш гукі ты, ды ня чуеш слоў.*
*Я кажу табе: ты глухі,*
*Бо паўтараць табе трэба зноў і зноў.*

Рэфрэн.

*Я кажу табе: ты дурны,*
*Бо лічыш ты, што разумнейшы тут.*
*Я кажу табе: ты дурны.*
*Бо ты з разумным тварам нясеш лухту.*
*Я кажу табе: ты дурны.*
*Бо ты сказаў, што Богам абраны ты.*
*Я кажу табе: ты дурны.*
*І не ўцячы ад гэтае дураты.*

Рэфрэн.

## Лепей ня будзе

*Лепей ня будзе,*
*Будзе толькі горш.*
*Ад панядзелку*
*Льецца дробны дождж.*

*Мора ня будзе,*
*Будзе толькі порт.*
*Бедныя людзі,*
*Бедны наш народ,*
*Бедны наш народ.*

Рэфрэн:
*Твой рок-н-рол*
*Даўно памёр.*
*Твой чорны джаз*
*Даўно пагас.*

*Грошай ня будзе,*
*Будзе толькі грош,*
*Лепей ня будзе,*
*Будзе толькі горш.*

*Лепей ня будзе,*
*Будзе толькі горш.*
*Не спадзявайся*

*На ўдалы лёс,*
*На ўдалы лёс.*

Рэфрэн.

*Сьмеху ня будзе,*
*Будзе мокры сьнег,*
*Рэха ня будзе,*
*Будзе толькі грэх.*

*Ад панядзелку*
*Льецца дробны дождж.*
*Лепей ня будзе,*
*Будзе толькі горш.*
*Будзе толькі горш.*

Рэфрэн.

### На вуліцы маёй

*Над гэтай вуліцай сонца,*
*Над гэтай вуліцай дождж і вецер,*
*Над гэтай вуліцай сьнег і сьцюжа,*
*На гэтай вуліцы бэз цьвіце.*

*На гэтай вуліцы цёмна,*
*Бо ліхтары не функцыянуюць,*
*І калі ты вяртаесься позна дадому,*
*Рызыкуеш нарвацца на непрыемнасьць.*

Рэфрэн:
*На вуліцы маёй —*
*Вуліцы дзяцінства.*
*На вуліцы маёй —*
*Вуліцы юнацтва.*
*На вуліцы травеньскіх песень,*
*На вуліцы студзеньскіх сноў.*

*На гэтай вуліцы сьвята,*
*І розныя людзі сталага веку*
*Сьпяваюць свае ўлюбёныя песьні,*
*Граюць на баянах полькі свае.*

Рэфрэн.

*Будуюць новыя гмахі,*
*І з кожным днём, і з кожным годам*
*Мне ўсё цяжэй і цяжэй*
*Знайсьці сваю вуліцу і пазнаць.*

*Вуліцу маю —*
*Вуліцу дзяцінства.*
*Вуліцу маю —*
*Вуліцу юнацтва.*
*Вуліцу травеньскіх песень,*
*Вуліцу студзеньскіх сноў.*

## Партызанская

*Як прыходзілі к нам партызаны,*
*Гаманілі лясы і паляны.*
*Гаманілі лясы і паляны,*
*Як прыходзілі к нам партызаны.*

*Акупанты прыйшлі, ім імя — легіён,*
*Але нас не спыніць, але нас не стрымаць.*
*Відаць, што зноўку давядзецца адкапаць кулямёт,*
*Відаць, што зноўку давядзецца страляць.*

Рэфрэн:
*Мы — партызаны,*
*Лясныя браты.*
*Мы — партызаны,*
*З вайной мы на «ты».*
*Мы — партызаны,*
*Любім наш край,*

*Ачысьцім свой край*
*Ад чужынскіх зграй.*

*І нашыя людзі, нібы павукі,*
*Распаўзуцца на ўсе на чатыры бакі*
*І будуць радзіму сваю вызваляць —*
*Страляць з-пад рукі, скідаць цягнікі.*

Рэфрэн.

*А потым мы вып'ем з табой самагонкі*
*За нашыя пушчы, лясы і пагоркі,*
*За вольны наш край, за канец вайны.*
*Мы — партызаны, беларускія сыны.*

Рэфрэн.

## На лініі фронту

*На лініі фронту наша Радзіма,*
*На лініі фронту вечнай вайны.*
*У сьвеце калючага дроту і дыму*
*Па лініі фронту поўзаем мы.*

*На лініі фронту юнацтва наша,*
*Там і наша дзяцінства.*
*На лініі фронту паходная каша*
*У алюміневай місе.*

*Па лініі фронту гойсаюць танкі*
*(Танкі, атакі, тактыка бою),*
*На лініі фронту санітаркі*
*Нас з табой суцяшаюць сабою.*

*На лініі фронту — крокі ў змроку,*
*Кожны крок можа стаць апошнім.*
*На лініі фронту ходзіць пад Богам*
*Кожны, кожны, кожны, кожны, кожны.*

*Супрацьстаяньне двух бакоў сьвету —*
*Хтосьці харошы, хтосьці варожы,*
*Хтосьці за тых, хтосьці за гэтых.*
*Большасьць — за тых, хто пераможа.*

*Паслухай, мой дружа, цікава даволі,*
*Куды сьцяжына нас завяла —*
*Мы не ў турме, але й не на волі,*
*Мы не ў цямрэчы, але безь сьвятла.*

*Мы быццам на працы, але без работы,*
*Нас вінавацяць, але безь віны.*
*Мы з табою на лініі фронту*
*Бясконцай айчыннай вайны.*

## Одзірыдзідзіна

*Калі ў вачох маіх туман,*
*І галава баліць мая,*
*Я вып'ю піва ды сьпяю:*
*«Я-я!»*
*І ўсе сябры, сябры мае*
*Падхопяць песеньку маю,*
*І кожны, кожны падпяе:*
*«Е-е!»*

Рэфрэн:
*Ку-ку, ку-ку,*
*Ля-ля-ля, ля-ля-ля.*
*Одзірыдзі, одзірыдзідзіна,*
*У-ха!*

*Мы разам пойдзем па вясьне,*
*І нам ніхто ня скажа: «Не!»,*
*Бо ўсе сябры, бо ўсе свае.*
*Е-е.*
*Мы закрычым: «На абардаж!!!»,*
*І гэты горад будзе наш.*

*Давай сюды сваю руку.*
*Ку-ку!*

Рэфрэн.

## «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.», 1998

### Паветраны шар

*О'к! Тут усё о'к.*
*Толькі дыхаць мне з кожным днём цяжэй.*
*Паветра зусім няма —*
*Колькі ні ўдыхай — усё дарма.*
*Глядзець на брудны горад*
*І крэмзаць мэмуары*
*Ня варта вачэй і ня варта рук.*
*І я гляджу на зоры,*
*І я гляджу на хмары*
*І слухаю ўласнага сэрца стук.*

Рэфрэн:
*Падымі мяне па-над зямлёю,*
*Падымі мяне ў сьветлы абшар!*
*Падымі мяне над мітусьнёю,*
*Падымі мяне, паветраны шар!*

*Ляцець, над зямлёй ляцець,*
*Бачыць гарады, бачыць сто дарог.*
*Глядзець, на мяне глядзець*
*Сумным позіркам будзе мой народ.*
*На нешта вырашацца*
*Прысьпеў, напэўна, час!*
*Паветрам свабоды дыхаю я.*
*Унізе сям'я ды праца*
*І сто неадкладных справаў,*
*Якія сто разоў я адкладаў.*

Рэфрэн.

*Няхай вы казалі мне*
*Пра няўдзячны лёс ды пра сумны фінал,*
*Але бачыў неба я,*
*Дыхаў небам я, неба я кранаў!*

Рэфрэн.

## Кумба

*Карочэ, я сібе сіводня нраўлюсь сам.*
*Сматру на сібя ў зеркала — крутой пацан.*
*Клёвая кепка, красоўкі, штаны...*
*Не-не, ну атвецьце, пацаны!*

*За свой базар всягда я атвячаць гатоў.*
*Я дажа с парашутам зьдзелаў нескака прыжкоў.*
*Да! Между прочым, я сіводня пры лавэ,*
*А хто пры лавэ, тот настаяшчы чалавек!*

*Кумба, кукумба, ты-ты!*
*Кумба, кукумба, ты-ты!*

*Вчара тут к нам прыехалі госьці с Масквы,*
*Крутыя пацаны, пачці што как мы.*
*Ну вот. Паехалі мы ў прыгарадны лес*
*І выпілі за інтэграцыонны працэс.*

*Карочэ, дальшэ плоха помню,*
*Я помню, далі ў глаз.*
*Значыт, білі панкаў (ці панкі білі нас).*
*Патом былі дзяўчонкі, адна, а можэт, две...*
*А-а, перапуталася ўсё у галаве.*

*Кумба, кукумба, да-да!*
*Кумба, кукумба, ты-ты!*

*Міня сільна ламают некрутыя людзі.*
*Па-моему, ані тока воздух паскудзят.*

*І хоць мне ў падлу хадзіць на работу,*
*Я был патрыотам і астанусь патрыотам.*

*А есьлі цібе ня нравіцца ўласьць,*
*Значыт, ты — галубаяваласатая мразь!*
*Ну, ладна, харэ! Давай свой стакан.*
*Давай стакан, я налью сібе сто грам.*

*Кумба, кукумба, да-да!*
*Кумба, кукумба.*

## Твой партрэт

*Ты падабаесься такім, як ты сам.*
*Ты павышаеш свой аўтарытэт.*
*Ты, ты зьяўляесься то тут, то там.*
*І дзе ні зьявісься, паўсюль твой партрэт.*

Рэфрэн:
*Твой партрэт прадаецца ў кніжнай краме.*
*Твой партрэт на сьцяне вісіць у раме.*
*Твой партрэт — ты на ім герой у масцы.*
*Твой партрэт пахне фарбаю друкарскай.*

*Ты вельмі хутка набіраеш разьбег.*
*Ты на ўсё новае глядзіш як баран.*
*Ты выклікаеш абурэньне ды сьмех.*
*Ты любіш праўду, не шануеш падман.*

Рэфрэн.

*Там, дзе адзін разумее другога,*
*Там, дзе ня можаш застацца ў журбе,*
*Там, дзе адна й прамая дарога,*
*Там і гаворкі няма пра цябе.*

Рэфрэн.

## Пакуль не пачнецца вайна

*За гэтай сьцяною наступная будзе сьцяна,*
*Я буду з табою, пакуль не парвецца струна.*
*Я буду з табою, пакуль не пачнецца вайна,*
*А заўтра ўранку, на самым сьвітанку*
*Сьпяюць нам званы пра пачатак вайны.*

Рэфрэн:
*Мы з табой адной крыві.*
*Дай мне шмат і шмат вазьмі.*
*Нічога ня зробіш,*
*Нам трэба пасьпець да відна.*
*Дай мне ўсё, што можаш,*
*Пакуль не пачнецца вайна.*

*За гэтай мяжою наступная будзе мяжа,*
*Я буду з табою, пакуль не пачнецца пажар.*
*Чарговы пажар нас чакае за рогам сьцяны,*
*А заўтра ўранку на самым сьвітанку*
*Сьпяюць нам званы пра пачатак вайны.*

Рэфрэн.

*Вазьмі мае вочы, і думкі, і словы вазьмі,*
*Чырвоныя ночы і бела-чырвоныя дні.*
*Вазьмі ўсё, што можаш, усё, што захочаш, вазьмі,*
*Бо заўтра ўранку на самым сьвітанку*
*Сьпяюць нам званы пра пачатак вайны.*

Рэфрэн:
*Мы з табой адной крыві.*
*Дай мне шмат і шмат вазьмі.*
*Нічога ня зробіш,*
*Нам дадзены час да відна.*
*Дай мне ўсё, што можаш,*
*Бо заўтра пачнецца вайна.*

## Песьні пра каханьне

*Калі мне будзе горача ў лютым,*
*Калі мне будзе ў ліпені халодна,*
*Калі ў натоўпе будзе мне самотна,*
*Глядзі, не забывайся на мяне!*

Рэфрэн:
*Сьпявай мне песні пра каханьне,*
*Каханьне.*
*Сьпявай мне песьні пра каханьне,*
*Каханьне.*

*Калі за мною прыйдуць санітары,*
*Маю гітару ім не аддавай.*
*Глядзі, не аддавай маю гітару.*
*Вазьмі маю гітару ды сьпявай.*

Рэфрэн.

*Няхай мая ўдача зноўку плача,*
*І зноўку мне гамон, няхай-няхай.*
*Пакуль трубіць труба і вочы бачаць,*
*Сьпявай, сьпявай мне песьні пра каха....*

Рэфрэн.

## 25, 26, 27...
(сл. М. Анемпадыстаў)

— *25, 26, 27, праверка сьвязі. Как слышыце мяня? Прыём!*
— *Слышым нармальна. Нармальна.*
— *Дваццацьпятачка, далажыце абстаноўку.*
— *Абстаноўка нармальная. Квадраты ачэплены.*
*Праходы перакрыты.*

*Нармальна!*

*— 26, как у вас сітуацыя?*
*— Сітуацыю кантраліруем.*
*— Блакіруйце і расьсякайце!*
*— Блакіруем і расьсякаем...*

*Нармальна!*

*— Дваццаць сёмы, пачаму маўчыце?*
*— У нас згарэў прэдахраніцель!*
*— Ну дак вызавіце *** пажарнікаў.*
*— Пажарнікаў вызвалі.*
*— Ну, нармальна, нармальна. 25, 26, 27 — нармальна.*

*Нармальна!*

*— Дваццацьпятачка, вы праход перакрылі?*
*— Праход перакрылі.*
*— А пачаму тут тада *** стока людзей?*
*— Прычыну выясьняем.*
*— Ну, нармальна. Тады нармальна. 25, 26, 27, нармальна.*

*— 26, дакладывайця.*
*— Блакіравалі і расьсяклі.*
*— Начынайце зачыстку!*
*— Зачыстку начынаем. Начынаем.*
*— Дваццаць сёмы, как слышыце мяня?*
*— Слышу вас очэнь харашо! Очэнь харашо.*
*— Што с прэдахраніцелем?*
*— Дык прэдахраніцель прэдахраняет.*
*— Не увлякайцесь, ***!*

*Нармальна!*

*— Усем адбыць на месца дзіслакацыі. Людзям аддыхаць, а з вамі буду разьбірацца. Как настраеніе ***мацеры?*
*— Настраеніе нармальнае.*
*— Тада нармальна. Тада нармальна. 25, 26, 27, нармальна...*

## Я еду

*Я еду па восеньскім лісьці,*
*Еду я празь дзіцячыя сны,*
*Еду я па пагорках і выспах,*
*Па дарогах зімы і вясны.*

*Я еду туды, дзе сьветла,*
*Дзе лунае паветраны шар,*
*Дзе ветразь напоўніцца ветрам,*
*Дзе сонцам асьветліцца твар.*

Рэфрэн:
*Усё на крыві, усё на касьцях,*
*Усё шматзначна і адназначна.*
*Я маю свой герб, я маю свой сьцяг,*
*Я маю свой край, дзе дыхаць мне смачна.*

*Я еду праз шэрыя вёскі,*
*Еду я цераз знакі бяды,*
*Я еду праз кропкі ды коскі,*
*Я еду адсюль туды, —*

*Туды, дзе ўзыходзіць золак,*
*Дзе падае сьнег долу.*
*Дзе сьвеціць калядная зорка,*
*Дзе гарыць купальскае кола.*

Рэфрэн.

*Я еду па вечным брудзе,*
*За брудам ня бачна зямлі.*
*Калісьці тут штосьці будзе,*
*Вось толькі што і калі?*

*Даеду альбо парыну*
*На хвалях сьцюдзёных вятроў...*
*Я еду ў сваю краіну*
*Ня першую сотню гадоў.*

Рэфрэн.

### Беларускі шлях

*Я беларус, Беларусь я люблю,*
*Маю надзею і веру сваю.*
*Шчыра кладу я на сэрца далонь, —*
*Я — беларус, так спрадвеку было.*

*Край ад пачатку Дняпра і да Буга,*
*Мы тут жывем безь ніякай напругі.*
*Побач суседзі, мы зь імі ў згодзе,*
*Слава табе, памяркоўны народзе!*

*Я — беларус, беларускі мой шлях,*
*Над комінам дым, над хатаю дах,*
*Добра, спакойна і ціха зраньня.*
*Хто кажа дрэннае — гэта хлусьня.*

*Сярод аблокаў матляецца бусел,*
*Шклянка з вадою на белым абрусе.*
*Хлеба акраец у торбе мы маем, —*
*Усіх пачастуем, усім адламаем.*

*Я — беларус, мне чужога ня трэба,*
*З чыстым сумленьнем гляджу я на неба.*
*Тут нарадзіўся я, тут застануся.*
*Я ганаруся сваёй Беларусьсю!*

## «Тры чарапахі», 1999

### Мы жывем някепска

*Мы жывем нядрэнна,*
*Мы жывем някепска.*
*Калі песьня трэба,*
*Засьпяваем песьню.*
*А калі ня трэба песьня,*
*Дык не засьпяваем —*

*Мы жывем нядрэнна,*
*Не пражываем.*

*Мы жывем някепска,*
*Мы жывем няблага:*
*Кожны вечар — брага,*
*А шторанак — смага.*
*Брага, смага, смага, брага —*
*Хай сабе і смага!*
*Мы жывем някепска,*
*Мы жывем няблага.*

*Мы жывем някепска,*
*Мы жывем няблага.*
*На твары усьмешка,*
*Сякера пад лавай.*
*Ла, ла, ла, ла, ла, ла, ла, ла,*
*Ла, ла, ла, ла, ла, ла,*
*Мы жывем някепска,*
*Мы жывем няблага.*

*Пражывем мы*
*Сто разоў па дзесяць —*
*Дуля у кішэні,*
*Бульба на талерцы.*
*1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 —*
*Пражывем мы столькі,*
*Не зьлічыць, ня зьмераць.*

### Бамжы

*Ну карацей,*
*Я выйшаў ранкам з хаты.*
*Зусім здаровы,*
*Не зусім багаты.*
*Іду, гляджу*
*На неба ды на глебу,*
*Наўпрост і ўбок,*
*Направа ды налева.*

*Наўпрост адно вар'яты ды маньякі,*
*Налева валацужныя сабакі.*
*І лепей вам ня бачыць, што направа,*
*І ўсё адно мы зробім нашу справу!*
*І будзе так,*
*Як трэба нам!*

*Мужчыны п'юць,*
*А потым прагнуць бою.*
*Жанчыны прагнуць міру ды спакою.*
*На гэтай глебе надта урадлівай*
*Міжполавыя твораца канфлікты.*

*Які народ?!*
*Якая, нахрэн, мова?!*
*Народ дурны,*
*Ён любіць жыць хранова.*
*А я люблю народ,*
*Хоць неўзаемна.*
*Люблю любіць —*
*Любіць заўжды прыемна.*

*І будзе так,*
*Як трэба нам!*

*Ну вось і ўсё,*
*Вяртаюся дадому.*
*І небагаты,*
*І ўжо нездаровы.*
*Паўсюдна грып*
*І іншая зараза —*
*Ну, паспрабуй здаровым тут застацца.*

*Але пляваць!*
*Сябе мы зробім самі*
*Прыгожымі дзяржаўнымі мужамі*
*Ці бруднымі ванючымі бамжамі.*
*Вось кім захочам,*
*Тым сябе і зробім.*

*І будзе так,*
*Як трэба нам!*

### Дзед Мароз

*Мы нарадзіліся дзеля таго,*
*Каб сьвяціць і каб саграваць.*
*Дзеля таго, каб вечар быў цёплы,*
*Каб была мяккай трава.*

*Дзеля таго, каб сонца і сьнег,*
*Каб любіць адно аднаго.*
*Зрэшты, якая ўжо розніца?*
*Гэта было даўно.*

*Ня плач, ня плач, дзяўчыначка,*
*Не наракай на лёс,*
*Табе свабоды скрыначку*
*Падорыць Дзед Мароз.*

*Горад засыпаны сьнегам ушчэнт,*
*Горад увесь пасівеў.*
*Пэнсіянеры ў тралейбусах*
*Мараць пра СССР.*

*Заплюшчы вочы свае,*
*Палічы да 120-ці.*
*Мы нарадзіліся дзеля таго,*
*Каб ісьці па гэтым жыцьці.*

*Ня плач, ня плач, дзяўчыначка,*
*Не наракай на лёс,*
*Табе каханьня скрыначку*
*Падорыць Дзед Мароз.*

*Ня плач, ня плач, дзяўчыначка,*
*Не наракай на лёс,*
*Табе удачы скрыначку*
*Падорыць Дзед Мароз.*

## Мая мэнтальнасьць

*Раней людзі былі не такія, як зараз,*
*А разы ў два-тры пабуйней.*
*І надвор'е было не такое, як зараз,*
*А такое, што о-го-го-го.*
*І ўсяго было значна болей,*
*І птушкі былі, як сабакі.*
*І калі я гэта ўсё прыгадаю,*
*Адразу плачу і цябе абдымаю.*

*Мая мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць!*

*А цяперашнія людзі пакідаюць свае гнёзды*
*І ў вырай чарадою лятуць.*
*Я хацеў ляцець зь імі, але сям'я і дзеці*
*Мне сказалі, што я буду сьвіньнёй.*
*А гэта значыць, што наперадзе восень,*
*На вочы рэзка навярнуліся сьлёзы,*
*І я цябе абдымаю і плачу,*
*І я цябе абдымаю і пла...*

*Мая мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць!*

*Раней былі такія сьвяты, што проста гамон —*
*Салют, шашлыкі, гарэлка.*
*І ўвесь народ у гэты час абдымаўся і плакаў,*
*Ён плакаў ад захапленьня.*
*Магчыма, гэта не зусім эстэтычна,*
*Але, згадзіцеся, як эратычна.*
*Я тры стагодзьдзі нічога ня бачу,*
*А ўсё цябе абдымаю і плачу.*

*Мая мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць!*

## Катлет-Матлет

*Што сказалі, хто сказаў,*
*Хто каго куды паслаў,*
*Хто каго куды паслаў,*
*Куды паслаў.*

*Хто сядзіць, а хто ляжыць,*
*Хто ідзе, а хто бяжыць,*
*Хто ідзе, а хто бяжыць,*
*А хто бяжыць.*

*Непахісная сьцяна,*
*За сьцяною цішыня,*
*За сьцяною цішыня,*
*За сьцяной.*

*І няма ў каго спытаць,*
*І няма чаго чакаць,*
*І няма чаго чакаць,*
*Няма чаго.*

Рэфрэн:
*Не кранай таго, што ёсьць, —*
*Ты ў гэтым сьвеце госьць.*
*Не рабі нікому зла,*
*Уначы няма сьвятла.*

*А навокал брыдкі сьмех*
*І хвароба ў галаве,*
*І хвароба ў галаве,*
*У галаве.*

*І стары і малады*
*Разыйшліся хто куды,*
*Разыйшліся хто куды,*
*Хто куды.*

Рэфрэн.

## Чыстая, сьветлая

*Я дакрануся да цёплага ветру,*
*Я буду бачыць уночы празь цемру,*
*Я зразумею, што ў сьценах ёсьць дзьверы,*
*Я зразумею, што ў сьценах ёсьць вокны.*

*Непрадказальнымі будуць учынкі,*
*Шматкаляровымі зробяцца хмары,*
*Хтосьці раскажа пра новыя плыні,*
*Ты будзеш ведаць усё, што захочаш.*

Рэфрэн:
*Ты будзеш самая сьветлая,*
*Ты будзеш самая чыстая,*
*Ты будзеш самая белая,*
*Ты будзеш самая-самая.*

*Я буду брудным, і шэрым, і дрэнным,*
*Я буду хворым, слабым і хлусьлівым,*
*Мне не пазьбегнуць гэтай адплаты,*
*Мы крочым назад, мы вяртаемся позна.*

Рэфрэн.

*Будзе пачуты шолах лістоты,*
*І зразумелымі стануць аблокі,*
*Неба і сонца як дар урачысты,*
*Я буду дыхаць іншым паветрам.*

Рэфрэн.

*Сьветлая-сьветлая-сьветлая,*
*Чыстая-чыстая-чыстая,*
*Белая-белая-белая,*
*Самая-самая-самая.*

## Тры чарапахі

*Калі раптам адчуеш камунальныя пахі*
*І жыцьцё цябе возьме ў пятлю,*
*Зразумееш тады, што тры чарапахі*
*Па-ранейшаму цягнуць зямлю.*

*Калі выйдзеш у горад ці залезеш у горы*
*І зь людзьмі усталюеш кантакт,*
*Зразумееш тады, што і сёньня і ўчора*
*Наша месца на трох кітах.*

Рэфрэн:
*Хэй ла-ла-ла-лай,*
*Ты не чакай, сюрпрызаў ня будзе.*
*Хэй ла-ла-ла-лай,*
*Ты не чакай, ты не чакай.*

*Не было Галілея і Боба Марлея,*
*Не было Сальвадора Далі.*
*Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінэя,*
*А кіты й чарапахі былі.*

Рэфрэн.

*Каб любіць Беларусь, нашу мілую маму,*
*Трэба ў розных краях пабываць.*
*Зразумееш тады — пад тваімі нагамі*
*Тры сланы нерухома стаяць.*

Рэфрэн:

*Хэй ла-ла-ла-лай,*
*Ты не чакай, сюрпрызаў ня будзе.*
*Хэй ла-ла-ла-лай,*
*Ніхто не чакае, і ты не чакай.*

## Катуй-ратуй

*Вось і насталі гэткія дні,*
*Нас разглядаюць вочы вайны.*
*Мы не належым самі сабе...*
*Ты не катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне.*

Рэфрэн:
*Не, не катуй мяне, не-не,*
*Ратуй мяне!..*
*Не, не катуй мяне, не-не,*
*Ратуй мяне!..*
*Не, не катуй мяне, не-не,*
*Ратуй мяне!..*
*Не, не катуй мяне, не-не,*
*Ратуй мяне!..*

*Мы па дарозе разам ідзем,*
*Скончыцца вецер,*
*Скончыцца дзень.*
*Што нам гавораць, не зразумець.*
*Ты не катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне.*

Рэфрэн.

*Немагчыма ратавацца,*
*Шкадаваць няма аб чым.*
*Нам няма куды хавацца...*

*Катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*

*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне.*

*Што мы хацелі, нам не зрабіць.*
*Сьвежых навінаў нам не здабыць.*
*Мы будзем слухаць самі сябе...*

*Ты не катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне, катуй мяне,*
*Ратуй мяне.*

Рэфрэн.

## Дастала

*Я нарадзіўся ў гэтым мейсцы:*
*Тут і ня добра, тут і ня кепска.*
*Тут не халодна, тут не сьпякотна.*
*Усё стабільна, але ж дэбільна...*

*Тут і ня вёска, тут і ня горад.*
*Тут і ня сёньня, тут і ня ўчора.*
*Тут не Айчына, тут не чужына,*
*Тут не мужчына, тут не жанчына.*

*Дастала! Дастала! Дастала! Дастала!*

*Пайду з народам мяняць валюту*
*І буду потым глядзець салюты,*
*Нібыта п'яны ці то цьвярозы.*
*Мой бедны розум пад пагрозай...*

*Дастала! Дастала! Дастала! Дастала!*

## Худсавет

*Прыдумай сабе свой сьвет,*
*Прыдумай сабе сьвятло,*
*Прыдумай свой дождж і сьнег,*
*Прыдумай усім на злосьць.*

*Прыдумай сабе свой край,*
*Свой дом на сямі вятрах,*
*Прыдумай сабе камін*
*І з коміну белы дым.*

*Прыдумай сабе жыцьцё,*
*Прыдумай паўсюль усё,*
*Няхай гэта ўсё жыве.*
*Прыдумай сабе сябе.*

*Прыдумай сабе свой сьпеў,*
*Каб ён у начы гарэў,*
*Каб ён асьвятляў і грэў.*
*Прыдумай сабе свой сьпеў.*

Рэфрэн:
*Быць можа, гэта табе дапаможа,*
*Быць можа, гэта...*
*Быць можа, гэта табе дапаможа.*
*Быць можа — дай Божа*

*Зноў падае мокры сьнег*
*На рукі, на твар, на шкло.*
*Я распавяду табе,*
*Што будзе і што было.*

*Я распавяду табе*
*Усё, што прыдумаў сам,*
*І гэты нясны сьвет*
*У рукі твае аддам.*

Рэфрэн.

*Прыдумай сабе свой скон,*
*Прыдумай апошні звон.*
*Хай будзе жыцьцё і сьмерць,*
*Хай будзе ўсё як сьлед...*

## «Дом культуры», 2002

### Беларускія дарогі

*На беларускіх дарогах паспаліты народ.*
*Кагосьці цягне на захад, нехта пнецца на ўсход,*
*Камусьці трэба свабода, а камусьці — прыгнёт.*
*Гэта зусім не распуста,*
*Гэта розьніца ў густах.*

*Па-беларуску дарога называецца «шлях»,*
*Альбо гасьцінец ці сьцяжына, ну, як-небудзь вось так...*
*Каля дарогі — ваўкі, па-над дарогай — каршак.*
*Жывёльны сьвет Беларусі*
*Багаты й разнастайны.*

*Па беларускіх дарогах столькі крочыла ног,*
*Чаравікаў, ботаў,*
*Нагавіцаў, панчох.*
*Тут забівалі, тут кахалі, нараджалі дзяцей.*
*А што ж вы хочаце, людзі?*
*Так было і гэтак будзе...*

*Над беларускай дарогай пралятаюць буслы,*
*Па беларускай дарозе праяжджаюць паслы.*
*Паслы ніколі нічога не гавораць услых.*
*Пра гэта нам сказаў*
*Нацыянальны канал.*

Рэфрэн:
*Чуеш, як пяе зямля?*
*Ля-ля-ля, ля-ля-ля.*
*Чуеш, як гудзе вясна?*

*На-на-на, на-на-на.*
*Чуеш, як сьпяваем мы —*
*Ы-ы-ы, ы-ы-ы!*
*Песьні пра дарогі*
*І ня толькі.*

*На беларускіх дарогах гудуць камары,*
*Па беларускіх дарогах ідуць трактары,*
*Для трактароў не бывае ўрадлівай пары —*
*Ці то дажджы, ці то вецер,*
*Ці сонца кепска сьвеціць.*

*На беларускіх дарогах — сэрца маё,*
*Тут пачынаецца ўсё, тут завяршаецца ўсё.*
*Прывітаньне, жыцьцё, да пабачэньня, жыцьцё*
*На беларускіх дарогах,*
*Беларускіх дарогах...*

Рэфрэн.

## О-о, гэта ўсё

*Я хацеў бы мець машыны*
*«Мэрсэдэс» і «Ягуар»,*
*Я хацеў бы мець краіну,*
*Дзе бы я быў гаспадар.*
*Мне бы мудрасьць Саламона*
*Ці хаця бы адну трэць,*
*І каб грошай было мора,*
*Каб хацелася хацець.*
*Я хацеў бы быць культурным,*
*Ведаць шмат і шмат спазнаць,*
*Я хацеў бы на Сатурне*
*Хоць адзін раз пабываць.*
*Мне бы скрыпку Страдывары,*
*Мне б карціну Пікасо,*
*Мне б аўтограф Рынга Стара —*
*Я хацеў бы гэта ўсё.*

*О-о, гэта ўсё!*

*Мне бы нюх, як у сабакі,*
*Мне бы зрок, як у арла,*
*Мне бы клюшні, як у рака,*
*І спакой, як у слана.*
*Я бы свой дзень нараджэньня*
*На Багамах адзначаў.*
*Я хачу задавальненьняў*
*Зь відам на марскі прычал.*
*Каб лілося піва з бочак*
*І каб шмат было віна,*
*Каб хапала дня і ночы,*
*Каб ня рвалася струна.*
*Я хацеў бы ў Галівудзе*
*Зьняцца разам з Шэран Стоўн.*
*Не судзіце строга, людзі,*
*Бо, напэўна, гэта ўсё.*

*О-о, гэта ўсё!*

*Не сядзіцца мне ў кватэры, —*
*Я даўно ўжо не студэнт,*
*Я хацеў бы ў Гранд-атэлі*
*Мець свой люкс-апартамэнт.*
*Каб жыцьцё было цікавым,*
*Майкам Тайсанам хачу,*
*Я хачу сусьветнай славы —*
*Мне ўжо гэта па плячу.*
*Я хацеў бы быць героем*
*І сваім сярод крутых,*
*Лепшым, першым, непаўторным,*
*Незалежным ад усіх.*
*На сваё на пахаваньне*
*Я хацеў бы паглядзець,*
*Каб сказаць на разьвітаньне:*
*«Усё, табе прыйшоў канец!»*

*О-о, гэта ўсё!*

## Вайна

*Вайна! Вайна! Вайна! Вайна!*

*Вайна была заўсёды.*
*Вайна — наш правадыр.*
*Мы гінем за свабоду,*
*Змагаемся за мір.*

*Мы любім нашу зброю*
*І верым толькі ёй.*
*Мы дыхаем зямлёю,*
*Палітаю крывёй.*

Рэфрэн:
*Нам так загадалі —*
*Па цэлі страляць.*
*Нас так рыхтавалі —*
*У баі выжываць.*
*Нам не пагражалі,*
*Ніхто не кранаў,*
*Нам проста сказалі:*
*Вайна! Вайна! Вайна! Вайна!*

*Тры тысячы гарматаў,*
*Гранаты і фугас.*
*Мы добрыя салдаты.*
*Вайна абрала нас.*

*Ляцяць ракеты ў неба*
*І асьвятляюць ноч.*
*Мы знаем, што нам трэба,*
*І ў гэтым наша моц.*

Рэфрэн.

## Сакрэт сусьветнага сьвятла

*У звыклым стане*
*Глядзіш на белыя сьнягі.*
*Твой стан нірваны*
*Табе знаёмы й дарагі.*
*Глядзіш на мора,*
*Глядзіш на хваляў белы шум,*
*А бачыш горад,*
*Яго сталёвую душу.*

Рэфрэн:
*А дзе шукаць, і дзе знайсьці, і дзе схаваць?*
*А як убачыць, як пачуць, як не праспаць?*
*Як утрымаць, як не прадаць, як не прапіць?*
*Куды ісьці, чаго хацець і што рабіць?*

*Каляды блізка —*
*Прамень чароўнага вагню,*
*Тваё дзяцінства*
*Бы абудзілася ад сну.*
*І недзе побач*
*Сакрэт сусьветнага сьвятла.*
*Знайшоў яго бы,*
*Падняцца б толькі з-за стала.*

Рэфрэн.

*Усё як трэба —*
*Усё паміж дабром і злом.*
*Гарыць папера,*
*Дае дрыготкае сьвятло.*

Рэфрэн.

## Прастора

*Гэта ня важна — позна ці рана,*
*Важна, з кім ідзеш.*
*Я іду па самым краі,*
*Пойдзеш — прападзеш.*

Рэфрэн:
*Што ў тваім сэрцы не прадаецца —*
*Гэта сьвятло душы.*
*Неба і зоры —*
*Гэта прастора*
*Дзеля таго, каб жыць.*

*Небясьпечна! Асьцярожна!*
*Пад стралой ня стой!*
*Гэта ня важна — нельга ці можна,*
*Важна, хто з табой.*

Рэфрэн.

*Я іду па самым краі,*
*Праз нуду і страх.*
*Што знаходжу, што губляю,*
*Усё ў маіх вачах.*

Рэфрэн.

## Лёгкія-лёгкія

*Здымай сядло,*
*Гасі сьвятло.*
*Па плечы сьнегу намяло.*
*Ці то ня сьнег,*
*Ці проста час*
*Зьмяняе сьвет,*
*Зьмяняе нас.*
*Растуць дамы*
*Пасьля дажджу.*

*Будуем мы*
*Сваю мяжу.*
*Будуем мы*
*Магутны мур,*
*Каб там схаваць*
*Сваю душу.*

Рэфрэн:
*Лёгкія-лёгкія*
*Нашы далёкія.*
*Цяжкія-цяжкія*
*Блізкія нашыя.*
*Сьветлыя-сьветлыя*
*Нашы памерлыя.*
*Цёмныя-цёмныя*
*Нашы штодзённыя.*

*У сьветлым сьне*
*Ці ў цёмных днях*
*Сказалі мне,*
*Што ты — мая.*
*Ніхто нічый.*
*Усе свае.*
*І кожны дбае пра сябе.*
*І кожны сам*
*Сабе бальзам*
*На раны лье начной парой.*
*І мы глядзім*
*Бязглузды фільм,*
*Дзе кожны — сам сабе герой.*

Рэфрэн.

*Было і ёсьць.*
*І наша злосьць,*
*Нібыта ў глытках нашых косьць.*
*Над намі страх,*
*Нібыта сьцяг.*
*І мы жывем, нібы ў гасьцях.*
*Зьбірай сяброў,*

*Запальвай газ.*
*Усё стагодзьдзе — дэкаданс.*
*Здымай сядло,*
*Гасі сьвятло.*
*Па плечы сьнегу намяло.*

Рэфрэн.

## Хавайся ў бульбу

*Баіцца мой сябар, калі навальніца,*
*Баіцца другі, што ня зможа напіцца,*
*Палохае трэцяга моцная ўлада,*
*Чацьверты баіцца памяншэньня акладу.*
*Усё гэта так, так, так,*
*А можа быць, не, не, не...*
*Але пытаньні гэтыя не да мяне.*
*Я, зрэшты, магу параіць адно:*
*Схавацца ў бульбу ці легчы на дно.*

*Хавайся ў бульбу!*

*Баіцца хірург, што сарвецца рука,*
*Баіцца студэнт ваенрука,*
*Баіцца жаўнер прамыўкі мазгоў,*
*Баіцца актор, што show must go on.*
*Усё гэта так, так, так,*
*А можа быць, не, не, не...*
*Баюся я, баісься ты, баяцца цябе, баяцца мяне.*
*Такая ў нашага народу нялёгкая праца —*
*Усе й паўсюль павінны баяцца.*

*Хавайся ў бульбу!*

*І страшна пажарным, і страшна міліцыі,*
*І страшна рабочым у нашай сталіцы,*
*Бо будуць шукаць, і могуць знайсьці —*
*Хоць што хочаш прасі, хоць што хочаш плаці.*
*Усё гэта так, так, так.*

*Усё гэта кепскі знак.*
*Змагацца з гэтай трасцай немагчыма ніяк.*
*А бульба ўрадзіла з высокаю батвой...*
*Стагодзьдзі праплываюць, нібы хмары, над табой.*

*Хавайся ў бульбу! —*
*Кажа наш беларускі народ.*
*Хавайся ў бульбу! —*
*У агарод.*
*Хавайся ў бульбу,*
*Каб ня ўбачылі, каб не знайшлі.*
*Хавайся ў бульбу!*
*Бліжэй да зямлі.*

## Юра, ёлкі-палкі, Коля

*Будоўля ішла, і рабочы сказаў:*
*Юрый, пайшлі пасьля зьмены ў спортзал.*
*А Юрый яму паказаў свой білет:*
*Даруй, Мікалай, я іду на балет.*

*Юра, ёлкі-палкі, Коля!*

*Мінула два тыдні, і Юрый сказаў:*
*Пайшлі, Мікалай, на спэктакаль «Гроза».*
*А Коля яму паказаў свой білет:*
*Даруй мне, але я іду ў Інтэрнэт.*

*Юра, ёлкі-палкі, Коля!*

*Яны збудавалі амаль што ўвесь дом,*
*І Юрый сказаў цёплым сонечным днём:*
*Пайшлі, Мікалай, на выставу Далі!*
*І Коля сказаў: добра, Юрый, пайшлі!*

*Юра, ёлкі-палкі, Коля!*

## FM

*Усё пад кантролем — спакойна!*
*Сэрца краіны на чужых далонях.*
*Мы самі ствараем сваю рэпутацыю.*
*Мы сёньня ідзем на радыёстанцыю.*

*Апошнія навіны раскажам.*
*Трэба? — Адкажам на ўсе пытаньні.*
*Імправізацыя без правакацыяў —*
*Гэта фармат усіх радыёстанцыяў.*

Рэфрэн:
*FM FM FM FM —*
*Мы тонем, мы не плывем.*
*FM FM FM FM —*
*Мы гінем, мы не жывем.*
*FM FM FM FM —*
*Мы слухаем, слухаем*
*FM FM FM FM*
*FM FM FM.*

*Усім прывітаньне і дзякуй.*
*Трэба сьмяяцца, ня трэба плакаць.*
*Жадаем вам посьпехаў у творчай працы,*
*Да новых сустрэч, радыёстанцыя.*

Рэфрэн.

## Тры чарапахі-2

*Каб разьлічана й сур'ёзна*
*Паглядзець на гэты сьвет,*
*Трэба мець цьвярозы розум*
*І спакой у галаве.*
Рэфрэн:
*Гэта сур'ёзна.*
*Добра, ды позна.*
*Мы — проста дзеці,*

*Блукаем па сьвеце.*
*Сонца нам сьвеціць.*
*А ў галаве — вецер.*

*Калі ўласная кар'ера*
*Падымаецца ўгару,*
*Трэба дзякаваць Карнэгі,*
*Фрэйду, Шапэнгаўэру.*

Рэфрэн.

*Будзе ўсё ў цябе ў парадку,*
*Будзе добра ўсё з табой.*
*Будуць грошы. Будуць градкі,*
*Глеба, гліна, перагной.*
*Будзе добрая ўлада,*
*Будзе нешта на стале,*
*Аптымальныя расклады,*
*Ды чагосьці не стае.*

Рэфрэн.

## Маё пакаленьне

*Маё пакаленьне у цемры расло.*
*Цяпер яму цемра — таксама сьвятло.*
*Маё пакаленьне расло на мяжы*
*З заслонай жалезнай у самай душы.*

*Маё пакаленьне хаваецца ў цень,*
*У сьвет летуценьняў, ва ўчорашні дзень.*
*Маё пакаленьне гуляе і п'е,*
*Стаіць на каленях, ня любіць сябе.*

*Набыць бы даляры, прадаць бы рублі,*
*А потым падалей ад гэтай зямлі.*
*«Мы — вольные птицы,*
*Пора, брат. Пора»,*
*На стомленых крылах у вырай ці ў рай.*

*Маё пакаленьне сядзіць пры стале,*
*Сядзіць у турме і сядзіць на ігле.*
*Сядзіць на пасадзе і любіць стагнаць:*
*І трэба падняцца, і цяжка стаяць.*

*Мы, беларусы, з братняю Русьсю*
*Шукалі да шчасьця дарог.*
*У бітвах за волю, ў бітвах за долю*
*Нас гэты шлях перамог.*
*Нас аб'яднала ні многа ні мала —*
*Удзел у дурной барацьбе.*
*Коласу слава, слава Купалу,*
*Але дзе мейсца тут для цябе?..*

*Згрызоты сумленьня, пакуты душы...*
*Маё пакаленьне — маё настальжы.*
*Твае сутарэньні, твае гаражы,*
*Сьпісаныя сьцены, жыцьцё на мяжы.*

*Нібыта нядаўна, нібыта даўно.*
*Састылая кава, дапіта віно.*
*Маё пакаленьне, «махая крылом,*
*Кровавую пищу клюёт под окном».*

## Фабрыка

*І вось гэты новы дзень —*
*Дзень як дзень, з ланцугу.*
*А я ў вакно глядзеў*
*Праз імжу, праз смугу.*
*Выбіраеш? Выбірай*
*Каляровы небакрай.*
*Выбіраеш? Выбірай*
*Дзіўны край, Індакітай.*

Рэфрэн:
*Толькі фабрыка ў маім акне*
*Будзе жыць у летаргічным сьне.*

*Толькі фабрыка ў маім акне*
*Не прачнецца нават па вясьне.*

*Прыйшоў гэты новы дзень*
*І згарэў, не сагрэў.*
*І ты ў гэты новы дзень*
*Пасталееў, пастарэў.*
*Робіш выгляд? Я раблю,*
*Што люблю ўсю зямлю.*
*Добры вечар, добры дзень...*
*Нібы колы па вадзе...*

Рэфрэн.

*Прыйшоў невядома хто,*
*Шэры твар, бляклы твар,*
*Сказаў, што цяпер ён тут*
*Гаспадар...*

*І можна ўсё забыць,*
*Есьці й піць, сноў ня сьніць.*
*І можна набыць віно*
*І глядзець у вакно.*
*Разумееш? Зразумей,*
*Што ня згас яшчэ агмень,*
*А калі агмень ня згас,*
*Нам згасаць яшчэ ня час.*

# ПАСЬЛЯСЛОЎЕ

Без тлумачэньняў не абыйсьціся. Чаму кніга скончылася на «Трох чарапахах»? Дзе «Дом культуры»? Дзе 10-годдзе N.R.M., «Справаздача...», выступ на Майдане Незалежнасьці пад час украінскае рэвалюцыі, нарэшце? Дзе эмацыйныя камэнтарыі апошніх адлучэньняў ад FM-эфіру?

Не хвалюйцеся. Нічога ня зьнікла. Усё там, дзе і мусіць быць — у вашае памяці. І ўсё адбывалася менавіта так, як вы гэта памятаеце, як пра гэта распавядалі энэрэмаўцы ў сотнях інтэрвью, як пісалі журналісты ў сваіх рэпартажах. Не хацелася ператвараць кнігу ў падручнік па найноўшае гісторыі. А хацелася больш распавесьці пра тое, што за даўнінай часу з памяці сьцерлася. Пра вытокі, пра факты малавядомыя альбо ўвогуле забытыя — нават самімі музыкамі. Пра што немагчыма прачытаць у апошнім нумары « Музыкальной газеты» ці на «слыхапе.сом».

Але не перажывайце. Сучаснасьць мае дрэнную якасьць — у гісторыю яна ператворыцца вельмі хутка. Пройдзе няшмат часу, вашыя ўспаміны пачнуць блякнуць, і зноў зьявіцца падстава заняцца графаманствам. У мяне ці ў кагосьці іншага.

*Віктар Дзятліковіч*

Вялікі дзякуй:

Алезісу, Лявону, Піту, Уладзю, Юрасю — за згоду выслухаць пытаньні і нават на іх адказаць.

Віталю Сямашку, Зьміцеру Падбярэзкаму, Вітаўту Мартыненку, Віктару Івашкевічу — за супрацоўніцтва.

Сяргею Сахараву, Алегу Клімаву — за тое, што не адмовілі ў просьбах.

Віктару Лосьмінскаму, Саніце, Сяргею (Шлёме) Лабандзіеўскаму, Лявону Нарушэвічу — за цікавыя дробязі.

Анастасіі — за дзіўную ўпэўненасьць.

Слаўку Ракіцкаму — за гарэлку «Шапэн» ды добры стол, за якім і нарадзілася ідэя.

У кнізе скарыстаныя фотаздымкі Віктара Дзятліковіча, Аляксандра Куліка, Сяргея Крыштаповіча, Ігара Супранёнка, Д. Вількіна, Вікі Казловай, а таксама аўтараў, імёны якіх паглынуў час, і ўзгадаць іх не ўяўляецца магчымым.

# ЗЬМЕСТ

ПРАДМОВА АД ВОЛЬСКАГА .......................5

ЭПОХА МРОЯ .......................................6

РАЗЬДЗЕЛ 1. ПАЧАТКІ. СТВАРЭНЬНЕ МРОІ ........8
Дзеці — баяністы ...................................8
Дэклямант Вольскі ..................................9
Школьныя вопыты ..................................10
Менск — музычнае балота .........................12
Як пазнаёміліся Вольскі і Дземідовіч ...............13
Машина Времени — хаўруснік Давыдоўскага .........14
Вярбоўка Алезіса ...................................16
Эскалатар ...........................................19
Нарачэньне Мроі ....................................20

РАЗЬДЗЕЛ 2. 1982—1983. ПЕРШЫЯ КАНЦЭРТЫ. «СТАРЫ ХРАМ» ....................................22
Вёска Дзегцяроўка ..................................22
«Майстроўня» і малады нацыяналізм .................26
Першы запіс «Старога храму» ........................29
Патлы да зямлі .......................................32
«Гурт, які граў у Траецкім» ...........................34

РАЗЬДЗЕЛ 3. 1984—1986. СТРАЧАНЫЯ ГАДЫ .....36
Армія і Ленін .........................................36
Пацыфіст Ляўкоў ......................................38
Рок-клюб «Няміга» ....................................39
Першы гіт-парад «Чырвонай змены» ..................41
Юрык і КДБ ...........................................42
Вяртаньне і самы жудасны правал Мроі ...............45

РАЗЬДЗЕЛ 4. 1987. ВЯРТАНЬНЕ ДА ЖЫЦЬЦЯ. ЗРОК» ........................48
Фестываль «Рок-крок» у Гародні ........................48
Хлопцы з «зоны» ........................52
Савецкая крытыка: «Гэта падобна на прафанацыю музыкі» ........................53
Стод-рок ........................57
Гілевіч і дэмакратыя ........................59
Каралі аўтапаркаў ........................61

РАЗЬДЗЕЛ 5. 1988. СКАНДАЛЫ Й ПЕРАМОГІ ........63
«Зярняткі духоўнасьці». Гіт-парад «Беларускай маладзёжнай» ........................63
Пена на хвалях перабудовы ........................66
Змова ў Наваполацку ........................74
Спрэчкі пра вартасьці ........................83
Парад папулярнасьці 1988 ........................84
«Студыя БМ» і першыя відэакліпы ........................86

РАЗЬДЗЕЛ 6. 1989—1990. СЫХОД ДАВЫДОЎСКАГА. «28-Я ЗОРКА» ................89
Каханьне і амбіцыі ........................89
Давыдоўскі пасьля Мроі ........................93
«28-я зорка» ........................95
«Веня быў у абсалютнай і пастаяннай адключцы...» ........99

РАЗЬДЗЕЛ 7. 1990—1992. ЗАМЕЖНЫЯ ВАЯЖЫ, ГКЧП І ПЛЯНЫ ЭМІГРАЦЫІ ................100
Басовішча ........................100
Музыкі-клунячнікі ........................103
Французскія ўражаньні ........................104
Сьмерць бізнэс-пляну ........................109
Жнівень 1991. На плытах у Швэцыю? ........................110
Басовішча '92 і выгнаньне Вені ........................112

РАЗЬДЗЕЛ 8. GARELKA, DRUGS & SAMAGON ........114
«Гэта мы пілі, а яны пелі» ........................114
Грызя і яе хаза ........................116
Подзьвіг Юрася ........................118
«Прыходзьце пасьля абеду» ........................121

Напой «Бураціна» ....................122
Марыхуана, амарэта і рыбкі гупі ....................124

**РАЗЬДЗЕЛ 9. 1992—1994. ШЛЯХ ДА СЬМЕРЦІ ....127**
Дзіўнае самазабойства ....................127
Шот і Цынкевіч, «браты-махляры» ....................128
Іншыя героі часу ....................130
Загінуўшы альбом ....................132
Зьмены гітарыстаў працягваюцца.
Віктар Смольскі ....................133
Апошнія фестывалі. Данія і Басовішча ....................134
Зьяўленьне Піта ....................138

**РАЗЬДЗЕЛ 10. 1994. СЬМЕРЦЬ МРОІ І СТВАРЭНЬНЕ N.R.M. ....................139**
Піт. Дзяцінства ....................139
Піт: «Мы ставілі на Мроі вялікі крыж» ....................142
«Нешта валасатае». Запрашэньне Піта ў Мрою ......144
Першыя рэпэтыцыі зь Пітам ....................146
Вольскі ставіць на Мроі крыж ....................147
Спроба выгнаць Алезіса ....................148
Апошняя рэпэтыцыя ....................151

**РАЗЬДЗЕЛ 11. 1994—1995. СТВАРЭНЬНЕ N.R.M. І «LALALALA» ....................155**
Пачаткі N.R.M. ....................155
Шчупак фаршаваны і N.R.M. на Рок-каранацыі ........157
У розныя бакі... ....................159
«LaLaLaLa» ....................162
Першае праслухоўваньне ....................164
«Дзе наш беларускі Deep Purple?» ....................166

**РАЗЬДЗЕЛ 12. 1996—1998. «ОДЗІРЫДЗІДЗІНА» І «ПАШПАРТ...» ....................168**
Хто «раскруціў» N.R.M.? ....................168
«Зь іроніяй, сарказмам, дурной весялухай...» ..........170
Прэзэнтацыя «Одзірыдзідзіны» і эміграцыя Алезіса ...173
Праблемы з уладамі ....................175
«Пашпарт...» у маналёгах ....................177
«Пашпарт...» у нататках ....................180

«Акустычныя канцэрты...» і іншыя праэкты ............183
Кліпаманія ............185

**РАЗЬДЗЕЛ 13. 1999—2000. «ТРЫ ЧАРАПАХІ» .....186**
«Дзейнічаць. І дзейнічаць нестандартна...» ............186
Польскі запіс. Памылкі ............188
Самотнік ............190
Канчатковы запіс «Трох чарапахаў» ............191
Рэакцыя ............194
«Бульба-рэкардз»: рэкордныя падманы ............200

**РАЗЬДЗЕЛ 14. «ГАЛІМАЯ ПАПСА». ДЫСКУСІІ Ў ПРЭСЕ ............202**
«Откуда у хлопца рок-н-ролльная грусть...» ............202
«Откуда у хлопцев рок-н-ролльная грусть»-2 ............209

**РАЗЬДЗЕЛ 15. 2000. ТУР ПА БЕЛАРУСІ ............216**
Лявон Вольскі: «Ну, усё, — падумалі мы, — зараз будзе дзікая бойка» ............217
Алезіс Дземідовіч: «Проста трэба мейсцы ведаць» .....222
Юрась Ляўкоў: «Аўтографы, фотаздымкі, машына, гатэль...» ............224
Піт Паўлаў: «Не, я не расеец...» ............225

**ТЭКСТЫ ............230**
**Мроя ............230**
1981—1986 ............230
1987—1990 ............236
1991—1994 ............251
**N.R.M. ............264**
«LaLaLaLa», 1995 ............264
«Одзірыдзідзіна», 1996 ............275
«Пашпарт грамадзяніна N.R.M.», 1998 ............283
«Тры чарапахі», 1999 ............290
«Дом культуры», 2002 ............301

**ПАСЬЛЯСЛОЎЕ ............314**

Літаратурна-мастацкае выданне

*Дзятлікові́ч Віктар*

*IX* МРОЯ
*IX* N.R.M.

Адказны за выпуск М. У. Адамчык

Падпісана да друку з гатовых дыяпазітываў 06.07.05.
Фармат 84x108$^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 16,8+1,68 вкл. Тыраж 2 100 асобн. Заказ 1532.

Выдавецкі кааператыў «Сучасны літаратар».
Ліцэнзія № 02330/0133053 ад 30.04.04.
РБ, 220029, Мінск, вул. Кісялева, 47, к. 4.

Пры ўдзеле ТАА «Харвест».
Ліцэнзія № 02330/0056935 ад 30.04.04.
РБ, 220013, Мінск, вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.















## Віктар Дзятліковіч

Віця (аўтар гэтае кнігі) — наш добры сябар. Як толькі прыяжджае ў наш стабільны, чысты й узорны Менск, дык мы абавязкова сустракаемся. Ён нам распавядае пра сваю нялёгкую працу, мы яму — пра сваю. Калісьці Віктар Дзятліковіч працаваў у Менску, але змушаны быў зьехаць у чужы далёкі велізарны горад, які, як усім вядома, ня верыць сьлязам. Таму наш герой ня стаў плакаць, а пачаў працаваць тэлежурналістам на адным зь вядомых расейскіх тэлеканалаў. Праца кідала яго ў Чачэнію, у Аўганістан, нядаўна тэлефанаваў з Таймыру...

Віктар добра нас ведае й нямала з намі паезьдзіў: наведваў «Басовішча», прыяжджаў у Менск на эпахальныя для нас канцэрты «Радыё Гамон» і «Падарожжа на Возера Трох Чарапахаў», гасьцяваў з намі ў Лёніка Тарасэвіча, карацей, зьведаў нягоды й цяжкасьці музыканцкага жыцьця.

Гэтая кніга, бадай, першая спроба біяграфіі беларускага гурту. Болей увагі тут надаецца «Мроі», яно й зразумела: «Мроя» тая была так даўно, што некаторыя з музыкаў ня памятаюць гарадоў і датаў, а хтосьці нават забыўся на падзеі. Таму гэта тое, што ў нас прынята называць легендай. Дзякуючы Віктару аднавіўся парваны ланцуг мроеўскага жыцьця, і цяпер можна ўдыхнуць дзіўны водар, здаецца, блізкіх, але такіх даўніх гадоў. Гэткая машына часу... Таму — добрага Вам падарожжа!

Лявон Вольскі

ISBN 985-14-1115-9

Віктар Дзятлiковiч

# Іх мроя Іх N.R.M.